СТРАЛЕЦ М. В.

# КРАІНАЗНАЎСТВА
# (Польшча, Германія)
# Курс лекцый

*для студэнтаў спецыяльнасці*
*25 01 03 "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны"*

БРЭСТ 2005

УДК 329(430.1)
ББК 66.2(4Ф)+63.3(4)
С84

Рэцэнзенты:
***Іофэ Э.Р.***, доктар гістарычных навук, прафесар
***Караў Д.У.***, доктар гістарычных навук, прафесар
***Марозава С.В.***, доктар гістарычных навук, прафесар
***Мішчанчук М.І.***, доктар філалагічных навук, прафесар

Навуковы рэдактар:
***Баюра А. М.***, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта

Рэкамендавана да выдання Саветам Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта (6 ліпеня 2005г.)

**Стралец М.В. Краіназнаўства (Польшча, Германія).**
С84 Курс лекцый. - Брэст: Выдавецтва БДТУ, 2005. – 148 с.

ISBN 985-493-025-4

Дадзены курс лекцый адрасуецца студэнтам дзённай формы навучання спецыяльнасці 25 01 03 “Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны”. Ён поўнасцю адпавядае рабочай праграме аднайменнай дысцыпліны, зацверджанай дэканам эканамічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.

УДК 329(430.1)
ББК 66.2(4Ф)+63.3(4)

ISBN 985-493-025-4

© Стралец М.В., 2005
© Выдавецтва БДТУ, 2005

*Прысвячаю брату Генадзю і яго сям'і:*
*жонцы – Інэсе і сынам – Міхаілу і Вячаславу.*

## УСТУП

Перш за ўсё, важна акрэсліць мэты і задачы дысцыпліны, яе месца ў навучальным працэсе.

Курс "Краіназнаўства: Польшча, Германія" надзвычай неабходны для будучых спецыялістаў у галіне міжнародных эканамічных адносін.

Неабходнасць у такім курсе тлумачыцца наступнымі прычынамі:

- адсутнасцю ў студэнтаў якіх-небудзь сістэматызаваных ведаў аб дзяржавах, з якімі ў Беларусі, акрамя краін СНД, найбольш цесныя кантакты;
- развіццём супрацоўніцтва Брэста і вобласці з ваяводствамі і гарадамі Польшчы, землямі і гарадамі Германіі;
- паглыбленнем кантактаў БДТУ з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі гэтых краін.

Галоўнай мэтай курса "Краіназнаўства" з'яўляецца набыццё студэнтамі сістэматычных ведаў па гісторыі, палітыцы, эканоміцы, культуры Польшчы і Германіі.

Задачы вывучэння дысцыпліны наступныя.

Галоўнай задачай курса з'яўляецца ўсведамленне студэнтамі адметнасці польскага і нямецкага этнасаў праз вывучэнне іх палітычнай гісторыі, гістарычных назваў палякаў і немцаў, дзяржаўнай сімволікі, праз знаёмства са здабыткамі матэрыяльнай і духоўнай культуры палякаў і немцаў.

Курс павінен дапамагчы студэнтам рэальна ацаніць ролю палякаў і немцаў у сістэме міжнароднай супольнасці народаў у мінулым і сучасным і глыбока разумець праблемы ўзаемаадносін палякаў і немцаў з суседзямі, што вельмі важна ва ўмовах суверэннага існавання Рэспублікі Беларусь.

Асабліва вялікае значэнне для студэнтаў спецыяльнасці "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны" мае вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі Польшчы і Нямеччыны. Атрымаўшы гісторыка-эканамічныя веды, студэнт павінен навучыцца даваць навуковае абгрунтаванне новых і канструктыўную крытыку існуючых эканамічных тэорый, усебакова аналізаваць сацыяльна-эканамічныя працэсы, тэндэнцыі, вызначаць перспектывы эканамічнага развіцця гэтых краін, рабіць абгрунтаваныя рэкамендацыі наконт магчымасці выкарыстання польскага і нямецкага вопыту для Беларусі.

А зараз прапануем пералік дысцыплін з указаннем раздзелаў (тэм), засваенне якіх неабходна для вывучэння курса "Краіназнаўства".

**Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый).**

Тэмы:

1) Праблемы беларускай дзяржаўнасці ў перыяд існавання Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

2) Беларускае пытаннне ў 1917-1921 гг.

**Культуралогія.**

Тэмы:

1) Еўрапейская культура эпохі Сярэднявечча.
2) Еўрапейская культура эпохі Адраджэння.
3) Еўрапейская культура эпохі новага часу.
4) Еўрапейская культура XIX-XX стст.

Дадзены курс лекцый поўнасцю адпавядае рабочай праграме аднайменнай дысцыпліны, зацверджанай дэканам эканамічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.

Улічваючы, што дысцыпліна "Краіназнаўства (Польшча, Германія)" інтэграцыйная, прапануемы вучэбны дапаможнік можа выкарыстоўвацца будучымі гісторыкамі, палітолагамі, філолагамі, культуролагамі.

Аўтар выказвае падзяку за дапамогу ў працэсе працы над кнігай супрацоўніку Генеральнага консульства Рэспублікі Польшча ў Брэсце Марку Трацяку, дацэнту Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта Эдмунду Ярмусіку, выкладчыку Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта Людміле Пікуле.

## Раздзел першы. Польшча

*Лекцыя першая*

### АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ ПОЛЬСКАЙ ГІСТОРЫІ
### (са старажытных часоў да 1918г.)

***План:***

1.1 Дадзяржаўны этап польскай гісторыі (ад верхняга палеаліту да другой паловы X стагоддзя).

1.2 Сярэдневяковая Польшча ад часоў княжання Мешкі І да ўтварэння Рэчы Паспалітай (другая палова X стагоддзя – 1569г.).

1.3 Рэч Паспалітая абодвух народаў і яе месца ў польскай гісторыі (1569г.-1795г.).

1.4 Польскія землі пад уладай Расіі, Прусіі, Аўстрыі (1795г.-1918г.).

1.5 Другая Рэч Паспалітая: фарміраванне нацыянальнай тэрыторыі, суадносіны дэмакратычных і антыдэмакратычных метадаў ў кіраванні грамадствам і дзяржавай (1918-1939гг.).

1.6 Польшча ў час Другой сусветнай вайны . Да пытання аб юрыдычным замацаванні новых дзяржаўных межаў (1939-1945гг.).

1.7 Польская гісторыя ў другой палове 1940-ых гг.-1989г.: курс вонкавых і унутраных сіл на дэмантаж заваёў народна-дэмакратычнай рэвалюцыі, мадэль дзяржаўнага сацыялізму ў кантэксце польскіх рэалій.

1.8 Рэспубліка Польшча (1989-2005гг.): сістэмныя пераўтварэнні ў рамках посткамуністычнага этапа.

Кожны пункт плана прысвечаны пэўнаму этапу польскай гісторыі. Натуральна, усяго гэтых этапаў восем, як і пунктаў плана. Першая лекцыя ўключае этапы з першага па чацвёрты, а другая – з пятага па восьмы.

#### *1.1. Дадзяржаўны этап польскай гісторыі (ад верхняга палеаліту да другой паловы X стагоддзя.)*

Першы этап польскай гісторыі – дадзяржаўны. Па сваей працягласці ён у шмат разоў пераўзыходзіць усе астатнія этапы, разам узятыя. Кропка адліку дадзенага этапа – з'яўленне першых людзей на тэрыторыі сучаснай Польшчы. Адназначна можна сцвярджаць, што першыя насельнікі з'явіліся тут у час верхняга палеаліту, жылі статкам, знаходзіліся на стадыі прысвойваючай гаспадаркі, пакінулі след на тэрыторыі выключна паўднёвай Польшчы. Ёсць таксама падставы для наступнай тэзы: неалітычная рэвалюцыя ў дадзеным рэгіёне, гэта значыць пераход ад прысвойваючай гаспадаркі да вытвараючай звязана з этнасамі неславянскага паходжання. Хутчэй за ўсё гэта былі фіна-угры. Даследчыкамі выяўлены сведчанні іх знаходжання на стадыі вытвараючай гаспадаркі ў IV тысячагоддзі да нашай эры. Сляды фіна-ўграў можна прасачыць у аналізуемым рэгіёне і ў наступным тысячагоддзі. Варта адзначыць, што эпоха неаліту адметна і наяўнасцю тут культур іншых неславянскіх этнасаў. З цягам часу сюды мігравалі носьбіты культуры стужачнай керамікі і культуры шнуравой керамікі.

Што ж тычыцца культуры, якую трэба звязваць з вытокамі славян, то агульны назоўнік падыходаў навукоўцаў наступны: яе трэба шукаць не раней, чым у канцы бронзавага веку. Безумоўна, нельга адназначна сказаць, ці маюць рацыю археолагі, якія на грунце дэталёвага вывучэння Біскупінскага гарадзішча вызначаюць лужыцкую культуру, носьбіты якой жылі і ў бронзавым, і ў жалезным вяках, як праславянскую. Калі ж размова ідзе пра маючую адносіны да жалезнага веку пшэворскую культуру, то ў навуковай супольнасці больш згоды наконт яе прамога дачынення да этнагенезу палякаў, чэхаў,

славакаў, лужыцкіх сорбаў. Польскі этап гісторыі пшэворскай культуры мае ў якасці кропкі адліку рубеж II-I стст. да н.э. Дарэчы, сваю назву дадзеная культура атрымала ад польскага горада Пшэворска. На зусім невялікай адлегласці ад гэтага горада знаходзіцца вёска Гаць. Менавіта тут стагоддзе таму польскі навукоўца К.Гадачэк звярнуў увагу на магільнік, які стаў аб'ектам яго дэталёвых даследванняў.

Наступны этап прадгісторыі польскай народнасці ўяўляе той адрэзак часу, калі на сучаснай польскай тэрыторыі жылі паморы, ругі, мазуры, куявы, віслякі, паляне, слянзакі, палякі, смаляне.

### *1.2. Сярэдневяковая Польшча ад часоў княжання Мешкі I да ўтварэння Рэчы Паспалітай (другая палова X стагоддзя – 1569г.)*

Для далейшага прасочвання этнічных, дзяржаўнаўтваральных, культурных і іншых працэсаў на тэрыторыі Польшчы мэтазгодна разабрацца з паняццямі: "Вялікая Польшча" і "Малая Польшча".

Першае і другое найменні трэба разглядаць, маючы на ўвазе перш за ўсё ключавыя племянныя саюзы: палян і віслян. Ядро Вялікай Польшчы – тэрыторыя, населеная палянамі. Базісная частка Малой Польшчы – землі, трывала абжытыя віслянамі. Найменні "Вялікая Польшча" (Polonia Major) і "Малая Польшча" (Polonia Minor) вельмі ўдала можна выкарыстоўваць для адлюстравання дзеяння гісторыка-генетычнага метаду. Менавіта з Вялікай Польшчай трэба звязваць вытокі польскай дзяржаўнасці. Састаўнымі часткамі дзяржаўнай тэрыторыі на старце выканання ўладных паўнамоцтваў князем Меш-кам I таксама былі Куявія, Мазовія, Усходняе Памор'е. З цягам часу ў такой якасці выступяць Заходняе Памор'е, Сілезія. Логіка прымянення ўказанага метаду падказвае, што на першым этапе фарміравання тэрыторыі Польскай дзяржавы базіснае месца займала "Старэйшая Польшча" ("Вялікая Польшча"), а ключавым элементам другога этапа з'явілася распаўсюджванне на жыхароў "Малодшай Польшчы ("Малой Польшчы") статуса падданых князёў з дынастыі Пястаў.

Цяжка пераацаніць такі вынік другога этапа, як вырашэнне заходнепаморскага пытання. Пытанне аб прыналежнасці Заходняга Памор'я разглядалася князем Мешкам I у кантэксце геапалітычнага раскладу, яго высокага па тагачасных мерках эканамічнага патэнцыялу, а таксама саюзніцкіх адносін паміж польскім і чэшскім бакамі. Прычым, усе гэтыя аспекты былі ўзаемазвязаны. Мець пад сваёй уладай стратэгічна важныя гарады Шчэцін, Волін, Калабжэг значыла для польскага князя атрыманне важнага козыра ў адносінах з яго суседзямі. 965 год адзначаны ў яго жыцці дальнабачным крокам: Мешка I становіцца зяцем першай асобы ў Чэхіі. Гэта падзея прадвызначыла станоўчую рэакцыю дадзенай асобы на тое, што Заходняе Памор'е пераўтварылася ў аб'ект тэрытарыяльных прэтэнзій Мешкі I. Заўважым, што палітычная вага яго чэшскага калегі Баляслава I у тагачаснай Цэнтральнай Еўропе была даволі высокая. Таму мудры дзяржаўны дзеяч Мешка I вырашыў падвесці пад саюзніцкія адносіны хрысціянскі грунт. Дзякуючы ініцыятыве, высілкам Баляслава I, двухбаковай зацікаўленасці, Польшча ў 966 г. папоўніла кола хрысціянскіх краін. З моманту прыняцця хрысціянства гэта краіна заўсёды заставалася вернай каталіцкай арыентацыі.

Рэзідэнцыя князя знаходзілася ў горадзе Гнезна. Менавіта з гэтага факта трэба адлічваць гісторыю сталіц Польскай дзяржавы. Час княжання Мешкі I адметны і з'яўленнем важнага атрыбута дзяржаўнасці – герба з выявай белага арла. Да дадзенага часу гэты герб выступаў выключна ў якасці герба Пястаў. Трэба мець на ўвазе, што выдатны прадстаўнік дынастыі Пястаў Мешка I пры ўсёй бясспрэчнай значнасці яго дзейнасці не паставіў кропку ў фарміраванні дзяржавы, якая б уключала ўсе этнічныя польскія абшары. Гэта здзейсніў яго

першанец – Баляслаў I Храбры. На мяжы X – XI стагоддзяў у склад Польскай дзяржавы трывала ўвайдуць Сілезія, Малая Польшча і маючы непасрэднае дачыненне да апошняй горад – прыгажун, будучая сталіца Кароны Польскай – Кракаў. Баляслаў I разглядаў у якасці моцнага аргумента для ўмацавання ўласнай улады той факт, што менавіта пры ім у 1000-ым годзе распачалася гісторыя айчынных мітрапалітаў. Першы з іх стаў дзейнічаць у сталіцы дзяржавы.

Часы Мешкі I, Баляслава I адметны ключавымі момантамі не толькі ў гісторыі польскай дзяржаўнасці, але і ў польскай этнічнай гісторыі, гісторыі польскай культуры. Паступова сталі набываць рэальныя абрысы прыкметы народнасці: агульная тэрыторыя, агульная гаспадарчая прастора, агульныя менталітэт, моўны і культурныназоўнікі. У крыніцах таго часу тытульная нацыя сучаснай Польшчы ўстойліва атрымлівала такое ж найменне, як і зараз. Розніца была толькі ў тым, што яно распаўсюджвалася на народнасць.

На жаль, напрыканцы княжання Баляслава I Храбрага ( 992-1025 гг.) можна прасачыць новую тэндэнцыю ў гісторыі Польскай дзяржавы – тэндэнцыю да дэцэнтралізацыі. Яна дасягнула сваёй кульмінацыі, як толькі скончылася эра Баляслава III Крываўстага (1102 – 1138гг.) Польшча перастае фактычна існаваць як адзіная дзяржава. Улада вялікага князя над агульнапольскай прасторай стала намінальнай. Яго рэальная ўлада распаўсюджвалася толькі на ўласны ўдзел. Суседзі захапілі і трывала ўтрымлівалі спрадвечныя польскія абшары – Сілезію, Заходняе Памор'е. Вельмі паказальным для адлюстравання сітуацыі ў некалі адзінай дзяржаве быў з'езд польскай эліты ў Лянчыцах ў 1180 г. Ініцыятар, арганізатар з'езда – вялікі князь Казімір II. Такога тыпу форумы мелі месца і раней. Заўважым, што іх гісторыя заканчваецца менавіта ў Лянчыцах. Лянчыцкі з'езд замацаваў status quo, гэта значыць дэцэнтралізацыю. Казімір II пагадзіўся на форуме з тым, што ў вялікага князя і яго акружэння будзе паўнамоцтваў значна меней, чым дагэтуль. Удзельнікі з'езда жорстка абмежавалі зону поўнага кантролю Казіміра II: Кракаў, які болей за стагоддзе таму стаў сталіцай дзяржавы, і далёка не ўся Малая Польшча. Астатняя тэрыторыя набывала мноства поўнаўладных гаспадароў. Прычым кожны гаспадар (князь, магнат, шляхціч) атрымаў права аднаасобна вырашаць, у чые рукі трапіць аб'ект валодання пасля ягонай смерці. Амбіцыйныя князі, рыцары, біскупы набылі і шэраг іншых прывілеяў, а таксама больш трывалыя імунітэты.

Заўважым, што сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Польшчы ўскладнялася не толькі дэцэнтралізацыяй. Даволі няпростым быў вонкавы фактар.

Для поўнай характарыстыкі месца Польшчы ў тагачаснай сістэме міжнародных адносін трэба, перш за ўсё, мець на ўвазе два праблемныя комплексы.

Першы праблемны комплекс – узаемадачыненні са Святой Рымскай імперыяй германскай нацыі, Тэўтонскім ордэнам. Першым накірункам сумнавядомага Drang nach Osten яшчэ ў другой палове XII ст. стала Памор'е. Суб'ектам агрэсіўных дзеянняў выступіла Брандэнбургскае маркграфства, якое было размешчана на спрадвечна славянскіх абшарах. У XIII стагоддзі падданымі маркграфа становяцца жыхары Любушчыны.

Пачатак другой чвэрці XIII стагоддзя адзначаны з'яўленнем новага суб'екта нямецка-польскіх стасункаў – Тэўтонскага ордэна. Гэты ордэн, карані якога трэба шукаць у далёкай Палесціне, выступіў у такой якасці дзякуючы князю Конраду Мазавецкаму, які ўладарыў на значнай частцы Малой Польшчы і, што было прынцыпна важна, – у Кракаве. Князь задумаў спачатку стварыць у Хэлмінскай зямлі моцны антыпрускі фарпост,а затым пераўтварыць прусаў у сваіх падданых. Тэўтонскі ордэн павінен быў адыграць якраз ключавую ролю ў рэалізацыі дадзенай задумкі. З Ордэнам у 1226г. была дасягнута дамоўленасць, якая ўтрымлівала наступныя ключавыя моманты: 1) месца базіравання Тэўтонскага

ордэна – Хэлмінская зямля; 2) рыцары Ордэна прызнаюць вярхоўную ўладу з боку Конрада Мазавецкага, жорстка яму падпарадкоўваюцца; 3) Ордэн уласнымі сіламі вырашае задачу далучэння Прусіі да Мазовіі. Аднак ні адзін з гэтых момантаў не вытрымаў выпрабаванне часам. Тэўтоны даволі хутка пераўтвараюцца з саюзнікаў Мазовіі ў галаўны боль яе князёў. Спачатку стала рэальнасцю новаўтварэнне, неад'емнымі састаўнымі часткамі якога з'яўляліся Тэўтонскі ордэн і Ордэн Мечаносцаў (1237г). Апошнюю ж чвэрць XIII стагоддзя крыжакі сустракалі, будучы поўнаўладнымі гаспадарамі Прусіі, маючы уласную дзяржаўнасць, істотную падтрымку з боку імператараў Святой Рымскай імперыі германскай нацыі, кіраўніка рымска-каталіцкай царквы. Такім чынам, дамоўленасць Мазовіі з Ордэнам 1226г. мела негатыўныя доўгатэрміновыя наступствы.

Другі праблемны комплекс – узаемадачыненні з мангола-татарамі. Вядома, што ў 1236г. яны ўсталявалі панаванне пад Маскоўскай Руссю, якое доўжылася да 1480г. Першапачаткова ў мангола-татар быў намер заваяваць не толькі Русь, але і ўсю Цэнтральную і Усходнюю Еўропу. Аднак мужнасць і самаадданасць рускіх людзей, праяўленыя імі ў барацьбе з ворагам, аднялі ў захопнікаў шмат сіл, прымусілі іх больш рэальна ацэньваць свае рэсурсы, магчымасці. Рэалізацыю праграмы – максімум прыйшлося часова адкласці, аднак мары пра яе ажыццяўленне былі вельмі жывучыя. Як свайго кшталту пралог да звяртання да яе ў будучым разглядаліся ўзброеныя нашэсці на польскія землі ў 1241, 1259, 1287гг. Залатая Арда ў той час была ў відавочным уздыме, і пагроза з яе боку ўспрымалася ўнутры Польшчы вельмі сур'ёзна.

Разам з тым замежныя сувязі польскіх абшараў не абмяжоўваліся наяўнасцю праблемных комплексаў.

Так, ведучы гаворку пра нямецка–польскія стасункі ў аналізуемы перыяд, важна мець на ўвазе не толькі агрэсіўныя памкненні нямецкіх князёў, маркграфаў, рыцараў, але і станоўчы ўплыў германскіх зямель на Польшчу. З Германіі ў Польшчу прыйшло Магдэбургскае права. Заўважым, што гарадское самакіраванне на грунце гэтага права набыло рэальныя абрысы на польскіх абшарах нашмат раней, чым на беларускіх землях. Нагадаем, што ў 1390г. Берасьце стала першым беларускім горадам, якому будзе даравана Магдэбургскае права. За стагоддзе да гэтага колькасць такога кшталту гарадоў у Польшчы будзе не меней за палову. Вядома, распаўсюджванне Магдэбургскага права адбывалася ў той час, калі кардынальна мяняўся этнічны склад гандляроў, рамеснікаў. У ім стала болей нядаўніх падданых нямецкіх князёў, маркграфаў, курфюстаў, чым саміх палякаў.

Больш прагрэсіўным, чым на Беларусі, быў уклад жыцця польскай вёскі, якая ў XIII стагоддзі дайшла да узроўню самакіравання, аўтаномнай праваахоўнай сістэмы.

Дыферэнцыраваную карціну ўяўляў сабой слой тагачасных непасрэдных сельгасвытворцаў. Гэту дыферэнцыяцыю лепей за ўсё паказаць, зыходзячы з паказчыкаў маёмаснага стану па канкрэтных сем'ях. Калі мець на ўвазе такі паказчык, як зямельны надзел, то можна прасачыць шырокую амплітуду ваганняў. Мінімальны паказчык будзе роўны 15 га, а максімальны – 50га.

Зразумела, зацікаўленасць пэўнай часткі эліты грамадства ў тым, каб паклясці канец дэцэнтралізацыі, існавала заўсёды. Аб гэтым, напрыклад, сведчыла гісторыя «манархіі сілезскіх Генрыхаў». Аднак з пункту гледжання атрымання рэальных вынікаў на шляху дасягнення дадзенай мэты ёсць падставы вылучыць у якасці першага рубяжа мяжу XIII – XIV стагоддзяў. Ролю магніта, які прыцягваў цэнтраімклівыя сілы, адыгрываў Кракаў. У якасці аўтарытэтнай постаці для гэтых сіл выступаў князь Уладзіслаў І Лакетак. Яго настойлівае і ўпартае жаданне – мець адзіную дзяржаву, якая б уключала ўсе этнічныя польскія землі, – пастаянна сустракала моцнае супрацьдзеянне з боку Брандэнбурга, Чэхіі,

Нямецкага Ордэна. Сур'езныя перашкоды стваралі для князя і дзеянні асобных удзельных польскіх князёў. Аргументы Уладзіслава І Лакетка ў барацьбе з яго праціўнікамі істотна ўзраслі пасля таго, як ён у 1320 г. стаў каралём. Новы этап у аб'яднальнай палітыцы польскіх каралёў звязаны з імем сына Уладзіслава І Лакетка Казіміра III Вялікага (1333-1370 гг). Дарэчы, ён – апошні манарх з дынастыі Пястаў. Сярод дзяцей Казіміра III Вялікага не было прадстаўнікоў мужчынскага полу. Таму калі скончылася яго эра, пытанне аб тым, хто зойме трон, засталося не вырашанае. Сілы, якія вызначалі сітуацыю ў краіне, спыніліся на кандыдатуры вугорскага караля Людовіка І Вялікага, які ў 1370–1382 гг. адначасова быў і польскім каралём. Адзначым, што ступень свабоды новага караля была адносна невялікая. Яго залежнасць ад польскіх магнатаў, шляхты, біскупаў была моцная. Яшчэ задоўга да смерці Казіміра III Людовік даводзіць да іх ведама, што ў тым выпадку, калі ён стане пераемнікам Казіміра III, для гэтага слоя насельніцтва пашырацца прывілеі, умацуюцца імунітэты (прывілей 1355 г.). Пасля таго, як распачалася эра Людовіка І Вялікага ў польскай гісторыі, мясцовыя феадалы бліскуча выкарысталі наступныя абставіны: сярод дзяцей караля былі толькі дочкі. Людовік не утойваў свайго жадання быць бацькам каралевы, якая стане яго пераемніцай па капітанскім мосціку польскай палітыкі. Феадалы далі зразумець манарху, што пагодзяцца з жаданнем апошняга толькі пры ўмове, што манарх рэзка павысіць ступень іх свабоды. Кошыцкі прывілей Людовіка І Вялікага 1374 года па-новаму рэгуляваў два аспекты гэтай свабоды. Першы аспект: на некалькі парадкаў зменшыўся аб'ём подацяў, якія ўносіліся дадзеным саслоўем у дзяржаўную скарбніцу. Другі аспект: шляхціч, які быў у пастаянным рэжыме непасрэдна задзейнічаны для выканання ваеннай функцыі дзяржавы, выступаў у такой якасці толькі на абшарах самой краіны.

У якой меры палітыка Людовіка І Вялікага адпавядала польскім нацыянальным інтарэсам? Адназначнага адказу на гэта пытанне быць не можа. У ідэале, будучы адначасова і каралём вугорскім, і каралём польскім, ён павінен быў як палітык адпавядаць інтарэсам абедзвюх краін. Аднак з'яўляючыся вугорцам па паходжанню, вугорскім каралём, ён фактычна ў сваёй свядомасці не ставіў знак роўнасці паміж Вугоршчынай і Польшчай, аддаючы відавочную перавагу сваёй радзіме. Таму ў параўнанні з Вугоршчынай не прасочвалася істотная роля Людовіка І Вялікага ў плане паляпшэння міжнароднага становішча Польшчы. Трэба браць ў разлік таксама і тое, што ў часы яго кіравання стала рэальнасцю вугорская вайсковая прысутнасць у Чырвонай Русі, якая рэзка разыходзілася з нацыянальнымі інтарэсамі Польшчы. У сувязі з тым, што мінусы ў знешняй палітыцы Людовіка – польскага караля пераважалі плюсы, польскія феадалы напрыканцы яго каралявання не жадалі, каб яго пераемніца была адначасова і польскай , і вугорскай каралевай. У другой палове 1382 года смерць караля ставіць кропку ў гісторыі эры Людовіка І Вялікага. У Вугоршчыне , але не ў Польшчы, аўтаматычна распачалася эра яго старэйшай дачкі. У наступным годзе малодшая сястра апошняй, якую звалі Ядвігай ,стане першай у гісторыі Польшчы каралевай. Далейшы лёс Ядвігі будзе прадвызначаны імкненнем польскіх феадалаў аб'яднаць Карону Польскую (КП) і Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (ВКЛ) ў адну дзяржаву. Гэта ж імкненне дэманстравалі і ўплывовыя колы ў ВКЛ. Агульны назоўнік настрояў магнатаў і шляхты ВКЛ і КП быў такі: стварэнне аб'яднанай дзяржавы прадухіліць пераўтварэнне літвінаў, русінаў, жамойтаў, палякаў у падданых Тэўтонскага ордэна. Рэальная магутнасць Ордэна, ступень яго міжнароднай падтрымкі ў 1380-ых гг. дазвалялі крыжакам ставіць на парадак дня пытанне аб гвалтоўным уключэнні ВКЛ і КП у зону іх непасрэдных уладных паўнамоцтваў і, натуральна, аб знікненні гэтых дзяржаў з палітычнай карты Еўропы.

Трэба таксама мець на ўвазе, што магнаты і шляхта ВКЛ і КП разлічвалі, што ў рамках аб'яднанай дзяржавы будзе знята валынскае пытанне, якое ўяўляла сабой сур'ёзную праблему ў двухбаковых адносінах. Неабыякавым да аб'яднання быў папа Рымскі, зацікаўлены ў рэзкім пашырэнні сферы распаўсюджвання каталіцкай канфесіі. ВКЛ дагэтуль у дадзеную сферу не ўваходзіла. Літвіны і русіны арыентаваліся на ўсходнюю галіну хрысціянства, а жамойты – на шматбожжа.

Падзеі, звязаныя з аб'яднаннем дзвюх дзяржаў, развіваліся наступным чынам. Спачатку былі складаныя,працяглыя перамовы, на якія Кракаў і Вільня дэлегавалі ўплывовых дзеячаў КП і ВКЛ. У перамовах, напрыклад, удзельнічаў брат вялікага князя Літоўскага Ягайлы князь Скіргайла. Юрыдычны грунт аб'яднаўчага працэсу быў закладзены 14 жніўня 1385 г. Менавіта гэтым днём датуецца з'яўленне Крэўскай уніі. З боку ВКЛ пакінулі свой аўтограф на акце уніі і тым самым афіцыйна пагадзіліся з яго зместам вялікі князь Літоўскі Ягайла, трокскі князь Скіргайла, мсціслаўскі князь Лугвен, ноўгарад-северскі князь Карыбут, князь гародзенскі і падляшскі Вітаўт. Гэта ж зрабілі і ўсе ўпаўнаважаныя прадстаўнікі польскага боку. Акт уніі ўключаў наступныя ключавыя моманты.

Першы момант. Вялікі князь Ягайла, які да гэтага быў праваслаўны, афіцыйна засведчыў, што ён стане адным з прадстаўнікоў каталіцкай канфесіі.

Другі момант. Уладныя паўнамоцтвы князя будуць максімальна выкарыстаны для таго, каб пераход жамойтаў ад політэізму да монатэізму меў выключна адзін напрамак – каталіцкі.

Трэці момант. Вялікі князь Літоўскі адначасова становіцца каралём польскім, афармляе шлюб з каралевай Ядвігай.

Канчатковая кропка ў пытаннях, звязаных з уніяй, была пастаўлена ў 1386 г. Дарэчы, таму яе трэба і датаваць 1386 г. З 4 сакавіка 1386 г. Ягайла ўжо фігуруе ў польскай гісторыі як чарговы кароль польскі Уладзіслаў II, застаючыся адначасова вялікім князем Літоўскім. Праўда, пройдзе зусім мала часу і адзін з падпісантаў Крэўскай уніі Вітаўт стане яе праціўнікам. У выніку набудзе рэальныя абрысы супрацьборства паміж Вітаўтам і Уладзіславам II. Развязка ў гэтым супрацьборстве наступіла ў 1392 г., калі ў выніку Востраўскага пагаднення ВКЛ стала зонай рэальных уладных паўнамоцтваў Вітаўта, а Уладзіслаў II рэальна кіраваў толькі ў Кароне Польскай. Прынцыпова нічога не мяняла ў такім раскладзе і Віленска-Радамская унія 1401 г. Саюзніцкія адносіны ВКЛ і КП прадвызначылі іх перамогу над Тэўтонскім ордэнам у час Вялікай вайны 1409-1411гг. Лёс вайны быў прадвырашаны ў выніку Грунвальдскай бітвы (1410), у якой бліскуча сябе праявілі ваяры абедзвюх дзяржаў. Зацікаўленасць бакоў у захаванні саюзніцкіх адносін прасочвалася і ў працэсе афармлення прававых актаў, звязаных з наданнем сілы закону Гарадзельскай уніі 1413 г.

Тая Польша, якую прыняў пад сваю ўладу Ягайла (Уладзіслаў II), істотна адрознівалася ад максімальнага тэрытарыяльнага варыянта часоў кіравання Баляслава І Храбрага. Не былі падданымі яго папярэднікаў, пачынаючы з Уладзіслава І Лакетка, жыхары сілезскіх і паморскіх абшараў. Эра Уладзіслава II таксама не была адметна тым, што дадзеныя абшары зноў сталі абшарамі Кароны Польскай. Вядома, што яшчэ Уладзіслаў І Лакетак, імкнучыся да аб'днання краіны, не змог вырашыць мазавецкае пытанне. Мазовія ў яго часы не вярнулася ў склад Польскай дзяржавы. Кропка ў гісторыі дадзенага пытання была пастаўлена аж у 1526 г., калі жыхары Мазавецкага княства трапяць пад уладу вялікага князя Літоўскага, караля польскага Жыгімонта І Старога.

Менавіта з Ягайлы (Уладзіслава II) распачынаецца гісторыя дынастыі Ягелонаў, якія з 1440 па 1572 гг. былі першымі асобамі ў ВКЛ, а з 1544 па 1572 гг. – у КП. Даводзілася ім пэўны час каралёваць і ў іншых краінах: Вугоршчыне, Чэхіі.

Заўважым, што Ягайла стаў каралём у краіне з адносна прагрэсіўным для таго часу палітычным ладам. Задоўга да яго эры ў польскай гісторыі асобы, якія займалі польскі трон, даволі сур'ёзна лічыліся з пазіцыяй каралеўскай рады (КР). У ёй засядалі магнаты, біскупы. КР дзейнічала на пастаяннай аснове. У крыніцах таго часу можна сустрэць ўзгадванне і пра іншыя структуры, форумы, якія мелі дачыненне да фарміравання палітыкі дзяржавы, курсу караля. Аднак іх роля была непараўнальна меншай.

Шырокія паўнамоцтвы КР захоўваліся да з'яўлення на свет Няшаўскіх статутаў 1454 г., замацаваных подпісам караля Казіміра IV. Няшаўскія статуты мелі сваім наступствам унясенне змен у расклад сіл унутры верхняга слоя польскага грамадства. Значна большым, чым раней, стаў аб'ём прывілеяў і імунітэтаў шляхты, аслаблі пазіцыі магнатаў.

Эра Казіміра IV адметна таксама сур'ёзнымі поспехамі ў галіне знешняй палітыкі. Аб гэтым сведчыць зыход Трынаццацігадовай вайны 1454-1466 гг. Польшчы з Тэўтонскім ордэнам. Кропку ў вайне паставіў Тарунскі мір 1466 г., паводле якога падданымі польскага караля зноў станавіліся ўсходнепаморцы і, зразумела, жыхары Гданьска, Эльблонга, Торуня.

Уступленне Польшчы ў новае, XVI стагоддзе было адметна завяршальнай стадыяй працэсу запрыгоньвання айчыннага сялянства.

Акрамя канчатковага ўсталявання прыгоннага права, у краіне напрыканцы XV – першай палове XVI стагоддзяў адбываліся важныя змены ў той частцы, што тычылася палітычнай надбудовы. Ужо кароль Ян Ольбрахт уносіць карэктывы ў Няшаўскія статуты. Вядома, што гэтыя статуты рэзка павышалі статус шляхецкіх сеймікаў, якія рэгулярна склікаліся ў розных рэгёнах Польшчы. Без згоды дадзеных структур польскі манарх не мог вызначыць парадак узымання подацяў са шляхецкага саслоўя, вырашыць ключавыя пытанні, звязаныя з паспалітым рушаннем. Праўда, такіх структур было шмат. Прычым спачатку па лініі кароль – канкрэтны сеймік шукаўся агульны назоўнік пазіцый сеймікаў і толькі потым набываў рэальныя абрысы канчатковы варыянт рашэння, які задавальняў і афіцыйны Кракаў, і цяжкія на ўздым шматлікія сеймікі, для якіх часта было характэрна імкненне перастрахавацца. Ян Ольбрахт(1492–1501гг.)дасягнуў таго, што запрацаваў на рэгулярным грунце новы інстытут – інстытут "земскіх паслоў". Гэтых паслоў пры вышэйшай службовай асобе краіны дэлегавалі ўсе сеймікі без выключэння. Наступствы новаўводзін караля такія: канчатковая кропка ва ўзгаданых пытаннях стала ставіцца значна хутчэй.

Дарэчы, інстытут "земскіх паслоў" займае важнае месца ў гісторыі польскага парламентарызму. Менавіта з ім генетычна звязана пасольская ізба. Апошняя вядома знаўцам гісторыі польскай дзяржаўнасці і польскага права як ніжняя палата парламента пад найменнем "сейм". Канешне, трэба мець на ўвазе, што вызначальную ролю ў парламенце адыгрывалі канцлер, ваяводы, біскупы, якія сталі сенатарамі, гэта значыць членамі верхняй палаты сената. Калі меркаваць па першых сенатарах, то можна прасачыць генетычную сувязь паміж каралеўскай радай (КР) і сенатам.

### *1.3. Рэч Паспалітая абодвух народаў і яе месца ў польскай гісторыі (1569 - 1795 гг.)*

Новы этап польскай гісторыі пачынаецца пасля заключэння першага ліпеня 1569 года Люблінскай уніі. Галоўны вынік уніі – утварэнне Рэчы Паспалітай абодвух народаў(РП).РП праіснавала з 1569 па 1795 гг. Гэта была федэрацыя з элементамі канфедэрацыі. На чале дзяржавы стаяў кароль польскі і вялікі князь Літоўскі. Дадзеная вышэйшая службовая асоба дзяржавы абіралася на спецыяльным (элекцыйным) сейме. Яе ўлада ў значнай ступені абмяжоўвалася

парламентам (сеймам). Верхняй палатай сейма быў сенат, а ніжняй – пасольская ізба. Неад'емнымі састаўнымі часткамі РП былі ВКЛ і КП, якія захоўвалі ў яе рамках адносную палітыка – дзяржаўную самастойнасць. ВКЛ і КП мелі ўласныя дзяржаўныя, мытныя межы, парламент (сейм), урад, войска, заканадаўства, грашовую сістэму. Аўтаномны статус ВКЛ узмацніўся ў выніку прыняцця Статута Вялікага княства Літоўскага (1588). Праўда, пэўныя ўплывовыя колы ў КП пастаянна імкнуліся да таго, каб пазбавіць ВКЛ дадзенага статуса. ВКЛ мела дакладна такія ж уладныя паўнамоцтвы, як і КП. У юрыдычна замацаванай жорсткай залежнасці ад караля польскага і вялікага князя Літоўскага знаходзіліся Інфлянты. Улады РП усталёўвалі рамкі, якія вызначалі свабоду манеўра Курляндыі, Земгаліі. Вельмі працяглы перыяд жыхары Пілтэнскага павета былі падданымі польскага караля. Апошні з 1525 па 1657гг. таксама неабмежавана дыктаваў сваю волю Прусіі. Для паўнаты карціны адзначым, што ў 1658 – 1659гг. РП уключала КП, ВКЛ і Вялікае княства Рускае (ВКР). ВКР уяўляла адзін з вопытаў украінскай дзяржаўнасці. Аднак трэба спецыяльна падкрэсліць, што ВКР узгадваецца ў вядомых даследчыкам крыніцах толькі пад 1658-1659гг. З моманту падпісання Люблінскай уніі да заснавання ВКР і з моманту яе краху да 1795г. у гісторыі РП ніяк не прасочваюцца факты існавання украінскай дзяржаўнасці.

Распад РП наступіў у выніку яе 3 падзелаў. Першы падзел датуецца 1772г. Яго ажыццявілі Расія, Прусія, Аўстрыя. Другі падзел РП адбыўся ў 1793г. Суб`екты падзелу – Расія і Прусія. І, нарэшце, 1795 год будзе адзначаны апошнім, трэцім падзелам. Склад яго ўдзельнікаў: Расія, Прусія, Аўстрыя.

### *1.4. Польскія землі пад уладай Расіі, Прусіі, Аўстрыі (1795 – 1918 гг.)*

У выніку падзела Рэчы Паспалітай абшары, якія ў яе уваходзілі, сталі аб'ектам каланіяльнага панавання Расіі, Прусіі, Аўстрыі. Спачатку разбяром іх становішча да Венскага кангрэса 1814-1815гг.

Палітыку прускіх акупацыйных улад можна адназначна ацаніць як антыпольскую. Пачнем з немалаважнага пытання аб найменні падуладных Берліну абшараў. У крыніцах, якія з'явіліся на свет у апошнія дзесяцігоддзі XVIII стагоддзя – пачатку XIX стагоддзя, можна сустрэць такія найменні: Заходняя Прусія, Паўднёвая і Новаўсходняя Прусія, Новая Сілезія. Падданыя прускага караля нямецкага паходжання ажыццяўлялі ўладныя паўнамоцтвы на ўсіх узроўнях і ва ўсіх структурах, упаўнаважаных вырашаць жыццёва важныя для палякаў пытанні. Даволі хутка мяняўся этнічны склад сярэдніх і буйных землеўладальнікаў. У іх шэрагах няўхільна павялічваўся працэнт немцаў, якія не мелі аніякага дачынення да Рэчы Паспалітай да яе падзелаў і, адпаведна, зніжаўся працэнт палякаў. З пачатку нямецкай акупацыі выразна абазначылася тэндэнцыя да рэзкага звужэння сферы ўжывання польскай мовы, уладныя структуры рабілі нормай у сваёй дзейнасці нямецкую мову.

Не была па-сапраўднаму спрыяльнай для палякаў і акупацыйная палітыка аўстрыйскіх улад. Імператар Леапольд ІІ палічыў за лепшае зрабіць падуладныя Вене польскія абшары састаўной часткай Каралеўства Галіцыі і Ладамерыі. Адным з ключавых напрамкаў акупацыйнай палітыкі было "паступовае пераўтварэнне галіцыйцаў у немцаў". У становішчы галіцыйцаў па сутнасці нічога не мяняла тая абставіна, што ў акруговых сеймах можна было прасачыць наяўнасць польскай эліты. Рэальныя ж паўнамоцтвы гэтых сеймаў былі нікчэмнымі.

Істотныя змены ў лёсе частцы абшараў былой Рэчы Паспалітай абодвух народаў адбыліся ў выніку падпісання 7 ліпеня 1807 года Тыльзіцкага трактата. Гэты трактат паклаў пачатак існаванню Герцагства Варшаўскага. Першай асобай у герцагстве быў не паляк, а немец. Размова ішла пра

Фрыдрыха Аўгуста, які займаў прастол у Саксоніі. Прычым фактычна канчатковую кропку ў прымаемых ім рашэннях ставіў Парыж. Таму нельга лічыць гэта ўтварэнне прыкладам паўнавартаснай дзяржаўнасці. Працэс фарміравання тэрыторыі Герцагства Варшаўскага прайшоў два этапы. Першы этап грунтаваўся строга на Тыльзіцкім трактаце і, натуральна, закранаў большую частку тых польскіх абшараў, якія былі падуладны Берліну на момант яго падпісання. Кропка адліку другога этапа – Шонбрунская дамова 1809 года. На гэты раз часткі свайго тэрытарыяльнага здабытку па выніках трох падзелаў Рэчы Паспалітай абодвух народаў пазбаўлялася Вена. Сам факт знаходжання на дадзеным абшары Кракава, Кельцэ, Радама, Любліна, Седльцэ падкрэсліваў яго спрадвечныя польскія карані. Герцагства Варшаўскае па тэрыторыі і насельніцтву лепей за ўсё параўнаць з сучаснай Беларуссю. Гэтыя дадзеныя ў адносінах да Рэспублікі Беларусь адпаведна былі 69% і 43%. Па тагачасных мерках размова ішла пра сярэднюю еўрапейскую дзяржаву і, натуральна, польскі нацыянальна-вызваленчы рух разглядаў факт яе стварэння як важны этап на шляху да аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 года, юрыдычны грунт якой утварыў бы Асноўны Закон, датаваны 3 траўня 1791 года. Заўважым, што ў французскага імператара былі спецыфічныя ўяўленні, якія леглі ў аснову Канстытуцыі Герцагства Варшаўскага. Апошняя Канстытуцыя па шэрагу ключавых пазіцый не стыкавалася з Канстытуцыяй 1791 года. Паводле Канстытуцыі новаўтварэнне складалася з 6 дэпартаментаў, 60 паветаў, ключавымі элементамі яго палітычнай сістэмы станавіліся сейм, дзяржаўная рада. Неўзабаве пасля ўзнікнення Герцагства яго ўлады паўтарылі англійскі варыянт XV стагоддзя, гэта значыць магчымасць існавання феадальнага ладу без прыгонніцкай сістэмы ў адносінах да непасрэдных вытворцаў. Стрыжнявым элементам ваеннай структуры дзяржавы былі ўзброеныя сілы. На чале іх стаяў Ю. Панятоўскі, які павінен быў зыходзіць з жорсткага ліміту, вызначанага Канстытуцыяй 1807 года: не больш за 40 тысяч жыхароў можна ўзяць пад ружжо. Герцагства Варшаўскае стала першым польскім абшарам, на якім стаў дзейнічаць славуты Кодэкс Напалеона, бясспрэчна прагрэсіўны для таго часу грамадзянскі кодэкс. Час існавання герцагства адзначаны шэрагам цікавых падзей, якія тычыліся адукацыйнай сферы. У польскую адукацыйную прастору пасля працяглага перапынку вярнуўся Ягелонскі універсітэт (Кракаў), пачала адлік сваёй гісторыі Варшаўская медыцынская школа. У параўнанні з часам аўстрыйскай акупацыі ў значна большай ступені задавальняліся патрэбы насельніцтва ў пачатковых школах. На тэрыторыі герцагства працягвала дзейнічаць грашовая сістэма Каралеўства Прусія. Важна адзначыць, што фінансы дзяржавы ў большай ступені выкарыстоўваліся дзеля інтарэсаў Парыжа, чым уласных грамадзян. Апошнія аплачвалі вялікія выдаткі на ўтрыманне арміі Ю. Панятоўскага. Напалеон актыўна выкарыстоўваў польскае гарматнае мяса для рэалізацыі сваіх анексіяніцкіх планаў. У час існавання дадзенага дзяржаўнага ўтварэння даволі часта ўслых казалася наступнае: "Герцагства варшаўскае, манета пруская, армія польская, кароль саксонскі, кодэкс французскі ". Лепей не скажаш.

Венскі кангрэс 1814 – 1815 гг. прывёў да новых змен у становішчы польскіх зямель. Была пастаўлена кропка ў гісторыі існавання Герцагства Варшаўскага. Тая яго частка, якая поўнасцю супадала з Пазнанскім, Быдгашчскім дэпартаментамі, зноў стала падуладна Берліну. У сферу прускага панавання ў чарговы раз трапіў Гданьск. Статус "вольнага горада" атрымалі Кракаў, ваколіцы гэтай былой сталіцы Кароны Польскай.

Абшар, які займала Герцагства Варшаўскае з 1807 па`1815 гг., за выключэннем названых дэпартаментаў і Кракава з ваколіцамі, набыў спецыфічны статус, акрэслены ў "Асновах канстытуцыі" Каралеўства Польскага. Ключавыя моманты гэтага дакумента, які ўбачыў свет у траўні 1815 года, наступныя.

Па-першае, Каралеўства Польскае з'яўлялася неад'емнай састаўной часткай Расійскай імперыі.

Па-другое, адна і тая ж асоба была і імператарам Расійскай імперыі, і каралём Каралеўства Польскага і, натуральна, найвышэйшай інстанцыяй у працэсе прыняцця рашэнняў.

Па-трэцяе, у сістэме заканадаўчай улады паўнамоцтвы сейма былі нефармальнымі, праўда, усечанымі. Ключавую ж ролю ў заканадаўчай сістэме адыгрываў расійскі манарх. Толькі ён аднаасобна атрымліваў права прапаноўваць тыя ці іншыя праекты законаў, мог уласнаручна надаць сілу закона бюджэту, які не задавальняў абсалютную большасць дэпутатаў сейма. Канстытуцыя 1815 года дапускала ўзнікненне сітуацыі, пры якой па волі манарха парламент Каралеўства Польскага не працаваў бы гадамі.

Па-чацвёртае, другой па значнасці інстанцыяй пасля імператара быў ягоны намеснік, які працаваў у цесным кантакце з Дзяржаўнай Радай (ДР). І намеснік, і ДР павінны былі аператыўна, штодзённа вырашаць польскія справы на месцы.

Па-пятае, неад'емнымі састаўнымі элементамі Каралеўства Польскага з'яўляліся Аўгустоўскае, Калішскае, Кракаўскае, Люблінскае, Мазавецкае, Плоцкае, Радамскае, Сандамежскае ваяводствы.

Па-шостае, Каралеўства атрымлівала права на стварэнне ўласных узброеных сіл.

Па-сёмае, улік інтарэсаў палякаў выразна прасочваўся ў падвядзенні юрыдычнага грунту пад працу галін улады на іх матчынай мове.

Па-восьмае, канстытуцыйна замацоўваўся плюралізм думак у грамадстве. І гэта ў той час, калі царскі рэжым душыў усялякае іншадумства ва ўласнай краіне.

З Пазнанскага і Быдгашчскага дэпартаментаў былога Герцагства Варшаўскага ўзнікла цікавае новаўтварэнне пад найменнем Вялікае княства Пазнанскае. І тут, як і ў Каралеўстве Польскім, быў сейм. Аднак ён фактычна быў чыста фармальнай, касметычнай структурай. І рыцарская курыя, і гарадская курыя, і сельская курыя сейма былі абсалютна бездапаможнымі.

Аб карэкцыі палітыкі ў адносінах да падуладных тэрыторый (Заходняй Галіцыі) думалі і ў Вене. На справе яе ступень карэкцыі была нязначнай. Цікавай была гісторыя Кракаўскай рэспублікі, кропкай адліку якой стаў Венскі кангрэс. Упер-шыню Кракаўская рэспубліка, ці "Вольны горад Кракаў", узгадваецца пад 1815 г. У гэтай дзяржаве існаваў парламент, які складаўся з дзвюх палат: верхняй (сената) і ніжняй (сейма). Праўда, дзяржаўнасць "Вольнага горада Кракава" была прывіднай. З 1816 г. рэальныя ўладныя функцыі належалі "Арганізацыйнай камісіі" (АК). У АК дэлегавалі сваіх прадстаўнікоў Вена, Берлін, Пецярбург, якія абралі ў якасці аптымальнага варыянта ўсталяванне пратэктарата.

З пачатку 1830-ых гадоў складана, драматычна развівалася сітуацыя, якая склалася на падуладных імператару Расіі Мікалаю II польскіх абшарах. Аб яе напружанасці сведчыла паўстанне ў Каралеўстве Польскім, якое доўжылася з 29 лістапада 1830 г. да 6 верасня 1831 г.

Пасля падаўлення паўстання 1830 – 1831 гг. у Пецярбурга прасочваліся новыя акцэнты ў польскім пытанні. Мікалай І пахаваў Канстытуцыю 1815 г. Спачатку царскія ўлады дзейнічалі ціхай сапай. "Арганічны статус", датаваны лютым 1832 г., хоць і з'яўляўся сабой адступленнем па шэрагу пазіцый ад Канстытуцыі 1815 г., усё ж утрымліваў пэўныя моманты, якія маглі задаволіць палякаў. Напрыклад, надавалася законнасць функцыянаванню адміністрацыйных структур, апарат якіх складаўся б з палякаў, прапісвалася існаванне органаў, у рамках якіх мела магчымасць падаць свой голас шляхта. Аднак прыстасоўваючыся да палітычнай кан'юнктуры, асобы, надзеленыя ўладнымі паўнамоцтвамі, не ўспрымалі "Арганічны статус" усур'ёз. Загадалі доўга жыць сейм,

Дзяржаўная Рада (ДР), узброеныя сілы Каралеўства Польскага і г.д. У рамках ваеннага становішча, пастанова аб якім была прынята ў 1834 г., душылася любая праява іншадумства. Антыпольскі характар насіў разбор шляхты.

Мікалай І быў крайне зацікаўлены ў тым, каб яго партнёры па Свяшчэннаму саюзу – імператар Аўстрыі і кароль Прусіі – займалі такую ж жорсткую антыпольскую пазіцыю, як і афіцыйны Пецярбург. У гэтай сувязі імператар Расіі быў задаволены фактам падпісання Мюнхенгрэцкай канвенцыі, датуемай верасьнем 1833 г. Мюнхенгрэц паклаў пачатак агульнаму назоўніку палітыкі ўсіх акупацыйных дзяржаў на польскіх абшарах. Яны былі адзіныя ў поўным ігнараванні нацыянальна-культурных патрэб палякаў, недапушчэнні свабоды, іншадумства. Мікалай І быў незадаволены тым, што статус Кракаўскай рэспублікі дазваляў ёй, па-першае, быць месцазнаходжаннем для асоб, якіх расійскі царызм лічыў сваімі ворагамі і, па-другое, мог разглядацца як натхняючы прыклад для іншых польскіх абшараў. Менавіта па ініцыятыве Пецярбурга была прынята Канстытуцыя 1833 г., якая маркіравала значнае пагаршэнне становішча кракавян, зводзіла іх аўтаномію да нікчэмнага мінімума, відавочнае замацаванне Вены на дадзеным абшары. Праходзіць тры гады, і тры манархі дасылаюць у рэспубліку свае ўзброеныя фарміраванні. Знаходжанне тут узброеных падданых імператара Расіі і караля Прусіі было адносна непрацяглым, затое прысутнасць у такой якасці іх саюзнікаў, прысягаўшых на вернасць Францу Іосіфу, доўжылася цэлых пяць гадоў. Зразумела, Вена стварыла тым самым перадумовы для таго, каб Кракаў навечна стаў аўстрыйскім. Незадаволенасць кракавян антыпольскім курсам Пецярбурга, Вены вылілася у паўстанне, датаванае 1846 г. У адказ яны зноў дасылаюць сюды ўзброеныя фарміраванні. Год паўстання стаў апошнім годам існавання Кракаўскай рэспублікі. Вена дасягнула свайго. Падуладны ёй абшар меў ужо новае найменне: Вялікае княства Кракаўскае.

Заўважым, што моцная апазіцыя антыпольскай палітыцы дзяржаў Свяшчэннага саюза існавала і ў далейшым, аб чым ,напрыклад, сведчылі падзеі, звязаныя з рэвалюцыяй 1848 – 1849 гг. у Старым Свеце. Бурліла Галіцыя, кароль Прусіі быў напужаны Пазнанскім паўстаннем 1848 г. Рэакцыйныя рэжымы, якія дзейнічалі супольна, "падавілі смуту ў Галіцыі і Познані", аднак ніяк не маглі падавіць імкненне палякаў да свабоды і незалежнасці.

У гісторыю польскага нацыянальна-вызваленчага руху назаўсёды ўвойдзе паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве, Беларусі. Галоўнай кіруючай структурай паўстання на польскіх землях, падуладных Аляксандру ІІ, быў Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК). Як і ў час паўстання 1830 – 1831 гг. патрыятычныя сілы польскага народа ставілі пытанне аб аднаўленні Рэчы Паспалітай.

Важна мець на ўвазе міжнародна-палітычны і беларускі аспекты паўстання 1863 - 1864 гг. Берлін рашуча падтрымаў Пецярбург. Афіцыйна дыстанцыраваліся Лондан, Парыж, Вена. Аднак ў іх не было аніякага жадання паўплываць на сітуацыю, выкарыстоўваючы рэальныя рычагі, якія на той час, безумоўна, меліся. Канешне, толькі рэальнае супрацьдзеянне ключавых ігракоў на еўрапейскай палітычнай сцэне магло спыніць Пецярбург. Нежаданне ЦНК ставіць пытанне аб адраджэнні Вялікага княства Літоўскага ў рамках будучай Рэчы Паспалітай сведчыла аб яго антыбеларускай пазіцыі і, натуральна, адштурхоўвала ад гэтай структуры айчынныя патрыятычныя сілы.

Канец паўстання 1863 – 1864 гг. маркіраваў новы этап у палітыцы Пецярбурга па польскім пытанні. Адышла ў мінулае польская спецыфіка ў спосабах утварэння і функцыянаванні мясцовых уладных структур, у адукацыйнай сферы. Антыпольская палітыка расійскага царызму ўсё больш тычылася мовы народа, які даў свету Каперніка, Манюшку, Шапэна. Яскрава прасочвалася зацікаўленасць Пецярбурга ў тым, каб сярод палякаў было больш праваслаў-

ных і менш каталікаў. Падуладны Аляксандру II польскі абшар усё часцей называўся ім Прывіслінскім краем. Такое найменне замацоўвалася і ў афіцыйных дакументах.

Праўда, заўважым, што маніфест Мікалая II ад 17 кастрычніка 1905 года парадзіў у палякаў надзеі на паляпшэнне свайго стану. Першапачаткова гэтыя надзеі спраўджваліся. Напрыклад, 37 жыхароў Каралеўства Польскага прадстаўлялі гэты рэгіён у якасці дэпутатаў у Дзяржаўнай Думе Расійскай імперыі. Аднак пасля трэцячэрвеньскага перавароту 1907 году ўсё вяртаецца на колы свае. У новы склад Дзяржаўнай думы ад дадзенага рэгіёна абіралася толькі 14 парламентарыяў. Каралеўства Польскае нават стала меней у тэрытарыяльным плане. У яго болей не ўваходзіў абшар, які пралягаў да Холму. Інтарэсы наёмных работнікаў не ўлічваліся ў працэсе адзяржаўлення Варшаўска-Венскай чыгункі, пры ўвядзенні новага гарадовага самакіравання ў рэгіёне.

Буйныя змяненні ў германскай гісторыі ў апошняй трэці XIX стагоддзя істотна паўплывалі на лёс Вялікага княства Пазнанскага. Прусія, пад уладай якой знаходзілася гэта княства, адыграла ключавую ролю ў аб'яднанні Германіі. Былы прускі канцлер Ота Бісмарк, які стаў германскім канцлерам, праводзіў палітыку, якая адмоўна адбівалася на становішчы ўсіх слаёў польскага насельніцтва. Канцлер не ўтойваў, што бачыць у палякаў нешта другараднае. Разглядаючы гэты народ як комплекс непаўнавартасці, афіцыйна Берлін усё часцей адмаўляў яму ў праве на заняцце адказных пасад на абшары, які той займаў, адкрыта дэманстраваў знявагу да польскай мовы, польскай культуры. Стваралася ўражанне, што Бісмарк марыў аб тым часе, калі на гэтым абшары ніхто не будзе размаўляць па-польску і нават не будзе людзей, якія лічаць сябе палякамі. Нарматыўныя акты, якія выдаваліся органамі цэнтральнага дзяржаўнага кіраўніцтва, яго рэальная палітыка ставілі ў яўна няроўнае становішча нямецкія і польскія суб'екты гаспадарання, нямецкія і польскія суб'екты палітычных працэсаў і г.д. Для замацавання такога становішча актыўна прыцягваліся сродкі з адпаведнай фундацыі. На спрадвечна польскіх землях мог жыць толькі паляк з юрыдычна акрэсленым статусам падданага кайзера Вільгельма. Магутным рычагом для рэзкага павелічэння ўдзельнай вагі асоб нямецкага паходжання ў складзе зямельных уласнікаў на польскім абшары была Каланізацыйная камісія. Аб яе фінансавых магчымасцях сведчыла наступная табліца.

| Год | Наяўныя фінансавыя рэсурсы Каланізацыйнай камісіі, у млн. марак |
|---|---|
| 1886 | 100 |
| 1913 | 990 |

Як бачым, дадзеная табліца дазваляе прасачыць унушальную дынаміку ў аналізуемым пытанні.

Цяжкім ударам па эканамічных інтарэсах непасрэдных сельгасвытворцаў з ліку этнічных палякаў, амаральным па сваёй сутнасці быў закон, замацаваны подпісам прускага манарха ў 1904 г. Сэнс закона можна праілюстраваць на наступным прыкладзе. Паляк Збігнеў Варынскі плаціць грошы і становіцца ўласнікам зямельнага ўчастка ў ваколіцах Познані. Натуральна, новы гаспадар плануе там жыць разам з сям'ёй, займацца земляробствам, жывёлагадоўляй. Аднак паводле закона на гэтым участку выключалася месца для хаты, сарая, хлява, што рэзка супярэчыла падобным планам. Больш таго, пройдзе некалькі гадоў, і афіцыйны Берлін будзе імкнуцца падвесці прававы базіс пад такое становішча, пры якім колькасць палякаў-уласнікаў будзе рэзка змяншацца.

Заўважым, што пасля адыходу Бісмарка з капітанскага мосціка германскай палітыкі ўрад па-ранейшаму меў у якасці сваіх кіраўнікоў антыпольскі настроеных дзеячаў. Яны адкрыта падтрымлівалі ворагаў польскага народа, якія аб'ядноўваліся ў наступныя арганізацыі: Усегерманскі саюз, "Гаката". Відавочна быў накіраваны на выкараненне польскай мовы закон, датаваны 1908 г. Для тлумачэння закона змадэліруем наступную сітуацыю. У вёсцы Н. каля Гданьска этнічны склад насельніцтва быў такі: палякаў – 55%, немцаў – 43%, літоўцаў – 2%. Польскія жыхары вёскі прызначылі на 17 студзеня 1909 года сход. Сход адбываецца на нямецкай мове. Каб на ім гучала матчына мова большай часткі насельніцтва вёскі, працэнт палякаў у ёй павінен павялічыцца яшчэ на 5%.

У адрозненні ад Пецярбурга і Берліна Вена ў апошняй трэці XIX ст. – пачатку XX ст. праяўляла пэўную гнуткасць у польскім пытанні. Стаў рэальнасцю аўтаномны статус Галіцыі. Дарэчы, з 1867 года яна стала неад'емнай састаўной часткай дуалістычнай імперыі Аўстра-Венгрыі. Новаўтварэнне імкнулася стаць адным з цэнтраў сілы ў Старым Свеце. Імператар меў рацыю, калі лічыў, што важнейшай перадумовай для гэтага павінны быць унутрыпалітычная стабільнасць, наяўнасць трывалых унутраных тылоў. Таму афіцыйная Вена задаволіла патрабаванне палякаў аб аўтаномным статусе. Заўважым, што да 1873 г. Галіцыйцы ставілі пытанне аб такім аб'еме паўнамоцтваў для рэгіёна, які нават даваў бы падставу казаць аб федэратыўным уладкаванні Аўстра-Венгрыі. У 1873 годзе эліта народаў, якія насялялі Галіцыю, здымае гэта пытанне. Заўважым, што імператар ні да 1873 года, ні пасля не быў гатовы яго вырашаць. Галіцыяй кіраваў намеснік з шырокімі паўнамоцтвамі, прызначаны імператарам. Пэўную свабоду мелі ў сваіх дзеяннях старасты, якія ўзначальвалі ўнутрыгаліцыйскія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі.

Разам з тым у палітыцы Габсбургаў былі моманты, якія не задавальнялі ўсіх галіцыйцаў, прадпрымальніцкі корпус, працоўныя масы Галіцыі, асобныя народы, якія яе насялялі. Прычым Вена даволі доўгі час не рабіла карэктыў у адпаведных напрамках.

Па-першае, прадстаўніцтва Галіцыі ў парламенце Аўстра-Венгрыі да 1907 г. далёка не адпавядала яе долі ў колькасці насельніцтва імперыі (толькі 78 дэпутатаў). У 1907 г. становіцца рэальнасцю ўсеагульнае выбарчае права, і як вынік, рэгіён займеў на імперскім узроўні 105 парламентарыяў.

Па-другое, прававы базіс, на якім грунтавалася дзейнасць сейма і школьнай рады Галіцыі, па шэрагу ключавых пазіцый не адпавядаў інтарэсам яе жыхароў. Становішча стала мяняцца ў лепшы бок толькі пасля 1907 г.

Па – трэцяе, аб'ектамі дыскрымінацыйнага становішча ў той частцы, якая тычылася выбараў у сейм, з'яўляліся прадпрымальніцкі корпус, працоўныя масы, украінцы. За трыма тысячамі землеўладальнікаў было забраніравана нямногім меней за трэць месцаў у галіцыйскім парламенце. Пры гэтым нават палову дэпутацкага корпуса не складалі асобы, дэлегаваныя ад усёй сукупнасці жыхароў гарадоў Галіцыі, якія мелі права голасу. І гэта ў той час, калі ў насельніцтве рэгіёна на 1 землеўладальніка прыходзілася звыш за 330 гаражан, якія мелі выбарчыя ўчасткі. Прыблізна кожны другі галіцыец прадстаўляў народ, які даў свету Тараса Шаўчэнку, Івана Франко, Лесю Украінку. Аднак з-за хібаў закона аб выбарах у сейм колькасць украінцаў была ў ім адносна невялікай. Толькі ў пачатку другой дэкады XX стагоддзя цэнтральныя органы дзяржаўнага кіравання дапусцяць больш справядлівае пераразмеркаванне дэпутацкіх месцаў у сейме, якое ішло насустрач пажаданням гаражан, украінцаў.

У 1914-1918 гг. адбываліся падзеі, якія аб'ектыўна спрыялі польскаму нацыянальна-вызваленчаму руху. З пачаткам першай сусветнай вайны ключавыя ігракі на сусветнай палітычнай сцэне сталі расстаўляць новыя

акцэнты ў сваіх падыходах да польскага паўстання. Краіны Антанты і Цэнтральныя дзяржавы добра разумелі наступную акалічнасць: ход вайны будзе ў нямалай ступені залежаць ад умелага розыгрышу польскай карты.

Варагуючыя бакі імкнуліся да чацвёртага падзелу польскіх зямель.

Агульны назоўнік пазіцый Лондана, Парыжа, Петраграда быў такі: усе польскія землі павінны стаць часткай Расійскай імперыі, якой будзе нададзены аўтаномны статус.

Цэнтральныя дзяржавы былі адзіныя ў тым, што ў канчатковым выніку да Аўстра-Венгрыі і Германіі далучаюцца тыя польскія землі, якія адышлі да Расіі ў выніку папярэдніх падзелаў. Каб поўнасцю кантраляваць сітуацыю на гэтых землях, Берліну і Вене прыйшлося пайсці на неардынарныя крокі. Найбольш гучны з гэтых крокаў: палякі ў лістападзе 1916 г. фармальна набываюць дзяржаўнасць. Зразумела, тэрыторыя абвешчанай дзяржавы супадала "з адарванымі ад рускага панавання польскімі абласцямі". У якасці ключавых элементаў яе палітычнай сістэмы меркаваліся "спадчынная манархія і канстытуцыйны лад". Вена была згодна з тым, каб Галіцыя мела і самакіраванне, і канстытуцыю. Не існавала дакументаў, у якіх былі б выразна акрэслены межы гэтай дзяржавы. За аналізуемым крокам утойвалася зацікаўленасць Цэнтральных дзяржаў у выкарыстанні палякаў у якасці гарматнага мяса. Менавіта таму, дзякуючы іх высілкам сталі набываць рэальныя абрысы "Польскія ўзброеныя сілы".

Канешне, нельга скідваць з рахунку спецыфічнае бачанне функцыянальнага прызначэння "Польскіх узброеных сіл" сябрамі Часовай дзяржаўнай рады (ЧДР). ЧДР пачала адлік свайго існавання 6 снежня 1916 года. Ёй афіцыйна быў нададзены статус вышэйшага органа дзяржаўнага кіраўніцтва. ЧДР налічвала 25 сяброў. Сярод яе камісій ключавой была ваенная. Старшынёй ваеннай камісіі быў У. Сікорскі. Прадуктам дзейнасці камісіі павінны былі якраз і стаць "Польскія ўзброеныя сілы", прычым сябры камісіі ЧДР бачылі ў іх даволі важкі аргумент у плане вырашэння польскага пытання. Невыпадкова менавіта сябры камісіі стаялі ля вытокаў Галоўнага нацыянальнага камітэта (ГНК). Паступова да сяброў камісіі дабавяцца іншыя, дарэчы, розныя па поглядах людзі, што адлюстроўвала шырокую сацыяльную базу, на якую абапіраўся ГНК. Калі размова ідзе пра генератараў ідэй у ГНК, то перш за ўсё трэба назваць У.Сікорскага, В.Вітаса, І.Дашынскага. Тое, што палякі павінны мець уласнае узброенае фарміраванне, пастаянна разумеў і Пілсудскі. Задоўга да фармальнага абвяшчэння Польскай дзяржавы ўзнікла дзецішча Пілсудскага – Польская ваенная арганізацыя (ПОВ). Спачатку ПОВ дзейнічала без дазволу ўлад. Гэта структура набывае легальны статус пасля таго, як яна ў кастрычніку 1914 г. засведчыла сваю прагерманскую арыентацыю. Будучы сябрам ЧДР, Пілсудскі верыў у тое, што на грунце саюзніцкіх адносін з Берлінам і Венай польскія патрыятычныя сілы змогуць пакласці рэальны пачатак Другой Рэчы Паспалітай.

Зусім іншай арыентацыі прытрымліваліся сябры Польскага нацыянальнага камітэта (ПНК). Кропка адліку гісторыі ПНК – лістапад 1914 г. Генератары ідэй у шэрагах ПНК – Р. Дмоўскі, З. Веляпольскі. Галоўнае жаданне пэнкоўцаў: "разгром злавеснай магутнасці Германіі і аб'яднанне Польшчы пад скіпетрам рускага манарха".

Стаўленне Расіі да польскага пытання істотна памянялася пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Вядома, што тут да падзей 3-5 ліпеня 1917 г. у Петраградзе існавала палітычная раўнавага паміж Саветамі і Часовым урадам. Таму ёсць сэнс прывесці падыходы як Саветаў, так і Часовага ўрада. Ключавы Савет, да рашэнняў якога далучаліся астатнія Саветы Расіі, – Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Яго падыход быў

наступны: "Польшча мае права быць зусім незалежнай у дзяржаўна-міжнародных адносінах" Савет быў салідарны з тымі коламі ў польскім нацыянальна-вызваленчым руху, якія бачылі ў якасці ключавога элемента палітычнай сістэмы Польшчы "дэмакратычны рэспубліканскі лад". Не было кардынальнага разыходжання з Саветам і ў Часовага ўрада, які лічыў, што пытанне аб польскай дзяржаўнасці павінна быць пастаўлена на парадку дня сусветнай палітыкі. Петраград быў зацікаўлены ў "свабодным ваенным саюзе" з праектуемай дзяржавай.

Новыя павевы ў Расіі абумовілі рэзкую актывізацыю палякаў, зацікаўленых ў стварэнні Другой Рэчы Паспалітай. Дадатковым стымулам для іх была тая акалічнасць, што меліся выніковыя захады на шляху да польскай арміі ў Расіі. Рэальныя абрысы набылі 1-я польская стралковая дывізія, тры польскія корпусы. Вайскоўцы польскага паходжання прымалі актыўны ўдзел у дзейнасці Галоўнага польскага ваеннага камітэта.

Жнівень 1917 г. у Расіі адзначаны з'яўленнем Польскага савета міжпартыйнага аб'яднання (ПСМА). З ПСМА генетычна звязана такая структура, як Польскі нацыянальны камітэт (ПНК). Заява, якая давала старт існаванню ПНК, была абнародавана ў Лазане ў жніўні 1917 г. Моцным аргументам для ключавых дзеячаў ПНК Р.Дмоўскага, М.Сейды, Э.Пільца была падтрымка буйных краін на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў. У Парыжы, Лондане, Рыме, Вашынгтоне ў ПНК бачылі паўнамоцнага прадстаўніка інтарэсаў польскага народа. Ідэя ўзнікнення польскіх узброеных сіл напаўнялася канкрэтным зместам не толькі ў Расіі, але і ў Францыі.

Відавочныя зрухі ў пазіцыях дзяржаў Антанты адбываліся на фоне пераканаўчых доказаў прывіднасці польскай дзяржаўнасці, пра якую лідэры Цэнтральных дзяржаў заяўлялі як пра факт, які здзейсніўся. ЧДР усё больш стагніравала. Крэдыт даверу да яе быў вычарпаны. У сяброў ЧДР трывала ўкаранялася разуменне таго, што краіны Антанты не выпусцяць са сваіх рук стратэгічную ініцыятыву. Такое разуменне знайшло шырокі водгук у масах. З 2 ліпеня 1917 г. афіцыйна перастае звязваць сябе з ЧДР самы ўплывовы яе сябра – Юзэф Пілсудскі. Зразумела, пачала дыстанцыравацца ад немцаў ПОВ. Не была адназначна прагерманскай арыентацыя новай структуры – Польскага дапаможнага корпуса. Даволі часта мела месца сітуацыя, калі вайскоўцы заяўлялі, што не будуць ваяваць за кайзера Вільгельма і імператара Аўстра-Венгрыі. Рэакцыя афіцыйнага Берліна была вельмі жорсткая: усталяванне зусім неспрыяльнага рэжыму абмежавання свабоды для дадзеных асоб. Пастаянным месцазнаходжаннем для Пілсудскага, бліжэйшага паплечніка дадзенага дзеяча К. Саснкоўскага стала крэпасць Магдэбург. Лагічнае завяршэнне стагнацыі ЧДР надышло 30 жніўня 1917 г. Гэты дзень стаў апошнім у гісторыі дадзенай структуры. Чарговы крок Берліна і Вены можна было адзначыць 12 верасня 1917 г.: пачынаецца адлік існавання Рэгенцкай рады (РР). Важна мець на ўвазе, што ніводзін сябра РР (усяго іх было 3) не ўспрымаўся насельніцтвам усур'ёз. Фактычна як да касметычных постацяў ставіліся да іх прызначэнцы кайзера і імператара ў гэтых землях, якія ўяўлялі вышэйшую інстанцыю па ўсіх пытаннях унутранага жыцця на дадзеных абшарах.

Бальшавікі-ленінцы, якія прыйшлі да ўлады пасля Кастрычніцкага перавароту 1917 г. у Расіі, афіцыйна займалі спрыяльную для польскага нацыянальна-вызваленчага руху пазіцыю. Новая ўлада, як і папярэдняя, падтрымлівала стварэнне Другой Рэчы Паспалітай. У Петраградзе разлічвалі, што такая пазіцыя стане агульным назоўнікам падыходаў яго і Цэнтральных дзяржаў. Аднак у іх сталіцах думалі інакш. Аб гэтым сведчыў падарунак у выглядзе абшару, населенага палякамі (Холмшчына і г. д.), зроблены Украіне, якую прадстаўляла Украінская цэнтральная рада (УЦР). Такая палітыка Цэнтральных дзяржаў мела ў якасці

свайго следства яшчэ больш адчувальную стаўку польскай нацыянальнай эліты на Антанту. Апошняя карысталася даверам у Саветах, якія былі шырока распаўсюджаны на польскіх землях.

Рэйтынг Антанты ў вачах палякаў яшчэ больш вырас у першай палове 1918 г. У самым пачатку 1918 г. бліскучы ход робяць Лондан і Вашынгтон. Абнародаваная пазіцыя фактычна першай асобы ў Англіі Д. Ллойд-Джорджа ўключала наступныя моманты:

1) аднаўленне польскай дзяржаўнасці – неадкладная тэрміновая задача;
2) праектуемая дзяржава "ўключае ў сябе ўсе выключна польскія элементы, якія пажадаюць стаць яе часткай";
3) Другая Рэч Паспалітая зможа разам са сваімі суседзямі стварыць зону, свабодную ад напружанасці.

"14 пунктаў" кіраўніка амерыканскай дзяржавы Вудра Вільсана ўтрымлівалі, у прыватнасці, такую прапанову: "стварыць незалежную польскую дзяржаву, якая павінна будзе уключаць тэрыторыі, заселеныя бясспрэчна польскім насельніцтвам". Падобныя меркаванні складалі агульны назоўнік пазіцый Лондана, Парыжа, Рыма. Першыя асобы, дэлегаваныя імі ў структуры вышэйшай выканаўчай улады, сустрэліся ў самым пачатку лета 1918 г. і прадэманстравалі аднадушша ў ацэнцы хадоў, раней здзейсненых Англіяй і ЗША. Разам з тым існавала пытанне, на якое не давалі адказу ва ўсіх названых сталіцах. Неад'емнай састаўной часткай Кароны Польскай да знікнення першай Рэчы Паспалітай з палітычнай карты свету былі абшар, які прылягаў да Познані, Верхняя і Ніжняя Сілезія, стратэгічна важны горад Гданьск, гэта значыць тэрыторыі, у этнічнай структуры насельніцтва якіх палякі былі ў відавочнай меншасці. З пункту гледжання міжнароднага права пры вырашэнні польскага пытання дадзеныя тэрыторыі павінны былі атрымаць статус, гвалтоўна пазбаўлены Берлінам.

Напрыканцы лета 1918 года Масква прадэманстравала цывілізаванае стаўленне да анексіі Пецярбургам, Берлінам, Венай Рэчы Паспалітай абодвух народаў, яе юрыдычнай кваліфікацыі. Канвенцыя паміж Расійскай імперыяй, Каралеўствам Прусія, Аўстрыйскай імперыяй аб першым падзеле Рэчы Паспалітай абодвух народаў ад 25 ліпеня (5 жніўня) 1772 г., Канвенцыя паміж Расійскай імперыяй і Каралеўствам Прусія аб другім падзеле Рэчы Паспалітай абодвух народаў ад 12(23) студзеня 1793 г., Канвенцыя паміж Расійскай імперыяй, Каралеўствам Прусія, Аўстрыйскай імперыяй аб трэцім падзеле Рэчы Паспалітай абодвух народаў ад 13(24) кастрычніка 1795 г., Канвенцыя паміж Расійскай імперыяй, Каралеўствам Прусія, Аўстрыйскай імперыяй аб канчатковым падзеле Рэчы Паспалітай абодвух народаў ад 15(26) студзеня 1797 г., падпісаныя ў Пецярбургу, іншыя дамоўленасці падобнага кшталту "з-за іх супярэчнасці прынцыпу самавызначэння нацый і рэвалюцыйнай правасвядомасці рускага народа, які прызнае за польскім народам права на самавызначэнне і адзінства, скасоўваліся (вышэйшым органам выканаўчай улады РСФСР. – М. С.) беспаваротна". Прыведзеная цытата сведчыць, што РСФСР у адрозненне ад заходніх дзяржаў адназначна падтрымлівала ўваходжанне абшару, які прылягаў да Познані, Верхняй і Ніжняй Сілезіі, Гданьска ў склад Другой Рэчы Паспалітай. Дарэчы, і Пілсудскі, як і Захад, выносіў пытанне аб лёсе дадзеных тэрыторый за дужкі.

ПНК выступаў за аднаўленне Рэчы Паспалітай абодвух народаў "ад мора да мора", у межах 1772 года, гэта значыць, да яе першага падзелу. Увосень 1772 г. яго самым паслядоўным саюзнікам была Францыя.

Такім чынам, палякі са старажытных часоў да 1918г. пазналі і вопыт дзяржаўнасці, і становішча аб'екта каланіяльнага панавання. Старажытнасць, сярэднявечча, новы час адметны для іх істотнымі культурнымі здабыткамі. Стала рэальнасцю польская нацыя.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Назавіце перадумовы ўзнікнення польскай дзяржаўнасці.
2. Якія фактары прадвызначылі фарміраванне польскай народнасці?
3. Ці можна было пазбегнуць распаду польскай дзяржавы ў час сталага сярэднявечча?
4. Ці можна было пазбегнуць распаду Рэчы Паспалітай абодвух народаў?
5. Якія этапы прайшоў працэс фарміравання польскай нацыі?
6. Што прынцыпова новага з'явілася ў польскім нацыянальна-вызваленчым руху ў час першай сусветнай вайны?

**Тэст – заданні:**

1. З якога часу заселена чалавекам тэрыторыя Польшчы?
а) з эпохі палеаліту;
б) з эпохі мезаліту;
в) з эпохі неаліту.
2. Калі на тэрыторыі Польшчы жылі фіна-угры?
а) у 8-7 тыс. да н.э.;
б) у 7-6 тыс. да н.э.;
в) у 4-3 тыс. да н.э.
3. Плямёны якой археалагічнай культуры з'явіліся на тэрыторыі Польшчы ў пал. 2-га тыс. да н.э.?
а) пшэворскай культуры; б) лужыцкай культуры;
в) культуры шнуравой керамікі.
4. Назавіце археалагічную культуру, носьбіты якой – аснова фарміравання заходніх славян.
а) культура шнуравой керамікі;
б) тшцінецкая культура;
в) пшэворская культура.
5. Як суадносяцца тэрыторыі Малой Польшчы і Вялікай Польшчы?
а) яны роўнавялікія;
б) Вялікая Польшча больш, чым Малая Польшча;
в) Малая Польшча больш, чым Вялікая Польшча.
6. Хто стаў жонкай князя Мешкі І у 965г.?
а) дачка чэшскага князя Дабрава;
б) дачка польскага князя Ядвіга;
в) дачка полацкага князя Рагвалода Рагнеда.
7. У якім годзе Польшча прыняла хрысціянства?
а) 966; б) 999; в) 1025.
8. Дзе знаходзілася першая сталіца Польшчы?
а) у Гнезна; б) у Кракаве; в) у Шчэціне.
9. Які герб стаў дзяржаўным у годы кіравання князя Мешкі І?
а) белы арол; б) "Пагоня".
10. Хто завяршыў аб'яднанне польскіх зямель?
а) Казімір ІІІ; б) Казімір IV; в) Баляслаў І Храбры.
11. Калі здзяйсняліся набегі мангола-татараў на польскія землі?
а) у 1201,1212,1213 гг.; б) у 1222,1227,1229 гг.;
в) у 1241,1259,1287 гг.
12. Ці уваходзілі Сілезія і Памор'е ў склад Польшчы ў XIV стагоддзі?
а) так; б) не.

13. Калі Польшча знаходзілася ў дынастычнай уніі з Венгрыяй?
а) 1200-1220 гг.; б) 1311-1332 гг.; в) 1370-1382 гг.
14. Хто стаў жонкай вялікага князя Літоўскага Ягайлы ў выніку Крэўскай уніі 1385-1386 гг.?
а) польская каралеўна Ядвіга;
б) маці Жыгімонта II Аўгуста Бона Сфорца;
в) старэйшая дачка вялікага князя Маскоўскага Алена Іванаўна.
15. Які слой насельніцтва больш за ўсё выйграў ад падпісання каралём Казімірам IV Няшаўскіх статутаў?
а) гаражане; б) сялянства; в) шляхта.
16. Калі Кракаў быў сталіцай Польшчы?
а) IX-X ст.ст.; б) XI-XVI ст.ст.; в) XVII ст.
17. Галоўны палітычны вынік Люблінскай уніі 1569 г.
а) утварэнне Рэчы Паспалітай абодвух народаў;
б) стварэнне новага цэнтра сілы ў Цэнтральнай Еўропе;
в) анексія Каронай Польскай ВКЛ.
18. Назавіце даты падзелаў Рэчы Паспалітай абодвух народаў.
а) 1717,1720,1723 гг.; б) 1762,1763,1771 гг.;
в) 1772,1793,1795 гг.
19. Хто камандаваў польскімі легіонамі, якія з 1797г. ваявалі на баку Францыі?
а) А. Чартарыйскі; б) Т. Касцюшка; в) Я.Г. Дамброўскі.
20. Калі было ўтворана Варшаўскае герцагства?
а) 1801г.; б) 1803г.; в) 1807г.
21. Пасля якой падзеі расійскія ўлады фактычна скасавалі аўтаномію Каралеўства Польскага?
а) пасля Айчыннай вайны 1812г.;
б) пасля паўстання дзекабрыстаў;
в) пасля паўстання 1830-1831гг.
22. Ці было скасавана прыгоннае права ў Варшаўскім герцагстве?
а) так; б) не.
23. У які час існавала Кракаўская Рэспубліка?
а) 1815-1846 гг.; б) 1850-1890 гг.; в) 1891-1917 гг.
24. Аб'ектам акупацыйнай палітыкі якой дзяржавы было Вялікае княства Познанскае?
а) Расіі; б) Прусіі; в) Аўстрыі.
25. У якім годзе ўзнікла рабочая партыя "Пралетарыят"?
а) 1782; б) 1861; в) 1882.
26. Якія дзве вядомыя польскія палітычныя партыі ўзніклі ў 1893г.?
а) Польская сацыялістычная партыя (ППС) і Сацыял-Дэмакратыя Каралеўства Польскага;
б) Камуністычная партыя, Нацыянальна-Дэмакратычная партыя;
в) Саюз свабоды і Польска Строніцтва Людове.

*Лекцыя другая*

## ВУЗЛАВЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПОЛЬСКАЙ ГІСТОРЫІ (1918-2005 гг.)

***План:***

2.1. Другая Рэч Паспалітая: фарміраванне нацыянальнай тэрыторыі, суадносіны дэмакратычных і антыдэмакратычных метадаў у кіраванні грамадствам і дзяржавай (1918-1939 гг.).

2.2. Польшча ў час Другой сусветнай вайны. Да пытання аб юрыдычным замацаванні новых дзяржаўных межаў (1939-1945 гг.).

2.3. Польская гісторыя ў другой палове 1940-ых гг. – 1989 г.: курс вонкавых і ўнутраных сіл на дэмантаж заваёў народна-дэмакратычнай рэвалюцыі, мадэль дзяржаўнага сацыялізму ў кантэксце польскіх рэалій.

2.4. Рэспубліка Польшча (1989-2005гг.): сістэмныя пераўтварэнні ў рамках посткамуністычнага этапа.

### *2.1. Другая Рэч Паспалітая: фарміраванне нацыянальнай тэрыторыі, суадносіны дэмакратычных і антыдэмакратычных метадаў у кіраванні грамадствам і дзяржавай (1918-1939 гг.)*

Увосень 1918 г. першая сусветная вайна імкліва падыходзіла да свайго лагічнага завяршэння, што супала з заканчэннем працэсу складвання перадумоў вырашэння польскага пытання. Перамога ў гэтай вайне Антанты, выцісканне на абочыну сусветнай і еўрапейскай палітыкі Берліна і Вены, падтрымка ідэй стварэння Другой Рэчы Паспалітай у сталіцах Антанты, Маскве далі гістарычны шанц польскай эліце, які яна бліскуча выкарыстала.

Гэта эліта была прадстаўлена ў шэрагу цэнтраў, якія сапернічалі паміж сабой за права пакласці новы пачатак у польскай гісторыі. Храналогія лёсавызначальных падзей, якія непасрэдна папярэднічалі гэтаму новаму пачатку, наступная.

28 кастрычніка 1918 года адзначана з'яўленнем такой структуры, як Польская ліквідацыйная камісія (ПЛК). Праз тры дні яна выступае ў якасці вышэйшай інстанцыі, якая поўнасцю кантралюе сітуацыю на абшары, які тэрытарыяльна супадае з Заходняй Галіцыяй.

Імкліва мянялася сітуацыя на польскіх землях, якія да першай сусветнай вайны знаходзіліся «пад скіпетрам рускага цара». Спачатку здавалася, што ўладу на гэтым абшары трывала будзе ўтрымліваць Люблінскі савет рабочых дэпутатаў, чыя гісторыя распачалася 5 лістапада. Аднак меней чым праз 48 гадзін афіцыйна заяўляе аб сябе часовы народны урад Польскай Рэспублікі. Сябры гэтага ўрада, які абаснаваўся ў Любліне, прадстаўлялі яго як вышэйшы орган улады для ўсёй Польшчы.

У сваю чаргу Германія робіць стаўку на Пілсудскага. Пасля таго, як Пілсудскі і Сасноўскі запэўніваюць Берлін у прагерманскіх сімпатыях, немцы дапамагаюць Пілсудскаму ўзняцца на капітанскі мосцік польскай палітыкі. Менавіта з падачы германскага боку Рэгенцкая Рада 11 лістапада 1918 года прызнае Юзэфа Пілсудскага вышэйшай службовай асобай Польскай дзяржавы і, натуральна, зыходзіць з палітычнай сцэны. Гэта падзея дала пачатак існаванню Другой Рэчы Паспалітай.

Улічваючы вельмі высокі рэйтынг Пілсудскага ў польскім грамадстве, яго бясспрэчны аўтарытэт за межамі Польшчы, Часовы народны урад Польскай Рэспублікі, ПЛК прынялі адзіна правільнае рашэнне: пагадзіцца са знаходжаннем Ю. Пілсудскага на вышэйшай прыступцы ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Гэтыя ж структуры не ставілі пад сумненне і мэтазгоднасць ключавога кадравага рашэння Ю. Пілсудскага, у выніку якога Е. Марачэўскі 18 лістапада ўзначаліў вышэйшы орган выканаўчай улады. З 28 лістапада Ю. Пілсудскі «часовы начальнік дзяржавы» з вельмі шырокімі паўнамоцтвамі. У пачатку 1919 года знаходжанне дадзенага дзеяча менавіта ў гэтай якасці знайшло падтрымку з бокуПНК.

Міжваенная Польшча атрымала назву Другой Рэчы Паспалітай. У прававым сэнсе канчатковая кропка ў яе узнікненні была пастаўлена на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919-1920 гг. Удзельнікі гэтага вельмі аўтарытэтнага міжнароднага форуму былі згодныя ў тым, што Польшча – паўнапраўны суб'ект міжнародных адносін. Польскі бок у ходзе ўдзелу ў гэтай канферэнцыі меў намер дасягнуць падтрымкі яго жадання трывала забяспечыць сабе выхад да Балтыйскага мора. Выхад да мора палякі атрымалі. Зноў стала польскай пэўная частка Верхняй Сілезіі. Заўважым, што пасля падпісання Версальскай мірнай дамовы ў Варшаве будуць актыўна чакаць вынікаў прадугледжанага ёй плебісцыту на некаторых землях. У выніку яшчэ адна частка Верхняй Сілезіі ўвойдзе ў склад Другой Рэчы Паспалітай. Безумоўна, у палітычным, эканамічным плане для Пілсудскага было прынцыпова важна, што Варшава нарэшце атрымала частку Памераніі, Познань, шэраг раёнаў Прусіі.

Разам з тым нельга ідэалізаваць рашэнні Парыжскай мірнай канферэнцыі і іх наступствы з пункту гледжання польскіх інтарэсаў.

Па-першае, дадзеным інтарэсам супярэчыла ўтварэнне акругі пад найменнем «Вольны горад Гданьск», што было геастратэгічным пройгрышам для Польшчы. Састаўной часткай Веймарскай Рэспублікі з'яўляліся немалыя па плошчы, стратэгічна важныя абшары, якія спрадвеку былі не нямецкія, а польскія. Гэта зніжала ролю балтыйскага фактару ў рашэнні задач умацавання эканамічнай і ваеннай бяспекі краіны.

Па-другое, 28 чэрвеня 1919 года прадстаўнікі Польшчы з аднаго боку і дзяржаў-пераможцаў – з другога замацавалі сваімі подпісамі дамову, прадметам якой было забеспячэнне правоў нацыянальных меншасцяў у Другой Рэчы Паспалітай. У гэтай дамове рэгуляванне пытанняў, якія тычыліся транзіту, гандлю, было прапісана так, каб задаволіць перш за ўсё бізнес – эліты краін, якія выступалі ключавымі ігракамі на глабальнай палітычнай сцэне, а не саміх палякаў.

На пачатковай стадыі ажыццяўлення сваіх уладных паўнамоцтваў Юзэф Пілсудскі актыўна прапагандаваў так званую федэралісцкую канцэпцыю. Яна ўключала тры моманты.

Першы момант. У якасці стратэгічнай мэты вылучалася аднаўленне Рэчы Паспалітай абодвух народаў "ад можа да можа" (ад мора до мора) у межах 1772 года, гэта значыць, да яе першага падзелу.

Другі момант. Прапаноўвалася стварэнне федэрацыі ў складзе незалежных дзяржаўных адзінак: Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны.

Трэці момант. У рамках кожнай з гэтых дзяржаўных адзінак гарантавалася абсалютная, поўная свабода нацыянальна-культурнага развіцця.

Гэта канцэпцыя падавалася афіцыйнай Варшавай як вузлавы аспект прапагандысцкага забеспячэння вайны супраць Літоўска-Беларускай ССР і Украінскай ССР, якая была распачата польскім бокам напрыканцы лютага 1919 года. Да вясны 1920 года Польшча ўстойліва ўтрымлівала стратэгічную ініцыятыву ў ходзе дадзенай вайны. З вясны 1920 года па сярэдзіну жніўня 1920 года ініцыятыва была на баку Чырвонай Арміі. З сярэдзіны жніўня 1920 года да канца самой вайны зноў дамінавала Польшча. Вайна сведчыла аб відавочным разрыве паміж дэмагагічнымі заявамі Пілсудскага і яго атачэння і рэальнай палітыкай акупацыйных улад. Гэта палітыка была антыбеларускай, антылітоўскай, антыўкраінскай. Ніяк не прасочвалася рэальная зацікаўленасць польскага боку ў вырашэнні польскага, літоўскага, беларускага пытанняў. Заставаліся на паперы благія абяцанні, дадзеныя Ю. Пілсудскім у яго адозве да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага, датаванай 22 красавіка 1919 года. Паводзіны галоўнай структуры акупацыйных улад -Грамадзянскага ўпраўлення ўсходніх зямель (ГУУЗ) – пастаянна выклікалі абурэнне мясцовага насельніцтва.

Важна мець на ўвазе, што ключавыя падзеі вайны Польшчы супраць Літоўска-Беларускай ССР і Украінскай ССР супалі па часе з тым адрэзкам у працы Парыжскай мірнай канферэнцыі, які быў прысвечаны абмеркаванню

Дарэчы, Рыжскі мір прадугледжваў, што польскі бок будзе паважаць правы нацыянальных меншасцяў: беларусаў, украінцаў, літоўцаў і гэтак далей. Аднак у рэальнай практыцы праводзілася супрацьлеглая палітыка.

Заўважым, што ў 1920-1939 гг. сур'ёзныя праблемы ў адносінах паміж Польшчай і Літвой ствараў Віленскі канфлікт.

У палітычным плане гісторыю Польшчы 1921-1939 гг. можна падзяліць на два перыяды:

дасанацыйны (1921-1926 гг.);

санацыйны (1926-1939 гг.).

Галоўная асаблівасць першага перыяду – рашучая перавага дэмакратычных метадаў кіравання дзяржавай і грамадствам. Юрыдычны грунт пад арыентацыю польскага грамадства на дэмакратычны выбар быў закладзены ў выніку прыняцця канстытуцыі ад 17 сакавіка 1921 года. Асноўны закон перш за ўсё падводзіў прававы базіс пад падзел улад, стварэнне сістэмы супрацьвагаў паміж заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладамі, што выключала ўсталяванне дыктатуры. Уладныя паўнамоцтвы атрымлівалі сілы, якім польскі народ аддаваў перавагу на выбарах у парламент. Калі размова ішла пра выбары ў ніжнюю палату парламента (сейм), на выбарчыя ўчасткі павінны былі прыходзіць грамадзяне не маладзей за 21 год. У аналагічнай працэдуры ў адносінах да будучага складу верхняй палаты парламента (сената) удзельнічалі іх суайчыннікі, узрост якіх мінаваў адзнаку ў 30 гадоў. У корпус выбаршчыкаў не ўваходзілі салдаты, афіцэры, генералы Узброеных Сіл Польскай Рэспублікі. Уяўляўся абгрунтаваным узроставы ценз для патэнцыяльных дэпутатаў сейма і сенатараў. Для першых ён складаў 25 гадоў, для другіх – 40 гадоў. Мяркуючы па паўнамоцтвах прэзідэнта, урада, сейма, аўтары канстытуцыі лічылі ў якасці аптымальнага варыянта стварэнне прэзідэнцка-парламенцкай рэспублікі. Два ключавыя элементы выканаўчай улады – кіраўнік дзяржавы, урад – маглі выступаць менавіта ў такой якасці толькі дзякуючы рашэнням парламента. Старт ажыццяўлення канкрэтнай асобай уладных паўнамоцтваў на пасадзе прэзідэнта даваўся членскім корпусам абедзвюх палат парламента. Урад фарміравалі партыі, якія перамагалі на выбарах у сейм на грунце прапарцыянальнай сістэмы. Заўважым, што ў прэзідэнта было значна менш функцый, чым у начальніка польскай дзяржавы, пасаду якога на момант прыняцця канстытуцыі займаў Пілсудскі. Для ілюстрацыі канкрэтнай ролі прэзідэнта змадэліруем наступную сітуацыю. Ліпень 1923 года. Прэзідэнт С. Вайцяхоўскі ставіць свой аўтограф на ініцыяваным ім указе аб павышэнні заработнай платы афіцэрам Узброеных Сіл. Указ набывае сілу закона тады і толькі тады, калі аналагічныя дзеянні здзяйсняюць прэм'ер-міністр В. Вітас, кіраўнік ваеннага ведамства С. Шэпцiцкі. Зразумела, можна змадэляваць бясконцую колькасць сітуацый і ў кожнай сітуацыі будуць тое ж самае рабіць С. Вайцяхоўскі – В. Вітас і адзін з калег С. Шэпцiцкага (міністр унутраных спраў, міністр фінансаў і г.д.). Верхняя палата парламента ставіла канчатковую кропку ў заканадаўчым працэсе. Разам з тым аўтары канстытуцыі адмовілі ёй у праве вета. Любы грамадзянін Другой Рэчы Паспалітай незалежна ад займаемай пасады мог быць аб'ектам судовага разбірацельства. Прычым суд выносіў вердыкт, не чакаючы званка з канцылярыі прэзідэнта або з прыёмнай міністра, ваяводы.

Асноўны закон выключаў дзяленне грамадзян Польшчы на першарадных і другарадных, выразна ўсталяваў, што для кожнага з іх дзейнічае аднолькавая адказнасць за выкананне актаў, прынятых уладнымі структурамі. Канстытуцыя

закладвала прававы падмурак для фарміравання грамадзянскага грамадства. У дакуменце прасочвалася наяўнасць юрыдычнага базісу гарантавання прыватнай уласнасці, без чаго немагчыма складванне сярэдняга класа, які з'яўляецца сацыяльнай апорай гэтага грамадства. Палякі атрымалі права на стварэнне яго структур: партый, аб'яднанняў. Прычым кожны грамадзянін, партыя, аб'яднанне маглі б мець пазіцыю, якая кардынальна адрознівалася ад падыходаў улад, маглі даводзіць яе да ведама ўлад, адкрыта выкладаць яе на мітынгах, дэманстрацыях, у незалежных сродках масавай інфармацыі. З улікам поліканфесійнай структуры насельніцтва Польшчы прынцыпова важным было прызнанне наяўнасці «раўнапраўных веравызнанняў». Праўда, заходняй галіне хрысціянства адводзілася «галоўнае месца сярод раўнапраўных веравызнанняў».

У Асноўным законе быў закладзены юрыдычны грунт польскай сацыяльнай дзяржавы. У дакуменце можна знайсці артыкулы, якія ішлі насустрач інтарэсам працаатрымальніцкага корпуса. Ад працадацеляў патрабавалася ствараць для яго важныя ўмовы працы (строгае вытрыманне тэхнікі бяспекі, санітарна-гігіенічнага стандарту і г.д.). Дзяржава абавязвалася падтрымліваць фінансавымі сродкамі членаў гэтага корпуса пры ўзнікненні наступных сітуацый: 1) страты месца працы і, натуральна, статуса працаатрымальніка; 2) поўнай або частковай непрацаздольнасці па прычыне сур'ёзных праблем са здароўем. Улады павінны былі клапаціцца аб жанчынах, якія нараджалі дзяцей, аб юных грамадзянах Польшчы, якія толькі што з'яўляліся на свет.

У канстытуцыі 1921 года была прапісана неабходнасць цывілізаваных міжэтнічных адносін, дзяржаўнай палітыкі ў інтарэсах нацыянальных меншасцяў. Закладваўся юрыдычны грунт для задавальнення патрабаванняў народаў, якія не адносіліся да тытульнага этнасу (беларусаў, украінцаў, яўрэяў і г.д.), у існаванні адпаведнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі.

Афіцыйна аналізуемы Асноўны закон дзейнічаў да 23 красавіка 1935 года. У той частцы, якая тычылася палітычнай надбудовы, палітычных правоў і абавязкаў грамадзян, яна да 1926 года ў асноўным адпавядала ўнутрыпольскім рэаліям. Аднак у 1921-1935 гг. так і не набыла рэальныя абрысы польская сацыяльная дзяржава, у ранг дзяржаўнай палітыкі была ўзведзена дыскрымінацыя ў адносінах да нацыянальных меншасцяў.

Сітуацыя ў краіне ў 1921-1926 гг. характарызавалася ўнутрыпалітычнай нестабільнасцю, адсутнасцю відавочнай дынамікі ў развіцці сацыяльна-эканамічных працэсаў. Пасля прыняцця канстытуцыі 1921 года вага Ю. Пілсудскага як палітычнага і дзяржаўнага дзеяча зніжалася. З 14 снежня 1922-га года ён перастае быць начальнікам дзяржавы. У той жа дзень гэта пасада скасоўваецца і пачынаецца эра прэзідэнтаў Другой Рэчы Паспалітай. На жаль, першы з іх Г. Нарутовіч фактычна быў кіраўніком дзяржавы толькі два дні. 16 снежня 1922 г. Першы прэзідэнт быў забіты. 20 снежня 1922 года пасаду кіраўніка дзяржавы заняў С.Вайцяхоўскі. У краіне часта мяняліся урады. Прэм'ер-міністрамі ў 1921-1922 гг. станавіліся В. Вітас, А. Панікоўскі, Ю. Новак, У. Сікорскі. З канца 1922 года Ю. Пілсудскі ўзначальваў генеральны штаб Узброеных Сіл Польшчы. У траўні 1923 года В. Вітас зноў займае пасаду кіраўніка ўрада. 19 снежня 1923 года яго пераемнікам становіцца В. Грабскі. Між тым Ю. Пілсудскі ўсё актыўней імкнуўся атрымаць вышэйшую ўладу ў краіне. Яго пазіцыі сталі ўмацоўвацца пасля таго, як 20 лістапада 1924 года Польшча атрымала новага прэм'ер-міністра Скшынскага. Апошні займаў гэту пасаду да 5 траўня 1926 года. Толькі чатыры дні (10-14 траўня 1926 года) праіснаваў новы ўрад В. Вітаса. Прычыну гэтаму трэба



РЫЖСКІ МІРНЫ ДАГАВОР 1921г.
(фрагмент карты)
Граніца паводле Рыжскага
мірнага дагавора 1921г.
ДЗВІНСК
Краслаўка
Друя
Дзісна
Браслаў
ПОЛАЦК
Новасвянцяны
Свянцяны
Паставы
Глыбокае
Дунілавічы
Докшыцы
Свір
воз. Нарач
Будслаў
Смаргонь
Вілейка
Ашмяны
Маладзечна
Лагойск
БАРЫСАЎ
Крупкі
Радашковічы
Ракаў
МІНСК
СМАЛЯВІЧЫ
Смілавічы
Ігумен
Кайданаў
Навагрудак
Стоўбцы
Мір
Нясвіж
Баранавічы
Клецк
Капыль
Узда
Рудзенск
Асіповічы
БАБРУЙСК
СЛУЦК
Старыя Дарогі
Любань
Старобіна
Глуск
Лунінец
ПІНСК
Кажан-Гарадок
Давыд-Гарадок
Тураў
Петрыкава
Мазыр
Столін
Ельск

шукаць у тым, што 12-14 траўня 1926 года ў краіне адбыўся дзяржаўны пераварот. Аўтарам сцэнарыя, галоўным арганізатарам перавароту быў Ю. Пілсудскі.

Вынікі перавароту наступныя.

Першы вынік – кадравыя перастаноўкі ў вышэйшым эшалоне Другой Рэчы Пас-палітай. З 14 траўня 1926 года абавязкі кіраўніка дзяржавы выконваў М Ра-тай, а ўрад узначальваў К. Бартэль. 1 чэрвеня 1926 года рашэннем парламента новым прэзідэнтам стаў І. Масціцкі. Пасаду кіраўніка ваеннага ведамства заняў Ю. Пілсудскі.

Другі вынік – распачаўся санацыйны перыяд у гісторыі Польшчы. Пілсудскі аб'явіў аб санацыі. Па-латыні "занасіо" значыць "ачышчэнне, аздараўленне". Ваенны міністр запэўніваў суайчыннікаў у тым, што ў выніку санацыйнай палітыкі польскае грамадства ачысціцца ад шкодных з'яў, атрымае дынаміку па ўсіх напрамках.

Рэаліі ж санацыйнага рэжыму былі такія. За 13 год яго існавання ў краіне назіраліся і дынаміка, і стагнацыя, і крызісныя з'явы. Не адбылося цуда ў эканоміцы, абгрунтаванай была занепакоенасць працоўных мас сваім матэрыяльным становішчам, рэальная палітыка ўлад штурхала беларусаў, украінцаў на нацыянальна-вызваленчую барацьбу, рос недавер да афіцыйнай Варшавы з боку іншых нацыянальных меншасцяў. Сутнасць санацыйнага рэжыму заключалася ў спалучэнні дэмакратычных і антыдэмакратычных метадаў кіравання грамадствам і дзяржавай з перавагай апошніх. Ёсць сэнс спецыяльна падкрэсліць, што яго нельга кваліфікаваць як фашысцкі. Безумоўна, з гісторыі не выкрэсліш рэпрэсіі гэтага рэжыму супраць іншадумцаў, яскравым прыкладам якіх выступаў канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картузскай. Разам з тым у адрозненне ад гітлераўскага, сталінскага рэжымаў у тагачаснай Польшчы дапускалася легальнае існаванне памяркоўнай апазіцыі, прадстаўленай палітычнымі партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, прафсаюзамі, друкам. Улады выключалі легальны статус для левых сіл. Левыя і левацэнтрысцкія сілы былі аб'ектам рэпрэсій.

Аб перавазе антыдэмакратычных метадаў кіравання сведчыла папраўка да канстытуцыі 1921 года ад 2 жніўня 1926 года. Стала значна большым кола пытанняў, якія маглі сваёй уладай выключна вырашаць кіраўнік дзяржавы, урад. З дадзенай папраўкі вынікала аслабленне ролі верхняй і ніжняй палат пар-ламента ў жыцці краіны. Праілюструем дадзеную тэзу на асабістым лёсе Ю. Піл-судскага. З 27 жніўня 1926 года ў выніку аднаасобнага рашэння І. Масціцкага ваенны міністр адначасова стаў генеральным інспектарам Узброеных Сіл Польшчы. Ні ніжняя палата парламента, ні ўрадавыя структуры, звязаныя з ваеннай палітыкай, не маглі патрабаваць ад Пілсудскага зрабіць справаздачу аб яго дзейнасці ў новай якасці. Калі б такое патрабаванне мела месца, генераль-ны інспектар мог спаслацца на спецыяльны дэкрэт кіраўніка дзяржавы і, нату-ральна, яго адмоўны адказ поўнасцю адпавядаў бы дадзенаму дэкрэту. У далей-шым Ю. Пілсудскі будзе заставацца і генеральным інспектарам Узброеных сіл, і ваенным міністрам незалежна ад таго, якія змены будуць яго чакаць на дзяр-жаўнай службе. Адзначым, што такія змены мелі месца. У 1928 годзе Ю. Піл-судскі некалькі месяцаў пабыў на пасадзе прэм'ер-міністра, а затым гэту пасаду зноў заняў К. Бартэль. У красавіку 1929 года пераемнікам К. Бартэля становіцца К. Світальскі. У снежні 1929 года – сакавіку 1930 года К. Бартэль у чарговы раз прэм'ер-міністр. У сакавіку – ліпені 1930 года гэту пасаду займаў Славек. З 25 жніўня 1930 года па 4 снежня 1930 Ю. Пілсудскі зноў быў кіраў-ніком польскага

урада, пасля чаго яго змяніў Славек (снежань 1930г. травень 1931г.). Затым дзейнічалі ўрады, якія ўзначальвалі А. Прыстар (з 23 траўня 1931г. да траўня 1933г.), Я. Янджэвіч (з траўня 1933г. да траўня 1934г.), Л. Каз-лоўскі (травень 1934г. – красавік 1935г.).

У сярэдзіне 1930-ых гадоў пілсудчыкі ажыццявілі сваю даўнюю мару: прыняцце адэкватнага іх інтарэсам Асноўнага закона.

Канстытуцыя, датуемая 23 красавіка 1935 года, перш за ўсё падвяла юрыдычную рысу пад рэаліямі санацыйнага рыжыму, замацавала злом сістэмы супрацьвагаў паміж заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладамі.

Праілюструем гэту тэзу на прыкладзе ключавой постаці ў дзяржаўным кіраванні – прэзідэнта. Антыдэмакратычнымі па сваёй сутнасці былі адказы на пытанні: 1) Хто можа стаць кіраўніком дзяржавы? 2) Якія пытанні ён можа вырашаць сваёй уладай? Адказ на першае пытанне: «Два грамадзяніна Польшчы і не болей». Аднаго ўдзельніка барацьбы за прэзідэнцкую пасаду называў прэзідэнт. Яго суперніка вызначала вельмі вузкае кола асоб. Хто яны?

Па-першае, размова ішла пра частку парламентарыяў. 77 з іх станавіліся электарамі. Прычым за маршалам сейма, маршалам сената месца электара была забраніравана. У электарскі корпус увайшлі 50 дэпутатаў сейма, 25 сенатараў, першыя асобы абедзвюх палат парламента. Астатнія парламентарыі выступалі ў такой якасці пасля таго, як збіраўся кворум у іх палатах і патрэбнай большасцю галасоў прымалася адпаведнае рашэнне.

Па-другое, кампанію дэпутатам сейма, сенатарам склалі кіраўнікі ўрада, вышэйшай судовай інстанцыі.

Па-трэцяе, у электарскі корпус уваходзіла ключавая постаць у ваеннай структуры дзяржавы – генеральны інспектар Узброеных Сіл.

У адрозненне ад канстытуцыі 1921 года новы Асноўны закон прадугледжваў, што кожны грамадзянін Польшчы, які меў права голасу, мог прыходзіць на выбарчы ўчастак і натуральна, павялічваць ці памяншаць шанцы аднаго з кандыдатаў на вышэйшую ў дзяржаве пасаду.

Адказ на другое пытанне з'яўляецца такім; «Палякі атрымалі прэзідэнта-дыктатара, які мог аднаасобна вырашаць ключавыя, нярэдка лёсавызначальныя для краіны пытанні».

Кіраўнік дзяржавы быў адзінай інстанцыяй, якая вырашала пытанне аб тым, хто зойме другую прыступку ў сістэме дзяржаўнага кіравання, гэта значыць, пасаду кіраўніка урада. Канешне, прэм'ер мог выказацца ў гутарках з прэзідэнтам наконт таго, якім бы ён хацеў бачыць склад урада, што, дарэчы, прадугледжвалася канстытуцыяй, у той частцы, якая тычылася кампетэнцыі дадзенай службовай асобы. Аднак і ў гэтым пытанні канчатковую кропку ставіў кіраўнік дзяржавы. Ён жа аднаасобна вырашаў, калі абедзве палаты парламента рэальна распачнуць ажыццяўленне сваіх паўнамоцтваў, і мог нават датэрмінова абвясціць несапраўднымі паўнамоцтвы ўсяго дэпутацкага і сенатарскага корпуса. Кожны трэці сенатар набываў статус члена верхняй палаты парламента дзякуючы выключна ўказу прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы з'яўляўся вышэйшай інстанцыяй у ваеннай структуры дзяржавы як у мірны, так і ў ваенны час. Пэўную рызыку для нацыянальных інтарэсаў Польшчы несла аднаасобнае права прэзідэнта абвяшчаць вайну, заключаць прымірэнні, мірныя дамовы. Пры аналізе канстытуцыі 1921 года мы мадэліравалі сітуацыю, калі дадзеная службовая асоба замацоўвае сваім подпісам ініцыяваны ёю ўказ. Пры гэтым было асабліва падкрэслена, што на гэтым дакуменце павінна

было быць яшчэ два аўтографы (кіраўнік урада + канкрэтны член урадавага кабінета). У выніку прыняцця канстытуцыі 1935 года на дадзеных указах быў толькі адзін подпіс – прэзідэнцкі.

Пройдзе два з паловай месяца, і санацыйны рэжым зноў здзейсніць крок, не-сумяшчальны з дэмакратычнымі нормамі і прынцыпамі. 8 ліпеня 1935 года з'явіўся закон, які кардынальна змяніў механізм, паводле якога грамадзянін Польшчы мог набыць статус дэпутата. Каб ён быў паўнамоцны змагацца за месца ў дэпутацкім корпусе, неабходна была згода патрэбнай большасці членаў канкрэтнай акруговай выбарчай камісіі. Прычым у выніковым рашэнні камісіі павінна было фігураваць не болей, чым два прозвішчы. Трэба таксама мець на ўвазе, што гэтыя камісіі фарміраваліся пры актыўным умяшальніцтве з боку дзяржавы.

У траўні 1935 года скончыўся жыццёвы шлях Ю. Пілсудскага і, натуральна, галоўнае прававое дзецішча яго рэжыму – Канстытуцыя 1935 года – напаўнялася рэальным зместам без бацькі санацыйнай палітыкі. Новы Асноўны закон працаваў у краіне, у якой правілы гульні вызначала так званая «генеральская група». Прадстаўнік гэтай групы М. Зындрам-Касцялкоўскі ўзначальваў урад з 13 кастрычніка 1935 года па 15 траўня 1936 года. Яго пераемнікам быў Ф. Славой-Складкоўскі.

### *2.2. Польшча ў час Другой сусветнай вайны. Да пытання аб юрыдычным замацаванні новых дзяржаўных межаў (1939-1945 гг.)*

Першага верасня 1939 года на Польшчу напала Германія, а 17 верасня 1939 года – Савецкі Саюз. Вермахт і Чырвоная Армія даволі хутка акупавалі польскую тэрыторыю. Краіна апынулася сам-насам са сваімі вельмі складанымі праблемамі, не мела аніякай рэальнай падтрымкі за мяжой у супрацьборстве з мацнейшымі праціўнікамі: СССР і Германіяй. У становішчы Польшчы нічога не змянілася пасля таго, як вайну Германіі абвясцілі Францыя, Злучанае каралеўства Велікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі і яго дамініёны і калоніі, іншыя дзяржавы. З боку Захада вялася так званая дзіўная вайна і, зразумела, час працаваў на Гітлера.

Ганьбой для гітлераўскага і сталінскага рэжымаў з'явілася тлумачэнне Берлінам і Масквой пытання аб польскай дзяржаўнасці ў святле вераснёўскіх падзей 1939 года. Агульны назоўнік іх пазіцый быў такі: польская дзяржава больш не існуе. Між тым Польшча працягвала быць суб'ектам міжнародных адносін і міжнароднага права. Функцыянавалі структуры, упаўнаважаныя выступаць ад імя польскага народа. Аптымальны варыянт гэтых структур быў знойдзены не адразу, што было перш за ўсё звязана са стаўленнем вышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва да галоўнага юрыдычнага прадукту санацыйнага рэжыму – Канстытуцыі 1935 года. Заўважым, што з пачаткам вайны апошні прэзідэнт міжваеннай Польшчы І. Масціцкі знікае з палітычнай сцэны, і краіна атрымала новага кіраўніка дзяржавы – В. Рачкевіча. Адбылася змена і на пасадзе прэм'ер-міністра, якую заняў аднадумца В. Рачкевіча – А. Залескі. Прэзідэнт і кіраўнік урада ў сваіх першапачатковых заявах строга арыентаваліся на Канстытуцыю 1935 года. Аднак неўзабаве В. Рачкевічу прыйшлося ўлічваць правілы гульні. Справа ў тым, што цэнтральныя органы дзяржаўнага кіравання Польшчы знаходзіліся ў Францыі і, натуральна, былі залежны ад вышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва гэтай краіны. Яно ж у сваю чаргу рабіла стаўку на тых уплывовых польскіх дзеячаў, якія выступалі за рэвізію

Канстытуцыі 1935 года. Тых, хто рабіў палітыку тагачаснай Францыі, задавальняла кандыдатура генерала У. Сікорскага на пасадзе прэм'ер-міністра Польшчы. Праз даволі кароткі тэрмін В. Рачкевіч па-гаджаецца з наступнымі зменамі: 1) У Сікорскі становіцца пераемнікам А. Залескага; 2). Рэзка ўзрастаюць паўна-моцтвы ўрада. Адлік прэм'ерства У. Сікорскага распачаўся 30 верасня 1939 года. 9 снежня 1939 года адметна з'яўленнем Нацыянальнай рады (Рады народавай). У гэтым дарадчым органе можна было пачуць голас і правых, і цэнтрыстаў, і левых. Усе яны, як і ўрад, бачылі галоўную мэту ў тым, каб вызваліць краіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У сувязі з тым, што на Польшчу напалі СССР і Германія, урад У. Сікорскага меў пераканаўчыя падставы для фармулявання тэорыі двух ворагаў. Лічачы ў якасці такіх Маскву і Берлін, вышэйшы орган выканаўчай улады Польшчы ўсё ж лічыў, што галоўная канфліктная лінія павінна тычыцца германскага напрамку. Менавіта для барацьбы з вермахтам эмігранцкі ўрад стварае на тэрыторыі Францыі 82-ты-сячнае ўзброенае фарміраванне. Вайскоўцы, якія ўваходзілі ў гэта фарміраванне, ваявалі супраць германскіх салдат і афіцэраў за межамі сваёй радзімы.

Паражэнне Францыі ад нацысцкай Германіі вымусіла цэнтральныя органы дзяржаўнага кіравання Польшчы перабрацца ў Велікабрытанію. Заўважым, што польскі ўзброены кантынгент актыўна дапамагаў Злучанаму каралеўству Велікабрытаніі супрацьстаяць моцнаму ворагу.

Важна падкрэсліць, што Сікорскі з цягам часу псіхалагічна рыхтаваў сябе да таго, каб пераасэнсаваць сваё стаўленне да Масквы. Будучы рэалістам, ён разумеў, што неўзабаве надыдзе момант, калі сталінскі Савецкі Саюз і гітлераўская Германія будуць ваяваць паміж сабой.

Пасля 22 чэрвеня 1941 года Крэмль і лонданскі эмігранцкі ўрад сталі актыўна рабіць крокі насустрач.

Адносіны СССР з гэтым урадам можна падзяліць на два перыяды: 1). чэрвень 1941 – красавік 1943 гг.; 2). з красавіка 1943 г. па 1945 год. У першы перыяд тэндэнцыя да супрацоўніцтва была вызначальнай. Безумоўна, былі і непаразуменні, і супярэчнасці. Яны тычыліся перш за ўсё сакрэтных пратаколаў да савецка-германскіх дамоўленасцяў 1939 года. Другі перыяд можна адназначна характарызаваць як канфрантацыйны.

Сведчаннем кардынальных зменаў у польска-савецкіх адносінах з'явіліся пагадненні, датуемыя 30 ліпеня і 14 жніўня 1941 года.

У першым пагадненні выразна прасочваўся агульны назоўнік пазіцый бакоў: зацікаўленасць у трывалым саюзе, у адзінстве дзеянняў, у тым ліку ўзброеных у адносінах да Берліна і яго сатэлітаў. Разам з тым у тэксце пагаднення моманты відавочнай згоды спалучаліся з неканкрэтнымі фармулёўкамі , якія дапускалі рознае тлумачэнне. Аб гэтым, напрыклад, сведчыў такі пасаж: «Урад СССР прызнае савецка-германскія дамовы 1939 года ў дачыненні да тэрытарыяльных перамен у Польшчы страціўшымі сілу. Польскі ўрад заяўляе, што Польшча не звязана ніякім пагадненнем з якім-небудзь трэцім бокам, накіраваным супраць Савецкага Саюза». Па тэрытарыяльным пытанні Польшча і Савецкі Саюз абмежаваліся толькі адным сказам у прыведзеным пасажы. З гэтага сказа вынікала, што Масква, з аднаго боку, гатова весці перамовы наконт усталявання новай савецка-польскай мяжы і, з другога боку, не вылучала канкрэтных прапаноў па змяненню статус-кво ў тэрытарыяльным пытанні.

Пазіцыя ж польскага боку з'яўлялася нязменнай: вяртанне крэсаў усходніх. Аналізуемая фармуліроўка тлумачылася ім як зыходны пункт для перамоваў аб аднаўленні той мяжы, якая існавала да 1939 года.

Другое пагадненне падводзіла трывалы юрыдычны грунт пад ваенную складовую савецка-польскага супрацоўніцтва.

Менавіта з гэтага пагаднення распачыналася гісторыя арміі В. Андэрса. 3 пагаднення вынікала, што пачатковая частка дадзенай гісторыі тычылася абшару, які трапляў пад выключную юрысдыкцыю Крамля. На гэтым абшары павінна была стварыцца дзеяздольная польская армія, якую эмігранцкі ўрад лічыў казырной картай. Фінансавыя, матэрыяльныя сродкі па лініі вышэйшага органа выканаўчай улады СССР, механізм ленд-ліза з'явіліся крыніцамі напаўнення рэальным зместам пагаднення ад 14 жніўня 1941 года.

Побач з дыпламатычнай дзейнасцю другім ключавым напрамкам для ўрада Сікорскага была арганізацыя супраціўлення нямецка-фашысцкім акупантам на роднай зямлі. Да гонару палякаў, адпаведныя групы сталі ствараца ўжо ў верасні 1939 года. Многія з іх у лістападзе 1939 года сталі неад'емнымі элементамі Саюза ўзброенай барацьбы ( Звёнзек валькі збройнай, ЗВЗ ). ЗВЗ вядомы як ключавая структура ў польскім руху Супраціўлення. Былі і іншыя структуры (Батальёны хлопске, БХ), «Народава арганізацыя вайскова», Цэнтральнае кіраўніцтва рухам працоўных мас горада і вёскі-Свабода, Роўнасць і Незалежнасць (Вольносць, Рувносць, Неподлеглосць), ППС-ВРН; «Барыкадаўцы», «Рэвалюцыйныя рабоча-сялянскія саветы», РРС і г.д. Аднак яны не ішлі ні ў якае параўнанне з ЗВЗ і па масавасці, і па значнасці, і па аўтарытэту ў насельнітцтва.

14 лютага 1942 года заканчваецца гісторыя ЗВЗ і распачынаецца адлік існавання Арміі Краёвай (АК). Для Сікорскага гэта была не проста змена найменняў. Ён спадзяваўся звесці да агульнага назоўніка разнастайныя структуры, якія са зброяй у руках змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Безумоўна, абсалютная большасць з гэтых структур сталі неад'емнымі састаўнымі элементамі АК. Разам з тым былі структуры, якія не падпарадкоўваліся кіраўніцтву АК і, натуральна, Лонданскаму эміграцыйнаму ўраду. 3 самага пачатку свайго існавання (студзень 1942 года) Польска партыя работніча (ППР) была занята фарміраваннем моцнай узброенай арганізацыі барацьбітоў Супраціўлення, незалежнай ад генерала Сікорскага. Ужо вясной 1942 года можна адзначыць яе сур'ёзны поспех на гэтым шляху: распачалася гісторыя Гвардыі Людовай (ГЛ).

Важнай падзеяй стала стварэнне арміі Андэрса. Да пачатку верасня 1942 года амаль уся яго армія, у якую ўваходзіла звыш за 100 тысяч салдат і афіцэраў, апынулася за межамі СССР.

У красавіку 1943 года стала вядома аб страшэнным злачынстве сталінскага рэжыму – Катынскай трагедыі. Глыбока абураны гэтым фактам урад Сікорскага разарваў адносіны з Савецкім Саюзам. На жаль, Сікорскі загінуў у авіякатастрофе ў г. Гібралтары 4 ліпеня 1943 года. Пераемнікам загінуўшага генерала стаў С.Мікалайчык.

Уступленне Польшчы ў новы, 1944 год было адзначана пачаткам дзейнасці на яе тэрыторыі Краёвай рады народавай (КРН). Дзеячы ППР, якія сталі ля вытокаў КРН, разглядалі гэты факт як прамежкавы этап на шляху да вяршыні палітычнай піраміды ў пастваеннай Польшчы. Арыентацыя КРН была адназначна прасавецкая. Дзецішчам КРН стала такая важная структура, як Армія Людова (АЛ) – пераемніца Гвардыі Людовай. Крэмль задавальнялі не толькі пазіцыя

КРН, але і падыход Саюза польскіх патрыётаў (СПП). Першай асобай СПП з'яўлялася выдатны майстар слова Ванда Васілеўская . Менавіта з СПП звязана ініцыятыва, рэалізацыя якой адкрыла яскравую старонку ў гісторыі савецка-польскага братэрства па зброі. Менавіта дзякуючы актыўным захадам СПП Масква з траўня 1943 года была не супраць, каб на савецкай зямлі, у цесным узаемадзеянні з савецкімі салдатамі і афіцэрамі распачала свой баявы шлях пяхотная дывізія, складзеная выключна з этнічных палякаў. Гэта была першая дывізія такога тыпу. Таму яна мела №1. Дывізія насіла імя Андрэя Банавентуры Тадэвуша Касцюшкі. Камандзірам дывізіі быў вопытны ваенны спецыяліст палкоўнік З.Берлінг. Усё ж задумка СПП на 100% рэалізавана не была. Салдацкі корпус дывізіі быў прадстаўлены выключна палякамі. У афіцэрскім складзе не ўсе адносіліся да гэтага этнасу, але, праўда, такіх было большасць.

Акрамя СПП польскі патрыятычны рух у СССР быў прадстаўлены таксама ЦБКП (Цэнтральным бюро камуністаў польскіх). Да сярэдзіны 1944 года СПП, ЦБКП мелі даволі моцны аргумент – 1-ую Польскую армію. Колькасць асабовага складу апошняй раўнялася 78 тысячам чалавек.

Унутры Польшчы сілы, якія былі звязаны з эміgranцкім урадам у Лондане, адказваюць на ўзнікненне КРН такім чынам: 9 студзеня 1944 года пачынаецца гісторыя Рады нацыянальнага адзінства (Рады еднасці народавай, РЕН).

Летам 1944 года Чырвоная Армія распачала вызваленне Польшчы. На гусеніцах савецкіх танкаў была завезена марыянеткавая структура – Польскі камітэт нацыянальнага вызвалення (ПКНВ), які 22 ліпеня выступіў з маніфестам, з якога вынікала, што вышэйшая ўлада ў краіне павінна належаць Краёвай радзе народавай. Дарэчы, да народна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1989 года штогод 22 ліпеня адзначаўся Дзень адраджэння Польшчы. Яшчэ да з'яўлення Хэлмскага маніфеста 21 ліпеня 1944 года распачалася гісторыя Войска Польскага. Крыніцамі яго фарміравання былі 1-я Польская армія, Армія Людова. Менавіта з ПКНВ савецкі ўрад збіраўся весці перамовы аб новай савецка-польскай мяжы, аб чым сведчыла пагадненне, датуемае 27 ліпеня 1944 года. Вызначальны ўплыў на перамоўніцкі працэс аказала Крымская канферэнцыя 1945 года. Агульны назоўнік пазіцый удзельнікаў канферэнцыі быў такі: зрабіць базай савецка-польскай дамоўленасці «лінію Керзона». Акрамя таго, пазначаліся абшары працягласцю не болей за 5-8 км, якія прымыкалі на ўсход ад гэтай лініі і павінны былі лічыцца польскімі. Калі ж узяць «лінію Керзона», то аказвалася, што такіх абшараў было няшмат.

31 снежня 1944 года заканчваецца гісторыя ПКНВ і распачынае адлік свайго існавання Часовы ўрад Польшчы.

Поўнае вызваленне Польшчы можна было канстатаваць вясной 1945 года. На заключным этапе вызвалення вызначыліся войскі 1-га Украінскага фронту, 1-га Беларускага фронту, 1-ай і 2-ой Польскіх армій.

Заўважым, што па-ранейшаму працягваў свае існаванне эміgranцкі ўрад у Лондане. Праўда, кардынальныя змяненні адбыліся ў настроі яго прэм'ера С.Мікалайчыка. Аб гэтым сведчылі падзеі, якія адбываліся ў сталіцы СССР 17-21 чэрвеня 1945 года. Там за адзін стол селі ключавыя дзеячы Часовага ўрада і прадстаўнікі шырокага спектра палітычных сіл, у тым ліку частка «лонданцаў». Пагадзіўшыся на сустрэчу са, здавалася б, вечнымі апанентамі, вечнымі праціўнікамі, С.Мікалайчык спрабаваў навязаць свае правілы гульні. Апетыты ў яго былі вялікія. С. Мікалайчык не ўтойваў жаданне ўзначаліць вышэйшы орган выканаўчай улады. Галоўны вынік сустрэчы: стаў рэальнасцю Часовы ўрад нацыянальнай згоды. Максімум, чаго дамогся С. Мікалайчык, —атрыманне пасады намесніка ўрада. Яго пераемнікам у Лондане стаў Арцішэўскі.

Спрыяльнымі для Польшчы былі рашэнні Патсдамскай канферэнцыі, якая працавала з 17 ліпеня па 2 жніўня 1945 года. Вялікія дзяржавы, адказныя за германскае мірнае ўрэгуляванне, згадзіліся з тым, што будучая адзіная

дэмакратычная Германія падпіша мірную дамову, у якой будзе падведзены юрыдычны грунт пад вызначэнне новай германа-польскай мяжы. Для пасляваеннай Польшчы станавілася рэальнасцю «істотнае прырашчэнне тэрыторыі на поўначы і на захадзе». Гэта прырашчэнне несла ў сабе плюсы геапалітычнага і эканамічнага парадку. Палякі атрымалі абшар, які на працягу 581км непасрэдна прылягаў да Балтыйскага мора. Для Другой Рэчы Паспалітай гэты паказчык быў роўны 140 км. Статус памежных пунктаў набывалі Свінаўйсьце (Свінэмюндэ), Шчэцын, памежных рэк – Одра, Ныса Лужыцкая. «Прырашчэнне тэрыторыі» заканчвалася на лініі польска-чэхаславацкай мяжы. Вялікія дзяржавы вырашылі падзяліць Усходнюю Прусію наступным чынам: адна яе частка пераходзіла да СССР, а другая перадавалася Польшчы. Зноў станавіўся польскім абшар, які меў найменне «Вольны горад Гданьск». Згажэлецкая дамова 1950 года паміж ГДР і ПНР, дамова, датаваная 7 снежня 1970 года, паміж ФРГ і ПНР, сведчылі аб тым, што Усходні Берлін і Бон афіцыйна прызналі status-quo у памежным пытанні, якое з'явілася вынікам Патсдамскай канферэнцыі.

16 жніўня 1945 года намеснік Старшыні Савета Народных Камісараў СССР В. М. Молатаў і Старшыня Савета Міністраў Польскай Рэспублікі Е.Асубка-Мараўскі замацавалі сваімі подпісамі Дамову аб савецка-польскай дзяржаўнай мяжы. Заўважым, што Масква ігнаравала інтарэсы беларускага і ўкраінскага народаў яшчэ ў большай ступені, чым у час працы Крымскай канферэнцыі. Аб гэтым сведчыў новы выгляд савецка-польскай мяжы. Савецкі бок быў згодны з тым, каб тэрытарыяльная сфера польскага дзяржаўнага суверэнітэту пашыралася за кошт новых абшараў, якія знаходзіліся на ўсход ад «лініі Керзона». Дакладныя межы гэтых абшараў вызначаліся наступным чынам: «на ўсход ад «лініі Керзона» да ракі Заходні Буг і ракі Салокія, на поўдзень ад горада Крылоў з водступам на карысць Польшчы максімальна на трыццаць кіламетраў, «частка тэрыторыі Белавежскай Пушчы на ўчастку Няміраў-Ялаўка, размешчанай на ўсход ад «лініі Керзона», уключаючы Няміраў, Гайнаўку, Белавеж і Ялаўку, з водступам на карысць Польшчы максімальна на 17 кіламетраў». За дзевяць гадоў, з 1946 па 1955гг. Масква яшчэ чатыры разы рабіла тэрытарыяльныя падарункі польскаму боку за кошт беларусаў і як вынік скарацілася тэрыторыя Сапоцкінскага, Бераставіцкага і Свіслацкага раёнаў Гродзенскай вобласці.

### *2.3. Польская гісторыя ў другой палове 1940-ых г.—1989 г.: курс вонкавых і ўнутраных сіл на дэмантаж заваёў народна-дэмакратычнай рэвалюцыі, мадэль дзяржаўнага сацыялізму ў кантэксце польскіх рэалій*

Зразумела, ідучы на істотныя ўступкі ў тэрытарыяльным пытанні, Масква разлічвала на тое, што Польшча назаўсёды стане часткай знешняй імперыі Крамля. Сталін разглядаў у кантэксце экспарту савецкай мадэлі сацыялізму ў гэту краіну выбары ў заканадаўчы сейм, прызначаныя на 17 студзеня 1947 года. Зараз усе сур'ёзныя даследчыкі адзіныя ў тым, што з падачы савецкага кіраўніцтва быў запушчаны механізм фальсіфікацыі вынікаў дадзеных выбараў. Насуперак яго рэальнаму рэйтынгу так званы дэмакратычны блок быў абвешчаны пераможцам. У гэтым блоку ключавую ролю адыгрывала ППР. Пэпээраўцы са сваімі саюзнікамі забраніравалі за сабой у парламенце 394 дэпутацкія месцы, а іншыя партыі і аб'яднанні разам узятыя – толькі 50. Прычым у якасці непрымірымага праціўніка дэмблока выступалі толькі 28 парламентарыяў, якія прадстаўлялі партыю Польска Строніцтва Людове (ПСЛ). З канца 1947 года ПСЛ пераходзіць да супрацоўніцтва з уладнымі структурамі.

Зразумела, ППР дзейнічала ў вельмі жорсткіх рамках, зададзеных Крамлём. Аднак трэба аддаць належнае Генеральнаму сакратару ЦК Уладзіславу Гамулку. У яго быў найбольш рэалістычны адказ на пытанне: «Як трэба будаваць сацыялізм?». У. Гамулка выключаў фарсіраваныя тэмпы, заклікаў улічваць польскую спецыфіку. Канешне, гэта не падабалася Маскве. Абураў Сталіна і той

факт, што генсек ППР не далучыўся да антыюгаслаўскай кампаніі, распачатай «бацькам усіх народаў». Таму Крэмль вырашыў памяняць «апартуніста» У. Гамулку на сталініста Баляслава Берута. Адпрацаваны ў Маскве сцэнарый быў поўнасцю рэалізаваны на Пленуме ЦК ППР, які датуецца 31 жніўня – 3 верасня 1948 года. Новы лідэр ППР Б. Берут адразу стаў укараняць сталінскую мадэль сацыялізму. Яго першы крок у гэтым напрамку – аб'яднанне ППР і ППС у Польскую аб'яднаную рабочую партыю (ПАРП), якое здзейснілася ў снежні 1948 года. З 1948 па 1989 гг. ПАРП мела манаполію на ўладу ў ПНР.

Камуністычныя ўлады з канца 1940-ых гг. зрабілі акцэнт перш за ўсё на цяжкую прамысловасць, што ніяк не стыкавалася з унутрыпольскімі рэаліямі. Парушаючы аб'ектыўныя эканамічныя законы, Берут і К* не адказвалі на наступнае пытанне: як яны могуць хутка кампенсаваць відавочны недахоп сыравіны, прапанаваць адэкватны фарсіраванаму развіццю дадзенай галіны палійна-энергетычны баланс пры дэфіцыце адпаведных рэсурсаў? Падобная палітыка моцна біла па інтарэсах польскага сялянства, прывяла да глыбокага крызісу ў сферы сельгасвытворчасці! Вялікае абурэнне працаўнікоў вёскі выклікала прымусовая калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Берутаўскі рэжым кінуў за краты без малага 150 тысяч грамадзян ПНР. Камуністычныя ўлады ацэньвалі гэтых суайчыннікаў як ворагаў сацыялізму.

XX з'езд КПСС (люты 1956 года) выкрыў культ асобы І. В. Сталіна і тым самым пазбавіў Б. Берута яго казырной карты. Рэальнасцю тагачаснай Польшчы стаў моцны антыаўтарытарны рух, які знайшоў сваю кульмінацыю ў Пазнанскім паўстанні (1956г.). Паўстанне мела шырокі рэзананс унутры краіны. Многія палякі былі салідарныя з паўстаўшымі ў тым, што ўладам трэба кардынальна мяняць эканамічную палітыку, што неабходна вярнуцца да тых свабодных выбараў, якія існавалі да ўсталявання камуністычнага рэжыму, што савецкая вайсковая прысутнасць супярэчыць нацыянальным інтарэсам Польшчы.

Безумоўна, сілы паміж уладамі і паўстаўшымі былі няроўныя. Афіцыйная Варшава прыбегла да сілавога аргумента – і паўстанне пацярпела паражэнне. Заўважым, што ў вышэйшых эшалонах не прасочваўся агульныназоўнік у прагназаванні ўплыву пазнанскіх падзей на грамадзянскую свядомасць палякаў. У корпусе ключавых функцыянераў ПАРП выразна абазначыліся дзве фракцыі: «пулавяне» і «натолінцы». Першая фракцыя бачыла галоўны ўрок паўстання ў тым, што трэба ажыццяўляць ліберальны курс і адпаведна рэфармаваць розныя сферы грамадскага жыцця. «Натолінцы» думалі катэгорыямі берутаўскай эры. Яны зацыкліліся на тым, каб не дапускаць аніякага іншадумства, кідаць не згодных з рэжымам за краты. У гэты няпросты час пераемнік Б. Берута на пасадзе галоўнага кіраўніка ПАРП Э. Охаб, кіраўнік вышэйшага органа выканаўчай улады Ю. Цыранкевіч выказваліся асцярожна, туманна, не выступалі з прынцыповых, самастойных пазіцый. Таму рэйтынг гэтых дзеячаў сярод суайчыннікаў быў нізкі. Імі была запатрабавана выдатная асоба, здольная ажыццявіць дэсталінізацыю, рэалізаваць на практыцы польскі шлях да сацыялізму. У гэтай сувязі ў вачах палякаў альтэрнатывы для кандыдатуры Уладзіслава Гамулкі для пасады кіраўніка ПАРП не было. Дадзеная кандыдатура была ва ўсіх на слыху з нагоды маючага адбыцца VIII кастрычніцкага (1956г.) пленума ЦК ПАРП. М. Хрушчоў не хацеў бачыць У. Гамулку польскім лідэрам. Ён робіць ход, які ніхто з аглядальнікаў не прагназаваў: накіроўваецца ў сталіцу ПНР, дае загад савецкім вайскоўцам, дыслацыраваным у Польшчы, прадэманстраваць прыхільнікам У. Гамулкі ў Палітбюро ЦК ПАРП наяўнасць у савецкага лідэра сілавога аргумента, набліжаючыся да Варшавы. Ход Першага сакратара ЦК КПСС не спрацаваў. Галоўны вынік Пленума – новы старт У. Гамулкі на вышэйшай прыступцы партыйнай лесвіцы. З пастановы Пленума вынікала, што Гамулка неўзабаве будзе працаваць з новым Міністрам абароны. Партыйны форум вырашыў, што Маршал Савецкага Саюза, Маршал Польшчы Канстанцін Ракасоўскі не павінен больш быць членам Палітбюро ЦК ПАРП.

Да задавальнення ліберальна настроенай часткі палякаў «сталініст» К. Ракасоўскі праз непрацяглы прамежак часу перастане ўзначальваць ваеннае ведамства і вернецца ў Савецкі Саюз.

У заслугу У. Гамулку можна паставіць частковую дэсталінізацыю, унясенне карэктыў у галіне ўнутранай палітыкі. Было пашырана кола пытанняў, якія суб'екты гаспадарання маглі вырашаць самастойна. Прасочвалася імкненне цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання пераадолець перакос у суадносінах паміж вытворчасцю сродкаў вытворчасці і вытворчасцю прадметаў спажывання. Уладныя структуры не рабілі болей ужо такі моцны акцэнт на развіццё цяжкай прамысловасці, як у эру Б. Берута. Набывала рэальныя абрысы дэкалектывізацыя сельскай гаспадаркі і рэзка ўзрасла доля індывідуальных сельгасвытворцаў у аграрнай сферы. Больш ліберальнай стала палітыка ў адносінах да СМІ, на свабодзе апынуліся кінутыя за краты праціўнікі сталінскай мадэлі сацыялізму, быў пакладзены канец уседазволенасці польскіх чэкістаў. Разам з тым У. Гамулка і яго атачэнне не адмовіліся ад многіх рэцэптаў вырашэння пытанняў дзяржаўнай важнасці, якія ўпершыню прайшлі апрабацыю ў часы кіравання «бацькі ўсіх народаў».

Эра У. Гамулкі ў польскай гісторыі скончылася ў 1970 годзе. Яе фінал адбываўся на дрэннай ноце. Распачаўся другі пасля 1956 года крызіс. Пасля таго як забунтавалі рабочыя ў Гданьску, хваля грамадскага незадавальнення ахапіла ўсю краіну. Пераемнікам У. Гамулкі на пасадзе кіраўніка партыі становіцца Эдвард Герэк. Новы польскі лідэр ведьмі актыўна звяртаўся да іншаземных пазыкадаўцаў. Пэўны час з пункту гледжання макраэканамічных паказчыкаў здавалася, што Э. Герэк абраў правільны курс. Аднак выкананне польскім бокам умоў, на якіх даваліся займы, моцна біла па кішэні падаткаплацельшчыкаў. Таму сярэднестатыстычны паляк адмоўна ўспрымаў палітыку ўлад, лічыў натуральным адказам на антынародны курс ПАРП забастоўкі, дэманстрацыі. З сярэдзіны 1970-ых гадоў такі адказ становіцца тыповай з'явай унутрапольскай рэчаіснасці. Бездапаможная ўлада ўсё актыўней прыбягала да рэпрэсій супраць рабочых. Адначасова яна прапісала ў Асноўным Законе новыя антыдэмакратычныя моманты, што яшчэ больш павысіла градус грамадскага незадавальнення. У другой палове 1970-ых гг. упершыню ў гісторыі антыаўтарытарнага руху ў сацыялістычнай Польшчы выразна акрэслілася структураваная апазіцыя. З 1976 года распачынаецца гісторыя Камітэта абароны рабочых, з 1977 года – Руху ў абарону правоў чалавека і грамадзяніна. Высокую грамадзянскую свядомасць прадэманстравалі ключавыя дзеячы каталіцкай царквы. Ім надаў дадатковыя сілы той факт, што з 1978 года пачаўся адлік пантыфіката кракавяніна Караля Вайтылы (Іаана Паўла ІІ). Суайчыннікі ўпершыню ўбачылі яго на радзіме ў такой якасці ў 1979 годзе. Антытаталітарныя, антыаўтарытарныя, антыкамуністычныя перакананні кіраўніка Рымска-каталіцкай царквы ўспрымаліся ў польскім грамадстве як перакананні вялікага маральнага аўтарытэта, выдатнага мысліцеля, сумлення польскай нацыі.

Адмоўныя з'явы ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны дасягнулі свайго апагея ў 1980 годзе. Менавіта тады распачаўся трэці, самы глыбокі крызіс у ПНР. Польшча павінна была сваім пазыкадаўцам 20 млрд. долараў. Зноў старт антыаўтарытарнаму руху далі нязгодныя з рэжымам рабочыя Гданьска. У ходзе забастовак на Балтыйскім узбярэжжы актыўна вылучаўся гданьскі электрык Лех Валенса. Менавіта ён пакладзе пачатак стварэнню агульнапольскага незалежнага прафсаюза «Салідарнасць», надоўга ўзначаліць гэту арганізацыю. Сацыяльна-палітычны антаганізм у грамадстве рэзка нарастаў. Сістэмны крызіс прымусіў Э. Герэка пайсці ў адстаўку. Новы лідэр ПАРП Станіслаў Каня аказаўся слабай постаццю для вырашэння задач, якія паўсталі перад краінай. У 1981 годзе яго мяняе на дадзенай пасадзе генерал Войцэх Ярузельскі. Ён атрымаў даставерную інфармацыю аб тым, што Масква рыхтуе ваенную інтэрвенцыю ў Польшчу. Крамлю яўна хацелася паўтарыць вопыт падаўлення пражскай вясны. У Ярузельскага быў толькі адзін спосаб прадухілення рэалізацыі планаў са-

вецкага кіраўніцтва: зрабіць рэальнасцю ваеннае становішча. 13 снежня 1981 года пад яго падводзіцца прававы базіс. Ваеннае становішча дзейнічала па 1983 год. Ва ўнутрыпольскім плане яно мела перш за ўсё адмоўныя наступствы, па сутнасці павялічваючы глыбіню грамадскіх супярэчнасцяў. Кіраўнік партыі, вышэйшая службовая асоба ў сістэме дзяржаўнага кіравання Войцэх Ярузельскі атрымаў большую ступень свабоды пасля таго, як у СССР да ўлады прыйшоў М. С. Гарбачоў. Абвешчанае ім новае палітычнае мысленне меркавала свабоду выбару, што з'явілася моцным штуршком для антыаўтарытарных сіл у Польшчы.

Натуральна, зараз мы падыходзім да разбору лёсавызначальных падзей у бліжэйшай суседкі.

## 2.4. Рэспубліка Польшча (1989-2005 гг.), сістэмныя пераўтварэнні ў рамках посткамуністычнага этапа

Сапраўды пераломным быў Пленум ЦК ПАРП, які адбыўся ў снежні 1988 - студзені 1989 гг. Галоўны вынік пленума – згода камуністычных уладаў на правядзенне круглага стала, які адбыўся ўвесну 1989г. Удзельнікі круглага стала былі дэлегаваны ад цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання, ПАРП, грамадскіх арганізацый, Касцёла, «Салідарнасці», Усяпольскага пагаднення прафсаюзаў. Была выпрацавана складаная, але ў той жа час спрыяльная для апазіцыі формула выбараў у сейм: 60% на 40%. 60% дэпутацкіх месцаў павінны былі заняць прадстаўнікі ПАРП, Аб'яднанай сялянскай партыі (АСП) і «Строніцтва дэмакратычнага» (СД), 40% – іншыя сілы. Чэрвеньскія (1989 г.) выбары ў сейм сталі відавочным поспехам для апанентаў камуністычнага рэжыму. Неўзабаве пасля выбараў адбылася перагрупіроўка сіл, якая ўнесла кардынальныя змены на капітанскім мосціку польскай палітыкі. Сталі супрацьстаяць адзін другому два блокі: першы блок («Салідарнасць», АСП, СД) і другі блок (ПАРП). Менавіта першы блок узяў на сябе з канца жніўня 1989 г. урадавую адказнасць. У Польшчы быў створаны першы ў пасляваеннай гісторыі Усходняй Еўропы некамуністычны ўрад, які ўзначаліў вядомы дзеяч «Салідарнасці» Тадэвуш Мазавецкі. Ключавое значэнне для сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі меў абнародаваны ў кастрычніку 1989 г. план Бальцаровіча, міністра фінансаў у гэтым урадзе. Снежань 1989 г. быў адзначаны канстытуцыйнай рэформай. З Асноўнага Закона Польшчы былі выключаны ўсе месцы, якія узгадвалі б пра таталітарнае мінулае. У студзені 1990 г. замест ПАРП узнікае Сацыял-дэмакратыя Рэспублікі Польшча. Перамога лідэра «Салідарнасці» Л. Валенсы на прэзідэнцкіх выбарах (снежань 1990 г.) азначала пачатак новага этапа ў сістэмных пераўтварэннях у гэтай краіне.

Эра Л. Валенсы ў польскай палітыцы цягнулася са снежня 1990 г. па 1995 г. Гэта – эра панавання неакансерватараў. Абранне яго пераемнікам А. Кваснеўскага сведчыла аб рэзкім умацаванні левацэнтрысцкіх сіл. У снежні 2005 года скончыліся два прэзідэнцкія тэрміны дадзенага палітыка. Ўрады ў Трэцяй Рэчы Паспалітай ўзначальвалі Ян Кшыштаў Бялецкі, Ежы Бузек, Тадэвуш Мазавецкі, Юзэф Алексы, Вальдэмар Паўляк, Ханна Сухоцка, Уладзімеж Цімашэвіч, Лешак Мілер. Зараз пасаду прэм'ер-міністра займае В. Белька. Галоўны вынік посткамуністычнага этапа гісторыі Польшчы – сістэмныя пераўтварэнні, аб якіх побач з іншымі сюжэтамі пойдзе гаворка ў наступных лекцыях.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Як суадносіліся дэмакратычныя і антыдэмакратычныя метады кіравання грамадствам і дзяржавай у часы існавання Другой Рэчы Паспалітай?
2. Чым Канстытуцыя 1921 года адрознівалася ад Канстытуцыі 1935 года?
3. Якія наступствы пакт Молатава – Рыбентропа меў для Польшчы?
4. Чым можна растлумачыць феномен "Салідарнасці"?
5. Як можна ацаніць В. Ярузельскага ў якасці палітычнага дзеяча?
6. Калі распачаўся посткамуністычны этап у гісторыі Польшчы?

**Тэст-заданні:**

1. Лінія Керзона насіла:

а) антыбеларускую накіраванасць;

б) прабеларускую накіраванасць.

2. Час існавання Другой Рэчы Паспалітай.

а) 1918-1939 гг.; 6)1930 – 1934 гг.; в) 1926-1939 гг.

3. Час дзеяння санацыйнага рэжыму.

а) 1926 – 1939 гг.; 6)1930-1934 гг.; в) 1932 – 1936 гг.

4. Калі была заключана Рыжская мірная дамова?

а)у 1921г.; б)у 1929 г.; в)у 1933г.

5) Самы папулярны палітычны дзеяч у міжваеннай Польшчы.

а) У. Сікорскі; б) Ю. Пілсудскі; в) В. Рачкевіч.

6. Калі Камітэрн распусціў Кампартыю Польшчы?

а)у 1930 г.; б)у 1937 г.; в)у 1938 г.

7. Калі ўзнік першы крызіс у сацыялістычнай Польшчы?

а)у 1951г.; б)у 1952 г.; в)у 1956 г.

8. Як называлася галоўная партыя ў сацыялістычнай Польшчы?

а) Польская аб'яднаная рабочая партыя;

б) Польская сацыялістычная партыя;

в) Польская дэмакратычная партыя.

9. Першы прем'ер-міністр посткамуністычнай Польшчы.

а) Т. Мазавецкі; б) Х. Сухоцка; в) А. Квасьнеўскі.

10. Да якога палітычнага лагера належыць Л. Валенса?

а) ліберальнага; б) неакансерватыўнага; в) рэфармісцкага.

11. Калі В. Ярузельскі зыходзіць з палітычнай сцэны?

а) у 1990 г.; б) у2000г.; в) у 2005 г.

12. У які час А. Кваснеўскі быў прэзідэнтам Польшчы?

а) у 1995 -2005 гг.; б) у 1990 – 1995 гг.; в) у 1989-1990 гг.

*Лекцыя трэцяя*

## ЭКАНАМІЧНАЯ СІСТЭМА І САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА РП

***План:***

3.1. Польскі вопыт эканамічных рэформ. Сучаснае эканамічнае становішча РП.

3.2. Праблемы сацыяльнай абароны грамадзян ва ўмовах эканамічнага рэфарміравання.

### *3.1. Польскі вопыт эканамічных рэформ. Сучаснае эканамічнае становішча РП*

Стартавая кропка постсацыялістычнага этапа ў гісторыі Польшчы — рэалізацыя плана віцэ-прэм'ера Лешака Бальцэровіча. Віцэ-прэм'ер прапанаваў паставіць у цэнтр эканамічнай стратэгіі макраэканоміку. Ён лічыў мэтазгодным распачынаць з захадаў, якія мелі на мэце дасягненне такіх ключавых макраэканамічных пачазчыкаў, якія сведчылі б аб пераадоленні паласы крызісных з'яў. Інфляцыя да моманту ўтварэння ўрада Т. Мазавецкага мела крытычныя маштабы, стварыла пагрозу эканамічнай катастрофы. Таму ў плане Л. Бальцэ-ровіча першым пунктам значыўся рух да рубяжа 3-5% ў год, які рабіў інфляцыю прымальнай для грамадства. Бацька польскіх рэформ лічыў рэальным выхад на дадзены рубеж да пачатку другой паловы дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя. Па слушным меркаванні гэтага буйнога эканаміста, інфляцыя у 3-5% у год дазваляла стварыць цывілізаванае рынкавае асяроддзе, устойлівыя механізмы самарэгуляцыі ў рамках рынкавай гаспадаркі. Самарэгуляцыя павінна была перш за ўсё тычыцца цэнаўтварэння. Гарантам гэтай самарэгуляцыі выступаў рашучы курс дзяржавы на дэцэнтралізацыю сістэмы эканамічнага кіравання, на максімальную свабоду суб'ектаў гаспадарання, якая абмяжоўвалася б толькі логікай дзеяння аб'ектыўных эканамічных законаў. Дзякуючы жорсткаму акцэнту на стымулюючую функцыю падаткаабкладання, інтэнсіўнай перабудове крэдытнай палітыкі на грунце рынкавых механізмаў рэзка павялічылася колькасць суб'ектаў гаспадарання. Л. Бальцэровіч не менш жорстка ставіў пытанне аб вызваленні польскай народнай гаспадаркі ад такой абузы, як прадпрыемствы – банкруты. На яго думку, манаполія павінна была саступіць месца нармальнай, здаровай канкурэнцыі. Бальцэровіч лічыў, што трэба пакласці канец манаполіі дзяржаўных банкаў, дзяржаўных структур, якія вызначалі палітыку на фінансавых рынках. Віцэ-прэм'ер прапанаваў таксама актыўна прыцягваць замежныя інвестыцыі. Усе адзначаныя моманты плана Бальцэровіча абапіраліся на моцны прававы базіс, што трэба паставіць у заслугу сейму і сенату.

План Бальцэровіча ўпісваўся ў мадэль «капіталізму без прыметнікаў». Гэта мадэль часам называецца «шокавай тэрапіяй».

Адзначым, што ў аналізуемым плане не былі прапісаны рэцэпты на выпадак узнікнення ўсіх магчымых складаных сітуацый у народнагаспадарчым комплексе. У працэсе ажыццяўлення рэформ аператыўна рабіліся ўдакладненні па шэрагу пазіцый. Канешне, выкарыстоўваўся і метад проб і памылак.

Ужо ў 1992 годзе можна было канстатаваць, што рэформы даюць першыя станоўчыя вынікі. Прадпрымальніцкі корпус, які вельмі актыўна падтрымліваў свае пазіцыі дзякуючы прэферэнцыям дзяржавы, паўсюдна дасягнуў таго, што прапанова тавару перавышала попыт на яго. Больш за тое, стала набіраць шырокія маштабы асваенне ім замежных рынкаў.

Разам з тым, трэба мець на ўвазе, што план Бальцэровіча прадугледжваў звядзенне да мінімуму колькасці ўтрыманцаў, гэта значыць грамадзян, якія разлічваюць выключна на дзяржаву, а не на сябе; рэзкае скарачэнне рэсурснай базы для падтрымкі палякаў, якія працавалі ў бюджэтнай сферы, на пачатковай

стадыі эканамічнага рэфарміравання. Да сярэдзіны 1990-ых гадоў нарошчванне дадзенай базы ніяк не прасочвалася, што выклікала сацыяльную напружанасць у суседняй краіне. Неакансерватары на чале з Л. Валенскай, змагаючыся з гіперінфляцыяй, аператыўна выключаючы з народнагаспадарчага комплексу прадпрыемствы-банкруты, у той жа час фактычна не ўключалі ў лік прыярытэтаў сацыялізацыю рынкавых пераўтварэнняў.

Натуральна, рэаліі жыцця запатрабавалі новага падыходу. Навукоўцы, палітыкі сталі называць яго градуалістычным. Аўтары градуалістычных канцэпцый выступалі за моцную сацыяльную палітыку польскай дзяржавы, якая разам з тым не супярэчыла б заканамернасцям развіцця рынкавай гаспадаркі. Яны належалі левацэнтрысцкім сілам, якія падтрымалі кандыдатуру лідэра Сацыял-дэмакратыі Рэспублікі Польшча Аляксандра Кваснеўскага на прэзідэнцкіх выбарах 1995 года. А. Кваснеўскі атрымае перамогу. Яго першая пяцігодка прынясе значныя станоўчыя вынікі для краіны. Як мінімум на 6 працэнтаў павялічваўся кожны год ключавы паказчык развіцця народнагаспадарчага комплексу — валавы унутраны прадукт (ВУП). Завяршылася фарміраванне структуры ВУП, якая характэрна для постіндустрыяльных краін. На мяжы XX-XXI стст. эканамічна актыўнае насельніцтва, якое занята ў абслугоўваючых галінах, гарантавала сваёй краіне без малага 70% ВУП. Калі ўзяць увесь корпус працадацеляў і працаатрымальнікаў у агульнапольскіх маштабах, то на сферу абслугоўвання прыпадала 44%. Болей за чвэрць ВУП можна было запісаць у актыў работнікаў прамысловасці. Палякі, якія маюць дычыненне да прамысловасці і будаўніцтва, у агульнай кольскасці працадацеляў і працаатрымальнікаў былі прадстаўлены трыццаццю працэнтамі.

Доля аграрыяў складала 26%. Дарэчы, апошнія стваралі 5 працэнтаў ВУП. У 2000 годзе, годзе чарговых прэзідэнцкіх выбараў, вартасць ВУПа давала падставу для наступнага разліку: без малага 7000 амерыканскіх долараў на сярэднестатыстычнага паляка. Ні за першую, ні за другую пяцігодку А. Кваснеўскага не было такога года, калі б статыстычныя службы заяўлялі аб тым, што інфляцыя дасягнула рубяжа ў 10%. Працягваўся працэс прыцягнення замежных інвестыцый. За 10 год сістэмных пераўтварэнняў (1989-1999гг.) у польскую эканоміку было ўкладзена замежнымі партнёрамі 35.5 млрд. амерыканскіх долараў. Напрыканцы 1990-ых гадоў рэальна функцыянавала 17 свабодных эканамічных зон (СЭЗ). У гэты ж час толькі дзесятая частка гандлёвых і будаўнічых прадпрыемстваў была дзяржаўнай, удзельная вага дзяржавы ў прамысловым комплексе не перавышала 40%. Дарэчы, мабільнасць, аператыўнасць дзяржаўнай прамысловай палітыкі праявілася перш за ўсё ў тым, што найбольшую дынаміку набыў пераапрацоўчы комплекс, страчваў пазіцыі адназначна базіснага комплекс, які быў традыцыйна жорстка зацыклены на сусветнай коштавай кан'юнктуры ў той частцы, якая тычыцца сыравіны і энерганосьбітаў. Безумоўна, такія паказчыкі ў значнай ступені прадвызначылі пераабранне А. Кваснеўскага кіраўніком дзяржавы на новы тэрмін у снежні 2000 г.

Важным фактарам развіцця польскай эканомікі з'яўляецца наяўнасць значнай рэсурснай базы. Дынамічна развіваюцца Верхнесілезскі і Ніжнесілезскі басейны каменнага вугалю. Напрыканцы XX – пачатку XXI стст. гарнякі выдаюць штогод на-гара звыш за 100 млн. тон гэтага віду паліўных рэсурсаў, прычым з гэтага аб'ёму без малага чвэрць ідзе на экспарт. Па пастаўках каменнага вугалю краіна ўстойліва ўтрымлівае другую пазіцыю сярод усіх краін – экспарцёраў дадзенай таварнай пазіцыі. Моцным аргументам Цэнтральнай, Заходняй Польшчы з'яўляецца наяўнасць у дадзеных рэгіёнах басейнаў па дабычы бурага вугалю. Дадзеная галіна паліўна-энергетычнага комплексу адзначана менш значнымі, але неблагімі паказчыкамі. У апошнія гады дабыча бурага вугалю не апускалася ніжэй за 60 млн. тон.

Аднак нельга ідэалізаваць сучасны рэсурсны патэнцыял РП. Яна меней чым напалову сама забяспечвае свае патрэбы ў нафце. Патынне аб без малага 40% адпаведных патрэбнасцей закрываецца, дзякуючы пастаўкам з Расійскай Федэрацыі. Ядро нафтаперапрацоўчага комплексу сканцэнтравана на прадпрыемствах, размешчаных у Плоцку, Гданьску. Аб сур'ёзных поспехах у развіцці гэтай галіны сведчыць адсутнасць праблем з забеспячэннем суб'ектаў гаспадарання, насельніцтва бензінам, дызельным палівам, мазутам. Польшча вельмі моцна залежыць ад Расіі па аднаму з ключавых элементаў сістэмы энерганосьбітаў — прыроднаму газу. Дакладна кажучы, асноўная частка прыроднага газу, якая выкарыстоўваецца ў гэтай краіне, мае расійскае паходжанне. Астатняя частка грунтуецца па дзвюх польскіх крыніцах: 1) перадкарпацкай; 2) балтыйскай. Апошнія крыніцы даюць краіне ў пачатку XXI стагоддзя штогод меней за 5 млрд $м^3$ прыроднага газу. Неад'емнымі састаўнымі часткамі польскай электрычнай гаспадаркі з'яўляюцца цеплаэлектрастанцыі (ЦЭС), гідраэлектрастанцыі (ГЭС). У гэтай гаспадарцы доля ГЭС нікчэмная. У асноўным размова ідзе аб ЦЭС. Вынікі працы дадзенай галіны напрыканцы XX ст. – пачатку XXI ст. (штогод польскія спажыўцы электраэнергіі атрымліваюць ад уласных ЦЭС і ГЭС не меней за 140 млрд кВт гадзін) даюць падставы казаць аб яе істотным укладзе ў гарантаванне энергетычнай бяспекі краіны.

У структуры прамысловасці важнае месца займае металургія, прычым у краіне закладзены трывалы базіс для развіцца як чорнай, так і каляровай металургіі. Польшча арыентуецца на шырокую геаграфію імпарцёраў жалезнай руды, знайшоўшы ў гэтым плане яснае паразуменне як з еўразійскімі, так і лацінаамерыканскімі партнёрамі. Украінскія, расійскія, шведскія, бразільскія дабываючыя прадпрыемствы разглядаюць польскі рынак як стабільны, доўгатэрміновы, перспектыўны. Жалезная руда трапляе на металур-гічныя камбінаты "Катавіцы" (г. Дамброва-Гурнічы), "Нова-Гута" (г. Кракаў), сталеплавільныя прадпрыемствы (Варшава, Сталёва-Воля, Глівіцы і г.д.). У пачатку XXI стагоддзя краіна атрымлівае ад сваіх металургаў штогод не меней за 9 млн. тон сталі і 6 млн. тон пракату.

У адрозненне ад чорнай металургіі польская каляровая металургія ў намнога меншай ступені залежыць ад кан'юнктуры на сусветным сыравінным рынку. Чаму? Адказ просты. Яго трэба шукаць у наяўнасці айчынных сыравінных запасаў, што і вызначыла наступныя прыярытэты ў развіцці аналізуемай галіны: свінцова-цынкавая прамысловасць, медная прамысловасць. Першы з названых прыярытэтаў тычыцца Сілезска-Кракаўскага басейна, атаясамляецца з такімі гарадамі: Бытам, Глогаў, Лягніца. Пачатковае звяно ў ланцужку (здабыча) пачынаецца ў Бытаме, наступнае звяно ўключае вытворчы цыкл (перапрацоўку) у Глогаве, Лягніцы. Такі ж ланцужок выразна прасочваецца адносна медзі ў паўднёва-заходняй частцы Рэспублікі Польшча. Напрыканцы XX ст. — пачатку XXI стагоддзя канчатковы вынік вытворчага працэсу ўвасабляецца ў паўмільённым паказчыку, які прадвызначае ўпэўненае лідэрства Польшчы па дадзенай пазіцыі. Суб'екты гаспадарання, якія маюць дачыненне да каляровай металургіі, займаюцца таксама выплаўкай тых металаў, якіх на айчыннай тэрыторыі або мала, або няма зусім. Размова, напрыклад, ідзе пра серабро, кадмій, кобальт, ванадый, золата.

У рэсурснай базе прамысловасці важнае месца займаюць таксама сера, каменная соль, барый.

Ёсць падставы вылучыць шэраг аспектаў пры аналізе польскага машынабудавання.

Аспект першы. Кожны трэці паляк, які мае непасрэднае дачыненне да прамысловасці, — работнік машынабудаўнічага комплексу.

Другі аспект. Адметнай рысай дадзенага сектара эканомікі з'яўляецца шматгаліновая структура. Таму зместам працы машынабудаўнікоў з'яўляецца задавальненне ў пэўнай ступені попыту на мноства таварных пазіцый: легкавыя аўтамабілі, грузавыя аўтамабілі, марскія судны, рачныя судны, лакаматывы, вагоны, матацыклы, веласіпеды. Дадзены пералік можна прадоўжыць.

Трэці аспект. Польскі машынабудаўнічы комплекс мае шырокую геаграфію: Бельска-Бяла, Быдгашч, Варшава, Вроцлаў, Гданьск, Гдыня, Жэшнаў, Кельцэ, Люблін, Познань, Свіднік, Старахавіцы, Шчэцін).

Чацвёрты аспект. У прамысловых сектарах шэрагу гарадоў аднaчасова прадстаўлены розныя галіны машынабудавання (Варшава, Быдгашч, Познань, Свіднік).

Пяты аспект. Машынабудаванне не здольна максімальна забяспечыць патрабаванні айчынных спажыўцоў.

Польскія вытворцы таксама пастаўляюць на рынак станкі, тэхніку, патрэбную аграрыям, дарожнікам, пральныя, швейныя машыны, пыласосы, тэлевізары, хімічныя валокны, шыны, фарбы, лекі, мэблю, тканіны, абутак, цыгарэты, папяросы, масла, гарэлку, піва.

А зараз пяройдзем да характарыстыкі сельскай гаспадаркі краіны. Калі ўвесь зямельны фонд Польшчы прыняць за 100%, то нямногім болей за 40% яго складае няворыўная частка і без малага 60% — ворыўная. У гектарным выражэнні апошняя частка раўняецца васемнаццаці мільёнам пяцістам тысячам гектараў. У сучаснай польскай вёсцы цэнтральная месца займаюць суб'екты гаспадарання, якія па аб'ему асноўнага і абаротнага капіталу вельмі далёка адстаюць ад бізнес-эліты гэтай краіны. Калі мець на ўвазе той зямельны фонд, які можна прадставіць як аб'ект апрацоўкі, то без малага палова яго размяркоўваецца паміж такога кшталту суб'ектамі з рэсурснай базай меней за 5 га. Суб'екты гаспадарання, якія працуюць на зямлі, перш за ўсё вырошчваюць пшаніцу, жыта, ячмень, авёс, трыцікале, зернебабовыя. Першаступеннае значэнне надаецца пшаніцы, жыту. Штогод польскія земляробы адводзяць пад кожную з гэтых культур не менш за дванаццаць працэнтаў усёй ворнай зямлі. На ячмень прыпадае не менш за шэсць з паловай працэнтаў, на зернебабовыя — не менш за сем з паловай. Доля аўса і трыцікале ў ворным зямельным фондзе складае не меней за 3%. У апошнія гады адзначаецца даволі высокая ўраджайнасць па стратэгічнай культуры — пшаніцы — не меней за 35 ц з гектара. Увогуле па ўсёй масе збожжавых сярэдні паказчык ураджайнасці ( не меней за 28 ц з гектара) таксама неблагі.

Польскія земляробы адводзяць пад бульбу 7% ворыўнага фонду. Яны штогод збіраюць з аднаго гектара не менш за 200 цэнтнераў дадзенай культуры.

Сярод суб'ектаў гаспадарання, якія арыентуюцца на раслінаводства, ёсць і тыя, што спецыялізуюцца па тэхнічных культурах. Сярод апошніх лідзіруючае становішча займаюць цукровыя буракі. У апошнія годы ўраджайнасць дадзенай культуры не падала ніжэй адзнакі 400 ц з гектара. Агульны збор таксама неблагі — не меней за 16 мільёнаў тон. Польскія земляробы вырошчваюць таксама рапс, лён, тытунь.

Разбор раслінаводчага блока сельскай гаспадаркі РП працягнем паказчыкамі, якія сведчаць аб тым, наколькі палякі ў пачатку XXI стагоддзя штогод задавальнялі свае патрэбы, па-першае, у гародніне і, па-другое, у пладах, ягадах. Па абедзвюх пазіцыях паказчыкі валавога збору зусім здавальняючыя: адпаведна не меней за 5 млн. т і не меней за 2,5 млн. т.

Ёсць падставы высока ацэньваць у колькасных і якасных адносінах вынікі працы суб'ектаў гаспадарання аграрнай сферы ў той частцы, якая тычыцца хмелю, фасолі.

Дынамічна развіваецца і жывёлагадоўчая галіна польскай сельскай гаспадаркі. Базісныя элементы яе структуры: 1) вытворчасць мяса; 2) вытворчасць малака. Выдатная інфраструктура, устойлівая ўцягненасць галіны ў рынкавыя адносіны даюць магчымасць для эфектыўнага выкарыстоўвання наяўнага фонду, які вымяраецца ў мільёнах галоў. У гэтым фондзе самая вялікая лічба (18) мае дачыненне да свіней, утрая меншая (6) — да буйной рагатай жывёлы; колькасці свіней і авечак, коз суадносяцца як 36 да 1. У структуры буйной рагатай жывёлы ключавое месца займаюць каровы (не меней за 50%). Сучасны ўзровень развіцця базісных элементаў жывёлагадоўлі дае магчымасць сярэднестатыстычнаму паляку максімальна ўжываць штогод нямногім болей за трыццаць кілаграм мяса, трыста кілаграм малака. Дарэчы, кожная сярэднестатыстычная карова, якая належыць польскім суб'ектам гаспадарання, дае на працягу аднаго астранамічнага года 3506 літраў малака. За той жа перыяд жывёлаводы патэнцыяльна забяспечваюць кожнага суайчынніка 200 яйкамі, 25 грамамі воўны.

Такім чынам, польскія аграрыі гарантуюць сваёй краіне харчовую бяспеку.

Вопыт сведчыць, што ўладныя структуры краіны адэкватна ўсведамляюць значэнне ключавога элемента інфраструктуры — транспарту. Безумоўна, пры распрацоўцы стратэгіі развіцця транспартнай галіны сыходзяцца і геапалітыка, і ваенныя меркаванні, і неабходнасць мець моцную інфраструктуру для функцыянавання рынкавай гаспадаркі, і ўлік шчыльнасці насельніцтва. Безумоўна, улічваецца тое, што Польшча выконвае ролю маста паміж Заходняй Еўропай і постсавецкай прасторай, што межы Польшчы з дзяржавамі СНД ёсць аднačасова межы Еўрасаюза, што Польшча — марская дзяржава, што Польшча залежыць ад іншых дзяржаў па пэўных энерганосьбітах, што нямалую частку тэрыторыі складаюць рэкі і азёры. Даволі высокай у параўнанні з Беларуссю, Украінай, а тым больш з Расіяй, з'яўляецца сярэдняя шчыльнасць насельніцтва на адзін квадратны кіламетр. Напрыклад, такія паказчыкі па Беларусі і Польшчы адпаведна 48,2 чалавека і 123,8 чалавека. Калі мець на ўвазе змест працы транспарту, гэта значыць, перавозку людзей, грузаў, то адпаведныя штогадовыя паказчыкі сведчаць аб устойлівым лідэрстве аўтатранспарту. Аўтамабілісты перавозяць удвая больш грузаў, чым чыгуначнікі. І гэта пры тым, што і першыя, і другія, разам узятыя, закрываюць аб'ём перавозак амаль на чатыры пятыя. Яшчэ больш унушальным — болей чым у два з паловай разы — з'яўляецца разрыў паміж аўтатранспартам і чыгуначным транспартам па аб'ёмах пасажырскіх перавозак. Дарэчы, доля ў гэтым аб'ёме іншых транспартных сродкаў зусім нязначная.

Звыш за 60 караблёў плаваюць пад польскім сцягам. Яны пачынаюць плаванне ў Гданьску, Гдыні, Калобжагу, Шчэціне, Свінауйсце, другіх партовых гарадах. Ключавымі пунктамі для заходу рачных судоў з'яўляюцца Варшава, Глівіцы, Вроцлаў.

Польскі транспартны комплекс уключае таксама газаправоды, нафтаправоды.

І, нарэшце, праца 74 аэрапортаў у многім прадвызначае агульны аб'ём авіяперавозак.

Аналіз сучаснага стану польскай эканомікі быў бы няпоўны без паказу ўмення польскіх улад прыстасаваць турысцкую галіну да рэалій рынкавай эканомікі. Дзеля гэтага створана аптымальная арганізацыйная структура, сфарміравалася інфраструктура, якая адэкватна ўсім агульнапрынятым стандартам. Для прасочвання дынамікі ў развіцці замежнага турызму на польскай зямлі возьмем два кантрольныя рубяжы. Першы рубеж — 1990 год, другі рубеж — 2000 год. Паміж гэтымі рубяжамі ляжаць дзесяць год сістэмных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у краіне. У 1990 годзе кампетэнтныя органы зарэгістравалі ў Рэспубліцы Польшча тры мільёны чатырыста тысяч замежных турыстаў, у 2000 годзе — на чатырнаццаць мільёнаў болей. Зараз у глабальным

маштабе толькі 11 дзяржаў маюць адпаведны паказчык, лепшы, чым у палякаў, а ў Старым Свеце — 7. Калі перавесці ўсю валютную масу, якая штогод становіцца здабыткам польскай дзяржавы у доларах ЗША, то можна пэўна сказаць, што кожны пяты долар, унесены з кішэняў турыстаў, якія наведалі РП

### *3.2. Праблемы сацыяльнай абароны грамадзян ва ўмовах эканамічнага рэфарміравання*

Асвятленне дадзенага пытання важна распачаць з праблемы беспрацоўя

«Да 1990 года беспрацоўе было невядома ў Польшчы, але жорсткія законы рынкавай экономікі неўзабаве распачалі ўплываць на рынак занятасці. Беспрацоўе з'явілася ў 1990 годзе і закранула 1,1 млн. чалавек або 6.3% эканамічна актыўнага насельніцтва. Яно выйшла на пікавую велічыню і стабілізавалася ў 1994 годзе на ўзроўні 2,9 млн. чалавек або 16% працаздольнага насельніцтва і з гэтага моманту пачало зніжацца. Аднак з 1998 года беспра-цоўе зноў стала расці, галоўным чынам як вынік накіраваных на павышэнне прадукцыйнасці працы і канкурэнтаздольнасці прамысловых пераўтварэнняў і структурных змен на прадпрыемствах. Яшчэ адным фактарам стаў эканамічны спад, які распачаўся ў 1998 годзе ў асноўным як вынік мерапрыемстваў у сферы грашовай палітыкі, нацэленых на зніжэнне інфляцыі, у тым ліку ўсталявання высокіх працэнтных ставак»[1]. "Напрыканцы 2000 года колькасць беспрацоўных дасягнула 2.7 млн. чалавек або 15% ад усяго працаздольнага насельніцтва. Напрыканцы 2001 года колькасць беспрацоўных склала 3115 тыс. чалавек, што давала норму беспрацоўя 17.4%"[2].

На працягу трох год, якія папярэднічалі сярэдзіне верасня 2004 г., у Польшчы было як мінімум 3 млн. беспрацоўных. І, нарэшце, наступіў момант, калі ў Польшчы стала меней за 3 млн. беспрацоўных. «У сярэдзіне верасня работы не было ў 2995 тыс. чалавек.»[3]

У апошнія гады больш за адзін год застаюцца непрацаўладкаванымі 1,21 млн. чалавек, прычым 80% з іх пазбаўлены правоў на дапамогу па беспрацоўю.»[4]

Імкнучыся павялічыць занятасць, (улады. – М.С.)... павышаюць гнуткасць працоўнага заканадаўства.

(Зараз прасочваюцца такія. – М.С.) змены у гэтай галіне...:

змяншаюцца абмежаванні на заключэнне з работнікамі тэрміновых працоўных дамоў;

больш выгадным для працадацеляў становіцца спосаб разліку працоўнага часу і выплаты дапамогі па хваробе;

больш выгадным для працадацеляў становіцца разлік зарплаты за працу у звышурочны час.

(Адбываецца. – М.С.) рэарганізацыя ўстаноў, якія займаюцца пасрэдніцтвам у працаўладкаванні, у накіраванні павелічэння намаганняў у галіне прафесійнай актывізацыі асоб, якія шукаюць працу.(Улады чакаюць. — М.С.)... істотны прырост занятасці ў сельскай мясцовасці шляхам стварэння новых працоўных месцаў па-за сельскай гаспадаркай, пры ажыццяўленні праграм лесапасадак, развіцця дробнага прадпрымальніцтва і шматфункцыянальнага асвойвання сельскай мясцовасці, шляхам павелічэння занятасці ў галінах, якія звязаны з інфраструктурай сяла."[5]

---

[1] Как делать бизнес в Польше. — Варшава: Бюро поддержки инвестиций и технологии ЮНИДО в Варшаве, 2001. С. 20-21.

[2] Польша - твой экономический партнёр. — Варшава: Институт коньюктуры и цен внешней торговли, 2002. С. 31.

[3] Кулерский В. Хроника (некоторых) текущих событий// Новая Польша: — 2004. — №11.

[4] Как делать бизнес в Польше. — Варшава: Бюро поддержки инвестиций и технологии ЮНИДО в Варшаве, 2001. С.21

[5] Польша – твой экономический партнер. — Варшава: Институт коньюнктуры и цен внешней торговли, 2002.С.31

Сярод беспрацоўных «вялікую групу складаюць выпускнікі навучальных устаноў. У многіх ёсць добрыя прафесійныя навыкі, але працу знайсці цяжка, таму што ранейшая сістэма працоўнай падрыхтоўкі не ўлічвала змяненняў попыту на канкрэтныя спецыяльнасці.»[6] Зараз уладныя структуры рэалізоўваюць «спецыяльны пакет «першая праца», які мае за мэту абмежаваць беспрацоўе і актывізаваць гэтую сацыяльную групу.

Гэты пакет прадугледжвае, у прыватнасці , наступныя меры:

– зніжэнне выдаткаў на аплату працы маладых спецыялістаў у малых і сярэдніх прадпрыемствах шляхам часовага вызвалення працадацеляў ад уплаты часткі налічэнняў на іх заработную плату;

– ільготы для выпускнікоў пры заснаванні фірмы ў выглядзе адтэрміноўкі ўплаты падаткаў і страхавых плацяжоў;

– уключэнне ў праграмы заняткаў школ і ВНУ па азнаямленню з правіламі заснавання ўласных фірм і самазанятасці,... у ВНУ арганізуюцца спецыяльныя цэнтры кар'еры, якія займаюцца пошукам працы для выпускнікоў і аказваюць ім прафесійныя паслугі ў галіне кансалтынгу;

Адной з формаў падрыхтоўкі выпускнікоў да працоўнай дзейнасці з'яўляецца валантарыят, г. зн. праца на грамадскіх пачатках у няўрадавых арганізацыях і ў розных арганізацыях публічнага сектара.

Валанцёры павінны мець права на ўплату за іх страхавых узносаў і вяртанне іншых выдаткаў, напрыклад, прадугледжваецца , што набыты прафесійны вопыт вельмі спатрэбіцца ім у будучай кар'еры.»[7]

«Сёння паляк зарабляе ў сярэднім каля 500 долараў у месяц. Напрыканцы 80-х яму плацілі каля 30 долараў. У гэтых адносінах разрыў паміж Польшчай і Захадам скарачаецца хутчэй усяго. У пачатку разглядаемага перыяду цэны раслі таксама хутка, але з кожным годам іх рост усё больш адставаў ад росту зарплаты.»[8]

І ўсе ж такі заробкі палякаў істотна меншыя, чым у шэрагу іншых краін Еўрасаюза. Праўда, «параўнальна нізкі сабекошт рабочай сілы і высокакваліфікаванай працы з'яўляюцца важнымі фактарамі для патэнцыяльных замежных інвестараў, асабліва ў рэгіёнах з даўнішнімі прамысловымі традыцыямі.»[9]

«Сярэдняя польская сям'я выдаткоўвае ў месяц 1700 злотых (568 зл. на чалавека). Палова гэтай сумы ідзе на штодзённыя бытавыя патрэбы, з іх 656 злотых – на харчаванне і 372 – на плату за кватэру і камунальныя паслугі. Большасці палякаў не ўдаецца адкладваць грошы. Назапашваннем займаюцца, галоўным чынам, людзі адзінокія, прадпрымальнікі і пенсіянеры.»[10]

Юрыдычны грунт для ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы здароўя закладзены ў Канстытуцыі 1997 г., Дзяржаўным статуце 1998 г. Апошні дакумент рэгулюе выключна тыя пытанні, якія маюць дачыненне да дадзенай галіны.

Кожны паляк, на якога дзяржаўнымі законамі распаўсюджваецца падаткаабкладанне, уносіць уклад у фінансавую падпітку Кас хворых. Звычайна гэтыя касы класіфікуюцца як па рэгіянальнай, так і па галіновай адзнаках. Дзяржава забяспечвае іх існаванне з дапамогай падатковага рычага. Змадэ-ліруем наступную сітуацыю. Варшаўскі прадпрымальнік Тадэвуш Валіхноўскі атрымаў даход у суме 100000 еўра. 7,5% ад дадзенай сумы, гэта значыць 7500 еўра ён уносіць для патрэб Кас хворых.

---

[6] Как делать бизнес в Польше. — Варшава: Бюро поддержки инвестиций и технологии ЮНИДО, 2001. С.21

[7] Польша – твой экономическій партнер. — Варшава: институт коньюнктуры и цен внешней торговли, 2002.С.31

[8] Кулерский В. Хроника (некоторых) текущих событий// Новая Польша. – 2005.— №2.С.19

[9] Как делать бизнес в Польше. — Варшава: Бюро поддержки инвестиций и технологии ЮНИДО в Варшаве, 2001. С.22.

[10] Кулерский В. Хроника (некоторых) текущих событий// Новая Польша. – 2004. — №9.С.31.

Менавіта такую ж долю ад уласных даходаў плацяць усе, хто іх атрымлівае. Кожная Каса хворых – юрыдычная асоба. Яна аўтаномна ў сваіх унутраных справах.

У посткамуністычнай Польшчы пастаянна павялічваецца колькасць суб'ектаў прадастаўлення медыцынскіх паслуг, якія не атрымліваюць аніякіх датацый з дзяржаўнага бюджэту. Тыповымі для сучаснай Польшчы з'яўляюцца сітуацыі, калі грамадзяне з уласнай кішэні аплачваюць прафілактыку, лячэнне, рэабілітацыю.

А зараз варта прывесці дадзеныя, якія сведчаць аб эфектыўнасці сістэмы аховы здароўя у РП. Пацыенты лечацца ва ўстановах, якія маюць 210555 бальнічных ложкаў. Урачэбны корпус налічвае 86926 чалавек. Гэта адпавядае агульнапрынятым стандартам. У пачатку XXI стагоддзя ў краіне штогод нараджаецца ў сярэднім 391740 чалавек, а памірае 367630. Як вынік натуральны прырост складае 24110 чалавек, гэта значыць нямногім меней за 0,1%. За апошнюю трэць стагоддзя Польшчы ўдалося выйсці на ўзровень постіндустрыяльных краін па паказчыках уходу з жыцця юных грамадзян. У пачатку эры Э.Герака ён быў роўны 3 %, а ў наш час набліжаецца да 1%. Вышэй сталі ўзроставыя рубяжы, на якіх абрываецца жыццё сярэднестатыстычных палякаў і полек. Для першых размова ідзе аб тым узросце, калі яны амаль набліжаюцца да размену восьмага дзесятка, для другіх – аб рубяжы, пасля якога толькі тры пункты аддзяляюць ад размену дзевятага дзесятка.

Польшча ўступіла ў 1999 год з кардынальнымі зменамі ў стане пенсіянераў. Размова ішла аб галоўнай крыніцы іх даходаў – пенсіях. Да 1 студзеня 1999 г. пенсія канкрэтнага пажылога паляка набывала рэальныя абрысы, дзякуючы выключна размеркавальнаму прынцыпу, што, дарэчы, было характэрна для сацыялістычных часоў. Захаванне такога стану спраў магло ў доўгатэрміновай перспектыве абярнуцца рэзка адмоўнымі наступствамі для польскай эканомікі, для дабрабыту пенсіянераў.

Канешне, распрацоўшчыкі пенсіённай рэформы мелі рацыю, калі вырашылі спачатку зыходзіць з размеркавальнага прынцыпу.Змадэліруем наступную сітуацыю. Эканамічна актыўны паляк зарабляе 1000 еўра ў месяц. 122,2 еўра, гэта значыць 12,22% ад сумы заработку ён уносіць на рахунак упраўлення сацыяльнага страхавання (УСС), што трактуецца ім як рэалізацыя размеркавальнага прынцыпу. Адначасова гэта асоба праводзіць тую ж самую аперацыю ў адносінах да 73 еўра, гэта значыць да 7,3% ад сумы заробку. У дадзеным выпадку ў дачыненні дадзенага паляка да УСС набывае рэальныя абрысы другі прынцып – прынцып назапашвання. Назапашванне арганічна звязана з полем дзейнасці markdown рознага кшталту пенсійных фундацый. Такіх фундацый 21. Зразумела, накапляльны элемент становіцца аб'ектам пераводу з рахунку УСС на рахунак канкрэтнай фундацыі. Зараз на рахунку ўсіх названых фундацый звыш за 12 млрд. злотых. У польскім заканадаўстве выразна прапісаны механізм іх функцыянавання ў якасці суб'ектаў гаспадарання. Ключавая роля належыць пенсійным таварыствам. Аб'ект іх інтарэсу – сегмент рынку, у якім у якасці суб'ектаў інвестыцыйнай актыўнасці прадстаўлены выключна фундацыі. Па логіцы рэчаў, любое пенсійнае таварыства зацікаўлена ў тым, каб дзякуючы дадзенай актыўнасці, нарошчваць уласныя фінансавыя рэсурсы. Выкарыстанне не меней за 3/5 наяўных капіталаў зрабіла гэтыя таварыствы трымальнікамі аблігацый, а пасля адпаведнага накіравання звыш за 3 млрд. злотых яны сталі і ўладальнікамі акцый.

Дзяржава разглядае дзейнасць аналізуемых фундацый у рэчышчы ўмацавання сацыяльнай абароны 1 мільёна палякаў, на грошы якіх утвараецца іх стартавы капітал. У гэтым плане вельмі эфектыўна дзейнічае упраўленне нагляду над пенсійнымі фундацыямі (УНПФ). УНПФ пільна сочыць за тым, каб у кіруючых органах фундацый правілы гульні не вызначаліся польскімі Маўродзі, каб любы суб'ект унясення ўзносаў меў прырашчэнне з кожнага ўкладзенага злотага.

Прааналізаваныя намі "два абавязковыя кампаненты новай пенсійнай сістэмы ў многім падобныя: той жа прынцып адлічэння ўзносаў ва ўсталяванай законам прапорцыі, тыя ж асабістыя рахункі, той жа пенсійны ўзрост, пенсіі ў форме штогадовых выплат і гарантаваная мінімальная дапамога.

У гэтай сувязі трэці – добраахвотны кампанент – дазваляе ўнесці разнастайнасць у арганізацыйныя прынцыпы і формы ўдзелу і больш гнутка прыстасавацца да асабістых пераваг грамадзян. Тут дзейнічае прынцып назапашвання будучай дапамогі шляхам узносаў у страхаванне жыцця, пенсійныя, інвестыцыйныя і працоўныя фундацыі. Працадаўцы маюць права ствараць працоўныя і пенсійныя фундацыі і фундацыі ўзаемнага страхавання на грунце поўнай добраахвотнасці. Узносы робяцца пасля вылічэння падаткаў, а выплачваемыя дапамогі свабодныя ад падаткаабкладання...

Яшчэ адзін важны аспект трансфармацыі пенсійнай сістэмы – гэта ануляванне шырокага спіса прафесійных прывілеяў."[11]

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Ці ўтрымліваў план Л. Бальцэровіча універсальны рэцэпт пераадолівання гіперінфляцыі?
2. Ці ёсць падставы лічыць сучасную Польшчу постіндустрыяльнай краінай?
3. Ці ёсць у сучаснага польскага ўрада жыццяздольны план вырашэння праблемы беспрацоўя?
4. Які ўплыў можа аказаць адміністрацыйная рэформа ў посткамуністычнай Польшчы на яе эканоміку?
5. Чаму ў Польшчы адносна танная рабочая сіла?

**Тэст – заданні:**

1. Памер замежных інвестыцый, укладзеных у польскую эканоміку ў 1989 – 1999гг. —

а) 35,5 млрд. долараў;
б) 40 млрд. долараў;
в) 50 млрд. долараў.

2. Доля польскай дзяржавы ў прамысловым комплексе не перавышае

а) 30%; б) 40%; в) 50%.

3. Польскія гарнякі ў пачатку XXI ст.штогод выдаюць на-гара тон каменнага вугалю.

а) звыш за 200 млн. тон; б) звыш за 100 млн. тон;в) звыш за 300 млн. тон.

4. Доля ГЭС у польскай электрычнай гаспадарцы

а) пераважная; б) значная; в) нікчэмная.

5. Ворыўная частка зямельнага фонду Польшчы складае

а) без малага за 60%; б) болей за 70%; в) меней за 40%.

6. Колькі караблёў плавае пад польскім сцягам?

а) звыш за 60; б) каля 50; в) каля 40.

7. Сярод відаў транспарту ў Польшчы па аб`ёмах перавозкі людзей, грузаў лідзіруе

а) аўтатранспарт; б) чыгунка; в) маркскі транспарт.

8. Урачэбны корпус Польшчы налічвае

а) 86926 чалавек; б) 90324 чалавек; в) 100011 чалавек.

---

[11] Как делать бизнес в Польше. – Варшава: Бюро поддержки инвестиций и технологий ЮНИДО в Варшаве, 2001. С.47

9. Натуральны прырост у сучаснай Польшчы складае

а) нямногім меней за 0,1%;

б) нямногім болей за 0,2%;

в) каля 0,4%.

10. Які працэнт ад сумы заробку эканамічна актыўны паляк уносіць на рахунак Упраўлення сацыяльнага страхавання?

а) 10,41%; б) 12,22%; в) 13,11%.

11. Колькі пенсійных фундацый налічваецца ў Польшчы?

а) 30; б) 29; в) 21.

12. Сярэдні заробак сёняшняга паляка ў месяц —

а) каля 400 долараў;

б) каля 800 долараў;

в) каля 500 долараў.

13. Які працэнт ад даходу эканамічна актыўны паляк ўносіць для патрэб Кас хворых?

а) 6%;

б) 7,5%;

в) 8%.

14. Сярэдняя працягласць жыцця польскіх жанчын —

а) 70 гадоў;

б) 85 гадоў;

в) 77 гадоў.

15. Калі ў Польшчы было звыш за 3 млн. беспрацоўных?

а) з канца 2001г. па верасень 2004г.;

б) з лютага 1991г. па сакавік 1994г.;

в) з красавіка 1995г. па снежань 1999г.

*Лекцыя чацвёртая*

## АСНОВЫ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ СІСТЭМЫ. УНУТРАНАЯ І МІЖНАРОДНАЯ ПАЛІТЫКА

***План:***

4.1. Выканаўчая, заканадаўчая і судовая ўлада.
4.2. Палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі РП.
4.3. Унутраная палітыка.
4.4. Міжнародная палітыка. Польшча-Беларусь.

### *4.1. Выканаўчая, заканадаўчая і судовая ўлада*

У тэксце Канстытуцыі Рэспублікі Польшча, прынятай у 1997 годзе, выразна прасочваецца падзел улад на заканадаўчую, выканаўчую, судовую, што стварае трывалую заслону на шляху ўсталявання дыктатуры.

У краіне існуе 2 ключавыя органы выканаўчай улады: прэзідэнт,Савет Міністраў.Ведучы гаворку аб паўнамоцтвах польскага прэзідэнта, цікава яго параўнаць з германскім і французскім калегамі. У Германіі прэзідэнт выконвае прадстаўнічыя функцыі.Рэальная ўлада належыць сілам, якія перамагаюць на выбарах у ніжнюю палату парламента–бундэстаг. Таму ёсць падставы называць ФРГ парламенцкай рэспублікай. У Францыі паўнамоцтвы прэзідэнта вельмі шырокія. Натуральна, размова ідзе пра прэзідэнцкую рэспубліку. У Польшчы можна назіраць прамежкавы варыянт паміж германскай і французскай мадэлямі. Яна – прыклад прэзідэнцка-парламенцкай рэспублікі.

Прэзідэнт выбіраецца ўсеагульным галасаваннем. Тэрмін выканання прэзідэнцкіх паўнамоцтваў пасля абрання на гэту пасаду–5 гадоў. Адна і тая ж асоба можа займаць дадзеную пасаду не болей за два тэрміны. У посткамуністычнай Польшчы адзіным дзеячам, які максімальна рэалізаваў гэту магчымасць, з'яўляецца Аляксандр Квасневускі (1995-2005 гг.).Прэзідэнт–кіраўнік дзяржавы, вышэйшая інстанцыя ў сістэме ваеннага кіравання. Прэзідэнт уносіць у парламент кандыдатуру кіраўніка ўрада. Без згоды сейма гэты кандыдат не зможа ўзначаліць вышэйшы орган выканаўчай улады. Кіраўнік урада мае права прапаноўваць кіраўніку дзяржавы кандыдатуры на пасады міністраў. Выніковая кропка ў пытанні аб кіраўніку міністэрства ставіцца тады, калі прэзідэнт замацоўвае сваім подпісам адпаведны ўказ аб прызначэнні.

У канстытуцыі добра прапісана сітуацыя, калі кіраўнік дзяржавы можа распусціць парламент. Вядома, што дзякуючы канкрэтным рашэнням гэтага органа, павінен набыць рэальныя абрысы персанальны склад легітымнага ўрада, павінна быць пастаўлена выніковая кропка ў дзяржаўным бюджэце. Зразумела, няздольнасць парламента прыняць гэтыя рашэнні абавязкова прыводзіць да паралiча ў дзейнасці дзяржаўных інстытутаў. Таму ўяўляецца слушным, што Асноўны закон дае ў такім выпадку прэзідэнту права на роспуск парламента.

Першая асоба ў структуры Савета Міністраў – старшыня. Звычайна яго называюць прэм'ер-міністрам. Другімі па рангу асобамі ў саўміне з'яўляюцца віцэ-прэм'еры, а трэцімі–кіраўнікі галіновых міністэрстваў–міністры.

Асновы сучаснай структуры вышэйшай выканаўчай улады былі створаны ў выніку адпаведнай рэформы, якая была ажыццяўлена ўвосень 1996 года. Некаторыя аглядальнікі пры характарыстыцы гэтай рэформы ўжывалі найменне "антыбюракратычная рэвалюцыя". Нават калі ў дадзеным выпадку ёсць нейкае перабольшванне, няма ўсё ж падстаў адмаўляць факт дэбюракратызацыі ў суб'ектна–аб'ектных дачыненнях такога кшталту: суб'ект–уладныя структуры, аб'ект–народная гаспадарка. Для іх перастала быць аб'ектам пастаянных жорсткіх дачыненняў мікраэканоміка. Затое ўнутры ўрад пера-

будаваўся так, каб утварыўся маналітны блок, які зарыентаваны на распрацоўку і прынята макраэканамічных рашэнняў. Гэты блок можна параўнаць з аркестрам, у якім у якасці дырыжора выступае прэм'ер–міністр. Дарэчы, кіраўніка ўрада з пункту гледжання распрацоўшчыкаў рэформы 1996 года можна прадставіць як дырыжора ўсяго корпуса віцэ-прэм'ераў і міністраў. Дачыненне да эканамічнага блока ў межах сваіх кампетэнцый маюць адміністрацыя прэм'ер-міністра, Міністэрства эканомікі, Міністэрства аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства фінансаў, Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, Міністэрства працы і сацыяльнай палітыкі, Міністэрства рэгіянальнага развіцця і будаўніцтва, Міністэрства скарбу, Упраўленне жыллёвага будаўніцтва і урбанізацыі, Урадавы цэнтр стратэгічных даследаванняў, упраўленне Камітэта па еўрапейскай інтэграцыі, Упраўленне абароны канкурэнцыі і спажыўца.

У выніку рэформы скончылася гісторыя многіх міністэрстваў. Важна таксама зазначыць, што пасля рэформы засталіся нязменнымі функцыі і структура некаторых міністэрстваў: замежных спраў, нацыянальнай абароны, нацыянальнай адукацыі і г.д.

Моцнымі рычагамі ўплыву на развіццё краіны валодае яе вышэйшая заканадаўчая ўлада – парламент. Яго афіцыйнае найменне: Нацыянальная асамблея. Верхняя палата парламента – сенат. Усяго членаў сената (сенатараў) налічваецца 100. Раз у чатыры гады грамадзяне, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, ідуць на выбарчыя ўчасткі, каб прыняць удзел у галасаванні на выбарах новага складу сената. Адначасова яны такім жа чынам вырашаюць пытанне аб абранні дэпутацкага корпуса сейма новага склікання. Сейм – ніжняя палата парламента. Разам з тым галасаванне ў сейм ажыццяўляецца па партыйных спісах, а ў сенат – на мажарытарным грунце.

Трэба таксама звярнуць увагу на спецыфіку паўнамоцтваў сейма і сената. Сейм мае ключавое ў структуры дзяржаўнага кіравання права заканадаўчай ініцыятывы. Толькі пасля таго як закон прымаецца патрэбнай большасцю дэпутатаў гэтага органа, ён прадстаўляецца на подпіс кіраўніку дзяржавы.

У прэзідэнта два варыянты дзеянняў у гэтым выпадку.

Першы варыянт: кіраўнік дзяржавы згодны з законам і, натуральна, замацоўвае яго сваім подпісам.

Другі варыянт: закон не задавальняе прэзідэнта і становіцца аб'ектам накладвання вета з боку апошняга.

Тут якраз узнікае такая сітуацыя, калі нават заўзяты скептык можа пераканацца, што сейм – не кішэнная, а вельмі ўплывовая палата Нацыянальнай асамблеі. Калі спрацоўвае другі варыянт, кропка не ставіцца. Дэпутаты сейма зноў галасуюць па пытанні аб прыняцці ўказанага закона. Калі як мінімум дзве трэці дэпутацкага корпуса падтрымліваюць закон, кіраўнік дзяржавы абавязаны яго падпісаць.

Ніжняя палата парламента патэнцыяльна можа выкарыстоўваць адчувальныя па выніках інструменты ўздзеяння ў дачыненні да ўрада. Калі дзейнасць вышэйшага органа выканаўчай улады не задавальняе сейм, ён мае паўнамоцтвы абвясціць недавер Савету Міністраў.

Дадзеныя моманты не ўваходзяць у змест дзейнасці сената. Максімум паўнамоцтваў верхняй палаты ў законатворчым працэсе – выказванне прапаноў на прадмет аптымальнага з пункту гледжання сенатарскага корпуса канчатковага варыянта рэдакцыі тых прававых актаў, якія з'яўляюцца аб'ектам разгляду ў сейме. Менавіта сейм ставіць выніковую кропку па пытаннях, звязаных з ключавымі кадравымі і функцыянальнымі аспектамі Вярхоўнай кантрольнай палаты (ВКП). Ужо з самога наймення ВКП вынікае, што гэта – вышэйшая інстанцыя для ўсіх унутрыпольскіх структур, якія паводле існуючага заканадаўства могуць быць аб'ектам кантролю.

У сейме прадстаўлены парламентарыі з рознымі поглядамі, аб чым сведчыць наяўнасць несумяшчальных па ідэйна-палітычных платформах дэпутацкіх клубаў.

Поспех працы сейма ў многім залежыць ад дзеяздольнасці яго прэзідыума. У ніжняй палаце Нацыянальнай асамблеі традыцыйна лічыцца аўтарытэтнай структурай Рада старэйшын.

Заўважым, што існуюць пытанні, па якіх суб'ектам рашэнняў адразу выступае ўвесь членскі корпус Нацыянальнай асамблеі. У дадзенай сітуацыі ў ролі агульнага для 460 дэпутатаў сейма і 100 сенатараў спікера выступае маршал сейма.

Зараз у абедзвюх палатах Нацыянальнай асамблеі засядаюць парламентарыі, абраныя ў выніку выбараў, якія адбыліся 23 верасня 2001 года.

У Польшчы існуе эфектыўная сістэма мясцовага самакіравання. На яе станоўча паўплывала адміністрацыйная рэформа. Гэта рэформа прадугледжвалася адпаведным законам ад 16 ліпеня 1998 года, які быў ухвалены ніжняй палатай Нацыянальнай асамблеі. Рэформа стартавала 1 студзеня 1999 года. Да яе ажыццяўлення ў краіне налічвалася 49 ваяводстваў, 2 тысячы 489 гмін. У выніку рэформы колькасць гмін не змянілася. Разам з тым падзел Польшчы стаў трохступенчатым. Калі гміна з'яўляецца ніжэйшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай ступенню, то павят выступае як сярэдняя ступень. У РП налічваецца 308 земскіх павятаў і 65 гарадскіх павятаў. У заканадаўстве прапісана сітуацыя, калі гарады маюць правы павятаў. Гэта трэба разумець пры звароце да тэрміна "гарадскі павят". І, нарэшце, адзначым вышэйшую ступень – ваяводства. Усяго ваяводстваў з 1 студзеня 1999 года – 16. Тэрыторыя краіны ўключае Апольскае, Вармінска-Мазурскае, Велікапольскае, Заходне-Паморскае, Куяўска-Паморскае, Лодзінскае, Люблінскае, Любушскае, Мазавецкае, Малапольскае, Ніжнесілезскае, Падкарпацкае, Падляскае, Паморскае, Свентакшыскае, Сілезскае ваяводствы.

А зараз пяройдзем да характарыстыкі сістэмы кіравання і канкрэтным паўнамоцтвам уладных структур у рамках кожнай з названых ступеняў.

Пачнём з гміны. Кожны грамадзянін, які мае права голасу і пражывае ў яе межах, праз усталяваны заканадаўствам тэрмін па ўласным жаданні прыходзіць на выбарчы ўчастак, каб прагаласаваць за таго ці іншага суб'екта палітычнага працэсу, які прэтэндуе на ўваходжанне ў савет гміны. Апошняя структура ўтварае базіс мясцовай уладнай сістэмы. Яна правамоцна вырашаць пытанне аб персанальным складзе праўлення гміны. Праўленне гміны – гэта яе ўрад. На чале дадзенага ўрада стаіць, натуральна, старшыня – першая асоба ў гміне.

Для сельскіх жыхароў кіраўніком такога рангу з'яўляецца войт, для гарадскіх – бургамістр або прэзідэнт. Заўважым, што бургамістр адрозніваецца ад прэзідэнта не ўладнымі паўнамоцтвамі, а колькасцю жыхароў, для якіх ён выступае ў якасці вышэйшай мясцовай уладнай інстанцыі. Пасада прэзідэнта лічыцца больш прэстыжнай, бо яна тычыцца горада, у якім нашмат болей жыхароў.

Гміны ўваходзяць у якасці адміністрацыйных адзінак у павяты. Апошні можа мець у сваім складзе максімальна 20 такіх адзінак. Кіруючыя структуры сярэдняй ступені – павята – фарміруюцца па такой жа схеме, як і ніжэйшай. Таму, зразумела, ёсць савет павята, праўленне павята. Першая асоба ў гэтым праўленні – староста.

І, нарэшце, вышэйшая ступень – ваяводства. Тут па выніках агульнанародных выбараў фарміруецца своеасаблівы парламент – сеймік. Спікер, які вядзе паседжанні сейміка, называецца на першы погляд, так, як і такая ж асоба ў сейме, – маршал. Але поўнае найменне яго пасады: маршал ваяводства. Вобразна кажучы, маршал ваяводства сядзіць на двух крэслах. Ён не толькі спікер сейміка, але і старшыня ваяводскага праўлення. Разам з тым для цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання, якія знаходзяцца ў Варшаве, першай асобай у ваяводстве з'яўляецца не маршал ваяводства, а ваявода.

"Выканаўчая ўлада ў гміне мае ў сваім распараджэнні:
- дзіцячыя садкі;
- бібліятэкі;
- дамы культуры;
- водаправодную сетку;
- мясцовы транспарт;
- ахову навакольнага асяроддзя на сваёй тэрыторыі;
- гмінныя дарогі;
- водазабеспячэнне;
- ліквідацыю цвёрдых адходаў і адвод сцёкавых вод;
- кіраванне рынкамі;
- ахову здароўя (амбулаторыі і паліклінікі, а ў гарадскіх гмінах таксама бальніцы)".[12]

Кіруючыя ў павяце структуры маюць у якасці аб'екта пастаяннай увагі, па-першае, праблемы агульнапавятовага значэння і, па-другое, дачыненні па лініі павят – гміна.

" У распараджэнні павятаў знаходзяцца:
- ахова грамадскага парадку і бяспекі;
- супрацьпаводкавая і супрацьпажарная ахова;
- барацьба са стыхійнымі бедствамі і іх наступствамі;
- утрыманне агульных бальніц;
- сацыяльная дапамога;
- супрацьдзеянне беспрацоўю;
- будаўніцтва і ўтрыманне дарог мясцовага значэння;
- абарона правоў спажыўцоў;
- выдача замежных пашпартоў і пытанні, якія звязаны са зменай грамадзянства (гэтыя задачы раней знаходзіліся ў кампетэнцыі ваявод)"[13]

Што ж тычыцца ваяводстваў, то яны рэзка адрозніваюцца ад рэгіёнаў з такой назвай, якія існавалі да 1 студзеня 1999 года. Маюцца на ўвазе і ў разы большыя памеры тэрыторыі, і ў разы большая колькасць насельніцтва. Трэба браць у разлік і тое, што іх гісторыя распачалася тады, калі была пастаўлена выніковая кропка ў фарміраванні рынкавай гаспадаркі. Таму кіраўнікі ваяводства, якія адказныя за эканамічны блок, выступаюць перш за ўсё як макраэканамічныя стратэгі. Іх мэта – дасягненне шляхам своечасова прапанаваных аптымальных шляхоў такіх макраэканамічных паказчыкаў, якія зробяць гэтую адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку канкурэнтаздольнай. Ваяводства ў меру сваіх паўнамоцтваў удзельнічае ў ажыццяўленні знешняй палітыкі Рэспублікі Польшча. У сувязі з уступленнем РП у ЕС для яго стала прыярытэтнай рэалізацыія ідэі Еўропы рэгіёнаў.

"Ваяводства выконвае тры асноўныя задачы:
- забеспячэнне эканамічнага развіцця ваяводства;
- публічныя паслугі высокага ўзроўню – вышэйшыя школы, спецыялізаваныя медыцынскія ўстановы, культурныя ўстановы;
- стварэнне лепшых, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, умоў для замежных інвестыцый."[14]

У адрозненне ад часоў камуністычнай дыктатуры судовая сістэма стала сапраўды незалежнай. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, той факт, што ў

---

[12] Польша – твой экономический партнёр. – Варшава: Институт конъюнктуры и цен внешней торговли, 2002. С. 11.
[13] Польша – твой экономический партнёр. – Варшава: Институт конъюнктуры и цен внешней торговли, 2002. С. 12.
[14] Обровский А. Конец эпохи «Солидарности» // Белорусская деловая газета. – 2001. – 27 сентября. – №49. С.5.

перыяд знаходжання Леха Валенсы на пасадзе прэзідэнта адзін з яго сыноў быў асуджаны на пэўны тэрмін зняволення. Вярхоўны суд (і толькі ён) ставіць канчатковую кропку па любых пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю судовых органаў. Гэты орган можа, не паддаючыся аніякаму ўціску, прызнаць несапраўднымі вынікі парламенцкіх або прэзідэнцкіх выбараў.

### *4.2. Палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі РП*

Найбольш вядомымі палітычнымі партыямі Рэспублікі Польшча з'яўляюцца: Выбарчая акцыя, Сацыял – дэмакратыя Рэспублікі Польшча, Саюз свабоды, Саюз дэмакратычных левых сіл, Грамадзянская платформа, Унія працы, Грамадзянскі рух, Сялянская партыя ПСЛ, Права і справядлівасць, Ліга польскіх сем'яў, Самаабарона, Хрысціянска-нацыянальнае аб'яднанне, Канфедэрацыя незалеж-най Польшчы, Хрысціянская дэмакратыя Трэцяй Рэчы Паспалітай, Народна-дэмакратычная партыя. Нельга скідваць з рахунку і Рух за адраджэнне Польшчы. Пастаянна ставіць перад уладамі пытанне аб задавальненні нацыянальна-культурных патрэб этнічных беларусаў Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне. У Рэспубліцы Польшча мноства профцэнтраў. Але з пункту гледжання рэальнага ўплыву ёсць падставы назваць Усяпольскае пагадненне прафесійных саюзаў, Незалежны прафесійны саюз "Салідарнасць", Агульнапольскі прафсаюз сялян, сялянскіх аб'яднанняў і арганізацый.

На апошніх выбарах у сейм, якія адбыліся 23 верасня 2001 года, перамогу атрымаў Дэмакратычны альянс (SCD). Левыя атрымалі каля 40 % галасоў у парламенце. 12% працэнтаў атрымалі цэнтрысты з грамадзянскай платформы, 10% – нацыяналістычны рух "Самаабарона". Кааліцыя, якую стварыў прэм'ер-міністр Е. Бузек на грунце руху "Салідарнасць", не трапіла ў новы сейм.

Многія ахрысцілі гэту падзею "канцом эпохі Салідарнасці". Новым прэм'ер-міністрам Польшчы стаў Лешак Мілер – былы член Палітбюро Польскай аб'яднанай рабочай партыі, які ўзначальвае спадчыннікаў ПАРП – сацыял-дэмакратаў"[15]. Ён знаходзіўся на гэтай пасадзе да 2004 года.

Аднак у далейшым пазіцыі СДЛС слабелі.

"Прамыя выбары прэзідэнтаў гарадоў [г. зн. мэраў], бургамістраў і войтаў (у лістападзе 2002 г. – М.С.) завяршыліся сакрушальным паражэннем левых.

"Саюз дэмакратычных левых сіл" прайграў нават у сваіх традыцыйных басціёнах (...). Тэарэтычна гэта добры зыходны пункт для стварэння правай партыі, якая стала б супрацьвагай СДЛС (...). Асабліва важны поспех Леха Качынскага ў Варшаве, дзякуючы якому ён мог стаць лідэрам усіх правых сіл"[16], – пісала 12 лістапада 2002 г. "Жэчпасполіта".

Партыі разыходзяцца па пытаннях унутранай і знешняй палітыкі.

Так, у лістападзе 2002 года "лідэры сямі палітычных партый падпісалі ў Варшаве пакт у падтрымку еўрапейскай інтэграцыі і дэкларацыю ў сувязі з уступленнем Польшчы ў Еўрасаюз. Абавязак супрацоўнічаць у справе аб'яднання Еўропы ўзялі на сябе "Саюз дэмакратычных левых сіл", "Унія працы", "Народна-дэмакратычная партыя" і "Рух новай Польшчы". Да пакта не далучыліся сялянская партыя ПСЛ, "Права і справядлівасць", "Ліга польскіх сем'яў" і "Самаабарона".[17]

"Паводле апытання ЦДГД, напрыканцы кастрычніка 2004 г. "Грамадзянскую платформу" падтрымлівалі 26% палякаў, "Лігу польскіх сем'яў" – 15%, "Права і справядлівасць" – 12%, "Самаабарону" – 11%, СДСЛ – 8%, "Польскую сацыял-дэмакратыю" і сялянскую партыю – па 7 %."

---

[15] Кулерский В. Хроника (некоторых) текущих событий // Новая Польша. - 2003. - №2. С.18-1.

[16] Кулерский В. Хроника (некоторых) текущих событий // Новая Польша. - 2003. - №1. С. 19-20.

[17] Кулерский В. Хроника (некоторых) текущих событий / Новая Польша. - 2004. - №12. С.12.

Зараз многіх цікавіць пытанне: "Да якой партыі будзе належаць пераможца прэзідэнцкіх выбараў 2005 года ?"

Сярод магчымых пераемнікаў А. Кваснеўскага эксперты часцей за ўсё называюць Дональда Туску, Леха Качынскага, Анджэя Лепера, Марэка Бароўскага. Яны адпаведна прадстаўляюць "Грамадзянскую платформу", "Права і справядлівасць", "Самаабарону", "Польскую сацыял-дэмакратыю".

### 4.3. Унутраная палітыка

Пасля народна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1989 г. галоўная мэта ўнутранай палітыкі Польшчы заключалася ў тым, каб шляхам сістэмных пераўтварэнняў выйсці на ўзровень постіндустрыяльных дзяржаў. Курс на ажыццяўленне трансфармацыйных працэсаў падкрэсліваўся перш за ўсё зменай афіцыйнага наймення дзяржавы. Да снежня 1989 года краіна называлася: "Польская Народная Рэспубліка". Са снежня 1989 года па рашэнні ніжняй палаты парламента ў афіцыйны ўжытак увайшло найменне : "Рэспубліка Польшча".

Трывалы грунт пад неабарачальнасць трансфармацыйных працэсаў закладвала Канстытуцыя 1997 года. Шлях да яе прыняцця быў такі. Спачатку быў запушчаны механізм грунтоўных экспертных прапрацовак. Затым сам польскі народ выказаўся на рэферэндуме наконт канчатковага варыянта рэдакцыі Асноўнага закона. Гэты ключавы юрыдычны дакумент атрымаў патрэбную для прыняцця актаў падобнага рангу большасць галасоў.

Зыходзячы з вынікаў рэферэндуму, Нацыянальная асамблея паставіла выніковую кропку ў канстытуцыйным працэсе.

Канстытуцыя гарантавала беспярэшкоднае дзеянне дэмакратычных механізмаў, надзейнае функцыянаванне польскай сацыяльнай дзяржавы.

Асноўны закон, безумоўна, задавальняў прадпрымальніцкі корпус. Распрацоўшчыкі канстытуцыі не толькі прапісалі свабоду яго дзеянняў, але і выразна раскрылі яе лагічную структуру. Паводле Асноўнага закона, гэта свабода не павінна выходзіць за межы прававога поля, што жорстка кантралюецца кампетэнтнымі органамі.

Прасцей кажучы, бізнесу дазволена ўсё, што не забаронена законам. Канстытуцыя абвяшчае жорсткі акцэнт на стымулюючую функцыю падаткаабкладання, падкрэсліваючы неабходнасць пабудовы арганізацыйна-прававога, канцэптуальнага і практычнага аспектаў яго механізму ў рэчышчы дзеяння аб'ектыўных эканамічных законаў. У Асноўным законе ўсталяваны жорсткія ліміты на выдаткі вышэйшага органа выканаўчай улады для мэтаў яго дзейнасці. Вядома, што Закон аб дзяржаўным бюджэце выразна акрэслівае, якім павінен быць яго дэфіцыт. Гэта значыць, вызначаецца мяжа, якую не можа пераступаць суб'ект распараджэння дзяржаўнымі фінансамі – урад. У дадзеныя рамкі павінен укладвацца аб'ём усіх выдаткаў Савета Міністраў. Аўтары канстытуцыі выключылі шчыліну, да якой нярэдка прыбягаюць урады розных краін свету. Сутнасць гэтай шчыліны такая. Галоўны банк краіны дае пазыку вышэйшаму органу выканаўчай улады ў суме, якая дае падставы дасягнуць узроўню бездэфіцытнага бюджэту. Асноўны закон 1997 г. забараняе рабіць такога кшталту пазыкі.

Канстытуцыя стварыла прававы базіс задавальнення нацыянальна-культурных патрэб тых грамадзян, якія не належаць да тытульнай нацыі. Маюцца на ўвазе перш за ўсё немцы, цыганы, беларусы, літоўцы, славакі, яўрэі, а таксама этнасы з зусім малой доляй прадстаўніцтва ў насельніцтве РП.

А зараз вылучым найбольш важныя законы, прынятыя ў посткамуністычнай Польшчы.

У адміністрацыйнай галіне трэба перш за ўсё вылучыць закон аб адміністрацыйнай рэформе 1998 г.

Ключавое значэнне для прадпрымальніцкага корпуса мелі Закон аб падат-ках і мясцовых зборах ад 1991 г., Закон аб падатку на даходы юрыдычных асоб ад

1993г., Закон аб падатку на дабаўленую вартасць і акцызных зборах ад 1993г., Закон аб сельскагаспадарчым падатку 1993 г., Закон "Аб спецыяльных эканамічных зонах" ад 20 кастрычніка 1994 г., Мытны кодэкс ад 9 студзеня 1997 г.,новая рэдакцыя Працоўнага кодэкса 1974 г., прынятая ў 1998 г., Закон "Аб гаспадарчай дзейнасці" ад 19 лістапада 1999г., Кодэкс камерцыйных прадпрыемстваў ад 15 верасня 2000г., Закон "Аб канкурэнцыі і абароне спажыўца" ад 15 снежня 2000г., Пастанова міністра фінансаў аб акцызах ад 2000г. і г. д.

У 1998 г. быў прыняты Дзяржаўны статут аб забеспячэнні аховы здароўя.

У 1998-1999 навучальным годзе паводле прынятага закону стартавала рэформа ў сферы адукацыі.

Галоўныя вынікі ажыццяўлення ўнутранай палітыкі ў посткамуністычнай Польшчы: сфарміравалася прававая, сацыяльная дзяржава, набыло рэальныя абрысы грамадзянскае грамадства, на ўсю моц запрацавалі механізмы рынкавай эканомікі, краіна папоўніла лік постіндустрыяльных дзяржаў.

### *4.4. Міжнародная палітыка. Польшча-Беларусь*

Пасля народна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1989 г. новыя ўлады Польшчы адразу ўзялі курс на інтэграцыю ў еўраатлантычныя структуры. Менавіта гэта стала ключавым напрамкам знешнепалітычнай дзейнасці афіцыйнай Варшавы. У рэчышча такой палітыкі ўпісвалася жорсткае дыстанцыраванне Польшчы ад СССР. У снежні 1989 г. ніжняя палата польскага парламента дэнансавала савецка-польскую дамову, якая на працягу многіх гадоў стварала юрыдычны базіс саюзных адносін паміж гэтымі краінамі. Не сталі для РП прыярытэтнымі і адносіны са спадкаемцай СССР – Расіяй, партнёрамі Масквы па СНД. 12 сакавіка 1999 года РП становіцца членам НАТО, а 1 траўня 2004 года – членам Еўрасаюза. Лічачы свой удзел у дзейнасці НАТО і ЕС стрыжнявым элементам міжнароднай палітыкі, Варшава разам з тым не ігнаруе важнасць іншых накірункаў знешнепалітычнай дзейнасці.

З усіх дзяржаў былога ўсходняга блока Польшча найбольш шчыльна супрацоўнічае з Чэхіяй, Венгрыяй, Славакіяй. Гэтыя краіны ўтвараюць Вышэградскую чацвёрку. Варшава пастаянна выказвае сваю зацікаўленасць у функцыянаванні Веймарскага трохкутніка ў складзе Польшчы, Германіі, Францыі.

РП – паслядоўны прыхільнік стварэння трывалых сістэм глабальнай і рэгіянальнай бяспекі. Краіна настойліва выступае за мірнае ўрэгуляванне міжнародных спрэчак, за актывізацыю намаганняў сусветнага супольніцтва ў барацьбе супраць міжнароднага тэрарызму, лакалізацыю рэгіянальных канфліктаў, за раззбраенне на грунце разумнай дастатковасці абароны, на прынцыпах роўнасці і аднолькавай бяспекі бакоў. Кіруючыя колы Польшчы выступаюць за рэзкае пашырэнне межаў свабоды і дэмакратыі ў сучасным свеце.

А зараз звернемся да знешнеэканамічных сувязяў польскай дзяржавы.

Палякі вывозяць каменны вугаль, серу, свінец, цынк, медзь, лекі і г.д. Увозяць нафту, прыродны газ, жалезную руду і г.д.

Калі ўсю вывазную і ўвазную таварную масу прыняць за сто працэнтаў,то адпаведныя паказчыкі па германскаму вектару будуць пераўзыходзіць такога кшталту дадзеныя датычна італьянскага, расійскага, французскага напрамкаў, разам узятых. Такая выснова пацвярджаецца наступнай табліцай.

***Доля асобных краін у польскім экспарце і імпарце:***

| *Краіна* | *Доля ў польскім экспарце ў %* | *Доля ў польскім імпарце ў %* |
|---|---|---|
| Германія | 32,9 | 24,1 |
| Італія | 5,9 | 9,9 |
| Расія | 8,4 | 6,3 |
| Францыя | 4,4 | 5,9 |

На краіны, названыя ў дадзенай табліцы, прыходзіцца болей за палову польскага экспарту і без малага палова імпарту гэтай краіны. У знешнім гандлі Рэспублікі Польшча істотныя вынікі дасягнуты таксама на брытанскім, украінскім, нідэрландскім, амерыканскім накірунках. Пасля ўступлення РП у ЕС сталі ўзмацняцца гандлёвыя адносіны Варшавы і з тымі дзяржавамі, якія ўваходзяць у дадзеную групоўку, якія мы дагэтуль не ўказвалі ў сваім аналізе.

Палітыка посткамуністычнай Польшчы па беларускім напрамку будавалася з улікам наступных фактараў.

Па-першае, беларуска – польскія сувязі маюць глыбокія гістарычныя карані.

Па-другое, браўся ў разлік геаграфічны фактар. Польшча непасрэдна мяжуе з Гарадзенскай і Берасцейскай абласцямі РБ.

Па-трэцяе, у РП, перш за ўсё, на тэрыторыі Падляскага ваяводства існуе значная беларуская дыяспара.

Па-чацвёртае, унутрыбеларускія працэсы разглядаюцца ў жорсткай прывязцы да стандартных падыходаў НАТО, Еўрасаюза.

Па-пятае, улічвалася цікавасць польскага прадпрымальніцкага корпуса да беларускага рынку.

Калі ў Польшчы адбылася народна-дэмакратычная рэвалюцыя, Беларусь яшчэ была састаўной часткай СССР. Зразумела, у той час беларуска-польскія сувязі развіваліся ў рэчышчы савецка-польскага супрацоўніцтва. З 1972 года дзейнічала Генеральнае консульства ПНР у Мінску. Са снежня 1989 г. яно ўжо функцыянавала як замежная ўстанова краіны пад назвай "Рэспубліка Польшча". Гісторыя генконсульства скончылася ў 1991 годзе. БССР прымала ўдзел у самых розных галінах супрацоўніцтва паміж абедзвюма краінамі.

У 1991 годзе Рэспубліка Беларусь, якая да 19 верасня 1991 г. называлася БССР, становіцца незалежнай дзяржавай. Заўважым, што з самага пачатку паміж РБ і РП дэ-факта існавалі міждзяржаўныя адносіны. У суседняй Польшчы ўважліва сачылі за разгортваннем трансфармацыйных працэсаў на Беларусі, за першымі крокамі ключавой для афіцыйнага Мінска інтэграцыйнай структуры – Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Польшчай былі адноўлены 2 сакавіка 1992 года. Зазначым, што размова ідзе менавіта аб аднаўленні дыпламатычных адносін, бо яны былі ўстаноўлены паміж абедзвюма краінамі ў 1921 годзе і належалі скасаванню ў выніку стварэння СССР. Першым амбасадарам незалежнай Беларусі ў Польшчы стаў вопытны дыпламат, бліскучы знаўца польскіх спраў Уладзімір Сянько. Затым гэту пасаду займалі Георгі Таразевіч, Уладзімір Бурскі, Мікалай Крэчка. Цяперашні амбасадар Беларусі ў Польшчы – Павел Латушка.

У некаторых польскіх гарадах ( Беластоку і г.д.) адкрыты генеральныя консульствы Беларусі. Генеральныя консульствы Польшчы дзейнічаюць у Берасці і Гародні.

Палітычны аспект двухбаковых адносін у першай палове 1990-ых гадоў актыўна напаўняўся рэальным зместам. Аднак з сярэдзіны 1990-ых гг. ён страчвае дынаміку ў сваім развіцці, пастаянна адстае па выніковасці ад непалітычных аспектаў.

У палітычным плане ключавымі з'явіліся Дамова паміж РБ і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 года і Дэкларацыя аб добрасуседстве, узаемапаразуменні і супрацоўніцтве паміж РБ і Рэспублікай Польшча. Месцам падпісання абодвух дакументаў была Варшава.

Можна адзначыць пэўныя поспехі ў эканамічнай галіне. Функцыянуе беларуска-польскі Савет па эканамічнаму супрацоўніцтву. Дзейнічае польска-беларуская гандлёва-прамысловая палата.

Трэба адзначыць значны дамоўна-прававы базіс двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін. Прывядзем толькі некаторыя прыклады. 24 красавіка 1992 года ўпаўнаважаныя прадстаўнікі Беларусі і Польшчы замацавалі сваімі подпісамі пагадненне аб узаемнай падтрымцы і абароне інвестыцый. Яно ўступіла ў сілу 18 студзеня 1993 года.

18 студзеня 1992 года паміж РБ і РП была падпісана канвенцыя аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання. Яна ўвайшла ў сілу 30 ліпеня 1993 г. Дзейнічае з 1 студзеня 1994 года.

У структуры беларускага экспарту ў РП устойлівае месца занялі хімічныя валокны, хімічныя ніці, казеін, трактары, калійныя ўгнаенні. У імпарце польскіх партнёраў прысутнічаюць такія таварныя пазіцыі, як акумулятары, помпы, абутак, лекі.

Двухбаковае супрацоўніцтва развіваецца і ў другіх галінах: культурнай, адукацыйнай, навуковай і г.д., нямалыя маштабы набыла народная дыпламатыя. У гэтай сувязі адзначым наступныя міждзяржаўныя пагадненні: аб ахове месц памяці і пахаванняў ахвяр вайны і рэпрэсій ад 21 студзеня 1995 года, аб супрацоўніцтве ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны ад 25 сакавіка 1995 г., аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, навукі і адукацыі ад 27 лістапада 1995 г. і г.д.

А зараз звернемся да ўдзелу Брэсцкай вобласці ў развіцці беларуска-польскага супрацоўніцтва.

У апошнія гады выразна прасочваецца дынаміка ва ўдзеле Берасцейшчыны ў гандлі паміж Беларуссю і Польшчай. Для параўнання возьмем першыя чатыры месяцы 2003 і 2004 гг. З 1 студзеня па 30 красавіка 2004 года суб'екты гаспадарання рэгіёну паставілі ў суседнюю краіну таварных пазіцый на агульную суму ў тры з паловай мільёны амерыканскіх долараў. Калі вымяраць за той жа адрэзак часу, у той жа валюце паказчык па імпарту, то ён будзе больш, чым у 10 разоў перавышаць названую суму і складзе 36,7 мільёнаў. Датычна аналагічнага перыяду ў параўнанні з мінулым годам першы паказчык сведчыць аб росце на 6,1%, а другі – аж на 26,6%. Як бачым, дынаміка ў імпарце больш пераканаўчая, чым у экспарце.

А зараз пяройдзем да канкрэтнага разбору ўвазных і вывазных пазіцый. Калі вартасць усёй увазной таварнай масы прыняць за 100%, то выразна абазначыцца лідзіруючае месца драўняна-валакністых пліт (18,6%). Другое і трэцяе месца са значным адрывам ад лідэра адпаведна займаюць свежая свініна (8,8%), яблыкі і грушы (6,4%). Палякаў перш за ўсе цікавяць драўняная сыравіна, канчатковыя рэчавыя вынікі працы дрэваапрацоўчага комплексу. Гэтым пазіцыям належыць 21,4% у агульнай вывазімай таварнай масе. Зусім нямнога недацягваюць да дадзенага паказчыка водныя беспазваночныя (20,6%). Роўнай з'яўляецца доля бялковых рэчываў, казеіну (11,6%).

Дарэчы, польскія суб'екты гаспадарання, якія не належаць да ліку буйных, лічаць мэтазгодным, каб знешнеэканамічныя сувязі іх краіны з Берасцейшчынай не абмяжоўваліся выключна гандлем. Яны не бачаць сур'ёзных перашкод для таго, каб, напрыклад, у Берасці, пад Берасцем з'яўляліся іх прадпрыемствы, што выпускалі б прадукцыю, якую б маглі купляць у Менску, Гомелі, Бранску, Смаленску і г.д. Дадзеную частку польскіх дзелавых колаў прывабліваюць тут цывілізаваная падатковая палітыка, танная і ў той жа час высокакваліфікаваная рабочая сіла, іншыя спрыяльныя моманты. У гэтым плане ёсць і сур'ёзныя рэальныя вынікі.

Важнае месца ў польскім вектары знешнеэканамічных сувязяў вобласці займае яе ўдзел у дзейнасці трансгранічнага аб'яднання "Еўрарэгіён "Буг". Пад-

рыхтоўка да таго, каб гэта структура набыла рэальныя абрысы, заняла тры гады (1992-1995 гг.). Урачыстае адкрыццё аб'яднання адбылося ў пачатку восені 1995 года. На адкрыцці былі названы яго першапачатковыя суб'екты: Валынская вобласць (Рэспубліка Украіна), Люблінскае ваяводства, Хелмскае ваяводства, Тарнабжэгскае ваяводства, Замосцькае вядомства (Рэспубліка Польшча). 3 траўня 1998 года з'яўляюцца новыя суб'екты: з беларускага боку – Берасцейшчына, з польскага – Бяла-Падляскае ваяводства.

У межах аналізуемага аб'яднання пражывае не меней за 5 мільёнаў цэнтральнаеўрапейцаў. Яно займае абшар, на якім маглі б размясціцца тры еўрапейскія дзяржавы: Бельгія, Нідэрланды, Люксембург, разам узятыя. Акрамя значнай колькасці насельніцтва, немалой тэрыторыі ў аб'яднання ёсць яшчэ адзін відавочны плюс: вельмі ўдалае геастратэгічнае становішча. Абшар, на які яно распаўсюджваецца, з'яўляецца транзітным для разнастайнага транспарту (цягнікоў, аўтобусаў, грузавых машын і г.д.), які, распачынаючы рух у цэнтральнай і заходняй частках Старага Свету, мае ў якасці канчатковага пункту населеныя пункты на постсавецкай прасторы.

Важна мець на ўвазе непасрэднае дачыненне праграмы TACIC Еўрапейскага Саюза да дзейнасці "Еўрарэгіёну "Буг". Вядома, напрыклад, што зараз у цяжкім стане знаходзіцца шмат прадпрыемстваў, якія ў савецкі час з'яўляліся складовай часткай ваенна-прамысловага комплексу. У гэтай сувязі адзначым, што з дапамогай праграмы TACIC запрацаваў як паўнавартасны суб'ект гаспадарання, адэкватна прыстасаваны да ўмоў рынкавай эканомікі, Пінскі завод "Камертон". Дзякуючы гэтай праграме ўдала функцыянуе TRANSFORM – Цэнтр у Берасцейскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце. Каардынатары праграмы рабілі і пэўныя захады па прывядзенню некаторых памежных пераходаў у адпаведнасць з агульнапрынятымі стандартамі. Пералік падобных прыкладаў можна працягнуць.

Не меней за 170 суб'ектаў гаспадарання, зарэгістраваных органамі дзяржаўнага кіравання Берасцейскай вобласці, выступаюць як адзін з вынікаў беларуска-польскага супрацоўніцтва. Іх можна падзяліць на дзве часткі: 1) прадпрыемствы, якія грунтуюцца выключна на польскім капітале; 2) прадпрыемствы, якія працуюць пры аднасачасовым удзеле беларускага, польскага, а часам яшчэ і іншых бакоў. Унушальнай уяўляецца польская прысутнасць сярод рэзідэнтаў свабоднай эканамічнай зоны "Брэст". Яна адзначана лічбай 20. Зразумела, геаграфічны фактар прадвызначыў тое, што ў аналізуемым напрамку самую вялікую актыўнасць праяўляюць дзелавыя людзі, якія прадстаўляюць Люблінскае ваяводства. Яны сталі ля вытокаў 43 суб'ектаў гаспадарання, якія працуюць у рэгіёне. Гэта ў шэсць з невялікім разоў болей таго паказчыка, які можна запісаць у актыў прадстаўнікам прадпрымальніцкага корпуса Валынскай вобласці.

Брэсцкая вобласць уносіць таксама істотны ўклад у напаўненне рэальным зместам іншых накірункаў беларуска-польскага супрацоўніцтва. Адзначым, што Бяла-Падляска з'яўляецца пабрацімам Брэста, Стрэльна–Пінска.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1 Ці дае адміністрацыйная рэформа 1999г. рэальныя падставы ваяводствам удзельнічаць у рэалізацыі канцэпцыі Еўропы рэгіёнаў?

2. Хто мае больш паўнамоцтваў: маршал сейма ці маршал сената?

3. Чым можна патлумачыць паражэнне "Салідарнасці" на парламенцкіх выбарах 23.09.2001г.?

4. Якія станоўчыя і негатыўныя наступствы прынясе ў доўгатэрміновым плане членства Польшчы ў НАТО?

5. Ці адпавядае нацыянальным інтарэсам Польшчы відавочная перавага заходняга вектара ў знешнепалітычнай арыентацыі гэтай краіны?

**Тэст-заданні:**

1. Польскі пабрацім Пінска –
а) Варшава; б) Лодзь; в) Стрэльна.
2. Колькі ваяводстваў налічваецца ў сучаснай Польшчы?
а) 10; б) 12; в)16.
3. Колькі дэпутатаў налічвае польскі сейм?
а) 460; б) 560; в) 600.
4. У верхнюю палату Нацыянальнай асамблеі Польшчы ўваходзяць
а) 90 сенатараў; б) 100 сенатараў; в) 150 сенатараў.
5. Колькі земскіх павятаў налічваецца ў Рэспубліцы Польшча?
а) 456; б) 308; в) 294.
6. Ці ўваходзяць дзіцячыя садкі ў распараджэнне выканаўчай улады ў гміне?
а) так; б) не.
7. Які вынік мелі левыя сілы на парламенцкіх выбарах 2001г. у Польшчы?
а) каля 40 % галасоў; б) каля 45 % галасоў; в) каля 49 % галасоў.
8. Колькі польскіх суб'ектаў гаспадарання з'яўляюцца рэзідэнтамі свабоднай эканамічнай зоны "Брэст"?
а) 20; б) 30; в)40.
9. Калі адбылося адкрыццё трансгранічнага аб'яднання "Еўрарэгіён "Буг"?
а) у пачатку восені 1995г.; б) у канцы лета 1996г.; в)у сярэдзіне зімы 1997г.
10. Дамова паміж РБ і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве была падпісана
а) 10 ліпеня 1990г.; б) 11 траўня 1991г.; в) 23 чэрвеня 1992г.
11. На тэрыторыі якога польскага ваяводства існуе значная беларуская дыяспара?
а) Сілезскага; б) Апольскага; в) Падляскага.
12. Першы амбасадар незалежнай Беларусі ў Польшчы
а) Уладзімір Сянько; б) Павел Латушка; в) Мікалай Крэчка.
13. Афіцыйнае ўступленне Польшчы ў НАТО адбылося
а) у 1997г.; б) у 1999г.; в) у 2002г.
14. Рэспубліка Польшча –
а) прэзідэнцкая рэспубліка; б) парламенцка-прэзідэнцкая рэспубліка; в) парламенцкая рэспубліка.

*Лекцыя пятая*

# АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ, ЗВЫЧАІ, ТРАДЫЦЫІ. СІСТЭМА АДУКАЦЫІ. РАЗВІЦЦЁ НАВУКІ І ТЭХНІКІ. ВЫДАТНЫЯ ДЗЕЯЧЫ ПОЛЬСКАЙ ГІСТОРЫІ

***План:***

5.1. Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі.
5.2. Сістэма адукацыі.
5.3. Развіццё навукі і тэхнікі.
5.4. Выдатныя дзеячы польскай гісторыі.

## *5.1. Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі*

Тыя крыніцы, на якія абапіраюцца даследчыкі, даюць падставы для даследавання польскай літаратуры з 966 года, года прыняцця хрысціянства. Банк дадзеных аб літаратурных працэсах да гэтай падзеі, на жаль, мізэрны.

Менавіта 966 годам распачынаецца сярэдневяковы этап у гісторыі польскай літаратуры. Ён быў адметны рашучым панаваннем лацінскай мовы. Складовымі элементамі спадчыны гэтага этапа з`яўляюцца казанні, малітвы, летапісы і хронікі. У рамках дадзенага этапа, які скончыцца ў XV стагоддзі, гісторыкі польскай літаратуры асабліва вылучаюць другую палову XIII ст. – XV ст., бо якраз гэты падэтап характарызуецца наяўнасцю польскамоўных літаратурных помнікаў. Разам з тым пераважнае становішча лацінскай мовы захоўвалася.

Аналізуемы этап адметны з`яўленнем генератара перадавых ідэй – Кракаўскага універсітэта, дзе сканцэнтравалася польская інтэлектуальная эліта. Функцыю генератара ідэй універсітэт яшчэ больш пераканаўча выканае на новым этапе, які ахоплівае эпоху Адраджэння. Гэта эпоха прыйшлася ў Польшчы на XVI стагоддзе.

Што ж прынцыпова новага з`явілася ў Польшчы ў эпоху Адраджэння?

Быў закладзены салідны базіс пад развіццё польскай мовы. У гісторыю гэтай мовы чырвонымі літарамі ўпісаны імёны ***Я. Паркашовіца, П. Саторыўса-Стаенскага.*** Яны выступілі піянерамі ў напісанні падручнікаў па ключавых галінах польскага мовазнаўства. Кніга першага была спецыяльна прысвечана арфаграфіі, другога – граматыцы.

Гісторыкі літаратуры адзіныя ў тым, што першай найбольш значнай велічынёй у менавіта польскай паэзіі быў ***Я. Каханоўскі.***

Заўважым, што для польскіх літаратараў эпохі Адраджэння вялікімі аўтарытэтамі былі іх сучаснікі, суайчыннікі Мікалай Капернік, Анджэй Фрыч-Маджэўскі.

Трэба таксама адзначыць таленавітых літаратараў Н. Яніцкага, М. Рэя, цікавыя гумарэскі, песні, драмы і камедыі аналізуемай эпохі.

Наступныя паўтара стагоддзя ахопліваюць этап барока, які адметны такімі імёнамі, як М. Сарбеўскі, Я. А. Морштын, С. Любамірскі, В. Патоцкі, В. Кахоўскі, Я. Х. Пасек.

Затым звыш паўстагоддзя дамінавалі прадстаўнікі эпохі Асветніцтва. Найбольш значны след у гэту эпоху пакінулі В. Багуслаўскі, Ю. У. Нямцэвіч, І. Красіцкі, А. Нарушэвіч.

Даволі плённым для польскай паэзіі, драмы, прозы было XIX стагоддзе (А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, А. Фрэдра, Ц. К. Нарвід, Ю. Кажанеўскі, У. Сыракомля, Э. Ажэшка, М. Канапніцкая, Б. Прус, Г. Сянкевіч).

Краіна ўступіла ў XX стагоддзе, калі ў літаратуры асабліва вылучаліся авангардысты. Актыўна знаходзілі свайго чытача паэтычныя творы К. Тэтмаера, Я. Каспровіча, Б. Лесьмяна. Атрымалі таксама прызнанне як майстры слова Л. Стаф, С. Жаромскі, У. Рэймант, З. Налкоўская, С. Выспянскі, Т. Міцінскі.

У часы існавання Другой Рэчы Паспалітай істотны ўклад у развіццё мастацкай літаратуры ўнеслі У. Бранеўскі, В. Васілеўская, С. І. Віткевіч, М. Дамброўская, Я. Івашкевіч, Л. Кручкоўскі, Ю. Тувім, Б. Ясенскі.

Важна мець на ўвазе, што 1939 – 1945 гг. не выкрэслены з гісторыі польскай літаратуры. Ёсць літаратурная прадукцыя, датаваная гэтымі гадамі ў К. К. Бачынскага, У. Бранеўскага, В. Васілеўскай, М. Жулаўскай, Е. Путраманта, А. Сланімскага, Ю. Тувіма, Л. Шэнвальда.

Пэўныя здабыткі былі ў польскай літаратуры і ў часы манапольнага панавання камуністаў. Найбольш значныя імёны гэтых гадоў: Е. Анджаеўскі, К. Брандыс, К. Галчынскі, Ю. Кавалец, Т. Канвіцкі, С. Лем, В. Мах, В. Мысліўскі, Я. Парандоўскі, В. Шымборская.

Актыўна развіваецца літаратурны працэс у Трэцяй Рэчы Паспалітай. На яго вельмі спрыяльны ўплыў робяць дэідэалагізацыя, дэпалітызацыя ў дзяржаўнай культурнай палітыцы, наяўнасць рэальнай свабоды ў краіне. Пісьменніцкі корпус уяўляе спалучэнне як ветэранаў літаратурнай творчасці, так і новых імён.

«У спісах (сучасных) польскіх бестселераў ... лідзіруе Януш Главацкі з аўтабіяграфічным раманам «З галавы». На другім месцы гісторыка-біяграфічная кніга Рышарда Купусцінскага «Вандраванні з Герадотам». Далей ідуць «Божыя ваяры» майстра фэнтэзі Анджэя Сапкоўскага і, нарэшце, лаўрэат прэміі «Ніке» Войцэх Кучок і яго кніга «Гніль».[18]

Польская архітэктура – гэта перш за ўсё цікавыя помнікі мінулых стагоддзяў, вынікі працы сучасных дойлідаў. На жаль, не ўсе помнікі могуць быць аб'ектам агляду польскіх грамадзян, гасцей Рэспублікі Польшча. Адны з іх поўнасцю зніклі, разбураны. Другія маюць патрэбу ў частковай рэстаўрацыі. З даўнішніх помнікаў увагу прыцягваюць, напрыклад, касцёл Дзевы Марыі ў Кракаве, інтэр'ер ратушы ў Познані, плошча Рынак у горадзе Замасць, замак у Віснічы, гандлёвыя рады «Сукеніцы» ў Кракаве. Да бліскучых архітэктурных рашэнняў найноўшай гісторыі Польшчы належаць касцёл Ушэсця Хрыста, Бізнес-цэнтр, атэль «Холідэй», бібліятэка Варшаўскага універсітэта, якія знаходзяцца ў польскай сталіцы. Да бясспрэчных удач сучасных польскіх архітэктараў можна таксама аднесці уніяцкі храм у Бялы-Боры, атэль «Радысан» у Шчэціне. У гістарычнай рэтраспектыве важна мець на ўвазе і ўклад сучасных польскіх архітэктараў, і значны ўклад замежных архітэктурных школ. У гістарычных архівах можна знайсці згадкі аб архітэктурных здольнасцях манаха Сымона, Б. Маранда, Я. Брыціўса, А. Карацы, Я. Кубіцкага, С. Віткевіча і г.д. Сярод сучасных дойлідаў знайшлі шырокае прызнанне З. Бадоўскі, М. Будзынскі, М. Думеньчыч, Б. Катарба, Т. Спыхала. Са старажытных часоў да нашых дзён у польскай архітэктуры прасочваецца прыналежнасць да наступных стыляў: раманскага, гатычнага, рэнесансу, маньерызму, барока, ракако, мадэрну, канструктывізму, постмадэрнізму, функцыяналізму.

Даследчыкі адпаведных помнікаў вылучаюць у іх як агульныя рысы, так і польскую спецыфіку. З замежных архітэктурных школ найбольшы ўплыў на развіццё польскага дойлідства аказалі нямецкая і італьянская. Палякі таксама нямала запазычылі ў галандцаў і аўстрыйцаў.

У гістарычнай рэтраспектыве можна адзначыць сур'ёзныя дасягненні палякаў у галіне выяўленчага мастацтва. У польскай культурнай спадчыне прадстаўлены практычна ўсе віды гэтага мастацтва, найбольш вядомыя стылі. У дадзеным мастацкім комплексе пастаянна адчуваўся і відавочны ўплыў, перш за ўсё з боку французаў, візантыйцаў, італьянцаў, немцаў і галандцаў. Мастацкая спадчына стварыла моцны падмурак для сучасных польскіх майстроў. Адны з іх займаюцца

[18] Куманецкая Янина. Летопись культурной жизни// Новая Польша. – 2005. –№1. С. 71.

відамі мастацтва, гісторыя якіх налічвае стагоддзі. Другія канцэнтрыруюць свае высілкі на відах, аб якіх стала вядома адносна нядаўна. Ёсць бліскучыя майстры інсталяцыі, хэпенінга, відэаарта, бодыарта. Найбольш вядомыя імёны ў найноўшай гісторыі польскага мастацтва: У. Бароўскі, З. Бяксінскі, Е. Берась, К. Вадзічка, М. Давідзюк, К. Казыра, Ю. Рыбакоўскі, Л. Тарасевіч.

Да паслуг польскіх аматараў музыкі 9 оперных тэатраў, яны маюць магчымасць наведаць 8 тэатраў музычнай камедыі. Патрабаванні меламанаў задавальняюць таксама 20 філармоній.

Далёка за межамі Польшчы атрымалі прызнанне ансамблі народнай песні і танца «Мазоўша», «Шлёнск». Майстры ігры на музычных інструментах, кампазітары, спевакі, музыказнаўцы – вось спектр будучых спецыялістаў, якіх рыхтуюць Музыкальная акадэмія імя Шапэна, Варшаўская, Катавіцкая, Пазнанская кансерваторыі. Усяго ўстаноў такога кшталту восем.

Краіна па шэрагу напрамкаў удзельнічае ў міжнародным музычным супрацоўніцтве.

Першы напрамак. Палякі – пастаянныя гаспадары мерапрыемстваў конкурснага характару, на якіх піяністы, скрыпачы, кампазітары, скрыпічныя майстры з усяго свету ў вострай барацьбе высвятляюць, хто з іх лепшы.

Другі напрамак. Актыўны ўдзел у міжнародным фестывальным руху, які ўключае два аспекты. З аднаго боку, дзяржаўныя і грамадскія структуры выдатна арганізоўваюць такога кшталту фестывалі на роднай зямлі. Дастаткова хаця б назваць сопацкі і зеленагурскі фестывалі. З другога боку, польскія выканаўцы рэгулярна ўдзельнічаюць у гэтых фестывалях на тэрыторыі розных краін.

Трэці напрамак. Гастролі музычных калектываў, асобных выканаўцаў: замежных – у Польшчы, польскіх – за мяжой.

Творы польскіх і замежных аўтараў находзяць сцэнічныя рашэнні ў 87 драматычных тэатрах. Маленькія дзеці маюць магчымасць прадоўжыць знаёмства з казачнымі героямі пры наведванні 32 лялечных тэатраў.

Найбольш вядомыя кінарэжысёры: А. Вайда, К. Занусі,Ф. Баян, К. Кеслёўскі, В. Пасікоўскі, К. Шалайскі, С. Хенцінскі, Ю. Махульскі, Е. Гофман.

Важным стымулам для развіцця кінематаграфічнай галіны стала правядзенне разнастайных кінафестываляў. Іх можна падзяліць на два тыпы.

Першы тып: фестывалі, якія маюць агульнапольскі статус. Заўважым, што свой спецыяльны фестываль існуе як для стваральнікаў кароткаметражных стужак, так і мастацкага кіно.

Другі тып звязаны выключна з кароткаметражнымі фільмамі. Размова ідзе аб міжнародным фестывалі. Яго пастаянны гаспадар – сярэдневяковая сталіца Польшчы – Кракаў.

Добрую прэсу атрымліваюць кінаролі А. Бяджынскай, Я. Гаяса, Б. Лінды, О. Любашэнкі, Ц. Пазуры, А. Ферэнцы.

Будучыя Барбары Брыльскі, Станіславы Мікульскія, Полі Раксы пасцігаюць азы акцёрскага майстэрства ў вышэйшай школе тэатра, кіно і тэлебачання імя Л. Шылера, гісторыя якой налічвае без малага шэсць дзесяцігоддзяў. Сярод студэнтаў гэтай установы ёсць і тыя, хто збіраецца прысвяціць сваё жыццё рэжысуры.

Дадзены навучальны курс прапануецца будучым спецыялістам у галіне міжнародных эканамічных адносін, эканамічнай дыпламатыі. Таму ёсць сэнс спецыяльна спыніцца на асаблівасцях нацыянальнай псіхалогіі і этыкету палякаў, якія трэба ўлічваць у сувязі з дзелавымі гутаркамі і перамовамі.

«Палякі, бадай, бліжэй за іншых да нас па менталітэту, але да гутарак і перамоваў з імі неабходна рыхтавацца не меней рупліва. Першая адметная рыса палякаў – гэта ветлівасць і пачцівасць да калег і партнёраў. Адзін да аднаго яны часта звяртаюцца ў трэцяй асобе («Што пан дырэктар думае з гэтай нагоды?»). Словы «калі ласка», «дзякуй», «прабачце» літаральна перанасычваюць гутарковую мову палякаў.

Польская мова вельмі багата дэталямі і нюансамі. Калі іншаземцы слаба ведаюць гэту мову, але, не звяртаючы на гэта ўвагі, спрабуюць размаўляць з партнёрамі па-польску, яны звычайна робяць масу памылак, што ўспрымаецца як бестактоўнасць і нават грубасць. Пагэтаму лепей карыстацца паслугамі перакладчыка.

Галантныя кавалеры – палякі заўсёды вельмі далікатны з жанчынамі, удзяляюць ім у кампаніі павышаную ўвагу. Цалуюць руку, уручаюць кветкі, кажуць камплiменты. На прыёмах звычайна кожны трэці тост прысвячаецца жанчынам. Вымаўленне тостаў – любімы занятак палякаў у ходзе неафіцыйных сустрэч. Іх змест звычайна адрасуецца камусьці з тых, хто прысутнічае, персаніфікуецца. Пагэтаму будзе слушным і пажаданым сказаць тост у адрас кіраўніка польскай дэлегацыі, а затым у гонар усіх іншых гасцей па чарзе. Пры гэтым неабходна знайсці становучыя якасці і асаблівыя заслугі кожнага.

З нагоды прыёму падарункаў у палякаў няма аніякіх забабонаў або абмежаванняў. Як правіла, яны прывозяць сувеніры для боку, які прымае, і чакаюць у адказ кроку ад гаспадароў.

У польскім грамадстве шануюцца адкрытасць і шчырасць. Дзелавыя прапановы павінны быць выказаны як мага лепей і як мага зразумела. Да сустрэч і перамоваў пажадана рыхтаваць добра надрукаваныя праграмы, плакаты, тэзы, прапановы. У адрозненне ад амерыканцаў або англічан палякі гатовы вяртацца да абмеркавання дзелавых пытанняў і ў нефармальнай абстаноўцы, у час прыёму і пасля яго. Гэтую іх якасць можна выкарыстоўваць.

Польская дэлегацыя звычайна адчувальна да пратакольнага ўзроўню яе прыёму. Пагэтаму пратакольны візіт да міністра, мэра або іншага мясцовага кіраўніка, які зможа арганізаваць бок, які прымае, будзе вельмі карысны. Аналагічна можна сказаць адносна польскіх амбасад і консульстваў на Беларусі.

Палякі амаль заўсёды гатовы да зносін з друкам. Пагэтаму будзе слушным прапанаваць кіраўніку дэлегацыі арганізаваць прэс-канферэнцыю або інтэрв'ю для мясцовых і замежных сродкаў масавай інфармацыі.»[19]

### *5.2. Сістэма адукацыі*

У адукацыйным комплексе Рэспублікі Польшча прадстаўлены ўстановы з наступнымі формамі ўласнасці: дзяржаўнай, прыватнай. Польскія і замежныя грамадзяне маюць права адукоўвацца ў любой з гэтых устаноў ад немаўляцтва да глыбокай старасці. Тыпы дзяржаўных і прыватных навучальных устаноў супадаюць.

Магчымыя варыянты адукацыйнага выбару пакажам на наступным прыкладзе. У сям'і Навакоўскіх з Варшавы нарадзіўся сын Лешак. Яго першая адукацыйная ступень – дзіцяцы садок. З 7 да 10 гадоў дзіця з'яўляецца аб'ектам інтэграванага навучання ў рамках пачатковай школы. Веды, атрыманыя Лешакам, стварылі падмурак для таго, каб ён з 10 да 13 гадоў прайшоў курс блокавага навучання. Зараз ён будзе выступаць як вучань базавай школы. Ужо ў 13 гадоў Лешак Навакоўскі можа ганарыцца, што стаў гімназістам. Выкладчыцкі корпус будзе забяспечваць для хлопчыка пераходнага ўзросту прадметнае навучанне выраўноўвання. У 16 гадоў Лешак папоўніць шэрагі ліцэістаў, а яго гімназічны сябра Генрык Дабжынскі паставіць перад сабой мэту стаць машыністам і будзе ўпэўнена крочыць да яе ў прафесійнай школе. Цікавы варыянт абраў іх аднакласнік Марэк Цяхноўскі. Ён, прайшоўшы дадатковы двухгадовы курс, стане такім жа ўладальнікам атэстата аб сярэдняй адукацыі, як і Генрык пасля заканчэння прафесійнай школы. Лешак будзе вучыцца на год болей, чым Марэк. Як і ўсе ліцэісты, ён пройдзе курс профільнага навучання і ў 19 гадоў будзе

---

[19] Михалькевич Г. Н. Протокол и этикет международного общения: Учебное пособие- Мн.: БГУ, 2003. С. 177-178.

трымаць дзяржаўны экзамен. Пасля дадзенага ключавога іспыту ў юнака будзе атэстат, які сведчыць, што для яго ўсе ступені агульнаадукацыйнай школы ужо ў мінулым. Аднакласнікі-ліцэісты зрабілі розны выбар. Лех Занусі паступіў у тэхнікум харчовай прамысловасці з мэтай атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Ванда Палонская – у вышэйшую школу і праз тры з паловай гады прымала віншаванні ў сувязі з тым, што яна – ліцэнцыят. Міне паўгода, і яе аднакласнік Збігнеў Бонэк будзе мець падставы прадстаўляцца як дыпламаваны інжынер. Што ж тычыцца Лешака Навакоўскага, то ён пасля заканчэння ліцэя стане студэнтам гістарычнага факультэта Варшаўскага універсітэта. Яму спатрэбіцца пяць гадоў, каб стаць уладальнікам магістарскага звання. Гэты ж рубеж адначасова возьме былы аднакласнік Лешака па ліцэю – выпускнік палітэхнічнай акадэміі Войцэх Ярульскі. Як бачым, прыведзены прыклад адлюстроўвае як ступені адукацыі, так і віды адукацыйных устаноў.

«85% моладзі атрымліваюць адукацыю ў школах, якія даюць атэстат сталасці. У 1979 годзе кожны другі школьнік з няпоўнай адукацыяй ішоў у трохгадовы тэхнікум. Зараз такую мадэль адукацыі абіраюць толькі 15% маладых людзей.»[20]

Бацькі без малага паўмільёна юных палякаў давяраюць іх выхавацелям дашкольных устаноў. Сёмая частка палякаў вучыцца ў пачатковых, базавых школах, гімназіях і ліцэях. 21 тысяча навучальных устаноў складае корпус агульнаадукацыйных школ. Прынцыпова важна, што ў гэты корпус уваходзяць і школы нацыянальных меншасцяў, якія насяляюць сучасную Польшчу. Так, беларуская нацыянальная адукацыя прадстаўлена без малага 40 школамі, двума ліцэямі. Паказчыкі колькасці агульнаадукацыйных школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў суадносяцца як 2.75 да 1. Што ж тычыцца навучэнскага корпуса гэтых тыпаў устаноў, то тут суадносіны яшчэ больш пераканаўчыя для першага тыпу: 3.5 да 1.

Вышэйшую адукацыю атрымліваюць студэнты 377 навучальных устаноў. Сярод студэнтаў універсітэтаў, акадэмій, вышэйшых школ 99.538% – грамадзяне Польшчы. Астатнія студэнты прадстаўляюць розныя краіны. У структуры замежных грамадзян, якія навучаюцца ў польскіх ВНУ, беларусы складаюць 12.5%.

Для маладых людзей лічыцца прэстыжным паступіць у ключавыя ВНУ былой польскай сталіцы – Кракава: Ягелонскі універсітэт, Эканамічную акадэмію. Высокім узроўнем прафесарска-выкладчыцкага складу традыцыйна адрозніваюцца ВНУ сучаснай сталіцы: Варшаўскі універсітэт, Медыцынская акадэмія, Варшаўская палітэхніка, Вышэйшая гандлёвая школа. Добра вядомы за межамі Польшчы Пазнанскі універсітэт, які носіць імя класіка польскай літаратуры Адама Міцкевіча. Сур`ёзныя падставы ганарыцца сваёй навучальнай установай ёсць у студэнтаў люблінскіх ВНУ: Каталіцкага універсітэта, Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай. Торунскі ўніверсітэт, якому яшчэ шэсць дзесяцігоддзяў таму было прысвоена імя другога выдатнага польскага навукоўца Мікалая Каперніка, пастаянна апраўдвае гэта імя высокім узроўнем падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, значнымі поспехамі ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях.

«У 1989/1990 навучальным годзе ў Польшчы было 378.4 тысяч студэнтаў – зараз іх 1.9 мільёна. За гэты ж час колькасць ВНУ ўзрасла з 98 да 377. Каэфіцыент ахопу вышэйшай адукацыяй моладзі ва ўзросце ад 19 да 24 гадоў павысіўся з 9.8 да 34.5%, а разам са старэйшымі студэнтамі складае цэлых 45.6%. Калі дабавіць да гэтага рост цікавасці палякаў да іншых форм адукацыі, наведванне моўных і камп`ютэрных курсаў, рост колькасці людзей з сярэдняй адукацыяй, то непазбежна напрошваецца выснова, што за апошнія 15 гадоў Польшча стала зусім іншай краінай.»[21]

---

[20] Кучерский В. Хроника (некоторых) текущих событий// Новая Польша. – 2004. –№17. С. 23.
[21] Кучерский В. Хроника (некоторых) текущих событий// Новая Польша. – 2004. – №11. С. 23.

### *5.3. Развіццё навукі, тэхнікі*

Польскі навуковы корпус сканцэнтраваны ва ўстановах двух тыпаў.

Першы тып – установы, якія займаюцца выключна навуковымі даследаваннямі. Базісная частка гэтых устаноў – падраздзяленні Акадэміі навук (АН) Рэспублікі Польшча. Статус навуковых устаноў мае шэраг структур, якія не ўваходзяць у склад АН.

Другі тып – вышэйшыя навучальныя ўстановы. Тут можна сустрэць навукоўцаў, якія працуюць на кафедрах, у спецыялізаваных НДІ пры універсітэтах і акадэміях, у лабараторыях.

Польская навукова-тэхнічная інтэлігенцыя пастаянна дэманструе сваю здольнасць да распрацоўкі найноўшых тэхналогій. Аб гэтым, напрыклад, сведчаць наступныя факты з сучаснай польскай гісторыі.

Навукоўцы Варшаўскай ваенна-тэхнічнай акадэміі пад кіраўніцтвам прафесара, доктара Альфрэды Грачык распрацавалі перспектыўны метад фотадынамічнага дыягназу і лячэння гумарам пры выкарыстанні гематапарфірыну і лазераў.

Вынаходнік з Варшавы Леапольд Ролек прапанаваў на рынак тэхналогій маламерныя гіпсавыя будаўнічыя модулі з тэрмаізаляцыйнай пракладкай. Прафесар, доктар Марыян Шчэрак, доктар Вітальд Пекашэўскі разам са сваімі калегамі па Радамскаму інстытуту тэхналогіі эксплуатацыі вынайшлі прыбор, які вельмі дакладна вызначае ўласлівасці трэння, зносу і змазачных масел.

Супрацоўнікі легніцкага аддзялення інстытута каляровых металаў пад кіраўніцтвам доктара Рышарда Хамера стварылі ўстаноўкі экалагічнай перапрацоўкі адходаў каляровых металаў. Шырокае прызнанне атрымаў рэактар тыпу «Біясет», прызначаны для біялагічнай ачысткі адходаў ад азоту і фосфару. Рэактар – дзецішча таварыства з абмежаванай адказнасцю «Інсталекс-Біяокс» (Варшава), а дакладней Леха Нарбута з яго аднадумцамі. Калектыў Цэнтра абмену тэхналогій пры Варшаўскім політэхнічным інстытуце прапанаваў і дэталёва абгрунтаваў метад мікрабіялагічнага аднаўлення глебаў ад нафтапрадуктаў. Аўтарства арыгінальнага, вельмі эффектыўнага метаду крышталічнага ўпрысквання пры асушэнні будынкаў належыць супрацоўніку Варшаўскай ваенна-тэхнічнай акадэміі Войцэху Наўрату.

Прафесар, доктар Анджэй Аледзкі, доктар Богдан Шымчак, якія працуюць у Варшаўскім політэхнічным інстытуце, – вынаходнікі пратэза «Параподзіум ПВ». У ім маюць вострую патрэбу людзі з паралічом. Яны могуць з дапамогай гэтага пратэза перасоўвацца. Для не менш як 300 гальванічных заводаў сталі істотным элементам вытворчых фондаў безцыянідныя ванны. Патэнт на вынаходніцтва дадзенай ванны выданы на імя Станіслава Шчэпаняка, які ўваходзіць у склад групы вынаходніцтваў і ўкаранення ( г. Кельцэ). Калектыў Варшаўскага інстытута прамысловай хіміі пад кіраўніцтвам доктара Евы Кіцка-Вальчак, прафесара, доктара Эдварда Гжывы прапаноўвае новыя экалагічныя поліэфірныя пластмасы. У акцыянерным таварыстве «ВПРІ ГІДРАЦЭНТРУМ» (Варшава) створаны далявы напаўцыклічны рэактар актыўнага адкладання тыпу «ГІДРАЦЭНТРУМ». У заслугу калектыву інстытута апрацоўкі пластмас трэба паставіць з`яўленне вытворчай лініі тыпу «3W45/2N» для вытворчасці абаронных пакрыццяў. Даследчыцка-вытворчы цэнтр «РЭДОР» (Бельска-Бела) мае ў сваім актыве падводныя змяшальнікі, змяшальнікі для асобных камер дыгерыравання. Многія хіміка-аналітычныя лабараторыі ўсё больш актыўна выкарыстоўваюць мікрахвалявы мінералізатар «Юніклевер» (ТМ). Ён прапанаваны на тэхналагічным рынку ўстановай «Плазматроніка-Сервіс» (Вроцлаў). Расце попыт на надзіманае цеплаізалюючае адзенне, якое было ўпершыню прапанавана інстытутам тэхнічнага тэкстылю «Моратэкс» (Лодзь).

Вынікам мэтанакіраванай працы інстытута авіяцыі (Варшава) стаў «PZL I-23»-чатырохмясцовы самалёт новага пакалення. Свая навінка – вакуумны кантактар «LSV 400» ёсць і ў даследчыцка-прамысловага цэнтра «OPAM» (Лодзь). Супрацоўнікі інстытута тэхнічнага тэкстылю (Лодзь) распрацавалі універсальны метад вытворчасці пнеўматэрмічных нятканых матэрыялаў. Кандыдаты навук Ірэна Граноўская, Антоній Латушак, Марцін Тшцінскі (Цэнтр абмену тэхналогій Варшаўскага політэхнічнага інстытута) стварылі прыбор для атрымання лічбавых здымкаў вока. У гэтым жа цэнтры з'явіліся сістэма аўтаматычнай дыягностыкі лязоў інструментаў, што рэжуць (прафесар Кшыштаў Емяльняк), прыбор для вывучэння астатковых выяваў (кандыдат навук Б. Халачынскі, Ежы Ласоцкі, Уладзімеж Лукасік), эндапратэз галоўкі прамянёвай косткі (прафесары Канстанцін Скальскі, Кшыштаў Кендзёр), новыя акрыла-крухмальныя палімеры (прафесар Збігнеў Бжазоўскі), генератар электратоку пераменнай хуткасці з вывадам пераменнага і пастаяннага току, які прыстасаваны да розных нагрузак (прафесар Уладзімір Качара), робат RNT з паслядоўна-паралельнай структурай, які характарызуецца высокай жорсткасцю і вялікай рабочай паверхняй (кандыдаты навук Кшыштаў Міаноўскі, Казімеж Назарчук), мінісэнсары тыпу «CHEMFET» для разметкі нітратных іонаў (кандыдат навук Войцэх Урублеўскі), прапанаваны прынцыпова новыя тэхналогіі порыстых падшыпнікавых утулак з градыентам уласцівасцяў (кандыдат навук Кароль Кшэмінскі).[22]

Спіс падобных прыкладаў можна прадоўжыць. Трэба таксама заўважыць, што польскія вынаходнікі ўсё актыўней кааперыруюцца са сваімі замежнымі партнёрамі.

### *5.4. Выдатныя дзеячы польскай гісторыі*

У розныя перыяды польскай гісторыі ў ёй можна абавязкова вылучаць дзеячаў, якіх можна ахарактарызаваць як розум, гонар і сумленне польскага народа.

Іх імёнамі названы вуліцы, плошчы, праспекты, навучальныя, адукацыйныя, культурныя ўстановы і г.д. У гонар гэтых людзей у краіне пастаўлена шмат помнікаў.

Вытокі польскай дзяржаўнасці звязаны з імем князя Мешкі І. Архітэктарам дасягнення польскай незалежнасці ў 1918 годзе, ключавой постаццю гісторыі Другой Рэчы Паспалітай быў Юзэф Пілсудскі. Шлях ад сацыялістычнай Польшчы да Трэцяй Рэчы Паспалітай трывала звязаны з імем выдатнага дзеяча антыаўтарытарнага руху Леха Валенсы. Трэцяя Рэч Паспалітая, акрамя Леха Валенсы, адметна такімі дзеячамі, як архітэктар польскіх рэформ Лешак Бальцэровіч, кіраўнік польскай дзяржавы з 1995 па 2005 гг. Аляксандр Кваснеўскі, выдатны дыпламат Б. Герэмек. У 2005 годзе у сувязі з 60-годдзем Вялікай Перамогі палякі вельмі актыўна ўзгадвалі пра Уладзіслава Сікорскага, які ў драматычныя 1939-1943 гг. быў для іх агульнанацыянальным лідэрам.

Сярод палякаў перыяду найноўшай гісторыі самы вялікі рэйтынг паводле розных апытанняў у Іаана Паўла ІІ, які з 1978 па 2005 гг. быў кіраўніком рымска-каталіцкай царквы.

Заўважым, што гэта толькі некаторыя з імён, якія пакінулі яскравы след у польскай гісторыі.

---

[22] Как делать бизнес в Польше. – Варшава: Бюро поддержки инвестиций и технологий ЮНИДО в Варшаве, 2001. С. 199-205.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Ці ёсць падставы сцвярджаць аб інтэграцыі Польшчы ў сусветную культурную прастору?

2. Ці мае Польшча дастаткова інтэлектуальных рэсурсаў для карэннага абнаўлення тэхналагічнага базісу вытворчасці?

3. Якія доўгатэрміновыя наступствы можа мець адукацыйная рэформа ў посткамуністычнай Польшчы?

4. У якой меры ўладныя структуры Польшчы ўлічваюць культурныя патрэбы нацыянальных меншасцяў?

5. Як трансфармацыйныя працэсы паўплывалі на маральна-філасофскія пошукі сучаснай польскай літаратуры?

**Тэст-заданні:**

1) Назавіце польскага паэта XIX ст., чые творы прасякнуты ўспамінамі пра «малую айчыну» – Навагрудчыну.
а) Я. Каханоўскі; б) Ю. Тувім; в) А. Міцкевіч.
2) Хто з`яўляецца заснавальнікам польскай рамантычнай драмы?
а) Ю. Славацкі; б) Ю. Кажанеўскі; в) У. Рэймант.
3) Назавіце перыяд у гісторыі польскай літаратуры, вядомы пад назвай «Маладая Польшча».
а) канец XIX – пачатак XX стст.; б) канец XVIII – пачатак XIX стст.;
в) сярэдзіна XIX ст.
4) Хто з`яўляецца заснавальнікам польскай рэалістычнай прозы?
а) Ю. І. Крашэўскі; б) С. Выспянскі; в) Л. Стаф.
5) На ўзор чаго пабудаваны Тэатр імя Ю. Славацкага ў Кракаве?
а) Крэдытнага і земскага таварыства ў Варшаве;
б) будынка Парыжскай оперы;
в) будынка таварыства сяброў выяўленчага мастацтва ў Кракаве.
6) Калі ў пошуках нацыянальнага стылю польская архітэктура арыентавалася на прыклады венскага СЕЦЭСІЁНУ?
а) у пачатку XIX ст.; б) у сярэдзіне XIX ст.;
в) у канцы XIX – пачатку XX стст.
7) У творчасці якога мастака XIX ст. дасягнуў свайго апагею польскі жывапіс?
а) А. Гротгера; б) Міхалоўскага; в) Я. Матэйкі.
8) Да якога стылю меў непасрэднае дачыненне польскі скульптар У. Аляшчынскі.
а) класіцызм; б) готыка; в) мадэрн.
9) Назавіце заснавальніка польскай музычнай фалькларыстыкі.
а) О. Кольберг; б) Я. Карловіч; в) Ф. Шапэн.
10) Стваральнік польскай класічнай оперы.
а) М. Каменскі; б) Я. Стафані; в) С. Манюшка.
11) Аўтар першага падручніка па польскай арфаграфіі.
а) Я. Паркашовіц; б) П. Саторыўс-Стаенскі; в) В. Патоцкі.
12) Колькі оперных тэатраў налічваецца ў сучаснай Польшчы?
а) 7; б) 8; в) 9.
13) Як называецца галоўная навучальная ўстанова Кракава?
а) Ягелонскі універсітэт; б) Эканамічная акадэмія;
в) вышэйшая школа тэатра, кіно і тэлебачання імя Л. Шылера.
14) Колькі ліцэяў прадстаўляюць беларускую нацыянальную адукацыю ў Польшчы?
а) 3; б) 2; в) 10.
15) У якім узросце польскае дзіця з`яўляецца аб`ектам інтэграванага навучання ў рамках пачатковай школы?
а) з 5 да 9 гадоў; б) з 7 да 10 гадоў; в) з 8 да 11 гадоў.

# РАЗДЗЕЛ ДРУГІ. ГЕРМАНІЯ

*Лекцыя шостая*

## ВУЗЛАВЫЯ ПРАБЛЕМЫ НЯМЕЦКАЙ ГІСТОРЫІ

***План:***

6.1. Германія са старажытных часоў да 1870 года.
6.2. Германія (1871-1918 гг.).
6.3. Веймарская рэспубліка (1919-1933 гг.).
6.4. Германія пад уладаю Гітлера.
6.5. Ад капітуляцыі трэцяга рэйха да гегемоніі Германіі ў Еўропе.

### *6.1. Германія са старажытных часоў да 1870 года*

Пакуль нельга дакладна сказаць, калі з'явіўся першы чалавек на тэрыторыі сучаснай Нямеччыны. Навукоўцы не ставяць пад сумненне той факт, што тут былі людзі ўжо 300 тысяч гадоў да новай эры. Частка з іх сцвярджае, што гэта адбылося 500 тысяч гадоў да новай эры. Вядома, што не германскія плямёны першымі засялілі дадзеную тэрыторыю.Германскія плямёны мігравалі на тэрыторыю сучаснай Нямеччыны з Паўднёвай Скандынавіі, Ютландыі, з узбярэжжаў Балтыйскага і Паўночнага мораў.

Да дадзенае міграцыі тут дамінавалі кельцкія плямёны. Прыблізна ў VI-I стст. да нашай эры яны вымушаны былі саступіць дамінуючую ролю германскім плямёнам.

Першымі, хто ўжыў тэрмін "Германія", былі рымляне. Іх узаемадачыненні з германскімі плямёнамі былі інтэнсіўнымі, што ў канчатковым выніку прывяло да істотных змен у этнічнай структуры на тэрыторыі Нямеччыны. У V-IX стст. н.э. новыя племянныя арганізацыі і саюзы трапілі пад уладу франкаў і сталі складовай часткай насельніцтва Франкскай дзяржавы. Падпарадкаванае становішча германскіх абласцей у межах гэтай дзяржавы было ў асноўным скасавана ў выніку Вердэнскага дагавора 843 года. На геаграфічнай карце з'явілася Каралеўства ўсходніх франкаў. Яго складовымі часткамі з'яўляліся наступныя племянныя герцагствы: Баварыя, Саксонія, Цюрынгія, Франконія, Алеманія (Швабія). Новым этапам ва ўмацаванні Каралеўства ўсходніх франкаў стала далучэнне Латарынгіі і Фрысландыі. Бадай, толькі з пачатку X ст. можна весці размову аб поўнай незалежнасці гэтага каралеўства. Ужо па меры свайго абасаблення германскія вобласці дэманстравалі свае агрэсіўныя памкненні. Перыяд IX-XI стст. вядомы спробамі немцаў падпарадкаваць сваёй уладзе тэррыторыі, населеныя памаранамі, палабскімі славянамі, італьянцамі. У гэты перыяд найбольш відавочных вынікаў у ажыццяўленні агрэсіўнай палітыкі дасягнуў кароль Атон I (936-973). У 951 г. ён падпарадкоўвае сваёй уладзе Паўднёвую Італію, а ў 962 г. – Рым. Атон I вядомы як заснавальнік "Свяшчэннай Рымскай імперыі". Зразумела, ён быў яе першым імператарам. У XII ст. тэрыторыя імперыі была пашырана за кошт тэрыторыі, якую насялялі бодрычы і люцічы. У XIII ст. эсты і лівы сталі аб'ектам каланіяльнага панавання мечаносцаў, а прусы – Тэўтонскага ордэна.

З XIII ст. у Нямеччыне выразна прасочваецца тэндэнцыя да дэцэнтралізацыі. Яна дасягнула свайго завяршэння ў XV ст. Па ўсёй тэрыторыі Нямеччыны ўзніклі самастойныя княствы. У кожным з гэтых княстваў улада князя была абмежавана ландтагам.

Разам з гэтым імперыя юрыдычна працягвала свае існаванне.

Агульныя для ўсіх княстваў пытанні вырашаў рэйхстаг. Не скончылася гісторыя імператараў "Свяшчэннай Рымскай імперыі". Змянілася толькі іх становішча. Не было ўжо той улады, якая існавала раней. Пайшла ў мінулае і спадчыннасць імператарскага трона. Бясспрэчна, абранне імператара было прагрэсіўнай з'явай у тагачасных умовах.

Да Венскага кангрэса 1515 года імператары Свяшчэннай Рымскай імперыі былі патронамі Тэўтонскага ордэна. Менавіта гэты ордэн уяўляў вялікую небяспеку для Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XIII – першай палове XV стст. Значную ролю ў барацьбе супраць крыжакоў адыграла перамога войскаў Вялікага княства Літоўскага, Кароны Польскай пад Грунвальдам 1410 года.

З 1438 года гісторыя германскіх імператараў была неад'емна звязана з родам Габсбургаў. Яны займалі гэты трон на працягу велізарнага перыяду(1438-1806, акрамя 1742-1745 гг.)Цікава, што род Габсбургаў меў дачыненне і да айчыннай гісторыі. Вялікі князь Літоўскі Жыгімонт I быў у шлюбе з унучкай імператара "Свяшчэннай Рымскай імперыі" Максімільяна італьянскай прынцэсай Бонай.

Заўважым, што тэндэнцыя да дэцэнтралізацыі, аб якой мы вялі гаворку вышэй, праявілася і ва ўзнікненні Рэйнскага і Швабскага саюзаў гарадоў, гандлёвага саюзу паўночнанямецкіх гарадоў пад назваю Ганза. Дарэчы, апошняя назва мела непасрэднае дачыненне і да цікавых старонак айчыннай гісторыі. Яшчэ ў пачатку XIII ст. купцы, якія належалі да саюзу Ганза, сталі наведваць гарады беларускага Падзвіння. Беларускія гарады з аднаго боку і Ганза з другога боку толькі выйгралі ад заключэння добра вядомай дамовы 1229 года. Стаў рэальнасцю вольны гандаль смалян, палачан, віцяблян у Рызе, на Гоцкім беразе, іншых месцах. У сваю чаргу ганзейцы атрымалі магчымасць беспера-шкодна займацца сваёй справай у Падзвінні. З сярэдзіны XIII ст. узяла адлік свайго існавання пастаянная ганзейская факторыя ў Полацку, што падкрэсліла ключавую ролю радзімы Скарыны ў гандлёвых сувязях гэтага рэгіёна з Ганзой. Нямецкія купцы разгарнулі актыўную дзейнасць у розных кутках Усходняй Еўропы. Але найбольш спрыяльна да іх ставіліся менавіта ў Полацку. Ганза праіснавала з XIII па XVII стст.

На рубяжы XV і XVI стст. да відавочнай дэцэнтралізацыі дабавіліся яшчэ дзве праблемы.

Па-першае, каталіцкая царква страціла давер значнай часткі немцаў.

Па-другое, рэзка пагоршыўся сацыяльны стан немаёмасных і маламаёмасных слаёў грамадства.

У гэтай сувязі заканамернымі былі Рэфармацыя і сялянская вайна 1524-1525 гадоў у Нямеччыне.

Без звароту да перыяду Рэфармацыі нельга зразумець спецыфіку рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Нямеччыне.

Пасля падаўлення рэфармацыйнага руху ўзмацніліся рэакцыйныя тэндэнцыі ў палітыцы Габсбургаў. Яны сталі праяўляць усё большую агрэсіўнасць. Апантаныя агрэсіўнымі памкненнямі, Габсбургі мелі ўплывовага хаўрусніка ў асобе папы рымскага. Трыццацігадовая вайна 1618-1648 гг. разглядалася імі з пункту гледжання вялікіх тэрытарыяльных прэтэнзій да шэрагу дзяржаў. Аднак ў гэтай вайне рашучую перамогу атрымалі праціўнікі Габсбургаў. Наступствы Трыццацігадовай вайны для Нямеччыны былі толькі са знакам мінус. Сталі відавочнымі крызісныя з'явы ў важнейшых сферах жыцця. Цяжкі лёс напаткаў сялян Памор'я, Брандэнбурга і Усходняй Прусіі. Тут адбылося другое выданне прыгоннага права. Аслаблялі Нямеччыну і тыя абставіны, што некаторыя княствы імкнуліся значна ўмацаваць свае пазіцыі ў межах імперыі. Гэта перш за ўсё тычылася Брандэнбургска-Прускай дзяржавы. Апошняя з 1701 года вядома як каралеўства. З гэтага часу яна набывае і больш звыклую назву: "Прусія". Каралеўства Прусія пераўзыходзіла ўсе астатнія нямецкія дзяржаўныя ўтварэнні і па плошчы, і па колькасці насельніцтва. На працягу XVIII ст. яно неаднойчы гвалтоўна далучала розныя тэрыторыі.

Першы істотны вынік у гэтым напрамку прынесла для Прусіі вайна за аўстрыйскую спадчыну, якая працягвалася 8 год (з 1740 па 1748 гады). У прускі каланіяльны прыгнёт трапілі жыхары Сілезіі. Зусім невялічкая яе частка змагла пазбегнуць цяжкага лёсу.

Прускі кароль разглядаў Сямігадовую вайну 1756-1753 гг. з пункту гледжання значнага ўмацавання пазіцый яго каралеўства ў Нямеччыне, што якраз і адбылося па заканчэнні дадзенай вайны.

На апантаную агрэсіўнымі памкненнямі Прусію без усялякага сумнення можна пакласці значную долю віны за знікненне з палітычнай карты Еўропы Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай да Прусіі былі гвалтоўна далучаны Вармія, Паморскае ваяводства (за выключэннем Гданьска), Мальборкскае і Хэлмінскае ваяводствы (без Торуня), а таксама землі па правым беразе ракі Ноцец. Праніклівы студэнт будзе параўноўваць гэты тэрытарыяльны набытак Берліна з тым, што атрымалі яго хаўруснікі.

Тэрыторыя, захопленая Аўстрыяй, складала 83 тысячы квадратных кіламетраў. На ёй пражывала два мільёны шэсцьсот тысяч чалавек. Хаця тэрытарыяльны набытак Расіі быў на дзесяць тысяч кіламетраў квадратных большым, яго насельніцтва было ў два разы менш. Датычна Прусіі гэтыя наказчыкі складалі: плошча – 36 тысяч квадратных кіламетраў, насельніцтва – 580 тысяч чалавек. Аднак не трэба спяшацца з высновай аб тым, што хаўруснікі вельмі абдзялілі Берлін. Трэба мець на ўвазе і геастратэгічныя меркаванні. Авалодаўшы ніжнім цячэннем Віслы, Прусія ўсталявала поўны кантроль над польскім гандлем. Тэрытарыяльны набытак Берліна пры першым падзеле – гэта якраз тое, што раней аддзяляла асноўную тэрыторыю прускага каралеўства ад Усходняй Прусіі.

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай Прусія далучыла да сябе Вялікую Польшчу і Куявію, стратэгічна важны горад і порт Гданьск. Новы тэрытарыяльны набытак Берліна ўключаў у сябе такія гарады, як Гнезна, Познань, Каліш. Серадз, Плоцк, Торунь.

Аб тым, наколькі ўдалым быў для Прусіі трэці падзел Рэчы Паспалітай, сведчыла ўсталяванне расійска-прускай мяжы на лініі Каўнас – Гародня – Берасце.

Усе падзелы прынеслі Прусіі наступны набытак: тэрыторыю ў 135 тысяч квадратных кіламетраў, якую насялялі 2,3 мільёна чалавек.

Міжнароднае становішча напрыканцы XIX – пачатку XX стст. было не на карысць Прусіі. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывалі і яе ўласныя знешнепалітычныя пралікі. Адным з такіх пралікаў быў удзел Берліна ў першай антыфранцузскай кааліцыі. Базельскі мірны дагавор, падпісаны паміж Берлінам і Парыжам ў 1795 годзе, наўрад ці можна лічыць поспехам прускага каралеўства. Гэта быў поспех рэвалюцыйнай Францыі. Берлін не толькі выйшаў з антыфранцузскай кааліцыі, але і згадзіўся з тым, каб спрадвечныя нямецкія тэрыторыі на левым беразе Рэйна ўвайшлі ў склад Францыі.

Важна зазначыць, што французскі імператар Напалеон І вельмі ўмела вёў лінію ў адносінах да асобных нямецкіх дзяржаў. У 1803 – 1804 гг. Аўстрыя, Баварыя, Бадэн, Вюртэмберг, Прусія атрымліваюць ад яго падарункі ў выглядзе тэрытарыяльных набыткаў. Размова ішла пра прыблізна 200 нямецкіх дзяржаўных утварэнняў, раней захопленых Францыяй.

Гэтыя падарункі трэба разглядаць як пралог да ўзнікнення ў 1806 г. Рэйнскага саюза. Фактычным кіраўніком у гэтым саюзе была Францыя. Адышла ў мінулае " Свяшчэнная Рымская імперыя ".

У 1806 г. Прусія робіць чарговую знешнепалітычную памылку.

Еўропа стала сведкай новай пруска-французскай вайны. Напалеон І меў справу з ваенна-палітычным блокам Аўстрыі, Прусіі, Расіі. Падзеі вайны разгортваліся вельмі пасьяхова для Францыі. За хуткі час яна заваявала ўсе тыя тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай, якія заваявала Прусія ў выніку трох вышэйуказаных падзелаў. Істотным набыткам Парыжа сталі нямецкія землі на левым беразе Эльбы. Польскія землі, якія раней належалі Прусіі, неаднойчы выкарыстоўваліся Напалеонам І ў якасці карты ў складанай палітычнай гульні.

1807 г. Рускія атрымліваюць перамогу над французамі пад Прэйсіш-Эйлау. Напалеон І ужо не супраць, каб прускі манарх Фрыдрых Вільгельм III адначасова быў польскім каралём. Але французскі імператар не атрымаў станоўчага адказу.

Чэрвень 1807 г. Зыходзячы з вынікаў бітвы пад Фрыдландам, Напалеон І спадзяваўся на згаворлівасць Расіі, што прадэманстраваў Тыльзіцкі дагавор 1807 г., падпісаны паміж Францыяй і Расіяй. У выніку з'яўлення гэтага дагавора Аўстрыя і Прусія страцілі ў асобе Расіі ўплывовага хаўрусніка. Прусія атрымала вельмі цяжкі ўдар. У час перамоваў французскі імператар быў гатовы аддаць Расіі ўказаныя польскія землі. Але Пецярбург адмоўна рэагаваў на гэты ход Парыжа.

Паводле Тыльзіцкай дамовы, лёс шэрагу зямель, якія належалі Прусіі, быў наступны. Тэрыторыя на левым беразе Эльбы стала складовай часткай зноў ствараемага Вестфальскага каралеўства. З поўнага тэрытарыяльнага набытку Прусіі па выніках трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай і частковага тэрытарыяльнага набытку гэтай жа дзяржавы па выніках другога падзелу Рэчы Паспалітай было ўтворана Варшаўскае герцагства агульнай плошчай 1850 квадратных міль. Расія далучыла да сябе Беластоцкую акругу. Гданьск набыў статус вольнага горада. Прадугледжвалася апека над ім з боку Прусіі і Саксоніі.

Цяжкія наступствы для Прусіі мела яе мірная дамова з Францыяй, падпісаная ў ліпені 1807 года ў Тыльзіце. Усталёўвайся жорсткі ліміт для прускіх узброеных сіл – 40 тысяч чалавек. Парыж атрымліваў ад Берліна 100 мільёнаў франкаў кантрыбуцыі. Прусія ўзяла на сябе абавязацельствы аб далучэнні да кантынентальнай блакады ў адносінах да Велікабрытаніі.

Прусія, дзяржавы Рэйнскага саюза, Аўстрыя, а таксама іншыя дзяржавы ўдзельнічалі ў вайне Францыі супраць Расіі, распачатай Напалеонам 10 (22) чэрвеня 1812 года. Пасля таго як вызначыўся пералом ў вайне на карысць Расіі, Прусія зноў стала хаўрусніцай апошняй. У выніку паспяховых ваенных дзеянняў Расіі і яе хаўруснікаў нямецкія дзяржавы былі ў 1813 годзе пазбаўлены напалеонаўскага панавання.

Венскі кангрэс 1814-1815 гг. прадвырашыў шэраг змен у становішчы нямецкіх дзяржаў.

У час працы гэтага кангрэса былі відавочны супярэчнасці, якія, у прыватнасці, закранапі і інтарэсы гэтых дзяржаў. З трэцяга студзеня 1815 года пачаў свой адлік хаўрус Англіі, Францыі і Аўстрыі. Хаўруснікаў аб'яднала імкненне перайграць ў дыпламатычнай гульні Расію і Прусію. Прусія змагла толькі часткова задаволіць свае тэрытарыяльныя патрабаванні. Кангрэс вырашыў, што ёй павінна належаць заходняя частка Варшаўскага герцагства з горадам Познань. Удзельнікі Венскага форуму былі згодны з прускім панаваннем над паўночнай часткай Саксоніі, Рэйнскай правінцыяй, Вестфаліяй, часткай Памор'я.

Важным вынікам кангрэса стала ўзнікненне Германскага саюза.

Лідэрам гэтага саюза з'яўлялася Аўстрыя. Складовымі часткамі дадзенага саюза былі 39 нямецкіх дзяржаў, герцагствы Люксембург і Гальштынія. Заўважым, што Люксембург прызнаваў уладу нідэрландскай кароны, а Гальштынія састаяла ў асабістай уніі з Даніяй.

Першынства Аўстрыі ў Германскім саюзе вельмі адмоўна ўспрымалася Берлінам. Прусія не пакідае спроб аднавіць ранейшае становішча сярод нямецкіх дзяржаў. Першай удалай спробай у гэтым напрамку з'явілася ўзнікненне ў 1834 годзе Мытнага хаўрусу, у склад якога ўвайшло 18 нямецкіх дзяржаў. Прусія была фактычным кіраўніком гэтага хаўрусу. На карысць Берліна былі тыя абставіны, што Аўстрыя не з'яўлялася яго членам.

### *6.2. Германія (1871-1918 гг.)*

Прусія вельмі ўдала выкарыстала тыя спрыяльныя ўмовы для аб'яднання Нямеччыны, якія склаліся ў 50–60-ыя гг. XIX ст. Бліскуча была ажыццёўлена стратэгія, распрацаваная прускім канцлерам О.Бісмаркам. Апошні займаў гэту пасаду з 1862 г. Паспяхова для Берліна скончыліся дацкая вайна 1864 г. і

аўстра-пруская вайна 1866 г. Кануў у лету Германскі саюз. Тэрытарыяльны набытак радзімы Бісмарка склаў 73 тыс. квадратных кіламетраў. На гэтай тэрыторыі пражывала каля 4 мільёнаў чалавек. Выдатным дасягненнем бісмаркаўскай дыпламатыі з'явілася ўзнікненне Паўночнагерманскага саюза. У яго склад увайшлі 22 краіны на поўнач ад ракі Майн. Вельмі дарэчы быў хаўрус з Баварыяй, Бадэнам, Гесенам, Дармштатам і Вюртэмбергам, якога дамогся прускі канцлер.

Заключным этапам барацьбы Бісмарка за аб'яднанне Нямеччыны з'явілася франка-пруская вайна 1870-1871 гг. У сферу прускага панавання трапілі Эльзас і Усходняя Латарынгія. З 1871 года пачала адлік свайго існавання Германская імперыя. Яе першым манархам стаў прускі кароль Вільгельм І. Прававым грунтам імперыі з'явілася Канстытуцыя 1871г. Пасля аб'яднання краіны стала вельмі дынамічна развівацца яе эканоміка і, як вынік, Германія ўступіла ў XX стагоддзе, займаючы вельмі значнае месца ў сусветным эканамічным табелі аб рангах. З цягам часу набыла рэальныя абрысы партыйная сістэма. У ёй былі прадстаўлены партыя Цэнтра, сацыял – дэмакраты і іншыя партыі. Важна адзначыць, што на момант германскага аб'яднання існавалі дзве партыі працаатрымальнікаў у гэтай краіне: Усеагульны германскі рабочы саюз (УГРС) і Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя(СДРП). 1875 год адзначаны іх аб'яднаннем і, натуральна, пачаткам існавання Сацыялістычнай рабочай партыі Германіі (СРПГ). У 1890 годзе апошняя партыя была перайменавана ў Сацыял-дэмакратычную партыю Германіі(СДПГ).

Бісмарк разглядаў аб'яднанне Нямеччыны як падмурак для задавальнення сваіх непамерных амбіцый. Размова ішла перш за ўсё аб імкненні Берліна да гегемоніі ў Старым Свеце. Расклад сіл у тагачаснай Еўропе быў такі, што для дасягнення гэтай мэты трэба было праявіць выключнае дыпламатычнае мас-тацтва. Значную перашкоду ўяўляла пазіцыя Францыі. Каб зняць гэту перашкоду, Германія была зноў гатова з ёй ваяваць. Але на карысць Парыжа быў падыход Лондана і Пецярбурга, што ў канчатковым выніку прадухіліла ваеннае сутык-ненне паміж дадзенымі дзяржавамі. Максімум, чаго дамаглася бісмаркаўская дыпламатыя, было стварэнне Траістага саюза ў складзе Германіі, Аўстра – Венгрыі і Італіі. Пачатак гэтаму саюзу паклала дамова Берліна з Венай 1879 г. У 1882 годзе Рым стаў хаўруснікам Берліна і Вены. Траістаму саюзу супрацьстаяла Антанта. Лагічным завяршэннем гэтага супрацьстаяння з'явілася першая сусветная вайна 1914-1918 гг. Дадзеная вайна непасрэдным чынам закранула і нашу Айчыну. Упершыню з 1410 года ўзброеныя немцы ўступілі на беларускую зямлю. Нямеччына не мела намеру ў выпадку завяршэння вайны пашыраць сваю тэрыторыю за кошт Паўночна-Заходняга края. Да верасня 1915 года немцы падышлі да лініі Дынебург-Браслаў-Паставы-Смаргонь-Баранавічы–Пінск-Луцк і не рухаліся далей гэтай лініі да 18 лютага 1918 года. Нямеччына захапіла частку беларускай тэрыторыі, роўную 50 тысячам квадратных кіламетраў.

Увосень 1915 года немцы акупіравалі значныя паўночна-ўсходнія тэры-торыі (па іх тэрміналогіі). Важная частка гэтых тэрыторый агульнай плошчай 109 тысяч квадратных кіламетраў атрымала назву Обер Ост. Размова ішла пра вайскова-адміністрацыйны абшар, у склад якога ўваходзілі і карэнныя бе-ларускія землі. Увесну 1917 года гэты абшар меў наступныя складовыя часткі: Літву, Курляндыю і Беластоцка-Гародзенскую акругу. Апошняя з гэтых частак якраз і ўключала гэтыя землі. Яна мела плошчу прыблізна 17 тысяч квадратных кіламетраў. Праніклівы студэнт, канешне ж, пацікавіцца аб лёсе астатніх 33 тысяч квадратных кіламетраў беларускай тэрыторыі, захопленых Нямеччынай. Яны з'яўляліся складовай часткай зоны вайсковых аперацый. Заходняя мяжа гэтай зоны супадала з усходняй мяжой Обер Оста. Яе ўсходняя мяжа пачыналася там, дзе мела месца ваеннае супрацьстаянне паміж Расіяй і Нямеччынай.

Пасля Кастрычніцкага перавароту 1917 года ў Расіі Паўночна-Заходні край стаў аб'ектам гандлю паміж Петраградам і Берлінам. З сакавіка 1918 года Савецкая Расія падпісала мірны дагавор з кайзераўскай Нямеччынай, Аўстра-

Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй. Да немцаў адышла частка беларускай тэрыторыі, размешчаная на захад ад лініі Дзвінск-Свянцяны-Ліда-Пружаны-Берасце. Берлін задавальняла ўзнікненне «малой Літвы». Пад «малой Літвой» немцы мелі на ўвазе не толькі карэнныя літоўскія землі, але і Віленшчыну, і Гародзеншчыну. У сферу нямецкай акупацыі трапіла большасць паветаў Паўночна-Заходняга края. Выключэнне склалі 14 паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерній: Віцебскі, Гарадоцкі, Клімавіцкі, Мсціслаўскі, Чавускі, Чэрыкаўскі, часткова Аршанскі, Быхаўскі, Гомельскі, Горацкі, Магілёўскі, Рагачоўскі і Сенненскі. Нямецкая вайсковая прысутнасць на беларускай зямлі пачала часткова скарачацца пасля таго, як 27 жніўня 1918 года была падпісана дадатковая савецка-нямецкая дамова. Артыкул 3 гэтай дамовы выключаў дадзеную прысутнасць на ўсход ад ракі Бярэзіны. Ужо ў верасні –кастрычніку 1918 года частка валасцей Аршанскага, Лепельскага, Магілёўскага, Полацкага і Сенненскага паветаў была вернута ў стан, які існаваў да нямецкай акупацыі.

Лёс Берасцейскай мірнай дамовы быў у значнай ступені прадвызначаны пачаткам Лістападаўскай рэвалюцыі 1918 года ў Нямеччыне. Адышла ў мінулае манархічная форма кіравання. З дзевятага лістапада 1918 года пачала адлік свайго існавання нямецкая рэспубліка. Выкарыстоўваючы спрыяльны момант, Савецкая Расія скасавала Берасцейскую мірную дамову. Улічваючы цяжкае становішча краіны, новы нямецкі ўрад падпісаў 11 лістапада 1919 года замірэнне з Антантай.

### *6.3. Веймарская Рэспубліка*

З лютага 1919 года пачаў адлік сваёй гісторыі перыяд існавання Веймарскай Рэспублікі. Менавіта тады ўстаноўчы сход у Веймары абвясціў Нямеччыну рэспублікай, прыняў Асноўны Закон германскай дзяржавы. Напрыканцы чэрвеня 1919 года ў Версалі паміж дзяржавамі – пераможцамі і пераможнай Нямеччынай была падпісана мірная дамова, якая падвяла рысу пад першай сусветнай вайной. Берлін пасля ратыфікаваў гэтую дамову. Версальская мірная дамова была вельмі цяжкім ударам па нямецкіх нацыянальных інтарэсах. Берлін пазбаўляўся свайго тэрытарыяльнага набытку па выніках франка-прускай вайны 1870-1871 гг. (Эльзаса і Латарынгіі) на карысць Парыжа. Французы станавіліся замест немцаў гаспадарамі капален вугалю ў Саарскім басейне. Лёс дадзенага басейна на працягу паўтара дзесятка гадоў павінна была вырашаць Ліга Нацый. Выразна акрэслівалася рэйнская дэмілітарызаваная зона. У сферу поўнай дэмілітары-зацыі ўключаліся левы бераг Рэйна, на тэрыторыі якога на працягу паўтара дзесятка гадоў павінны былі размяшчацца войскі Антанты і правы бераг Рэйна шырынёй 50 км. Суседзі Нямеччыны былі задаволены тым, што паводле Версальскай мірнай дамовы ў некаторых месцах павінны былі адбыцца плебісцыты. Гэта дала ім магчымасць пашырыць сваю тэрыторыю. Бельгія набыла такім чынам акругі Эйпен і Мальмеды, Данія – Шлезвіг–Гальшэйн, Польшча – частку Верхняй Сілезіі. Паводле Версальскай мірнай дамовы, Аўстрыя, Польшча, Чэхаславакія былі для Нямеччыны паўнапраўнымі суб'ектамі міжнародных зносін. Складовай часткай маладой Чэхаславацкай дзяржавы станавіўся Гульчынскі раён. Берлін быў згодны з тым, каб Варшава атрымала частку Памераніі, Познань, шэраг раёнаў Прусіі. Статус вольнага горада атрымаў Данцыг (Гданьск). Нямеччына адмаўлялася на карысць дзяржаў-пераможцаў ад Мемеля (Клайпеды). Нямеччына страчвала ўсе свае калоніі. Яны трапілі пад мандат Лігі Нацый. Адышлі ў мінулае правы і прывілеі Нямеччыны ў залежных і паўзалежных краінах. Імі завалодалі дзяржавы, якія перамаглі ў першай сусветнай вайне.

У Нямеччыне скасоўвалася абавязковая вайсковая служба. Усталёўваўся жорсткі ліміт у 100 тысяч чалавек-добраахвотнікаў для ўзброеных сіл. Адыходзіў у мінулае нямецкі генеральны штаб. Выразна акрэсліваўся даволі сціплы ліміт для ваенна-марскіх сіл: 6 браняносцаў, 6 лёгкіх крэйсераў, 12 контрмінаносцаў і 12 мінаносцаў. Было прынята рашэнне і аб рэпарацыйных выплатах з боку Нямеччыны.

Акрамя таго, у Версальскай мірнай дамове меўся і шэраг іншых палажэнняў, якія ўшчамлялі інтарэсы Берліна. Зразумела, у пасляверсальскі перыяд Берлін рабіў шэраг намаганняў з тым, каб выправіць узнікшае становішча.

Першым крокам на шляху пераадольвання знешнепалітычнай ізаляцыі Нямеччыны стала падпісанне Рапальскай дамовы 1922 года паміж Берлінам і Масквой. Кінуўшы выклік сусветнай супольнасці, СССР адыграў пэўную ролю ў аднаўленні германскага ваеннага патэнцыялу.

Заўважым, што яшчэ ў 1920 годзе галоўнакамандуючы рэйхсверам Х. фон Сект спрабаваў пакласці пачатак савецка-германскаму ваеннаму супрацоўніцтву. У 1921-1923 гадах была распрацавана канцэпцыя такога супрацоўніцтва. Ужо ў 1924-1926 гадах на тэрыторыі былога СССР з'явіліся наступныя ваенныя вучэбныя цэнтры рэйхсвера: лётная школа пад Ліпецкам, танкавая школа пад Казанню, аэрахімічная станцыя пад Саратавам. Немцы азнаёміліся ў названых школах з найноўшымі тыпамі самалётаў і танкаў. Складовай часткай знаходжання нямецкіх спецыялістаў на ўказанай станцыі з'явіўся іх удзел у выпрабаваннях хімічнай зброі.

Шэраг прадпрыемстваў на тэрыторыі былога СССР выконваў нямецкія ваенныя заказы. Назавём, у прыватнасці, авіяцыйны завод у Філях (з удзелам «Юнкерса»), хімічны завод «Берсаль» па вытворчасці атрутных рэчываў бліз Самары (з удзелам «Штольцэнберга»), заводы, якія спецыялізаваліся на вытворчасці боепрыпасаў для артылерыі (з удзелам «Крупа»). Сур'ёзным вынікам савецка-германскага ваеннага супрацоўніцтва з'явіўся пачатак у 1925 годзе серыйнай вытворчасці цэльнаметалічнага самалёта на заводзе ў Філях.

Не меншую адказнасць за адраджэнне нямецкага ваеннага патэнцыялу нясуць і заходнія дзяржавы. Нагадаем, у прыватнасці, пра план Даўэса, рашэнне Гаагскай канферэнцыі 1930 года аб скасаванні кантролю над эканомікай Нямеччыны. Дзякуючы гэтым дзяржавам, яна ўмацоўвала сваё знешнепалітычнае становішча. 16 кастрычніка 1925 года быў падпісаны Рэйнскі гарантыйны пакт. Тым самым быў замацаваны статус-кво заходніх межаў дадзенай краіны. Нямеччына стала членам Лігі Нацый. Сур'ёзным поспехам для яе было атрыманне пастаяннага месца ў савеце гэтай уплывовай міжнароднай арганізацыі.

Веймарская Рэспубліка – гэта першы вопыт германскай дэмакратыі, першая германская рэспубліка. У рэальным напаўненні гэтай дэмакратыі былі зацікаўлены партыі веймарскай кааліцыі, якія былі ля ўлады да 1920 г. (рэйхсканцлер Шэйдэман). Размова ідзе аб Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ), партыі Цэнтра, Германскай дэмакратычнай партыі. У сувязі з вельмі складанай унутрыгерманскай сітуацыяй з 1920 года замест веймарскай кааліцыі ўрадавую адказнасць неслі выключна буржуазныя партыі. Спачатку вышэйшую выканаўчую уладу ўзначальвалі прадстаўнікі партыі Цэнтра (Канстанцін Ферэнбах, Йозеф Вірт), Вільгельм Куно, які не належаў ні да адной партыі. Зусім кароткі час (жнівень – лістапад 1923 г.) на чале выканаўчай улады знаходзіўся старшыня нямецкай народнай партыі Густаў Штрэземан. Сацыял-дэмакраты нейкі час зноў утваралі кааліцыю разам з буржуазнымі партыямі. Усе названыя ўрады 1919 - 1923 гг. ажыццяўлялі ўладныя паўнамоцтвы ва ўмовах эканамічнага крызісу. Пасля краху ўрада Штрэземана сацыял – дэмакраты аж да траўня 1928 г. не неслі ўрадавай адказнасці. Несумненна, у значна лепшых умовах дзейнічалі ўрады, якія ўзначальвалі рэйхсканцлеры Вільгельм Маркс, Ганс Лютэр. Гэта быў перыяд часовай частковай стабілізацыі германскага капіталізму.

Па Веймарскай Рэспубліцы вельмі моцна ўдарыў сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг. З сакавіка 1930 г. сацыял-дэмакраты не былі больш прадстаўлены ў вышэйшым органе выканаўчай улады. Ён фарміраваўся ўжо выключна буржуазнымі партыямі, узначальваўся спачатку Г. Брунінгам (1930-1932 гг.), затым Ф. фон Папенам (1932г.) і, нарэшце, К. фон Шляйхерам (1932-1933 гг.).

### *6.4 .Германія пад уладаю Гітлера*

Дыскрымінацыйнае становішча Нямеччыны ў міжнародным супольніцтве, наяўнасць складаных сацыяльных праблем у гэтай краіне ў час сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. былі вельмі ўдала выкарыстаны нямецкімі нацыянал-сацыялістамі. 30 студзеня 1933 года яны прыходзяць да ўлады. Пачынаецца дванаццацігадовы перыяд існавання так званага трэцяга рэйха. Правадыр нацыянал-сацыялістаў рэйхсканцлер А. Гітлер яшчэ задоўга да 30 студзеня 1933 года ў сваёй кнізе «Мая барацьба» заклікаў немцаў змагацца за сусветнае панаванне. Нацысцкі рэйхсканцлер дзейнічаў ва ўмовах спрыяльнага для яго міжнароднага становішча. У інтарэсах Нямеччыны былі як пазіцыя Захаду, так і падыход былога СССР.

Спачатку назавём факты, якія ляжалі на сумленні заходніх палітыкаў.

1933 год. Лондан і Парыж падпісваюць з Берлінам і Рымам «Пакт чатырох».

1935 год. Лондан і Берлін заключаюць паміж сабой марскую дамову.

1936-1937 гады. Узнікае хаўрус Берлін-Рым-Токіо.

1938 год. Лондан і Парыж падтрымліваюць на Мюнхенскай канферэнцыі тэрытарыяльныя патрабаванні Берліна ў адносінах да Чэхаславакіі.

Але не меншую долю віны за стварэнне спрыяльнага для гітлераўскай Нямеччыны міжнароднага становішча нёс і былы СССР. Вядома, што сталінскі рэжым меў шэраг агульных рыс з парадкамі ў тагачаснай Нямеччыне. Напрыклад, НКУС дзяліўся сваім вопытам з нямецкім гестапа.

Да траўня 1939 года Народны Камісарыят Замежных Спраў СССР узначальваў М. М. Літвінаў, які выступаў за хаўрус Крамля з традыцыйнымі заходнімі дэмакратыямі, супраць збліжэння з нацысцкай Нямеччынай. У траўні 1939 года М. М. Літвінава мяняе на гэтай высокай пасадзе В. М. Молатаў. З новым наркомам быў звязаны курс на збліжэнне з Берлінам. 23 жніўня 1939 года паміж СССР і Нямеччынай быў падпісан пакт аб ненападзе, а 28 верасня таго ж года заключана дамова аб сяброўстве і мяжы. І да пакта, і да дамовы былі прыкладзены адпаведныя сакрэтныя пратаколы.

Зараз звернем увагу на тэкст гэтых пратаколаў.

"ИМПЕРСКИЙ МИНИСТР ИНОСТРАННЫХ ДЕЛ
ГЕРМАНСКОМУ ПОСЛУ В МОСКВЕ.
Телеграмма

Отправлена из Берлина 20 августа 1939 -16 час.25 мин. Получена в Москве 21 августа 1939-00 час. 45мин. Москва.

Телеграмма N 189 от 20 августа. Срочно! Лично господину послу.

Фюрер уполномачивает Вас немедленно явиться к Молотову и вручить ему следующую телеграмму Фюрера для господина Сталина:

«Господину Сталину, Москва.

1. Я искренне приветствую подписание нового германо-советского торгового соглашения как первую ступень перестройки германо-советских отношений.

2. Заключение пакта о ненападении с Советским Союзом означает для меня определение долгосрочной политики Германии. Поэтому Германия возобновляет политическую линию, которая была выгодна обоим государствам в течение прошлых столетий. В этой ситуации Имперское правительство решило действовать в полном соответствии с такими далеко идущими изменениями.

3. Я принимаю проект пакта о ненападении, который передал мне Ваш Министр иностранных дел господин Молотов, и считаю крайне необходимым как можно более скоро выяснение связанных с этим вопросов.

4. Я убежден, что дополнительный протокол, желаемый советским правительством, может быть выработан в возможно короткое время, если ответственный государственный деятель Германии сможет лично прибыть в Москву для перего-

воров. В противном случае, имперское правительство не представляет, как дополнительный протокол может быть выработан и согласован в короткое время.

5. Напряженность между Германией и Польшей стала невыносимой. Поведение Польши по отношению к великим державам таково, что кризис может разразиться в любой день. Перед лицом такой вероятности, Германия в любом случае намерена защищать интересы государства всеми имеющимися в ее распоряжении средствами.

6. По моему мнению, желательно, ввиду намерений обеих стран, не теряя времени, вступить в новую фазу отношений друг с другом.

Поэтому я еще раз предлагаю принять моего Министра иностранных дел во вторник, 22 августа, самое позднее в среду, 23 августа. Имперский Министр иностранных дел имеет полные полномочия на составление и подписание как пакта о ненападении, так и протокола. Принимая во внимание международную ситуацию, Имперский Министр иностранных дел не сможет остаться в Москве более, чем на один-два дня. Я буду рад получить Ваш скорый ответ. Адольф Гитлер.»

Пожалуйста, передайте господину Молотову вышеприведенную телеграмму Фюрера Сталину в письменном виде на листе бумаги без заглавия.

Риббентроп

## СЕКРЕТНЫЙ ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЙ ПРОТОКОЛ К «ГЕРМАНО-СОВЕТСКОМУ ДОГОВОРУ О НЕНАПАДЕНИИ», ЗАКЛЮЧЕННЫЙ В МОСКВЕ 23 АВГУСТА 1939 г.

При подписании договора о ненападении между Германией и Союзом Советских Социалистических Республик нижеподписавшиеся уполномоченные обеих сторон обсудили в строго конфиденциальном порядке вопрос о разграничении сфер обоюдных интересов в Восточной Европе. Это обсуждение привело к следующему результату:

1. В случае территориально-политического переустройства областей, входящих в состав Прибалтийских государств (Финляндия, Эстония, Латвия, Литва), северная граница Литвы одновременно является границей сфер интересов Германии и СССР.

При этом интересы Литвы по отношению Виленской области признаются обеими сторонами.

2. В случае территориально-политического переустройства областей, входящих в состав Польского Государства, граница сфер интересов Германии и СССР будет приблизительно проходить по линии рек Нарев, Висла и Сана.

3.Вопрос, является ли в обоюдных интересах желательным сохранение независимого Польского Государства и каковы будут границы этого государства, может быть окончательно выяснен только в течение дальнейшего политического развития.

Во всяком случае, оба Правительства будут решать этот вопрос в порядке дружественного обоюдного согласия.

4. Касательно юго-востока Европы с советской стороны подчеркивается интерес СССР к Бессарабии. С германской стороны заявляется о ее полной политической незаинтересованности в этих областях.

5.Этот протокол будет сохраняться обеими сторонами в строгом секрете.

Москва, 23 августа 1939 года

По уполномочию Правительства СССР

В. МОЛОТОВ

За Правительство Германии

И. РИББЕНТРОП

## ГЕРМАНО-СОВЕТСКИЙ ДОГОВОР О ДРУЖБЕ И ГРАНИЦЕ МЕЖДУ СССР И ГЕРМАНИЕЙ, ЗАКЛЮЧЕННЫЙ В МОСКВЕ

28 сентября 1939 года

Правительство СССР и Германское Правительство после распада бывшего Польского Государства рассматривают исключительно как свою задачу восстановить мир и порядок на этой территории и обеспечить народам, живущим там, мирное существование, соответствующее их национальным особенностям. С этой целью они пришли к соглашению в следующем:

Статья I

Правительство СССР и Германское Правительство устанавливают в качестве границы между обоюдными государственными интересами на территории бывшего Польского государства линию, которая нанесена на прилагаемую при сем карту и более подробно будет описана в дополнительном протоколе.

Статья II

Обе стороны признают установленную в статье I границу обоюдных государственых интересов окончательной и устранят всякое вмешательство третьих держав в это решение.

Статья III

Необходимое государственное переустройство на территории западнее указанной в статье-I линии производит Германское Правительство, на территории восточнее этой линии-Правительство СССР.

Статья IV

Правительство СССР и Германское Правительство рассматривают вышеприведенное переустройство как надежный фундамент для дальнейшего развития дружественных отношений между своими народами.

Статья V

Этот договор подлежит ратификации. Обмен ратификационными грамотами должен произойти возможно скорее в Берлине.

Договор вступает в силу с момента его подписания. Составлен в двух оригиналах, на немецком и русском языках.

За Правительство Германии — И. РИББЕНТРОП

По уполномочию Правительства СССР — В. МОЛОТОВ

### Секретный дополнительный протокол.

Нижеподписавшиеся полномочные представители заявляют о соглашении Правительства Германии и Правительства СССР в следующем:

Секретный дополнительный протокол, подписанный 23 августа 1939 года, должен быть исправлен в пункте 1., отражая тот факт, что территория Литовского государства отошла в сферу влияния СССР, в то время, когда, с другой стороны, Люблинское воеводство и часть Варшавского воеводства отошли в сферу влияния Германии. Как только Правительство СССР примет специальные меры на литовской территории для защиты своих интересов, настоящая Германо-Литовская граница, с целью установления естественного и простого пограничного описания, должна быть исправлена таким образом, чтобы Литовская территория, расположенная к юго-западу от линии, обозначенной на приложенной карте, отошла к Германии.

Далее заявляется, что ныне действующее экономическое соглашение между Германией и Литвой не будет затронуто указанными выше мероприятиями Советского Союза.

Москва, 28 сентября 1939 года

И. РЕББЕНТРОП

В. МОЛОТОВ

СЕКРЕТНЫЙ ПРОТОКОЛ

Москва, 10 января 1941 года

Совершенно секретно!

Германский посол граф фон Шуленбург, полномочный представитель Правительства Германской Империи, с одной стороны, и Председатель Совета Народных Комиссаров СССР В.М. Молотов, полномочный представитель Правительства СССР, с другой стороны, согласились в следующем:

1. Правительство Германской Империи отказывается от своих притязаний на полосу литовской территории, упомянутой в Секретном Дополнительном Протоколе от 28 сентября 1939 года и обозначенной на карте, приложенной к этому протоколу.

2. Правительство Союза Советских Социалистических Республик готово компенсировать Правительству Германской Империи территорию, упомянутую в статье 1 данного Протокола, выплатой Германии 7.500.000 золотых долларов, или 31.500 тысяч марок.

Сумма в 31,5 миллиона марок будет выплачена Правительством СССР в следующей форме: одна восьмая, т.е. 3.937.500 марок, -поставками цветных металлов в течение трех месяцев с момента подписания Протокола, остающиеся семь восьмых, или 27.562.500 марок, – золотом, путем вычета из платежей германского золота, которые Германия должна произвести к 11 февраля 1941 г. в соответствии с письмами, которыми обменялись Председатель Германской Экономической Делегации д-р Шнурре и Народный Комиссар Внешней торговли СССР А.И. Микоян в связи с «Соглашением от 10 января 1941 года о взаимных поставках во втором договорном периоде на базе Хозяйственного Соглашения между Германской Империей и Союзом Советских Социалистических Республик от11 февраля 1940 года.»

3. Данный протокол составлен в двух оригиналах, на немецком и русском языках каждый, и вступает в силу немедленно после его подписания.

За правительство Германии

ШУЛЕНБУРГ

По уполномочию Правительства СССР

В. МОЛОТОВ

Крыніца: Спадчына, 1994,№ 1. С. 79-84."

Цікава параўнаць надрукаваныя тут сакрэтныя пратаколы. Паводле сакрэтнага пратакола да пакта аб ненападзе, Крэмль быў не супраць, каб немцы гаспадарылі ў Літве. Сакрэтны пратакол да дамовы аб сяброўстве і мяжы сведчыў аб тым, што Літва ўжо ўваходзіла ў «сферу ўплыву» Крамля. У гэтай сувязі Масква прапанавала Берліну ракіроўку, з якой апошні пагадзіўся. Яна адмаўлялася на карысць хаўрусніка ад Люблінскага ваяводства і часткі Варшаўскага ваяводства.

Зараз шэраг навукоўцаў лічаць, што менавіта германа-савецкі хаўрус адыграў галоўную ролю ў развязванні другой сусветнай вайны. Яны нават прыходзяць да наступнай высновы: каб не было гэтага хаўрусу, можна было б пазбегнуць вайны. Не ўсе архівы, прысвечаныя трыццатым гадам, даступны зараз навукоўцам. Таму гэту смелую выснову пакуль нельга лічыць ісцінай у апошняй інстанцыі. Але наўрад ці яе можна лёгка поўнасцю абвяргаць, зыходзячы з існуючай крыніцазнаўчай базы.

Так, Нямеччына распачала свае агрэсіўныя дзеянні супраць суверэннай, незалежнай Польшчы 1 верасня 1939 года,а СССР – 17 верасня 1939 года.

Разам з гэтым дзеля гістарычнай справядлівасці трэба зазначыць, што Вялікабрытанія і Францыя, якія з 3 верасня 1939 года знаходзіліся ў стане вайны з Нямеччынай, практычна аніяк не дапамаглі Польшчы. Парыж, Лондан

і іх саюзнікі з самага пачатку другой сусветнай вайны аж цэлых дзевяць месяцаў вялі так званую дзіўную вайну. Дзіўная вайна – гэта па сутнасці працяг мюнхенскага курсу Велікабрытаніі і Францыі. Яны фактычна лічылі за лепшае "ўлагодзіць" Гітлера, заплюшчыць вочы на яго агрэсію супраць іншых краін, спадзеючыся на тое, што ў канчатковым выніку французская і брытанская тэрыторыі не стануць аб'ектам германскай агрэсіі.

Зразумела,што на Берлін працавалі і тыя абставіны, што германскі вектар набыў месца прыярытэтнага ў еўрапейскай палітыцы Масквы.

Паміж СССР і гітлераўскай Нямеччынай усталёўваецца цеснае супрацоўніцтва ў самых розных галінах. Ваенны накірунак быў адным з галоўных у гэтым супрацоўніцтве. Кіраўніцтва СССР выдавала гітлераўцам ваенныя сакрэты сваёй краіны, садзейнічала ўмацаванню нямецкага ваенна-эканамічнага патэнцыялу. Сталінская прапаганда ўнушала свайму народу, што менавіта англа-французскі імперыялізм развязаў другую сусветную вайну. А між тым усё больш пашыралася тэрыторыя, на якую распаўсюджвалася агрэсія фашысцкай Нямеччыны. У 1940 годзе не ўстаялі перад салдатамі вермахта Данія, Нарвегія, краіны Бенілюкса, Францыя. Цяжкім паражэннем для Францыі і вялікім трыумфам для Нямеччыны стала Камп'енскае замірэнне 1940 года. Яно было падпісана ў Камп'енскім лесе, у тым самым вагончыку, у якім немцы заявілі французам аб капітуляцыі ў 1918 годзе. Хоць нямецкая вайсковая прысутнасць распаўсюджвалася толькі на частку французскай тэрыторыі, гітлераўцы трымалі пад кантролем сітуацыю ва ўсёй краіне. Частка Францыі, якой кіраваў урад маршала Петэна, была свабодна ад такой прысутнасці. Але гэты ўрад трымаў раўненне на Берлін. У 1941 годзе быў падпісаны Берлінскі пакт з удзелам Нямеччыны, Італіі і Японіі. У 1941 годзе гітлераўцы прынялі капітуляцыю з боку Югаславіі і Грэцыі.

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза. Менавіта ў гэты дзень Нямеччына напала на СССР.

Увосень 1941 года немцы выразна акрэслілі ваенна-адміністрацыйны падзел Беларусі. Пры гэтым яны зыходзілі з загаду А. Гітлера ад 17 ліпеня 1941 года «Аб кіраванні ў зноў захопленных усходніх абласцях». Складовай часткай рэйхскамісарыята «Остланд» стала генеральная акруга Беларусь. Прыблізная ўсходняя мяжа гэтай акругі праходзіла па лініі Полацк – Барысаў, паўднёвая мяжа – па лініі Старыя Дарогі-возера Чырвонае, заходняя мяжа – па лініі рака Зальвянка – ўсходняя ўскраіна Белавежскай пушчы. Калі ўлічыць, што размова ішла толькі пра 25% тэрыторыі тагачаснай БССР, то нескладана прыйсці да высновы аб тым, што немцы не ўлічвалі пры гэтым падзеле этнічны фактар. Гэта выснова падмацоўваецца інфармацыяй пра лёс іншых беларускіх тэрыторый. Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай і Берасцейскай абласцей сталі складовай часткай рэйхскамісарыята «Украіна». Таксама не было аніякіх этнічных падстаў для таго, каб уключаць акругу «Беласток» у склад Усходняй Прусіі. Гэта акруга была ўтворана з Беластоцкай вобласці і часткі Баранавіцкай вобласці. Спрадвечна беларускія раёны сталі складовай часткай генеральнай акругі «Літва». Лінія Полацк – Барысаў – рака Бярэзіна – возера Чырвонае аддзяляла вобласць аховы тылу групы арміі «Цэнтр» ад астатняй беларускай тэрыторыі.

У час Вялікай Айчыннай вайны бальшавікі былі гатовы так сябе паводзіць, як і ў час распрацоўкі Берасцейскай мірнай дамовы 1918 года. Увосень 1941 года Сталін, не будучы ўпэўненым, што ўдасца адстаяць Маскву, зрабіў праз пасрэднікаў Гітлеру прапанову аб замірэнні. У якасці ўмовы аб замірэнні ён быў гатовы аддаць Нямеччыне Прыбалтыку, Беларусь, Украіну. Але рэйхсканцлер рэагаваў адмоўна, і пытанне аб гандлі Беларуссю і іншымі тэрыторыямі адпала.

Вайна скончылася паражэннем Нямеччыны. На Патсдамскай канферэнцыі 1945 года былі вызначаны генеральныя накірункі нямецкага мірнага ўрэгулявання. Нямеччына дзялілася на чатыры акупацыйныя зоны: амерыканскую, брытанскую, французскую, савецкую. Кіраўніцтва кожнай з гэтых зон павінна было правесці комплекс мерапрыемстваў з мэтай паступовага стварэння адзінай міралюбнай Нямеччыны. Меліся на ўвазе дэмакратызацыя, дэнацыфікацыя, дэмілітарызацыя, дэкартэлізацыя.

### *6.5. Ад капітуляцыі трэцяга рэйха да гегемоніі Германіі ў Еўропе*

Па віне і былога СССР, і Захаду нямецкае мірнае ўрэгуляванне зацягнулася амаль на паўстагоддзя. У выніку зацікаўленасці Масквы, Вашынгтона, Лондона і Парыжа ў нямецкім расколе ў 1949 годзе ўзніклі Федэратыўная Рэспубліка Германія і Германская Дэмакратычная Рэспубліка. Абедзве нямецкія дзяржавы раздзельна існавалі на працягу 41 года. У гэты час яны не былі поўнасцю суверэннымі. Праўда, аб'ём суверэнных правоў ФРГ і ГДР быў непараўнальны. ГДР з'яўлялася складовай часткай знешняй імперыі Крамля. ФРГ паступова набыла такі аб'ём суверэнных правоў, які дазваляў ёй падтрымліваць унутрыпалітычную стабільнасць, гарантаваць эканамічны дынамізм, забяспечыць сярэднестатыстычнаму бундэсбюргеру належны жыццёвы стандарт. У Федэратыўнай Рэспубліцы Германія адбыўся эканамічны цуд, ніколі не спынялася развіццё дэмакратычных працэсаў. Масква экспартавала ва Усходнюю Нямеччыну сваю мадэль дзяржаўна-манапалістычнага сацыялізму.

Напрыканцы нямецкага расколу можна было канстатаваць вялікі разрыў ва ўзроўнях развіцця паміж ФРГ і ГДР. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што Масква імкнулася зрабіць з былой ГДР вітрыну сацыялізму. ГДР лідзіравала па важнейшых сацыяльна-эканамічных паказчыках ва Усходняй Еўропе. Узроўні прадукцыйнасці працы паміж ФРГ і ГДР суадносіліся як 3 да 1. Усходненямецкі прамысловы патэнцыял складаў адну дзесятую ад заходненямецкага. У заходніх немцаў быў намнога больш высокі ўзровень жыцця. Прыход да ўлады ў былым СССР М. С. Гарбачова, змены ў адносінах да нямецкага пытання з боку заходніх лідэраў стварылі вонкавыя перадумовы для пераадолення нямецкага расколу. Што тычылася ўнутраных перадумоў, то заходнія і пераважная большасць усходніх немцаў заўсёды былі зацікаўлены ў аднаўленні нямецкага адзінства. Кіруючая ў ФРГ кааліцыя ХДС/ХСС – СвДП бліскуча выкарыстала вельмі спрыяльны момант. Перамовы па формуле «два плюс чатыры» (травень – верасень 1990 года) скончыліся падпісаннем 12 верасня 1990 Дагавора аб канчатковым урэгуляванні ў адносінах да Нямеччыны. У выніку сакавіцкіх выбараў 1990 года да ўлады ў ГДР прыйшлі сілы, з якімі Бон хутка вырашыў пытанні, звязаныя з унутранымі аспектамі нямецкага адзінства.

3 кастрычніка 1990 года адбылося аб'яднанне Нямеччыны. На долю федэральнага канцлера Г. Коля выпала такая ж роля, якую ў свой час адыграў О. Бісмарк. Але Г. Коль у адрозненне ад О. Бісмарка аб'ядноўваў Нямеччыну не «жалезам і крывёю», а мірным шляхам. Аб'яднанне адбылося на грунце Канстытуцыі ФРГ, прынятай у 1949 годзе.

Аб'яднанне Германіі стала падмуркам для пераўтварэння ФРГ у цэнтральнаеўрапейскі цэнтр сілы, для трывалага зацвярджэння яе ў ролі ключавога іграка на еўрапейскай палітычнай арэне, для яе ўсё больш актыўнай уцягненасці ў справы глабальнай палітыкі. У наступных лекцыях мы паспрабуем разгадаць феномен ФРГ, краіны, якая прайшла шлях ад капітуляцыі трэцяга рэйха да эканамічнай гегемоніі ў Старым Свеце.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1 Ці даюць сучасныя навуковыя дадзеныя дастаткова падстаў для абвяржэння нацысцкай тэорыі аб узнікненні ў глыбокай старажытнасці арыйскай расы?

2. Чым можна патлумачыць вельмі працяглы перыяд дзяржаўна-палітычнай раздробленасці ў Германіі?

3.Чаму пацярпела крах Веймарская Рэспубліка?

4.Ці можна лічыць, што пакт Молатава-Рыбентропа адыграў ключавую ролю ў развязванні Другой сусветнай вайны?

5.Ці ставілі рашэнні Патсдамскай канферэнцыі канчатковую кропку ў германскім пытанні?

**Тэст-заданні:**

1. Хто першым ужыў тэрмін "Германія"?

а)рымляне; б)грэкі; в)егіпцяне.

2. Заснавальнік Святой Рымскай імперыі германскай нацыі.

а)Атон І; б)Фрыдрых І; в)Вільгельм II.

3. З якога часу гісторыя германскіх імператараў звязана з родам Габсбургаў?

а)з 1438 года; б)з 1742 года; в)з 1745 года.

4. Калі Брандэнбургска-Пруская дзяржава набыла назву "Прусія"?

а)у 1701 г.; б)у 1720 г.; в)у 1740 г.

5. Калі ўзнік Мытны хаўрус?

а)у 1700 г.; б)у 1834 г.; в)у 1849 г.

6. Колькі краін уваходзіла ў склад Паўночна-германскага саюза?

а)20; б)22; в)30;

7. Калі была створана Сацыялістычная рабочая партыя Германіі?

а)у 1860 г.; б)у 1875 г.; в)у 1890 г.

8. Калі была падпісана Версальская мірная дамова?

а)28 чэрвеня 1919 г.; б)1 студзеня 1920 г.; в)18 сакавіка 1921 г.

9. Ці ўваходзіла партыя Цэнтра ў склад партый веймарскай кааліцыі?

а)так; б)не.

10. Калі нямецкія нацыял-сацыялісты прыходзяць да ўлады?

а)10 верасня 1932 г.; б)30 студзеня 1933 г.; в)8 снежня 1937 г.

11. Як суадносіліся ўзроўні прадукцыйнасці працы паміж ФРГ і ГДР напрыканцы германскага расколу?

а)як 3 да 1; б)як 2 да 1; в)як 4 да 1.

12. Калі быў падпісаны Дагавор аб канчатковым урэгуляванні ў адносінах да Нямеччыны?

а)12 верасня 1990 г.; б)10 студзеня 1991 г.; в)1 верасня 1992 г.

13. Калі адзначаюць Дзень германскага адзінства?

а)1 верасня; б)3 кастрычніка; в)10 лістапада.

14. На грунце якога юрыдычнага дакумента адбылося аб'яднанне Германіі ў эру Т.Коля?

а)На грунце Дамовы аб асновах адносін паміж ФРГ і ГДР;

б)на грунце Заключнага акта агульнаеўрапейскай нарады па пытаннях бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе;

в)на грунце канстытуцыі ФРГ, прынятай у 1949 годзе;

15) Ці была ФРГ да аб'яднання Германіі цэнтральнаеўрапейскім цэнтрам сілы?

а)так; б)не.

*Лекцыя сёмая*

## ЭКАНАМІЧНАЯ СІСТЭМА І САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА ФРГ

***План:***

7.1. Станаўленне і развіццё сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. Германскі эканамічны цуд. Месца Бонскай рэспублікі ў гісторыі народнай гаспадаркі Германіі.

7.2. Гаспадарчае развіццё Берлінскай рэспублікі: пераемнасць і абнаўленне. Эканамічная гегемонія Германіі ў Еўропе. Праблемы станаўлення рыначнай гаспадаркі ва Усходняй Германіі.

7.3. Беларуска-германскае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва і ўдзел у ім Брэстчыны.

7.4. Сістэма сацыяльнай абароны грамадзян ФРГ. Сярэднестатыстычны бюджэт нямецкай сям'і. Становішча моладзі ў ФРГ.

### *7.1. Станаўленне і развіццё сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. Германскі эканамічны цуд. Месца Бонскай рэспублікі ў гісторыі народнай гаспадаркі Германіі*

Стартавыя ўмовы развіцця германскай эканомікі ў пасляваенны час былі выключна цяжкія.

У 1946 годзе суб'екты гаспадарання, якія ўваходзілі ў прамысловы комплекс, дасягнулі аб'ёму прамысловай прадукцыі, які на 67% саступаў узроўню 1938 года. У тым жа годзе стан аграрнага комплексу можна было параўнаць з катастрафічнай сітуацыяй, якая назіралася напрыканцы існавання кайзераўскай Германіі.

Вельмі вялікае скарачэнне колькасці суб'ектаў германскага прадпрымальніцкага корпуса ў першую чаргу закранула тых немцаў, якія па сваіх даходах былі вельмі далёкія ад бізнес-эліты. Па ключавых таварных пазіцыях, якія былі перш за ўсё запатрабаваны насельніцтвам, попыт у шмат разоў перавышаў прапанову. Жудасныя маштабы набыла інфляцыя. Суб'екты, якія давалі трэцяму рэйху грошы пад даўгавыя абавязацельствы, чакалі ад новых улад вяртання астранамічнай сумы доўгу, роўнай 377 мільярдам марак.

Канцэнтруючы ўвагу на заходніх зонах акупацыі, трэба адзначыць два спецыфічныя непрыемныя моманты. Па-першае, значныя маштабы набылі ўцёкі немцаў з усходняй, савецкай зоны акупацыі ў адну з заходніх. Па-другое, у заходнія зоны перш за ўсё перасяліліся немцы, выгнаныя з радзімы. Гэтыя дзве прычыны вялі да рэзкага росту спажыўцоў і без таго яўна незадавальняючага аб'ёму прадметаў першай неабходнасці, дадаткова абвастралі надзвычай напружаную сітуацыю на рынку працы.

У рэальнай гаспадарчай практыцы ўсё больш станавіліся нормай парушэнні дзеяння аб'ектыўных эканамічных законаў. Суб'екты гаспадарання сталі ўсё часцей апускацца да стадыі натуральнай гаспадаркі.

Безумоўна, перад акупацыйнымі ўладамі, мясцовымі адміністрацыйнымі структурамі паўстала пытанне: «Што рабіць?». Канешне, дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што амерыканцы аж да славутай прамовы дзяржсакратара Дж. Бірнса, зробленай у 1946 годзе, сур'ёзна не задумваліся над гэтым пытаннем. Толькі з цягам часу быў абраны прадукцыйны па сваіх наступствах курс–маршалізацыя заходніх зон акупацыі. У рамках гэтага курсу яны пачалі з 1948 года атрымліваць моцную амерыканскую фінансавую падпітку. З верасня 1949 года адрасатам такога кшталту дапамогі будзе ўжо Федэратыўная Рэспубліка Германія. Сумарныя памеры гэтай дапамогі ў 1948–1951 гг. складуць 2,4 млрд. доларaў.

А зараз звернемся да асобы чалавека, якому амерыканцы дазволілі ажыццяўляць лёсавызначальныя сістэмныя эканамічныя пераўтварэнні ў Заходняй Германіі. Яго імя – Людвіг Эрхард.

Першая прыступка ў яго пасляваеннай дзяржаўнай кар'еры – міністр эканомікі Баварыі. Затым ён пасля перапынку, звязанага з выкладчыцкай працай, зноў вяртаецца на дзяржслужбу. Л.Эрхард упершыню вельмі гучна пра сябе заявіў як аўтар знакамітай рэформы 1948 года. Ён у той час займаў пасаду эканамічнага дырэктара Бізоніі.

Ідэалагічная аснова рэфарматарскіх захадаў Л.Эрхарда – уласная канцэпцыя сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. Аўтар канцэпцыі разглядае чалавека не як сродак, а як мэту эканамічнай палітыкі, робячы галоўным яе вымярэннем чалавечае. Дадзенае вымярэнне мае тры аспекты. Першы аспект – канкрэтны чалавек. Другі аспект--сям'я, для якой гэты чалавек выступае кармільцам. Трэці аспект -- страта ў структуры грамадства, да якой чалавек непасрэдна належыць. Чалавек у якасці суб'екта эканамічнага жыцця абірае тыя аптымальныя варыянты паводзін, дзеянняў, якія ўлічваюць інтарэсы суб'ектаў, якія прысутнічаюць у 3 названых аспектах. Гэты варыянт паводзін павінен уключаць у сябе максімальную аддачу для ўласнага, сямейнага бюджэту, высокую адказнасць за напаўненне рэальным зместам свайго функцыянальнага прызначэння ў эканамічнай сферы.

У аналізуемай канцэпцыі эканоміка разглядаецца скрозь прызму ключавой агульначалавечай каштоўнасці -- свабоды. Прычым свабода разумеецца як шматаспектная катэгорыя.

Першы аспект звязаны са свабодай спажывання. Пасля таго, як рынак запрацуе як самарэгулюючая сістэма, прапанова ўстойліва апярэджвае попыт і, натуральна, прадухіляецца вяртанне да сітуацыі таварнага дэфіцыту.

Другі аспект. Кожны грамадзянін на грунце трывалых палітычных і прававых гарантый сам вырашае, у якой якасці зараз прапанаваць сябе на рынку працы ці патэнцыяльна папаўняць шэраг працаатрымальнікаў, папярэдне авалодаўшы прафесіяй на ўласны густ.

Трэці аспект. Уладныя структуры не павінны ствараць аніякія штучныя перашкоды ў працэсе станаўлення і функцыянавання суб'ектаў гаспадарання, уцягнутых ў рынкавыя адносіны.

Чацвёрты аспект. Падвядзенне моцнага юрыдычнага грунту пад інстытут прыватнай уласнасці, наданне яму статуса базіснага элемента ў эканамічнай сістэме і, натуральна, забеспячэнне права асоб, якія ўвасабляюць гэты інстытут, на вырашэнне лёсу ўсёй маёмасці, якая ім належыць.

Пяты аспект. Члены прадпрымальніцкага корпуса самі вольныя выбіраць сабе дзелавога партнёра і замацоўваць адносіны з ім спецыяльнымі дамовамі.

Усе пяць аспектаў разглядаліся аўтарам канцэпцыі сацыяльнай рыначнай гаспадаркі ў кантэксце універсальнасці свабоды, яе распаўсюджвання на ўсе сферы грамадскага жыцця. Гэтыя аспекты матэрыялізуюцца толькі ва ўмовах універсальнай свабоды.

Час запатрабаваў неардынарныя захады прадпрымальніцкага корпуса, дэманапалізацыю, этатызм. Вышэйшы эшалон краіны ў працэсе распрацоўкі і ажыццяўлення эканамічнай палітыкі павінен быць «канстытуіруючым», «кіруючым», «рэгулюючым», абавязаны «фарміраваць грамадства». Пасля ўтварэння ФРГ Эрхард пастаянна ставіў пытанне аб тым, каб федэральны ўрад у цесным кантакце з бундэстагам, бундэсратам, урадамі суб'ектаў федэрацыі паклалі ў аснову макраэканамічнай стратэгіі канцэпцыю сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. У ліку элементаў гэтай стратэгіі можна назваць жорсткі акцэнт на стымулюючую функцыю падаткаабкладання, прэферэнцыі для заходніх немцаў, замежных дзелавых людзей, якія забяспечвалі стартавым капіталам разнастайныя перспектыўныя праекты ў самой ФРГ, пратэкцыянізм у адносінах да айчынных суб'ектаў гаспадарання, уход дзяржавы ад усталявання коштаў на таварныя пазіцыі, меры, накіраваныя на скасаванне манаполій і г.д.

А зараз зноў вяртаемся да буйнамаштабнай рэформы 1948 года. Гэта былі тры дні, якія ўзрушылі заходнія зоны акупацыі. Ход і змест рэформы былі такія.

Пасля таго як 20 чэрвеня 1948 года гадзіннікі паказалі лічбу 24, у заходніх зонах закончылася гісторыя рэйхсмарак, тых рэйхсмарак, якія часта ўспрымаліся як «фанцікі». Адначасова распачалася гісторыя дойчмарак.

Канешне, для насельніцтва склалася няпростая сітуацыя. У кожнага немца адразу ўзнікалі 2 пытанні: 1) Што рабіць з рэйхсмаркамі, якія былі на руках? 2) Калі канкрэтна трапяць да насельніцтва дойчмаркі?

Для адказу на гэтыя пытанні змадэліруем наступную сітуацыю. У Мюнхене жыве сям'я Майснер. Бруна Майснеру 70 гадоў. Ён пенсіянер. Жонка Бруна, Рэната, працуе на заводзе. Ёй 50 год. Іх сыну Карлу 20 год. Ён студэнт Мюнхенскага універсітэта Людвіга-Максімільяна. Бруна, Рэната, Карл атрымалі паасобку аднаразовую выплату, эквівалентную 40 дойчмаркам. З цягам часу іх выклічуць у кампетэнтныя органы і ўручаць дадаткова яшчэ па 20 дойчмарак.

Да грашовай рэформы пенсія Бруна складала 100 рэйхсмарак, заработная плата Рэнаты – 250 рэйхсмарак, стыпендыя Карла – 40 рэйхсмарак. 1 ліпеня 1948г. паштальён прынес пенсію Бруна. 2 ліпеня 1948 г. у заводскай касе атрымала на рукі заработную плату Рэната. 3 ліпеня 1948г. Карл атрымаў чарговую месячную студэнцкую стыпендыю. Усе яны атрымалі столькі ж, колькі і раней, але ў дойчмарках. Дакладна такое ж становішча было і з кватэрнай платай. Да рэформы Майснеры плацілі за кватэру 50 рэйхсмарак, пасля рэформы – 50 дойчмарак. У Бруна на рахунку ў ашчадбанку было 20000 рэйхсмарак, Рэната захоўвала дома 3000 рэйхсмарак, Карл – 200. Лёс гэтых грошай для сям'і Майснер быў такі. На сямейнай радзе было вырашана абвясціць усе рэйхсмаркі (23200) здабыткам сям'і. Улады аператыўна вырашылі пытанне толькі аб 50% усіх гэтых грошай, гэта значыць 11600 рэйхсмарак. За кожныя 10 рэйхсмарак Майснеры атрымлівалі толькі 1 дойчмарку. Усяго было атрымана 1160 дойчмарак.

Астатнія 50% сямейнага здабытку Майснеры абавязаны былі здаць у банк. Бруна прыйдзе сюды толькі ў той час, калі Заходняя Германія выйдзе з крызіснага стану. За кожныя 20 рэйхсмарак Бруна будуць даваць 1 дойчмарку і, як вынік, сям'я Майснераў атрымае яшчэ 580 дойчмарак. А зараз зноў вяртаемся да 21 чэрвеня 1948 г. На заводзе, дзе працуе Рэната, людзі сталі хвалявацца. Справа ў тым, што завод вельмі залежыць ад мноства іншых суб'ектаў гаспадарання, а ім адназначна патлумачылі, што ільготная сістэма абмену па рэформе (1 рэйхсмарка = 1 дойчмарка) да такога кшталту адносін не падыходзіць. Тут дзейнічала іншая формула: 10 рэйхсмарак = 1 дойчмарка. Праўда, работнікаў завода супакойвалі наступным цвёрдым абяцаннем. Кожны з суб'ектаў гаспадарання, якія ўваходзілі ў прамысловы комплекс, атрымаў фінансавую падпітку з тым, каб ніводны іх работнік у ліпені не быў пакінуты без заработнай платы. На пытанне: «А што будзе у жніўні, верасні?» упаўнаважаныя асобы адказвалі так: «Час датацый, час утрыманцаў прайшоў, у канкурэнтнай барацьбе ва ўсіх павінны быць роўныя стартавыя ўмовы». Пасля таго, як Рэната атрымала зарплату, на заводзе вельмі актыўна чакалі добрых вестак з Пасау, Вайдэна, Нюрнберга, Шангау, гэта значыць з гарадоў, дзе знаходзіліся дзелавыя партнёры. Да эканамічнай рэформы яны мелі доўг перад заводам у адзін мільён рэйхсмарак. Пытанне было закрыта да 15 ліпеня 1948 года. У гэтым выпадку зноў будзе рэалізавана формула: 10 рэйхсмарак = 1 дойчмарка. Як вынік завод атрымаў 100000 дойчмарак. Менавіта столькі грошай аказалася на рахунку завода ў прынцыпова новай структуры – Эмісійным банку нямецкіх зямель. Толькі з цягам часу завод стаў працаваць і з якасна новым камерцыйным банкаўскім сектарам.

24 чэрвеня 1948 года эканамічны дырэктар Бізоніі замацаваў сваім подпісам закон аб прынцыпах гаспадарчай структуры і палітыцы цэн. Цэны выключаліся са сферы дзяржаўнага рэгулявання, лёс рэсурснай базы залежаў цалкам ад эканамічнага абгрунтавання.

Яшчэ да ўзнікнення ФРГ быў адрэгуляваны комплекс пытанняў, звязаных з паступленнем у бюджэт адлічэнняў ад суб'ектаў гаспадарання, іх фінансавай падтрымкай, увядзеннем нізкай стаўкі банкаўскага працэнта, дэманапалізацыяй.

У германскіх СМІ таго часу часта можна даведацца пра «слушныя цэны». З цягам часу цэны станавіліся «ўсё больш слушнымі». Набывала рэальныя абрысы тая свабода спажыўцоў, якая была закладзена ў канцэпцыі Эрхарда.

Вялікі эканамічны стратэг бліскуча вызначыў «аснову дабрабыту для ўсіх». Для гэтага ён выключыў з яго частку, якая атаясамляецца з буйнымі суб'ектамі гаспадарання. Заўважым, што такі падыход тычыцца як прамысловай, так і аграрнай сферы. Прычым у аграрным сектары роля слоя, якому аддаваў перавагу Эрхард, умацоўвалася хутчэй, чым у прамысловым комплексе. За два гады, якія папярэднічалі ўтварэнню ФРГ, гэты слой пераўтварыўся ў станавы хрыбет сельскай гаспадаркі заходніх зон акупацыі. Яго гегемонія змяніла гегемонію юнкераў.

Кіраўніцтва Бізоніі, Трызоніі ў часы Эрхарда дэталёва распрацоўвала прапановы, звязаныя з тым, каб павысіць выпрацоўку ў сельскай гаспадарцы на аднаго работніка, што павінна было, па-першае, прывесці да скарачэння колькасці аграрыяў, і па-другое, прадвызначыць унушальную дынаміку ў плане гарантавання харчовай бяспекі.

У верасні 1949г. распачынаецца гісторыя Федэратыўнай Рэспублікі Германія. Л. Эрхард адразу ж узначаліў эканамічнае ведамства і выступаў у такой якасці да 1963 года. 1963г. адзначаны новай прыступкай у яго кар'еры. Л. Эрхард узначаліць федэральны ўрад. Канцлерскія паўнамоцтвы гэтага дзеяча захоўваліся да 1966 года. Пры падтрымцы Конрада Адэнауэра (федэральнага канцлера ў 1949 – 1963 гг.) ён актыўна, настойліва, мэтанакіравана напаўняў рэальным зместам сваю канцэпцыю сацыяльнай рыначнай гаспадаркі.

Ужо ўступленне ФРГ у 1950-ыя гады супала з першымі адчувальнымі вы-нікамі аналізуемай палітыкі. Другі год свайго існавання Федэратыўная Рэспубліка распачала без таварнага дэфіцыту, з трывалым вяртаннем да даваеннага паказчыка валавага аб'ёму вытворчасці ў прамысловым комплексе, з ростам рэальнай заработнай платы працаатрымальніцкага корпуса, са станоўчай дынамікай па такому паказчыку, як прадукцыйнасць працы, з пераадольваннем гіперінфляцыі. Трэці год гісторыі Бонскай Рэспублікі адметны спрыяльнай для бундэсбюргераў тэндэнцыяй у сістэме цэнаўтварэння. Калі раней бундэсбюргер атрымліваў зарплату, асцерагаючыся, што яна неўзабаве ў пэўнай меры абясцэніцца і, натуральна, па максімуму затаварваўся, то зараз была іншая сітуацыя. Змяненні ў бок павелічэння на цэнніках тавараў прасочваліся ўсё радзей, што давала падставы ўсё больш грошай зарэзерваваць для будучых пакупак. Нарэшце, наступіў момант, калі змяненні такога кшталту не мелі месца, Бюргеры яшчэ больш былі задаволены ўладамі ў 1953г., годзе другіх парламенцкіх выбараў. Сакрэт просты: на цэнніках пакрысе стала прасочвацца адваротная тэндэнцыя, а сямейныя бюджэты мяняліся са знакам плюс. У тым жа годзе ўжо кожны другі работнік народнагаспадарчага комплекса ўносіў уклад у стварэнне валавога нацыянальнага прадукту (ВНП) у тых суб'ектах гаспадарання, якія Эрхард называў «асновай дабрабыту для ўсіх». Улады сумесна з прамысловым супольніцтвам дасягнулі ўнушальных вынікаў у той частцы, якая тычылася машынабудаўнічага комплексу, прыборабудавання і г.д. З максімальнай карысцю для эканомікі была выкарыстана кан'юнктура, звязаная з вайной у Карэі 1950 – 1953 гг. У год парла-менцкіх выбараў уступала краіна, якая больш вывозіла таварнай масы, чым увозіла. Моцны рост эканомікі, яе канкурэнтаздольнасць, жорстка ўсталяваны курс дойчмаркі ў адносінах да амерыканскага долара (4,2:1) давалі падставы для прагназавання замацавання гэтай надзвычай важнай тэндэнцыі. Для прасочвання дынамікі ключавых эканамічных паказчыкаў важна ўзяць два кантрольныя часовыя пункты, якія звязаны з імем бацькі заходнегерманскіх эканамічных рэформ Людвіга Эрхарда. Першы кантрольны пункт – старт саміх рэформ (чэрвень 1948г.). Другі кантрольны пункт – фініш першай у дзейнасці Л. Эрхарда ў якасці федэральнага міністра

легіслатуры (1953 год). У год другіх у гісторыі краіны выбараў у бундэстаг здабыткам бундэсбюргераў стаў валавы нацыянальны прадукт (ВНП), які быў без нечага на 70% большы, чым у 1948 годзе. За гэты ж прамежак часу суб'екты гаспадарання, якія ўваходзілі ў прамысловы комплекс, змаглі ледзь не на 200% палепшыць сумарныя гадавыя паказчыкі выпуску канчатковай прадукцыі. Аграрыяў станавілася ўсё менш, а харчовая бяспека краіны гарантавалася адпаведнымі суб'ектамі гаспадарання ўсё больш пераканаўча.

Урад Адэнаўэра вельмі абгрунтавана падышоў да вызначэння межаў дэцэнтралізацыі ў сацыяльна-эканамічнай сферы, настойліва і паслядоўна адмаўляючыся распаўсюдзіць яе на энергетыку, галіну грамадскага транспарту, аграрны комплекс, рэгуляванне пытанняў суадносін попыту і прапановы на жыллё. Такая палітыка бліскуча спрацавала ў інтарэсах краіны. Вядома, што ў сярэдзіне першай легіслатуры стаў рэальнасцю паліўны крызіс. Афіцыйны Бон аператыўна рэагаваў на яго моцнай фінансавай падпіткай вуглездабываючага комплексу і гісторыя крызісу адносна хутка скончылася. Уладныя структуры маглі запісаць у свой актыў той факт, што ўжо ў 1950 годзе патэнцыяльна набылі статус аб'ектаў куплі-продажу амаль 1000000 кватэр у дамах, якія былі пабудаваны ў гэтым жа годзе. Трэба адзначыць і шэраг іншых абставін, якія працавалі на поспех эканамічнай палітыкі ўрада Адэнаўэра. Адсутнічала ваенная структура, і не было, натуральна, падстаў для выдаткаў на яе ўтрыманне. Змест удзелу працаатрымальнікаў у вытворчым працэсе быў адметны беспрэцэдэнтным рытмам. Выразна прасочвалася перманентнае імкненне ўладных структур, прадпрымальніцкага корпуса да прывядзення тэхнічнага базісу вытворчасці ў адпаведнасць з патрабаваннямі часу. Велізарныя маштабы набыла фінансавая падпітка эканомікі. Яе ажыццяўлялі як суайчыннікі, так і партнёры ФРГ з розных краін, перш за ўсё са Злучаных Штатаў Амерыкі.

У курсе федэральнага ўрада па сацыяльнаму блоку прынцыпова важнымі з'явіліся два наступныя моманты.

Быў падведзены трывалы юрыдычны грунт пад саўдзел працаатры-мальнікаў у кіраванні вытворчасцю. Першай ластаўкай стаў такога кшталту закон ад 21 траўня 1951 года. Але ён распаўсюджваўся выключна на суб'екты гаспадарання, якія адносіліся да цяжкай прамысловасці. Прыняцце закона, які ахопліваў бы ўвесь вытворчы комплекс, універсальнага закона, адбудзецца ў 1952 годзе.

Немалаважнай крыніцай паляпшэння матэрыяльнага становішча многіх бундэсбюргераў стала рэалізацыя закона аб выраўноўванні страт, выкліканых ваеннымі разбурэннямі ад 14 жніўня 1952 года.

Таму невыпадкова, што кіруючаму блоку ХДС/ХСС зусім мала не хапіла для дасягнення абсалютнай большасці па выніках парламенцкіх выбараў. Гэты рубеж будзе ўзяты у 1957 годзе. Трыумф 1957 года будзе тлумачыцца новымі выніковымі крокамі на шляху да пераўтварэння ФРГ у эканамічнага гіганта. На момант выбараў у бундэстаг яна па прамысловаму патэнцыялу ўваходзіла ў тройку лідэраў у несацыялістычнай прасторы, прапускаючы наперад толькі Злучаныя Штаты Амерыкі і Злучанае каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Моцным аргументам эканамічнай палітыкі Бонскай рэспублікі стаў хуткі рост золатавалютных рэзерваў. Колькасны паказчык наяўнасці адпаведнай рэсурснай базы быў лепшы толькі ў адной краіне – ЗША.

Кардынальна змянілася сітуацыя на рынку працы. У час станаўлення Бонскай рэспублікі для ўрада Адэнаўэра галаўным болем былі два мільёны беспрацоўных бундэсбюргераў. У час другой легіслатуры федэральныя ўлады сутыкнуліся з супрацьлеглай праблемай: на рынку працы попыт устойліва апярэджваў прапанову.

Кожны з чатырох гадоў дадзенай легіслатуры адзначаны дабаўленнем у сярэднім ледзь не паўмільёна аб'ектаў куплі-продажу ў жыллёвым сектары. Бундэсбюргеры, якія набывалі кватэры, усяляліся або ў дамы, якія былі здадзены будаўнікамі пад ключ, або ў дамы, якія з'явіліся аб'ектам рэстаўрацыі.

Моцным ходам у плане пашырэння сацыяльнай базы кіруючых партый з'явілася карэнная перабудова разліку пенсій, юрыдычны грунт пад якую падвёў закон ад 21 студзеня 1957 года. Сэнс закону трэба разумець так. Валавы нацыянальны прадукт (ВНП) можа павялічвацца ці памяншацца. Строга ў адпаведнасці з гэтымі зменамі вызначаецца сума пенсій, якую атрымліваюць бундэсбюргеры.

Чарговая, трэцяя легіслатура (1957 – 1961гг.) характарызуецца новымі значнымі вынікамі эканамічнай палітыкі федэральнага ўрада.

1958 год адзначаны падзеяй этапнага характару ў гісторыі дойчмаркі: яна набывае статус свабодна канвертуемай валюты. З 1961 года выразна абазначылася тэндэнцыя да істотнага ўмацавання пазіцый дойчмаркі ў сістэме міжнародных валютна-фінансавых каардынат.

Новыя рубяжы былі ўзяты ў павышэнні ўзроўню жыцця бундэсбюргераў. Напрыканцы трэцяй легіслатуры не менш за 33% іх сем'яў былі ўладальнікамі аўтамабіляў.

Краіна ўступала ў 1960-ыя гады, знаходзячыся на пачатковай стадыі постіндустрыяльнай цывілізацыі. Для гэтай цывілізацыі зусім не ўласціва сацыяльная структура буржуазнага грамадства, якая была апісана ў «Маніфесце камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса. У сацыяльнай структуры ФРГ не было ўжо таго слоя, якому адрасаваўся ключавы лозунг «Маніфеста» – «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Значна ўзрасла колькасць эканамічна актыўных немцаў, занятых у сферы паслуг. Зразумела, істотна павялічвалася і доля галін дадзенай сферы ў стварэнні валавога ўнутранага прадукту ФРГ. У гэтай сувязі асабліва дынамічнымі былі змяненні ў сярэднім класе. Набывала ўстойлівасць тэндэнцыя да зніжэння яго прадстаўніцтва ў прамысловым і аграрным комплексах, да ўсё больш актыўнага ўключэння дадзенага класа ў працэс пашырэння сферы паслуг.

За час аналізуемай легіслатуры краіна робіць чарговы эканамічны рывок. Напрыканцы гэтай легіслатуры ФРГ становіцца другой прамысловай дзяржавай свабоднага свету. Прамысловая дзяржава № 1 у глабальным маштабе ЗША эфектыўна працягвала ажыццяўляць фінансавую падпітку заходнегерманскай эканомікі. Рубяжы, на якія выйшла ФРГ, дазволілі дэмахрысціянам застацца ва ўладзе ў выніку парламенцкіх выбараў 1961 года. Праўда, яны страчвалі абсалютную большасць ў бундэстагу. Дарэчы, блок ХДС/ХСС на сённяшні дзень не можа паўтарыць трыумф 1957 г. Чарговая перамога на выбарах будзе дасягнута ў 1965 годзе.

На эканамічную палітыку ФРГ у 1960-ыя гг. аказалі уплыў два фактары.

Першы фактар. Да пачатку легіслатуры 1961 – 1965гг. сталі актыўна паглыбляцца інтэграцыйныя працэсы ў рамках Еўрапейскага Эканамічнага Супольніцтва, створанага ў 1957 г.

Другі фактар. У 1950-ыя гг. у свеце актыўна разгарнулася навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР). У гэтыя гады афіцыйны Бон не рабіў акцэнт на буйнамаштабнае ўцягванне нямецкай інтэлектуальнай эліты ў НТР. Маркамі ФРГ шчодра аплочвалася тое, што складала інтэлектуальную ўласнасць замежных даследчыцкіх цэнтраў, вынаходнікаў. Патэнты, ліцэнзіі, якія купляліся ў іх, сталі ключавым элементам перабудовы тэхналагічнага базісу заходнегерманскага вытворчага комплексу.

Дзеянне абодвух фактараў у пачатку 1960-ых гг. было наступным.

Дзякуючы першаму фактару, краіна мела больш спрыяльныя магчымасці для рэалізацыі канчатковай прадукцыі, істотна ўмацавала гандлёва-эканамічную складовую ў сваіх адносінах з Італіяй, Францыяй, краінамі Бенілюкса.

Што ж тычылася другога фактару, то ў сувязі з ім адбылася змена акцэнтаў у федэральнай палітыцы. Кіруючыя колы Германіі былі сведкамі рэвалюцыйных зрухаў у тэхналагічным базісе краін-экспарцёраў патэнтаў і ліцэнзій і апынуліся

перад дылемай: або ўзяць прыклад з гэтых дзяржаў і, натуральна, выйсці на этап такога кшталту зрухаў, або ісці ранейшым курсам і ў выніку апынуцца ў шэрагах аўтсайдэраў. Афіцыйны Бон аддаў перавагу першаму варыянту дзеяння.

Актыўнае ўключэнне ФРГ у НТР прадвызначыла перагрупіроўку ўнутры той часткі прадпрымальніцкага корпуса, зместам дзейнасці якой была вытворчасць. У шэрагу галін прамысловасці (дабываючай, тэкстыльнай, абутковай) рэзка скараціліся колькасць суб'ектаў гаспадарання, паказчыкі выпуску канчатковай прадукцыі. Найбольш моцным было падзенне адпаведных паказчыкаў для дабываючай прамысловасці.

Бонская рэспубліка станавілася краінай вялікай хіміі. Актыўна нарошчваліся аб'ёмы вытворчасці ў нафтаперапрацоўчым комплексе. Гэта стала магчымым, у многім дзякуючы фінансавай падпітцы з боку Велікабрытаніі. Відавочна прасочвалася дынаміка ў айчыннай вытворчасці аўтамабіляў. Зацікаўленасць нямецкага прадпрымальніцкага корпуса, мэтанакіраваныя захады амерыканскіх інвестараў прадвызначылі рэзкае пашырэнне наменклатуры таварных пазіцый, якія прапаноўваліся вытворцамі электроннай і электратэхнічнай прадукцыі. Узровень, на які выйшла заходнегерманскае самалётабудаванне, дазваляў яму ўсё актыўней выконваць заказы, якія траплялі ад «Люфтганзы», «Люфтвафэ», замежных авіякампаній. Хутка набірала абароты ракетна-касмічная прамысловасць. Яна таксама працавала ў цесным кантакце з грамадзянскімі і ваеннымі ведамствамі. Стала дасягаць буйных вынікаў яшчэ адна маладая галіна ў індустрыяльным комплексе – атамная.

Калі вартасць усіх таварных пазіцый, якія ў 1960-ыя гг. можна было запісаць у актыў прамыслоўцам, узяць за 100%, то ўклад машынабудаўнікоў складаў 25%, а ўклад хімікаў – 10%. Гэта, безумоўна, падкрэслівала іх базісныя пазіцыі ў прамысловым комплексе.

Цікава, што, з аднаго боку, істотна ўзрасла выпрацоўка на аднаго працаатрымальніка, а з другога боку, не было адпаведнага павелічэння арміі беспра-цоўных. Калі краіна ўступала ў 1970-ыя гады, 10 прамысловых рабочых рабілі такую ж працу, што 10 гадоў назад іх 16 калег. У той жа час у ФРГ знаходзілі сабе працоўнае месца гастарбайтэры, якія мелі грэчаскае, італьянскае, партугальскае, турэцкае грамадзянства.

1960-ыя гады адзначаны кардынальнымі зрухамі ў галіне сельскай гаспадаркі. Калі ўзяць усіх заходніх немцаў, якія выступалі ў якасці суб'ектаў вытворчых адносін у народнагаспадарчым комплексе, то на аграрыяў, работнікаў лясной гаспадаркі ў часы станаўлення ФРГ прыпадала іх пятая частка, на мяжы 1950–1960-ых гадоў–сёмая, а напрыканцы 1960-ых гадоў – дванаццатая.

Наступная табліца дае падставы прасачыць унушальную дынаміку заходнегерманскага аграрнага і харчовага экспарту ў аналізуемы перыяд.

ГЕРМАНСКІ АГРАРНЫ І ХАРЧОВЫ ЭКСПАРТ

| Год | Германскі аграрны і харчовы экспарт у 1000 еўра |
|---|---|
| 1960 | 557.819 |
| 1961 | 549.639 |
| 1962 | 584.407 |
| 1963 | 673.371 |
| 1964 | 825.225 |
| 1965 | 1.012.869 |
| 1966 | 1.006.222 |
| 1967 | 1.265.959 |
| 1968 | 1.526.206 |
| 1969 | 1.869.283 |

У дадзены перыяд у адрозненне ад мінулых гадоў федэральны і зямельныя ўрады рэалізоўвалі свае ўладныя паўнамоцтвы ў эканамічнай сферы ў істотна большай меры. Стаў рэальнасцю новы элемент эканамічнай палітыкі–планаванне. Дадзеная навацыя мела ў якасці сваіх аб'ектаў як федэрацыю ўвогуле, так і яе суб'ектаў, адміністрацыйна – тэрытарыяльныя адзінкі ўнутры федэральных земляў; як сукупнасць усіх суб'ектаў гаспадарання, якія ствараюць валавы нацыянальны прадукт, так і сукупнасць тых з іх, якія прапаноўваюць аднастайную прадукцыю на ўнутраным і міжнародным рынку. Набыло рэальныя абрысы ваенна-тэхнічнае праграмаванне. Дзяржава падвяла трывалы планавы грунт пад выкананне фірмамі заказаў бундэсвера. Быў узяты жорсткі і няўхільны курс на тое, каб выканаўцы навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ (НДВКР) з году ў год атрымлівалі з бюджэту сумы, для якіх была б характэрна тэндэнцыя да нарастання. Калі ўзяць за кропку адліку ўступленне ФРГ у 1960-ыя гады, то напрыканцы пятай легіслатуры навукова-даследчы і вопытна-канструктарскі корпус атрымаў ад дзяржавы фінансавую падпітку на 420% большую, чым у пачатку пераломнага для навукова-тэхнічнай палітыкі ФРГ дзесяцігоддзя.

Неад'емнай складовай часткай планавання стала сістэма мер па недапушчэнню хібаў у механізме цэнаўварэння, якія б мелі доўгатэрміновыя негатыўныя наступствы. Уладныя стуктуры актыўна ішлі на датаванне тых аспектаў развіцця транспартнага комплексу, якія былі ў найбольшай ступені запатрабаваны бундэсбюргерамі.

У 1960-ыя гады стала ўзмацняцца тэндэнцыя да манапалізацыі ў прамысловасці. Усё часцей не болей за пяць гіганцкіх па аб'ёмах асноўнага і абаротнага капіталаў канцэрнаў займалі манапольныя пазіцыі ў галінах, якія, па-першае, былі адметныя навукаёмістасцю і, па-другое, з'яўляліся прыярытэтнымі ў структуры германскага экспарту. Трэба таксама зазначыць, што менавіта ў гэтыя гады распачынаецца гісторыя транснацыянальных карпарацый (ТНК) у ФРГ. Вельмі інтэнсіўным стала супрацоўніцтва манаполій з тымі суб'ектамі гаспадарання, якія, па Эрхарду, ствараюць «асновы дабрабыту для ўсіх».

Разам з тым нельга ідэалізаваць стан заходнегерманскай эканомікі ў 1960-ыя гады. Рэцэсія 1966 – 1967 гг. сведчыла аб тым, што эканамічная палітыка, якая будавалася на канцэпцыях Л. Эрхарда, зайшла ў тупік. У 1966 годзе Л. Эрхард пакідае палітычны алімп. Да ўлады прыходзіць вялікая кааліцыя ў складзе ХДС, ХСС, СДПГ, якая кіравала да 1969 г. Яе першай асобай, гэта значыць федэральным канцлерам быў Курт-Георг Кізінгер. Выхад са стану рэцэсіі грунтаваўся на прапановах двух міністэрстваў: эканомікі і фінансаў. Міністр эканомікі К. Шылер і міністр фінансаў Ф. Й. Штраус распрацавалі стабілізацыйны план. Паводле гэтага плана кіраўнікі суб'ектаў гаспадарання, Аб'яднання нямецкіх прафсаюзаў (АНП), урада ФРГ, выканаўчай улады на больш нізкіх узроўнях выступалі як неад'емныя састаўныя элементы таго базісу, на якім грунтавалася канцэртаваная акцыя. У выніку дадзенай акцыі ўдалося дасягнуць эканамічнай стабілізацыі. Гэтаму спрыяла і тое, што пашырылася кола пытанняў фінансавай палітыкі, якія вырашаліся федэральнай выканаўчай уладай. Пашырэнне адбылося за кошт тых пытанняў, якія раней вырашаліся суб'ектамі федэрацыі.

З 1969 па 1982 гг. у ФРГ кіравала сацыял-ліберальная кааліцыя. Заўважым, што галоўная партыя кааліцыі – СДПГ – у сваіх праграмных установах пастаянна дыстанцыравалася ад канцэпцыі сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. На практыцы ж адмаўлення ад гэтай канцэпцыі не адбылося. Разам з тым планаванне ў рамках дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў эканоміку стала больш змястоўнае, канкрэтнае. Гэта ў першую чаргу тычылася такога макраэканамічнага паказчыка, як эканамічны рост. Больш унушальнай была сацыялізацыя эканамічнай палітыкі. Дадзеная сацыялізацыя набрала значныя абароты ў сувязі з пераканаўчай дынамікай эканамічнага

росту, якая прасочвалася ад старту ўрадавай адказнасці сацыял-дэмакратаў да пачатку крызісу сусветнай капіталістычнай эканомікі 1973 – 1975 гг. Праўда , у сусветным эканамічным табелі аб рангах ФРГ не займала ўжо такога месца, як у часы Эрхарда. З 1970 года па магутнасці эканамічнага патэнцыялу ў маштабах свабоднага свету яна прапускала наперад не толькі ЗША, але і Японію.

У 1974 годзе, гэта значыць у разгар эканамічнага крызісу, адбылася змена вахты на Рэйне. Пераемнікам лідэра СДПГ В. Бранта, які быў на чале федэральнай выканаўчай улады з 1969 па 1974 гг., стаў яго аднапартыец Гельмут Шміт. Зразумела, на долю новага канцлера выпала роля крызіснага менеджэра. Яго лозунгам быў: «Эканамічны рост любой цаной!». Таму ў палітыцы ўрада выкананне сацыяльных функцый дзяржавы заняло істотна меншае месца, чым у эру В. Бранта. У эру Шміта распачалася рэіндустрыялізацыя ФРГ. У прамысловым комплексе слабелі пазіцыі матэрыялаёмкіх галін. Па сутнасці стартаваў першы этап перабудовы народнай гаспадаркі з улікам дасягненняў у галіне інфарматыкі, біятэхналогіі, геннай інжынерыі, хіміі палімерных злучэнняў.

Заўважым, што Шміт, як і Брант надаваў асаблівую ўвагу садзеянню суб'ектам гаспадарання, у якіх працавала меней за 500 бундэсбюргераў. Разам з тым у эру Г. Шміта маштабы фінансавай падпіткі гэтай часткі прадпрымальніцкага корпуса з боку федэральнага ўрада былі значна больш моцныя, чым у часы Бранта. З сярэдзіны 1970-ых г. яна атрымлівала на вельмі спрыяльных умовах крэдыты. Гаспадары прадпрыемстваў з колькасцю працуючых меней за 500 чалавек сталі плаціць са сваіх прыбыткаў падаткі у аб'ёме, які іх задавальняў у большай ступені, чым дагэтуль. У эру Г. Шміта таксама істотна павялічыліся запасы золатавалютных рэзерваў, відавочна ўмацавалася нацыянальная валюта. Дзякуючы актыўнай зацікаўленасці ўрада Г. Шміта і яго бліжэйшых замежных саюзнікаў, запрацаваў механізм свабоднага гандлю канчатковай прадукцыяй прамысловата комплексу ў заходняй частцы Старога Свету, набыла рэальныя абрысы Еўрапейская валютная сістэма (ЕВС).

Эканамічная палітыка Г. Шміта сведчыла аб тым, што ён у адрозенне ад Бранта не быў сацыялістам. Ён фактычна прытрымліваўся рэцэптуры, якая больш паходзіла да ліберальнай. У рэальнай эканамічнай палітыцы ён яшчэ больш дыстанцыраваўся ад праграмных установак СДПГ, чым В. Брант. У перыяд чарговага эканамічнага крызісу 1980 – 1981 гг. Шміт добра разумеў, што яму трэба быць манетарыстам. Аднак гэта супярэчыла настроям партыйнага базісу СДПГ, што ў многім прадвызначыла крах сацыял-ліберальнай кааліцыі. Манетарысцкую палітыку будзе ўжо праводзіць кааліцыя ў складзе ХДС, ХСС, СвДП, якой выпадзе лёс кіраваць краінай у 1982 – 1998 гг. Увесь гэты час на капітанскім мосціку германскай палітыкі знаходзіўся Гельмут Коль.

Новы ўрад перш за ўсё прайшоўся чырвоным алоўкам па шэрагу артыкулаў дзяржаўнага бюджэту. Меліся на ўвазе перш за ўсё артыкулы, звязаныя з выкананнем дзяржавай сацыяльных функцый. Быў рэзка скарочаны дзяржаўны апарат. Перастала існаваць у ранейшым выглядзе стыпендыяльная сістэма для студэнтаў у вышэйшай школе ФРГ. Студэнцкі корпус падтрымліваўся шляхам прадастаўлення індывідуальных крэдытаў, што, натуральна, патрабавала значна менш выдаткаў з боку дзяржавы. Дзяржава адышла ад жорсткага кантролю ў пытаннях, звязаных з функцыянаваннем аб'ектаў куплі-продажу ў жыллёвым сектары. У духе неакансерватыўных рэцэптаў было вырашана пытанне аб гарантаванні рэнтабельнасці ў доўгатэрміновым плане для тых галін, якія мелі дагэтуль няпростыя праблемы. Памянялі форму ўласнасці пошта, чыгунка, страціўшы статус аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці. Дзяржава адмовілася ад манаполіі ў сферы тэлебачання і тым самым дала зялёнае святло для з'яўлення канкурэнтаў у барацьбе за авалодванне сімпатыямі тэлеаўдыторыі.

Спачатку федэральны міністр фінансаў Г. Штольтэнберг, а затым яго пераемнік Т. Вайгель пры падтрымцы і садзеянні з боку Г. Коля ажыццявілі рэформу падатковай сістэмы. Ад гэтай рэформы перш за ўсё выйгралі прадпрымальнікі, якія валодалі суб'ектамі гаспадарання з колькасцю працуючых меней чым 500 чалавек.

Заходнегерманскія эканамічныя стратэгі бліскуча выкарыстаўвалі тыя абставіны, што ў разгар першай для Г. Коля легіслатуры краіне прыйшлося выдаткоўваць значна менш дойчмарак для імпарту нафты. Дарэчы, такая ж сітуацыя захавалася на працягу шэрагу наступных гадоў. Былі расстаўлены прыцыпова новыя акцэнты ў прамысловай палітыцы з улікам экалагічнага фактару. Выразна прасочваўся прарыў у навукаваёмкіх галінах. Ключавое месца ў электроніцы занялі мікрапрацэсары. Бонская рэспубліка ўжо нікому не саступала ў свеце па ўкараненні найноўшых дасягненняў НТР суб'ектамі гаспадарання, якія спецыялізаваліся ў сферы чорнай і каляровай металургіі, вытворцамі станкоў. Тая ж ацэнка можа быць аднесена да прадпрыемстваў – аўтагігантаў «Фольксваген», «Опель», «Даймлер Бенц», «Форд-мотарс», гігантаў хімічнай індустрыі «БАСФ», «ХЁХСТ», «БАЕР». Самыя перадавыя тэхналогіі з'явіліся грунтам для заходнегерманскай ядзернай энергетыкі. Гэта тычылася як перадгісторыі АЭС, якая распачыналася з нулявога цыкла, так і перыяду іх паўнавартаснага функцыянавання.

Тры першыя легіслатуры Г. Коля адзначаны паступальным эканамічным ростам. Рэзка ўзмацніліся пазіцыі Бонскай рэспублікі ў міжнародных гандлёва-эканамічных адносінах. У глабальным маштабе толькі са Злучаных Штатаў Амерыкі вывозілася таварная маса большая, чым з ФРГ. Зразумела, не ўсе сур'ёзныя праблемы сацыяльна-эканамічнага характару былі вырашаны. Перш за ўсё гэта тычылася беспрацоўя.

### *7.2. Гаспадарчае развіццё Берлінскай рэспублікі: пераемнасць і абнаўленне. Эканамічная гегемонія Германіі ў Еўропе. Праблемы станаўлення рыначнай гаспадаркі ва Усходняй Германіі*

Эканоміка ФРГ у 1990 - 2005 гг. развівалася арытмічна. Пасля аб'яднання Германіі паказчыкі эканамічнага росту паслядоўна змяншаліся. Толькі пасля 1993 года эканамічны рост зноў набывае дынаміку, што выразна прасочвалася да канца эры Г. Коля. У эру Г. Шродэра па гэтаму ключавому макраэканамічнаму паказчыку назіраюцца і дынаміка, і супрацьлеглая тэндэнцыя. Сацыял-дэмакрат Г. Шродэр афіцыйна ўзяў на ўзбраенне канцэпцыю сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. СДПГ на агульнапартыйным узроўні ўхваліла курс канцлера. Да яе далучыўся малодшы партнёр па ўрадавай кааліцыі - Саюз 90 / Зялёныя.

Чырвона-зялёнай кааліцыі дасталіся ў спадчыну перш за ўсё праблемы, звязаныя з інтэграцыяй экс-ГДР у эканамічную сістэму ФРГ, а таксама праблемы працаўладкавання бундэсбюргераў. Афіцыйна колькасць беспрацоўных складае 4000.000 чалавек, а фактычна – не менш за 7000.000

Для Берлінскай рэспублікі характэрна рэзкае ўзмацненне ўцягненасці ў працэсы еўрапейскай эканамічнай інтэграцыі. Пры гэтым вызначальнае значэнне мелі выкананне абавязацельстваў, якія вынікалі для ФРГ з Маастрыхцкай дамовы 1992 года, прытрымліванне адпаведных артыкулаў Амстэрдамскай дамовы 1997 года. 31 снежня 2001 года скончылася гісторыя дойчмарак. З 1 студзеня 2002 года ФРГ – неад'емная складовая частка еўразоны. Федэратыўная Рэспубліка ў вачах яе партнёраў па ЕС – лакаматыў еўрапейскай інтэграцыі, перш за ўсё яе ключавы фундатар.

Сучасная Германія вельмі высока каціруецца ў сусветным эканамічным табелі аб рангах.

Зараз эканамічна актыўнае насельніцтва ФРГ стварае шостую частку ўсёй таварнай масы Еўрапейскага саюза, дванаццатую частку валавога прадукту

прамысловасці ў глабальным маштабе. У актыў суб'ектам гаспадарання ФРГ можна занесці адзінаццатую частку сумарнай таварнай масы, якую вывозяць экспарцёры на ўсіх кантынентах.

З эканамічнага пункту гледжання найбольш слушна характарызаваць сучасную Германію як індустрыяльную дзяржаву. Калі вартасць канчатковай прадукцыі ўсіх галін матэрыяльнай вытворчасці выразіць у еўра, то не менш за дзевяць з кожных дзесяці еўра трэба запісаць у актыў работнікам прамысловага комплексу ФРГ. У гэтым комплексе ў сістэму працоўных адносін уключаны два з пяці эканамічна актыўных немцаў.

Базісныя элементы прамысловасці ў перыяд існавання Берлінскай рэспублікі застаюцца дакладна такія ж, як і большую частку гісторыі Бонскай рэспублікі. Размова ідзе аб пераемнасці ключавых пазіцый машынабудаўнічага і хімічнага прамысловага комплексаў. Таму з гэтых галін варта распачаць характарыстыку стану сучаснай германскай прамысловасці.

Немцы пакідаюць у сябе не болей, чым дзве пятыя усёй таварнай масы машынабудаўнічага комплексу, астатнія тры пятыя прапаноўваюць гандлёвым партнёрам Федэратыўнай Рэспублікі. Гэта сведчыць аб высокай канкурэнтаздольнасці канчатковай прадукцыі германскіх машынабудаўнікоў. У гэтым плане перш за ўсё вылучаюцца вытворцы аўтамабіляў. Яны могуць запісаць у свой актыў сёмую частку вывазной таварнай масы.

Каб мець уяўленне аб станавым хрыбце аўтамабільнай галіны машынабудаўнічага комплексу ФРГ, дастаткова наведаць гарады-мільянеры Кёльн, Мюнхен, далёкую пакуль ад мільённага рубяжа сталіцу зямлі Бадэн-Вюртэмберг – Штутгарт і два гарады, якія, разам узятыя, па колькасці насельніцтва значна саступаюць аднаму Штутгарту–Вольфсбург і Русельсгайм. Градаўтваральным для Вольфсбурга з'яўляецца завод «Фольксваген», а для Русельсгайма – не менш славутае прадпрыемства «Опель». Завод-вытворца прэстыжных аўтамабіляў БМВ знаходзіцца ў Кёльне. Месца знаходжання індустрыяльнага гіганта «Даймлер-Бенц» – сталіца зямлі Бадэн-Вюртэмберг. У баварскай сталіцы размешчаны завадскія карпусы «Форд-мотарс».

У такіх суб'ектах германскай федэрацыі, як Гамбург, Брэмен, Шлезвіг-Гальштэйн ёсць суб'екты гаспадарання, якія спецыялізуюцца на выпуску караблёў розных класаў.

Адметная рыса сучаснага хімічнага прамысловага комплексу ФРГ – вельмі высокая канцэнтрацыя вытворчасці. Станавы хрыбет гэтага комплексу абмяжоўваецца 3 гарадамі: дзелавой сталіцай Германіі Франкфуртам-на-Майне, прыгожым горадам на Рэйне Леверкузенам, радзімай Гельмута Коля Людвігсхафенам. У гэтых гарадах размясцілі сваю вытворчасць лідэры аналізуемай галіны: «Хёхст», «БАСФ», «Баер». Яны, разам узятыя, даюць не менш за чатыры пятыя ўсёй таварнай масы дадзенай галіны. Вядомы таксама як гарады хімікаў Лейна і Швет.

У прамысловым комплексе сучаснай ФРГ значна прадстаўлены суб'екты гаспадарання, якія спецыялізуюцца на электроніцы і электратэхніцы. Адпаведны сегмент унутрыгерманскага рынку перш за ўсё кантралююць кампаніі «Сіменс», «Бош». На іх жа прыпадае асноўная частка германскага экспарту ў галіне электронікі і электратэхнікі. Базіс дадзеных кампаній складаюць суб'екты гаспадарання, якія размешчаны ў баварскай сталіцы, другім па велічыне баварскім горадзе Нюрнбергу, сталіцы Бадэн-Вюртэмберга, Гамбургу, які мае статус суб'екта федэрацыі, горадзе-мільянеры Кёльне.

У сучаснай ФРГ, як і ў гады існавання Бонскай рэспублікі ўладныя структуры грунтоўна прапрацоўваюць пытанні, звязаныя з рэсурснай базай прамысловасці, эканомікі ўвогуле.

Краіна самастойна пакрывае свае патрэбы ў каменным вугалю. Суб'екты гаспадарання могуць гарантаваць спажыўцам пастаўку на працягу астра-намічнага года не менш за 60 млн. тон гэтага віду паліва. Асноўная частка адпаведных шахт размешчана ў землях: Паўночны Рэйн–Вестфалія, Саар. Пры звароце да першай з названых земляў размова ідзе найперш пра Рур – эканамічнае сэрца Германіі. Указаны від паліва мае вялікае значэнне для дынамічнага развіцця ў гэтым рэгіёне ўзгаданых вышэй базісных элементаў прамысловага комплексу. Гэта тэза распаўсюджваецца, канешне, і на металургію. Дарэчы, па ключавых паказчыках развіцця дадзенай галіны зямлі Паўночны Рэйн – Вестфалія няма роўных у германскай федэрацыі. Цікава мець на ўвазе і наступны факт. Адлегласці паміж гарадамі гэтай зямлі – Дуйсбургам, Дортмундам, Бохумам – невялікія. Між тым у кожным з іх маюцца металургічныя заводы, вядомыя далёка за межамі краіны і па якасных, і па колькасных вытворчых паказчыках. Такой шчыльнасці размяшчэння вытворчых магутнасцяў дадзенай галіны не назіраецца ні ў адной іншай краіне заходняй часткі Старога Свету. Для паўнаты карціны дабавім таксама прадпрыемствы аналагічнага профілю, якія маюцца на радзіме апошняга кіраўніка ГДР Эрыха Хонекера – Саары, у самым малым суб'екце германскай федэрацыі – Брэмене, а таксама у Айзенхютэнштаце. Германскія металургі ў пачатку XXI стагоддзя штогод выплаўлялі патэнцыяльныя аб'екты куплі-продажу ў наступных аб'ёмах: сталі – не менш за 37 млн. тон, чыгуну – не менш за 27 млн. тон. На указаных заводах выкарыстоўваецца жалезная руда, якая пастаўляецца гандлёвымі партнёрамі Германіі.

Гэтыя паказчыкі – сведчанне сусветнага ўзроўню металургіі ФРГ.

У адрозненне ад чорнай металургіі каляровая металургія ФРГ жорстка завязана па кан'юнктуры на сусветным рынку сыравіны. Базісным элементам сыравінных рэсурсаў гэтай галіны з'яўляецца тая іх частка, якая завозіцца з-за мяжы. У глабальным маштабе Германія знаходзіцца ў групе лідэраў па выплаўцы стратэгічна важных каляровых металаў. Размова ідзе перш за ўсё пра алюміній, свінец, медзь, цынк.

Важнай тэндэнцыяй развіцця энергетычнай гаспадаркі з'яўляецца рэзкае павышэнне ролі прыроднага газу для забеспячэння патрэб экс – ГДР, якія задавальняе дадзеная гаспадарка. Адначасова назіраецца супрацьлеглая тэндэнцыя ў адносінах да выкарыстання бурага вугалю. Яго здабываюць зараз усё менш і менш.

Германія з'яўляецца залежнай па такім ключавым элементам энерганосьбітаў, як нафта, прыродны газ. Уласная нафта дазваляе задавальняць патрэбы краіны на 3 %, прыродны газ – на 20,3 %. Таму не меней за 100 млн. тон нафты, 70 млрд. м³ прыроднага газа штогод пастаўляюць Германіі яе замежныя партнёры. З Расіі ў апошнія гады ФРГ атрымлівала 25 млрд. м³, з Нарвегіі – 9,9 млрд. м³. Суб'екты гаспадарання энергетычнага комплексу здольны забяспечыць краіну электраэнергіяй з тым разлікам, каб на кожнага немца яе патэнцыяльна прыходзілася звыш за 600 кВт/ гадзін штогод.

На грунце найноўшых тэхналогій наладжана таксама працуюць такія галіны прамысловага комплексу, як тэкстыльная, трыкатажная, харчасмакавая. Высокай якасцю адрозніваецца канчатковая прадукцыя вінаробаў і піваvараў. Абгрунтавана арыентуюцца на ўстойлівы попыт суб'екты гаспадарання, якія канцэнтруюцца на вытворчым працэсе, звязаным з футрам.

Па-ранейшаму адметна высокімі паказчыкамі ў сваім развіцці германская сельская гаспадарка.

Колькасць суб'ектаў гаспадарання, якія задзейнічаны ў аграрным комплексе старых земель, – 60000. Іх першыя асобы адпавядаюць усім прыметам фермераў. Колькасць фермераў у федэральным маштабе павялічылася пасля таго, як сельская гаспадарка ў новых землях стала аб'ектам трансфарма-

цыйных працэсаў. Праўда, зона фермерскіх гаспадарак у экс – ГДР не стала ўсеабдымнай: сярод тутэйшых суб'ектаў гаспадарання ёсць і таварыствы.

Незалежна ад таго, хто знаходзіцца ва ўладзе ў аб'яднанай Германіі – дэмахрысціяне ці сацыял-дэмакраты – аграрны сектар выступае аб'ектам дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў большай ступені, чым прамысловы комплекс. Ключавы аспект дадзенага ўмяшальніцтва – пастаянная істотная фінансавая падпітка.

Нязменнай застаецца структура сельгасвытворчасці, якая ўстойліва зацвердзілася з 1960-ых гг. Калі канчатковыя вынікі працы аграрыяў адлюстраваць у вартасным выражэнні, то па-ранейшаму захоўваецца вялікі разрыў паміж раслінаводствам і жывёлагадоўляй на карысць апошняй галіны. У структуры жывёлагадоўлі не страцілі статуса базісных малочны і мясны напрамкі. У жывёльным фондзе гэтай галіны можна вылучыць тры блокі: 1) блок буйной рагатай жывёлы; 2) свіны блок; 3) авечы блок. Па агульнай колькасці жывёльных адзінак другі блок пераўзыходзіць першы і трэці, разам узятыя. Суб'екты гаспадарання ўтрымліваюць дваццать шэсць мільёнаў свіней. Другім па колькасці галоў, але першым па важнасці з'яўляецца першы блок. Ён прадстаўлены ў фермерскіх гаспадарках і сельгаставарыствах 16 мільёнамі галоў. Прыблізна трэцюю частку першага блока складаюць каровы, якія даюць малако для бундэсбюргераў. Апошні, трэці блок налічвае два мільёны чатырыста тысяч галоў.

Што ж патэнцыяльна мае штогод сярэднестатыстычны немец ад айчыннай жавёлагадоўлі ў той частцы, якая тычыцца канчатковай прадукцыі? На яго прыпадае 20,9 кг ялавічыны, 44 кг свініны, 344,3 кг малака. Пры гэтым 680000 тон ялавічыны вывозіцца за межы ФРГ.

Пэўнае развіццё атрымала таксама птушкагадоўля.

Апошнія гады, як і папярэднія, адметны высокімі паказчыкамі валавога збору важных сельскагаспадарчых культур. Цікава параўнаць адпаведныя паказчыкі па Польшчы і Германіі. Валавы збор збожжа ў Польшчы складае 81,5% ад германскага ўзроўню. Затое палякі на працягу шэрагу гадоў збіраюць бульбы больш, чым у два разы за немцаў. Раслінаводчая галіна прыносіць бундэсбюргерам таксама штогод амаль 3 мільёны тон кукурузы, немалыя зборы садавіны, агародніны. Ёсць і суб'екты гаспадарання, якія актыўна займаюцца вінаградарствам.

У структуры тэхнічных культур упэўнена лідзіруюць цукровыя буракі. Адзначым, што валавы збор у палякаў па гэтай культуры складае толькі 55,9% нямецкага ўзроўню. Немцы збіраюць цукровых буракоў у 10,1 раза болей, чым другой па значнасці тэхнічнай культуры – рапсу.

Аналіз германскага раслінаводства мы заканчваем хмелем. Аднак гэта зусім не сведчыць аб ар'ергардных пазіцыях дадзенай культуры ў аграрным комплексе. Наадварот, у свеце няма дзяржавы, якая б магла на роўных супернічаць з Германіяй па яе вывазу ў іншыя краіны.

Нягледзячы на тое, што ў аграрным сектары аб'яднанай Германіі мае месца працы толькі кожны семнаццаты эканамічна актыўны немец, ён, па – першае, гарантуе харчовую бяспеку краіны і, па – другое, стварае падставы для моцных пазіцый Берлінскай Рэспублікі па адпаведным сегменце сусветнага рынку.

У Германіі сфарміраваўся вельмі моцны транспартны комплекс. У ім вытрымліваецца сусветны ўзровень па ключавых паказчыках. Транспарту належыць велізарная роля ў вырашэнні задач знешнеэканамічнай стратэгіі краіны, ва ўмацаванні кааперацыі паміж суб'ектамі гаспадарання розных узроўняў, у функцыянаванні ўнутрыгерманскага рынку. Зразумела, яго важнейшай функцыяй з'яуляецца задавальненне патрабаванняў бундэсбюргераў і гасцей ФРГ у пасажырскіх перавозках.

У Федэратыўнай Рэспубліцы выдатныя дарогі для руху аўтатранспарту, якія маюць працягласць у многія тысячы кіламетраў. Машыніст цягніка, які паставіць перад сабой мэту праехаць ўсе германскія чыгуначныя станцыі, будзе мець агульны наезд 30 000 км. Бесперабойную працу нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў, аўтазаправак перш за ўсё забяспечваюць нафтаправоды працягласцю без нечага 4000 км. Мэтам энергетычнай бяспекі падпарадкаваны газаправоды. Кампетэнтныя ведамствы гарантуюць належны стан кожнага са 100000 км газаправодаў. Амаль 7000 км могуць максімальна праплыць айчынныя аматары воднага турызму па германскіх рэках у межах ФРГ. Эфектыўна выкарыстоўваюца гавань Дуйсбург – Рурарт, Кільскі канал, транспартныя магчымасці Рэйна, Везера, Эмса, Эльбы, Одэра. Наладжана функцыяніруе партовая гаспадарка. Аб гэтым перш за ўсё сведчыць вопыт працы адпаведных суб'ектаў гаспадарання ў Гамбургу, Брэмене, Любеку, Ростаку. Вядома, што ключавы паказчык іх працы – грузаабарот на працягу канкрэтнага года. Для Германіі ён сапраўды гіганцкі – 200 мільёнаў тон. Пры вызначэнні перспектыў транспартнай галіны пастаянна бярэцца ў разлік і пяты акеан. У краіне паўтысячы аэрапортаў.

У Берлінскай рэспубліцы ў працаатрымальніцкім корпусе расце доля асоб, якія не маюць германскага грамадзянства. Зараз такіх асоб налічваецца прыблізна 6 000 000. Прычым у большасці з іх трывалая сувязь з радзімай Гётэ і Шылера выражаецца не толькі ў непасрэдным удзеле ў стварэнні валавога нацыянальнага прадукту ФРГ, але і ў адначасовым пражыванні з гэтымі людзьмі членаў іх сем'яў, якія або тут працуюць, або не маюць працоўнага месца, або ў якасці вучняў і студэнтаў інтэгруюцца ў германскую адукацыйную сістэму. Дадзенае кола асоб складаецца перш за ўсё з грамадзян Турцыі, дзяржаў, якія ўтварыліся на пост'югаслаўскай прасторы, а таксама тых, хто мае пашпарты грамадзян старых (Грэцыі, Італіі, Партугаліі) і новых (Польшча) партнёраў ФРГ па Еўрасаюзу. Калі ж дадаць да гэтых асоб эмігрантаў, паток якіх пасля аб'яднання Германіі пастаянна нарастаў, то становіцца зразумелым паходжанне, па крайняй меры, дзвюх крыніц надзвычайнай напружанасці на сучасным унутрыгерманскім рынку працы.

Ключавымі вектарамі рэалізацыі знешнегандлёвай стратэгіі ФРГ з'яўляюцца французскі, італьянскі, галандскі, брытанскі, амерыканскі, швейцарскі, кітайскі.

15 гадоў аддзяляюць усходніх немцаў ад таго дня, калі была аб'яднана Нямеччына. Гэты перыяд умясціў перш за ўсё шэраг важнейшых крокаў, накіраваных на інтэграцыю экс-ГДР у эканамічную сістэму ФРГ. Да аб'яднання ўсходнія немцы жылі ва ўмовах дзяржаўна-манапалістычнага сацыялізму. Тып гаспадарання, навязаны немцам Крамлём, быў характэрны для ўсіх краін так званага сацыялістычнага лагера.

Асноўныя рысы дадзенага тыпу гаспадарання былі наступныя:

- уласнікам сродкаў і прылад вытворчасці, усіх вынікаў матэрыяльнай вытворчасці была камуністычная наменклатура, якая адчужала непасрэдных вытворцаў ад уласнасці і ўлады;

- непасрэдныя вытворцы з'яўляліся аб'ектам пазаэканамічнага прымусу з боку дзяржавы, заробкі дадзенай катэгорыі насельніцтва былі намнога меншымі, чым яе рэальны працоўны уклад;

- маючы ў сваіх руках камандныя вышыні ў эканоміцы, камуністычная наменклатура была слаба ўспрымальнай да навукова-тэхнічнага прагрэсу;

- вялікі акцэнт на адміністрацыйныя метады кіравання, ігнараванне аб'ектыўных эканамічных законаў і перш за ўсё закону вартасці;

- апераджальны рост капіталаўкладанняў.

Безумоўна, нельга не ўлічваць спецыфіку Усходняй Нямеччыны.

Па-першае, ФРГ, будучы эканамічным гігантам, аказалася здольнай вельмі ўнушальна спрыяць трансфармацыі эканамічнай сістэмы экс-ГДР. Туды пасля аб'яднання ўжо ўкладзена звыш за 1 трыльён еўра.

Па-другое, эканамічная сістэма ФРГ, у якую інтэгруюцца ўсходнія немцы, існуе звыш за паўстагоддзя. Яна пераканаўча даказала сваю эфектыўнасць.

Шэраг элементаў нямецкай мадэлі ўзятыя на ўзбраенне лідэрамі асобных посттаталітарных дзяржаваў.

Па-трэцяе, на паспяховае ажыццяўленне эканамічнай трансфармацыі істотны ўплыў аказвае добра вядомы нямецкі характар.

Ключавым момантам грунтоўных рэформаў у экс-ГДР з'явілася прыватызацыя прадпрыемстваў. 1 ліпеня 1990 года "ствараецца Папячыцельскае ведамства. Яму давядзеццаператварыць цэнтралізаваную дзяржаўную эканоміку ў арыентаваную на канкурэнцыю рынкавую гаспадарку. У сакавіку (1990 года. - М.С.) урад ГДР ацаніў "народную уласнасць", сканцэнтраваную ў руках Папячыцельскага ведамства, прыкладна ў 1300 млрд. марак. Аднак ва ўступным балансе фігуруе лічба ў мінус 210 млрд. марак"[23].

1 студзеня 1955 года "спыняецца дзейнасць Папячыцельскага ведамства. За 4 гады прыватызаваны поўнасцю або часткова каля 14500 былых народных прадпрыемстваў. Выручка ад прыватызацыі – 65 млрд. марак. Атрыманы абяцанні стварыць 1,5 млн. працоўных месцаў і інвеставаць 207 млрд. марак. З 1995 года задачы, якія засталіся, вырашае Федэральнае ведамства па асаблівых задачах, якія звязаны з аб'яднаннем Нямеччыны"[24]. Зараз можна канстатаваць завяршэнне працэсу прыватызацыі.

"Пайшоўшы шляхам паскоранай прыватызацыі, экс-ГДР змагла павысіць эфектыўнасць на макраэканамічным узроўні"[25]. Вопыт Усходняй Нямеччыны паказвае, што "за кошт прыватызацыі наўрад ці магчыма пакрыць выдаткі"[26]. Таму ўяўляецца слушнай наступная выснова: "...палітыка прыватызацыі ...не павінна кіравацца фінансавымі меркаваннямі. У яе грунце павінна ляжаць іншая мэта – пошук эфектыўнага ўласніка"[27]. За апошнія 15 год рэзка вырас працэнт прадпрымальнікаў у сацыяльнай структуры экс-ГДР. Іх інтарэсам аб'ектыўна адпавядаюць наступныя рэаліі: 1) існаванне прыватнай уласнасці на зямлю; 2) акцэнт на стымулюючую функцыю падаткаабкладання; 3) наяўнасць грунтоўнай заканадаўчай базы; 4) адсутнасць сур'ёзных перашкодаў з боку кіруючых дзяржаўных структур; 5) унутрыпалітычная стабільнасць.

Важнейшым элементам усходненямецкага вопыту з'яўляецца жорсткі манетарызм, які быў узяты на ўзбраенне пасля стварэння ў 1990 годзе валютнага хаўрусу паміж ФРГ і ГДР. Гэта паспрыяла значнаму зніжэнню інфляцыі, пэўнаму прытоку фінансавых рэсурсаў.

Экс-ГДР у 1990 – 2005гг. – гэта "рэгіён з самымі высокімі тэмпамі эканамічнага росту ў Еўропе"[28].

Зараз узровень жыцця сярэднестатыстычнага ўсходняга немца значна перавышае той, які ён меў да аб'яднання.

Аднак час да эйфарыі яшчэ не надышоў. Застаецца яшчэ нямала праблем. "Моцны эканамічны рост кантрастуе з высокім, маючым тэндэнцыю да замацавання, беспрацоўем. Фарміраванню актыўнага слоя прадпрымальнікаў супрацьстаяць цяжкасці, звязаныя з пранікненнем на надрэгіянальныя рынкі. Сур'ёзнай перашкодай з'яўляецца і недахоп уласнага капіталу, нягледзячы на шырокую фінансавую дапамогу з боку дзяржавы"[29]. Разам з тым цяперашняя палітыка федэральных уладаў дае падставы сцвярджаць, што з цягам часу гэтыя праблемы будуць вырашаны.

---

[23] Хроника германского единства (1989-1995) //Deutschland. Политика, культура, экономика и наука. - 1995. - №4. - Август. - С.20

[24] Хроника германского единства (1989-1995)...С.21.

[25] Евстигнеев В. Германское объединение: уроки для России //Мировая экономика и международные отношения. -1995. - №10.С.156.

[26] Евстигнеев В. Указ. соч... С. 157.

[27] Там жа.

[28] Поль Рюдигер. Пять лет подъема на Востоке или о создании нового народного хозяйства// Deutschland. Политика, культура, экономика и наука. - 1995. - №4. - Август. - С.20.

[29] Там жа.

### *7.3. Беларуска-германскае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва і ўдзел у ім Брэстчыны*

Федэратыўная Рэспубліка Германія і Рэспубліка Беларусь з пачатку 1990-ых гг. істотна ўзбагацілі змест гандлёва-эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. З 8 чэрвеня 1992 года дзейнічае беларуска-германскі савет эканамічнага супрацоўніцтва. Ужо яго першае пасяджэнне (ліпень 1992 г., Мінск) «вызначыла асноўныя задачы і накірункі двухбаковага супрацоўніцтва ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, эканамічнай навуцы, падрыхтоўцы кадраў і сфарміравала базавыя прынцыпы для наладжвання кантактаў паміж беларускімі і нямецкімі прадпрыемствамі».[30]

Дзякуючы працы дадзенага савета Рэспубліка Беларусь заключыла з Германіяй шэраг важных пагадненняў. Назавём найбольш важныя з іх:

1) пагадненне аб шырокамаштабным эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве;

2) пагадненне аб садзейнічанні і ўзаемнай абароне інвестыцый;

3) пагадненне ў галіне аўтамабільных і паветраных зносін.

Шырокі дыяпазон згоды быў адзначаны ў час пэтэрсбергскай сустрэчы дзелавых колаў РБ і ФРГ (красавік 1993 г.). Беларускую дэлегацыю ўзначальваў старшыня Савета эканамічнага супрацоўніцтва з боку РБ першы намеснік старшыні Савета Міністраў РБ М.В. Мясніковіч. Зараз ён займае пасаду старшыні прэзідыума нацыянальнай Акадэміі Навук РБ. І беларускі, і германскі бакі лічылі, што гэта сустрэча дасць моцны штуршок развіццю супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

З сакавіка 1993 года бярэ адлік свайго існавання міжурадавая камісія па аўтамабільнаму транспарту. З красавіка 1995 года паспяхова працуе міжурадавая камісія па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву.

26 студзеня 1996 года Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка прымаў вялікую дэлегацыю нямецкіх бізнесменаў. Прадстаўнікі дзелавога свету Германіі выразілі сваю зацікаўленасць у пашырэні супрацоўніцтва.

У аналізуемы перыяд Беларусь знаходзілася ў ліку тых краінаў, да якіх мела дачыненне германская «TRANSFORM-Konzept».

«Асноўная ідэя гэтай канцэпцыі заключаецца ў даванні дапамогі ў мэтах самадапамогі... Зыходзячы з назапашанага Германіяй вопыту і яго моцных бакоў, з абмежаванасці фінансавых рэсурсаў, а таксама ў мэтах забеспячэння эфекыўнага давання кансультацый федэральны ўрад робіць галоўны ўпор на:

- эканамічныя кансультацыі ў мэтах стварэння агульных умоў для сацыяльнай рыначнай эканомікі і развіцця прадпрымальніцтва і яго структур;
- дапамогу ў правядзенні структурнай перабудовы, прыватызацыі і разбуйненні прадпрыемстваў;
- стварэнне падатковай, мытнай, страхавой і банкаўскай сістэмы;
- даванне кансультацый у галіне сельскай гаспадаркі;
- навучанне і павышэнне кваліфікацыі ў сферы эканомікі (падрыхтоўка мэнэджэраў, прафесійна-тэхнічнае навучанне і пашырэнне ўзроўню майстэрства);
- юрыдычныя кансультацыі з упорам на гаспадарчае права;
- дапамогу ў стварэнні адміністрацыйных структур;
- дапаможныя кансультацыі ў такіх галінах, як рынак працы, сацыяльная палітыка і ахова навакольнага асяроддзя».[31]

---

[30] Мясникович М.В. Белорусско-германское экономическое сотрудничество: всерьёз и надолго. // Советская Белоруссия. – 1996 – 26 января. – С.1

[31] Германия. Факты. – Франкфурт – на – Майне: Издательство "Социетэтс-ферлаг", 1996. С.226-227

Такія важнейшыя складовыя TRANSFORM-Konzept. Немцы ўкладваюць болей за палову ўсіх фінансавых сродкаў Захаду, якія маюць у якасці свайго мэтавага прызначэння падтрымку рэформаў у Цэнтральнай, Усходняй Еўропе, у СНД. Пры гэтым яны на справе дэманструюць незацікаўленасць у рэнацыяналізацыі мыслення. На думку федэральнага ўрада, «імкненне Усходняй Еў-ропы да самавызначэння будзе развівацца тым стабільней, чым болей будзе неабходных для гэтага агульнаеўрапейскіх структур і чым больш агульна-еўрапейскай салідарнасці сустрэнецца ёй на шляху».[32] Менавіта такую пазі-цыю Берлін займаў і займае ў кіруючых органах Еўрасаюза.

Практычная рэалізацыя «TRANSFORM-Konzept» у дачыненні да Беларусі выглядае наступным чынам. У 1993 годзе пры амбасадзе ФРГ у Мінску распачало сваю дзейнасць каардынацыйнае бюро банка КФВ (Крэдытны банк для рэканструкцыі) пры ўдзеле Міністэрства знешнеэканамічных сувязяў РБ у рамках Беларуска-германскага савета эканамічнага супрацоўніцтва. Узначальвае бюро доктар Штэфан Рэнэ Лойдэсдорф.

У гісторыі дзейнасці дадзенага бюро можна выдзяліць два перыяды: да 1995 года і з 1995 года. У першы перыяд бюро мела справу ў асноўным з адказнымі супрацоўнікамі ўрада Беларусі. З 1995 года значна павысілася ўдзельная вага беларускіх арганізацый, прадпрыемстваў у рэалізацыі «TRANSFORM-Konzept». Фінансавае забеспячэнне «TRANSFORM-Konzept» для Беларусі з нямецкага боку ў 1990-я гг. даволі сціплае – 16,3 млн. ДМ. Крыху болей за 4млн. ДМ маюць наступнае мэтавае вызначэнне: «1) змена структуры прадпрыемстваў; 2) падтрымка малога і сярэдняга бізнесу»[33].

Ёсць сэнс перш за ўсё адзначыць наступныя вынікі рэалізацыі «TRANSFORM-Konzept»:

– аўтаматызацыя беларускіх банкаў і павышэнне кваліфікацыі іх супрацоўнікаў (Белінвестбанк);
- стварэнне аграрна-кансультацыйнай службы ў г. Брэсце;
- стварэнне жыллёва-камунальных гаспадарак у Заслаўі і Лідзе;
– падтрымка цэнтра занятасці ў Барысаве;
– рэструктурыраванне будаўнічых арганізацый у Мазыры.[34]

У 1997 годзе тавараабарот паміж РБ і ФРГ склаў 908 мільёнаў долараў, а ў 2004 г. – 1,5 млрд. долараў. «Сярэднегадавы рост тавараабароту складае 15 працэнтаў. З усіх краін Захаду Германія стала самым буйным партнёрам Беларусі. Прадпрымальнікі Германіі стварылі 220 сумесных прадпрыемстваў, працуюць 70 прадстаўніцтваў банкаўскіх фірмаў. Асабліва важнае пашырэнне міжбанкаўскага супрацоўніцтва з буйнейшымі нямецкімі банкамі»[35]. Адным з напрамкаў развіцця германа-беларускіх адносін у аналізуемы перыяд з'явілася даванне крэдытаў. Пакуль яны не параўнальныя з тымі аб'ёмамі, якія тычацца ўсходнееўрапейскіх саюзнікаў Берліна (Чэхіі, Польшчы і г.д.). Аднак нельга недаацэньваць таго, што зроблена ў гэтым накірунку.

«З 1991 года па лістапад 1997 года ў рамках экспартных крэдытных ліній Германіі ў Беларусь пастаўлена тэхнічнага абсталявання, тэхнікі, рухомага складу, запчастак, камплектуючых, медыцынскай тэхнікі і лекавых прэпаратаў на суму ДМ 594,4 млн. (агульная сума дадзеных крэдытаў – ДМ 608 млн.). У рамках гэтай крэдытнай лініі прафінансавана болей за 80 прадпрыемстваў розных галін».[36] Беларускі прадстаўнік на ўзроўні міністра прысутнічаў на

---

[32] Там жа. С. 224

[33] На шаг ближе к Европе // Дело. – 1997. – №2. С.10

[34] На шаг ближе к Европе // Дело. – 1997. – №2.С.10

[35] Наркевіч У. Аляксандр Лукашэнка: "Мы павінны выкарыстоўваць сітуацыю, каб добра было беларускаму народу" // Звязда. – 1998. – 24 красавіка. С.1.

[36] Вавохін Н. Дают тому, кто может вернуть // Дело. –1998. – №3.С.27.

мерапрыемствах, якія праводзіліся ў рамках Міжнароднай кааперацыйнай біржы «Еўрапартнёр Паўночны Рэйн–Вестфалія-98» ( люты 1998 г. ).

Істотным фактарам у двухбаковых адносінах з'яўляецца крэдытная лінія «Гермес». Зараз паводле гэтай лініі на беларускай зямлі ажыццяўляецца 15 інвестыцыйных праектаў.

Кіраўнікі аб'яднання «Шкловалакно» (г.Полацк, РБ) і фінансава-прамысловай групы (ФПГ) «Ламітэк АГ» замацавалі сваімі подпісамі мемарандум. Ключавыя моманты мемарандума:

1) палачане атрымліваюць крэдыт, роўны 15 мільёнам долараў;

2) ФПГ «Ламітэк АГ» займаецца рэалізацыяй праекта, які мае на сваёй мэце з'яўленне на радзіме Ф.Скарыны прадпрыемства па вытворчасці ламінітаў.

«Мінскі Прыорбанк, адзін з вядучых камерцыйных банкаў Беларусі, адкрыў у пачатку 1995 г. сваё прадстаўніцтва ў Франкфурце-на-Майне». Гэта азначала, што ў Германіі «з'явіўся першы беларускі банк».[37] Для эканомікі маладой беларускай дзяржавы істотнае значэнне мае ўдзел РБ у Гановерскіх кірмашах. У красавіку 1996 года ў рамках Гановерскага кірмашу праводзіліся Дні беларускай эканомікі. Гэты кірмаш буйнейшы ў Старым Свеце. Рашэнне аб удзеле ў ім РБ прымаў усходні камітэт германскай эканомікі.

Неад'емным элементам беларуска-германскага супрацоўніцтва сталі доўгатэрміновыя партнёрскія адносіны Беларускай прамыслова-гандлёвай палаты з прамыслова-гандлёвымі палатамі Бона, Франкфурта-на-Одэры. Стала традыцыйай правядзенне Дзён эканомікі зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія і зямлі Брандэнбург у Мінску. У ходзе гэтых мерапрыемстваў «найвялікшую цікавасць беларусаў выклікалі прапановы (нямецкага боку. – М.С.) па дрэваапрацоўцы і гандлю драўнінай, тэкстыльнаму абсталяванню і тэкстылю».[38] Застаецца спадзявацца, што за дадзенай цікавасцю настане паласа практычных спраў.

З 1994 года на Беларусі ажыццяўляецца праграма «Пратрэйд». Гэта праграма аказвае фінансавую падтрымку недзяржаўным фірмам, што выпускаюць прадукцыю з экспартным патэнцыялам. Яе ініцыятар – нямецкае аб'яднанне ў галіне тэхнікі, якое садзейнічае пастаўкам экспартнай прадукцыі ад вытворцы з краін, што развіваюцца, да пакупніка ў ФРГ. Калі тое ці іншае прадпрыемства малога ці сярэдняга бізнесу адпавядае патрабаванням, то яно можа разлічваць на аплату 50-70% усіх сваіх выдаткаў у вядомых Гановерскіх кірмашах. З сярэдзіны 90-х гадоў немцы актыўна прыглядаюцца да беларускіх фірмаў, якія спецыялізуюцца ў галіне лазерных тэхналогій. У 1994 годзе сабрала першы ўраджай хмелю для піўзаводаў беларуска-германскае СП «Бізон», створанае ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці.

У 1995 годзе Мінскі аўтамабільны завод і фірма «Кегель» (ФРГ) стварылі сумеснае прадпрыемства па вытворчасці, тэхабслугоўванню і збыту аўтамабільных паўпрычэпаў. МАЗ і фірма «Ота Заўэр Аксенфабрык» (ФРГ) стварылі СП па вытворчасці восей і падвесак.

25 студзеня 1996 года ў Міністэрстве знешнеэканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь было падпісана пагадненне аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве з акцыянерным таварыствам «Сіменс» (ФРГ). Пагадненнем прадугледжвалася сумесная праца ў галінах энергетыкі, транспарту, вытворчасці медтэхнікі,рэалізацыі праектаў па развіццю інфраструктуры, мадэрнізацыі і аўтаматызацыі прадпрыемстваў і г.д. Выходзячы з гэтага пагаднення была створана сумесная рабочая група экспертаў, у якую ўвайшлі як прадстаўнікі беларускіх міністэрстваў,

---

[37] Первый белорусский банк в Германии // Deutschland. Политика, культура, экономика и наука. – 1995. – №6. – Декабрь С.35.

[38] Потребин А. В четвёртый раз из Бонна приехали партнёры // Рэспубліка.–1998.– 15 мая.

ведамстваў, прадпрыемстваў, так і спецыялісты адпаведных дэпартаментаў "Сіменса". Яны разам падрыхтавалі шэраг канкрэтных праектаў,далі папярэднюю ацэнку неабходных аб'ёмаў інвестыцый, вызначылі аб'ем фінансавання.

У 1997 годзе была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні беларуска-германскага камбайна.

«22 красавіка 1998 года Гановерскі кірмаш наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка. Прэзідэнт падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з кампаніяй «Кантынентель». Гэта кампанія займае чацвёртае месца ў свеце па выпуску аўтамабільных шын. Кампанія «Кантынентель» адпісала таксама мемаандум аб супрацоўніцтве з бабруйскім камбінатам «Белшына». Чакалася, што ўжо (у 1998 годзе. – М.С.) «Кантынентель» пачне выпускаць шыны для бела-ускіх трактароў і будаўнічай тэхнікі. Пры станоўчых тэндэнцыях у супрацоўніцтве было запланавана стварэнне сумеснага прадпрыемства ў 1999 годзе.

Для правядзення перамоваў з праўленнем кампаніі «МАН» Аляксандр Лукаэнка наведаў завод па выпуску колавых цягачоў у г. Зальцгітэр. Тут размова ішла аб рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых яшчэ ў 1997 годзе».[39] Змест дамоўленасці быў наступны: 1) распачаць выпуск цяжкіх грузавікоў на плошчах МАЗа; 2) стварыць сумеснае прадпрыемства, 51 % капіталу у якім будзе належаць германскаму канцэрну. «З кампаніямі «Сіменс» і «Дойчэ Тэлеком» дасягнута дамоўленасць аб арганізацыі на Беларусі мабільнай талефоннай сеткі».[40]

Важна адзначыць, што пералічаныя дамоўленасці працуюць. «Намаганні спеыялістаў беларуска-германскага прадпрыемства «МАЗ – MAN», накіраваныя на тое, каб стварыць сучасны аўтамабіль з сучаснай цаной, не аказаліся марнымі: новы беларускі «волат», які выпушчаны СП, спалучае ў сабе высокі тэхнічны ўзровень і якасць нямецкіх машын MAN з немудрагелістасцю і надзейнасцю МАЗа ў нашых умовах эксплуатацыі. Па цане ($62000 з улікам ПДВ) новы цягач істотна танней заходніх машын такога ж класа. Сабраны на плошчах Мінскага аўтамабільнага завода, на 41% ён складаецца з матэрыялаў і камплектуючых беларускай ці расійскай вытворчасці, якасць якіх кантралюецца нямецкім бокам. Такім чынам, беларускае прадпрыемства, якое ўвайшло ў СП, у адрозненне ад іншых аналагічных праектаў сумеснай вытворчасці ў СНД не з'яўляецца проста пастаўшчыком таннай рабочай сілы. Што, безумоўна, сведчыць аб дастойным супрацоўніцтве».[41] Звяртаючыся да праекта, да якога маюць дачыненне «Кантынентель» і «Белшына», варта асабліва сказаць аб яго куратары – генеральным дырэктары міжнароднага канцэрна «Otto producs for industry» Дзітэры Ота. Гэта – актыўнейшы прыхільнік пашырэння і паглыблення беларуска-германскіх сувязяў.

Зараз спадар Ота заняты новым праектам. У інтэрв'ю газеце "Советская Белоруссия" ён паведаміў наступнае: «Мы... плануем стварыць недалёка ад Мінска буйную вытворчасць па перапрацоўцы бульбы. Гэты праект цікавы тым, што ... у вашай краіне пакуль няма прадпрыемстваў, якія б мелі сучасныя тэхналогіі па перапрацоўцы бульбы, напрыклад, па вытворчасці бульбы «фры».[42]

Разам з тым аналізуемы накірунак супрацоўніцтва развіваўся не без праблем. «На жаль, з кожным годам захоўваецца тэндэнцыя адставання аб'ёмаў беларускага экспарту ад імпарту з Германіі.

У прыватнасці, у асобныя гады імпарт перавышаў экспарт амаль у пяць разоў»[43].

---

[39] Навіны .–1998.–30 красавіка.– №44.С.5.

[40] Там жа.

[41] Владимиров О. "МАЗ-MAN-Белорус" немецких кровей // Комсомольская правда.–1998.–18 сентября. С.12

[42] Лазарь Л. Крупный немецкий бизнес заинтересован в сотрудничестве с нашей страной // Советская Белоруссия.–1998.–14 мая. С.3

[43] Міліцын В. Германія-галоўны эканамічны партнёр Беларусі ў Заходняй Еўропе // Народная газета. – 1998. – 22 красавіка.С.3

Патэнцыял знешнеэканамічных сувязяў ФРГ-РБ далёка не вычарпаны. Адной з галоўных прычын такога становішча з'яўляецца наяўнасць недахопаў пры распрацоўцы знешнеэканамічнай стратэгіі Беларусі. У гэтай сувязі ёсць сэнс звярнуцца да аўтарытэтнай думкі, выказанай на старонках часопіса "Дело". Часопіс, у прыватнасці, адзначае: «Першачарговых мераў, калі падлічыць, набярэцца дастаткова. Трэба дапрацаваць і прыняць закон «Аб дапаўненнях і зменах у закон «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», а таксама ў закон «Аб свабодных эканамічных зонах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», рэфарміраваць, з улі-кам міжнародных стандартаў, падатковую сістэму; стварыць дзейсны механізм уцягнення ў працэс прыватызацыі замежных інвестараў; шырэй выкрыстоўваць ускосныя метады стымулявання інвестыцыяў (выплата грантаў на навукова-даследчыя распрацоўкі, даванне дзяржаўнага фінансавання, даванне замежным інвестарам прэферэнцыяльнага рэжыму ў прыярытэтных для рэспублікі галінах); развіваць рынак каштоўных папер і г.д. Гэты пералік можна працягнуць...»[44]

У беларуска-германскім супрацоуніцтве ўдзельнічала і Брэсцкая вобласць. "На Брэстчыне паспяхова працуюць сумесныя беларуска-германскія прадпрыемствы "Бізон", "Калор".

Сярод рэзідэнтаў СЭЗ "Брэст" вылучаецца "Кандор". "Кандор" выпускае фарбы і грунтоўкі. У сваёй працы выкарыстоўвае нямецкую тэхналогію, нямецкія кампаненты, нямецкае абсталяванне. Якасць іх прадукцыі агульнапрызнана ў Беларусі, краінах СНД."[45]

### *7.4 Сістэма сацыяльнай абароны грамадзян ФРГ. Сярэднестатыстычны бюджэт нямецкай сям'і. Становішча моладзі ў ФРГ*

Берлінская рэспубліка атрымала ў спадчыну ад былой ФРГ моцную сацыяльную дзяржаву. Аднак стандарты гэтай дзяржавы ўсё больш ўваходзілі ў супярэчнасць з рэаліямі аб'яднанай Германіі. "Атрымаўшы на выбарах 1994г. "вымову з папярэджаннем", новы ўрад Коля паставіў задачу знізіць сацыяльныя выдаткі да 40% валавога ўнутранага прадукту."[46]

Заўважым, што напрыканцы самай апошняй для Г. Коля легіслатуры дадзеная задача была нават і перавыканана.

"Доля сацыяльных паслуг у валавым унутраным прадукце ў 1998г. склала 33,5%. У 1998г. сукупная вартасць сацыяльных паслуг дасягнула прыкладна 1272 млрд. марак. Амаль трэць паслуг прыходзіцца на пенсійнае страхаванне, больш за 20% - прадпісанае законам страхаванне на выпадак хваробы... (У Германіі – М.С.) распрацаваны шырокі спектр сацыяльных законаў, якія прадугледжваюць сістэму забеспячэння ў выпадку хваробы, неабходнасці догляду, пры няшчасным выпадку, пры наступленні старасці аж да давання дапамогі на дзяцей, на частковую аплату жылля або па беспрацоўю...

(Цікава зрабіць невялікі экскурс у гісторыю. – М.С.) сацыяльнага страхавання. Законамі ад 1883г., 1884г. і 1889г. былі створаны тры віды абавязковага страхавання для рабочых і для часткі служачых, якія характэрны для Германіі і да цяперашняга часу: страхаванне на выпадак хваробы, ад няшчасных выпадкаў і пенсійнае страхаванне, якое тады называлася страхаваннем на выпадак інваліднасці. У 1911г. гэтыя віды страхавання былі зведзены ў імперскія правілы страхавання, у якія, акрамя таго, было ўключана пенсійнае забеспячэнне ўдоў і

---

[44] Дело. - 1998. - №3. С.20

[45] Серова А.П., Басалай А. Анализ функционирования СЭЗ "Брест" и перспективные направления эффективной деятельности // Вестник Брестского государственного технического университета. – Экономика. – 2001. - №3. С.73.

[46] Ватлин А.Ю. Германия в XX веке.– М. "Российская политическая энциклопедия" (РОССПЭП), 2002.С.288.

сірот у выпадку страты карміцьца. У тым жа годзе пенсійнае страхаванне было ўведзена і для ўсіх служачых. У 1923г. для гарнякоў уведзены асобны від страхавання – пенсійнае страхаванне за выслугу гадоў. У 1927г. з'явілася сацыяльнае страхаванне на выпадак беспрацоўя, а з 1938г. у сферу прадугледжанага законам сацыяльнага страхавання ўключаны і рамеснікі, калі яны не страхавалі сябе прыватным чынам.

Пасля другой сусветнай вайны паслугі сацыяльнага страхавання былі значна пашыраны. Так, у 1957г. фермеры атрымалі права на дапамогу па старасці. Пасля буйной рэформы пенсійнага забеспячэння ў 1957г. пенсіі ўвязаны з агульным ростам даходаў наёмных работнікаў. У 2000 і 2001 гг. пенсіі ў якасці выключэння (былі. – М.С.) прывязаны да тэмпаў інфляцыі. Сістэма пенсійнага забеспячэння была рэфарміравана ў 1972 і 1992 гг. Шырокай сеткай сацыяльнага забеспячэння з 1990г. карыстаюцца і пенсіянеры, інваліды вайны, сем'і загінуўшых на вайне або інваліды, інтарэсы якіх ушчамляліся ў былой ГДР. У 1990г. валютны, эканамічны і сацыяльны саюз і Дамова аб аб'яднанні Германіі стварылі грунт для таго, каб па сцячэнні пераходнага перыяду ўсё насельніцтва мела роўную ступень сацыяльнай абароны.[47] " У 1995г. сістэма сацыяльнага страхавання была дапоўнена страхаваннем на выпадак неабходнасці догляду пры хваробе або па старасці. Яна прадугледжвае аказанне паслуг як у хатніх, так і ў стацыянарных умовах. Гэта азначала для тых, хто працуе па найму, змяншэнне іх чыстай зарплаты."[48]

"Зараз у старых федэральных землях мужчыны атрымліваюць пенсіі ў сярэднім у памеры 980 еўра,жанчыны – 644 еўра. У новых землях мужчыны атрымліваюць у сярэднім 1030 еўра , жанчыны – да 830 еўра...

Працаатрымальнікі і працадаўцы ў 2003 г. унеслі адпаведна папалам ў памеры 19,5% ад агульнай сумы заробку страхавыя ўзносы, якія не павінны перавышаць 5.100 еўра (заходнегерманскія федэральныя землі) або 4250 еўра (усходнегерманскія федэральныя землі)."[49]

"Пенсія па старасці, як правіла, выплачваецца па дасягненні 65-гадовага ўзросту. Пры пэўных умовах яна можа выплачвацца і па дасягненні 63 або 60 гадоў (у будучым, у асноўным з вылічэннямі з пенсіі, закліканымі кампенсаваць страты ад датэрміновага выхаду на пенсію ў выглядзе больш працяглага тэрміну яе атрымання)." [50]

Заўважым, што ў 1990-ыя гады становішча пенсіянераў у ФРГ пагоршылася. "Урадам Коля быў павышаны пенсійны ўзрост (да 65 гадоў для мужчын і жанчын), паводле новай сістэмы разліку пенсій яны знізіліся з 70 да 64% ад сярэдняй заработнай платы. Аднак далейшае наступленне на правы пенсіянераў было прыпынена – патэнцыял прагэсту гэтай сацыяльнай групы ўзяла пад сваё крыло парламенцкая апазіцыя."[51]

"Штогод у Германіі на падтрымку сем'яў выдаткоўваецца звыш за 53 мільярды еўра. Дапамога на першае, другое і трэцяе дзіця штомесяц складае 154 еўра. На кожнае наступнае дзіця выплачваецца 179 еўра. Сума даходаў, якія не абкладаюцца падаткамі ў сувязі з наяўнасцю дзяцей да 16 гадоў, складае 3648 еўра на адно дзіця. Існуе дапамога на выхаванне дзіцяці, якая выплачва-

---

[47] Германия. Факты. – Франкфурт на Майне: Societatsverlag, 2000. С.368 – 369

[48] Ватлин А.Ю. Германия в ХХ веке – М.: "Российская политическая энциклопедия" (РОССПЭП), 2002.С.288.

[49] Tatsachen uber Deutshland – Berlin:Auswartiges Amt, 2003.S.147.

[50] Германия. Факты. Франкфурт-на-Майне.Societatsverlag, 2000.С368-369

[51] Ватлин А.Ю. Германия в ХХ веке – М.: "Российская политическая энциклопедия" (РОССПЭП), 2002.С.289.

ецца маці ці бацьку на працягу двух гадоў і складае 370 еўра ў месяц на дзіця."[52] Маюць месца і некаторыя іншыя льготы.

Напрыканцы 2001г. 2,7 мільёна чалавек у ФРГ атрымлівалі сацыяльную дапамогу.[53]

Уладным структурам Берлінскай рэспублікі не ўдалося перамагчы "галоўнае сацыяльнае зло.".. – беспрацоўе... У студзені 1994г. яго ўзровень пераваліў за адзнаку 4 млн. (зараз у ФРГ фактычна беспрацоўных – 7 млн. – М.С.). Беспрацоўе носіць структурны характар і адлюстроўвае працэс скарачэння колькасці занятых у прамысловай вытворчасці Германіі. Укараненне робатаў (асабліва ў аўтаіндустрыі) і сістэм аўтаматызаванага кіравання прывяло да таго, што канвейеры буйнейшых прадпрыемстваў літаральна "абязлюдзелі".

У сферы нематэрыяльнай вытворчасці да канца 1990-ых гг. было занята ўжо дзве трэці самадзейнага насельніцтва, пры гэтым чвэрць з іх працавала на дзяржаву, што адрознівала ФРГ ад іншых высокаразвітых краін Захаду».[54]

"У прынцыпе на выпадак беспрацоўя застрахаваныя ўсе наёмныя работнікі (гэта значыць рабочыя, служачыя, надомнікі і тыя, хто навучаецца прафесіі). Страхавыя ўзносы наёмныя работнікі і працадаўцы плацяць папалам. Права на дапамогу па беспрацоўю ў памеры 60% (пры наяўнасці аднаго дзіцяці ў памеры 67%) ад чыстай сярэдняй заработнай платы беспрацоўны мае, як правіла, у тым выпадку, калі за апошнія тры гады ён выплачваў страхавыя ўзносы мінімум на працягу 12 месяцаў. Працягласць выплаты гэтай дапамогі залежыць ад узросту."[55]

У якія ўстановы можа звярнуцца жыхар ФРГ, калі ў яго ёсць патрэба ведаць усё пра стан свайго здароўя, калі ён мае праблемы са здароўем ?

Ва ўстановы з рознай формай уласнасці, установы, якія падпарадкоўваюцца розным суб'ектам (дзяржаўным, камунальным і г. д.), маюць розныя механізмы функцыянавання. Разлічваючы свае магчымасці і рэсурсы на доўгатэрміновую перспектыву, немцы абавязкова бранiруюць у сваім індывідуальным або сямейным бюджэце тую яго частку, якая павінна быць прызначана для медыцынскай страхоўкі, для ўнясення ў медыцынскую касу.

Заўважым, што сістэма, звязаная з аказаннем паслуг па ахове здароўя, не абмяжоўваецца медыцынскімі касамі. Ёсць адпаведнае міністэрства ў структуры выканаўчай улады суб'ектаў федэрацыі, якія маюць ў дадзенай галіне значна больш паўнамоцтваў, чым федэрацыя. Разам з тым кіруючыя колы ФРГ маюць неабходнасць ў распрацоўцы і ажыццяўленні агульнафедэральнай палітыкі і, натуральна, існуе агульнафедэральнае міністэрства. Пастаянна застаецца высокім попыт на паслугі, суб'ектамі аказання якіх выступаюць таварыствы, якія ствараюцца бундэсбюргерамі, якія давалі клятву Гіпакрата.

Кліентура медыцынскіх устаноў атрымлівае тры віды паслуг.

Першы від паслуг – прафілактыка. Галоўны прыярытэт у аказанні дадзеных паслуг – маленькія жыхары ФРГ, якія не дасягнулі чатырохгадовага рубяжа. Яны рэгулярна з'яўляюцца аб'ектам пільнай увагі ўрачэбнага корпуса, які сканцэнтраваны на абследаванні. Пры гэтым найбольшая нагрузка прыходзіцца на дзіцячых кардыёлагаў і неўрапатолагаў, якія абавязаны даць экспертнае заключэнне аб прыналежнасці таго ці іншага юнага немца да групы рызыкі, якая ўваходзіць у іх кампетэнцыю.

Германская дзяржава зацікаўлена ў тым, каб як мага менш бундэсбюргераў цярпела пакуты, звязаныя з наяўнасцю ў іх злаякаснай пухліны. Трывала вызначаны аптымальны у плане прафілактыкі дадзенага вельмі небяспечнага віду

---

[52] Tatsachen über Deutshland. – Berlin: Auswärtiges Amt, 2003.S.153.

[53] Tatsachen über Deutshland. – Berlin: Auswartiges Amt, 2003.S.153.

[54] Ватлин А.Ю. Германия в XX веке. – М: "Российская политическая энциклопедия" (РОССПЭП), 2002.С.288.

[55] Германия. Факты. – Франкфурт-на-Майне: Societätsverlag, 2000.С373.

захворванняў графік наведванняў грамадзянамі ФРГ кампетэнтных спецыялістаў. Пры гэтым выразна прасочваецца полаўзроставая дыферэнцыяцыя. Дадзены графік распаўсюджваецца:

па-першае, на жаночую частку бундэсбюргераў, якая мінавала 30-гадовы рубеж і,

па-другое, на моцную палову германскага насельніцтва, якая не маладзей за 45 гадоў.

Другі від паслуг – лячэнне. Ва ўрачэбны корпус уваходзіць 258000 чалавек. У германскіх медыцынскіх установах 677685 бальнічных ложкаў. Дадзеныя паказчыкі адпавядаюць патрэбам краіны.

Трэці від паслуг – рэабілітацыя. У ФРГ дзейнічае моцны комплекс рэабілітацыйных цэнтраў.

У краіне высокі паказчык сярэдняй працягласці жыцця. Жыццёвы шлях сярэднестатыстычнага нямецкага мужчыны заканчваецца ў 73 гады. Аналагічны паказчык адносна жаночай часткі бундэсбюргераў на 7 пунктаў вышэй. Аб высокай выніковасці абслугоўвання немцаў, якія штогод распачынаюць свой жыццёвы шлях, сведчыць наступны факт.

З кожных 1000 немаўлят 993 застаюцца жыць і, натуральна, павялічваюць колькасць насельніцтва Германіі. На жаль, у маштабах федэрацыі ўстановы, у якіх прымаюцца роды, загружаны далёка не поўнасцю. У гісторыі аб'яднанай Германіі не было ніводнага года, калі б кампетэнтныя органы краіны зарэгіст-авалі мільён і болей немаўлят. Немцам у сярэднім не хапала 100000 для дасягнення мільённага рубяжа. Праўда, нараджальнасць апярэджвае смяротнасць і, зразумела, натуральны прырост прасочваецца, хоць і ў сціплых памерах. Бясспрэчна, кадравы патэнцыял германскай медыцыны, выдатная якасць медыцынскага абсталявання, значныя клопаты дзяржавы аб дзецях дашкольнага ўзросту, рэальная падтрымка дзяржструктурамі іх бацькоў ствараюць спрыяльныя ўмовы для таго, каб сярэдняя колькасць дзяцей у нямецкіх сем'ях павялічвалася. Аднак гэта не ўпісваецца ў менталітэт сучаснага сярэднестатыстычнага немца.

Разам з тым для паказу аб'ектыўнай карціны трэба зазначыць, што палітыка дзяржавы ў галіне аховы здароўя з другой паловы 1990-ых гадоў стала абапірацца на значна меншы фінансавы базіс. "Быў урэзаны ўклад дзяржавы ў медыцынскае страхаванне, меншай колькасці маючых патрэбу ў папраўцы здароўя стала аплачвацца знаходжанне ў санаторыі..." ( Даволі адчувальным для бундэсбюргераў. – М.С.) было скарачэнне дзяржаўных гарантый выплаты зарплаты ў выпадку хваробы работніка."

"І ўсё ж немцы дасягнулі да мяжы XXI ст. такіх матэрыяльных поспехаў, што ўражваюць. Статыстыка, якая ведае ўсё, сцвярджае, што зберажэнні жыхароў Германіі перавысілі 6,7 трыльёна марак, што ў ФРГ зарэгістравана 50 млн толькі легкавых аўтамабіляў. Сярэднестатыстычная сям'я мае на сваіх рахунках 180 тыс. марак, сярэднегадавы даход на душу насельніцтва перавысіў у сярэдзіне 1990-х гг. 50 тыс. марак. (Гэтай грашовай адзінкі больш не існуе. – М. С.). (З набліжэннем. – М.С.) новых выбараў хрысціянскія дэмакраты былі вымушаны адмовіцца ад рэжыму жорсткай эканоміі. У другой палове 1990-х гг. сацыяльныя артыкулы зноў перавысілі палову расходнай часткі дзяржаўнага бюджэту (на абарону выдаткоўваецца 2,5%)".[56]

І, нарэшце, трэба сказаць аб становішчы моладзі ў ФРГ. У апошнія гады змяншаецца ў грашовым выражэнні сацыяльны пакет, які яе непасрэдна тычыцца. Разам з тым яго памер застаецца нямалым. Менавіта моладзь утрымлівае першае месца сярод тых бундэсбюргераў, якія атрымліваюць дапамогу па беспрацоўю.

---

[56] Ватлин А.Ю. Германия в XX веке.– М: "Российская политическая энциклопедия" (РОССПЭП), 2002.С.288-290.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Што прынцыпова новага ў германскую эканамічную палітыку ўнёс Л.Эрхард?
2. Чаму канцэпцыя сацыяльнай рыначнай гаспадаркі спрацавала ва ўмовах ФРГ хутка і з бліскучымі вынікамі?
3. Што прынцыпова новага з'явілася ў эканамічнай палітыцы Берлінскай Рэспублікі?
4. Якія змены ў сістэме сацыяльнай абароны грамадзян і чаму адбыліся ў аб'яднанай Германіі ?
5. Якія доўгатэрміновыя наступствы мелі памылкі, каторыя былі дапушчаны на пачатковым этапе інтэграцыі экс-ГДР ў сацыяльна-эканамічную сістэму ФРГ?

**Тэст-заданні:**

1. Які курс дойчмаркі ў адносінах да амерыканскага долара быў усталяваны ў пачатку 1950-х гг.?

а) 4,2:1; б) 3:1; в) 2:1.

2. Калі дойчмарка набывае статус свабодна канвертуемай валюты?

а) у 1958 г; б) у 1967 г; в) у 1980 г.

3. Калі ФРГ становіцца другой прамысловай дзяржавай свету?

а) напрыканцы 1950-х гг.;
б) напрыканцы 1960-х гг.;
в) напрыканцы 1970-х гг.

4. Калі ФРГ стала краінай вялікай хіміі?

а) у 1960-я гг.; б) у 1970-я гг.; в) у 1990-я гг.

5. З якога часу ў эканамічную палітыку ФРГ у якасці неад'емнага элемента было ўведзена планаванне?

а) з 1960-х гг.; б) з 1970-х гг.; в) з 1990-х гг.

6. Назавіце федэральных міністраў, якія распрацавалі план па выхаду ФРГ з рэцэсіі 1966-1967гг.

а) Ф.Й. Штраус, К. Шылер; б) Ф. Руэ, Г. Штольтэнберг;
в) Т. Вайгель, О. Лафантэн.

7. Назавіце федэральнага канцлера, чыім лозунгам быў: «Эканамічны рост любой цаной!»

а) К. Адэнауэр; б) В. Брант; в) Г. Шміт.

8. Калі ФРГ стала складовай часткай еўразоны?

а) з 1 студзеня 1998г.; б) з 1 студзеня 1999г.; в) з 1 студзеня 2002 г.

9. Уласная нафта задавальняе патрэбы ФРГ на

а) 10% б) 50% в) 3%

10. Працягласць нафтаправодаў ФРГ амаль

а) 5000 км; б) 4000 км; в) 2000 км.

11. Беларуска-германскі савет эканамічнага супрацоўніцтва дзейнічае з

а) 5 лютага 1991г.; б) 8 чэрвеня 1992г.; в)10 чэрвеня 2005г.

12. Які беларускі банк мае прадстаўніцтва ў Германіі?

а) Беларусбанк; б) Прыорбанк; в) Нацбанк.

13. Колькі легкавых аўтамабіляў зарэгістравана ў Германіі ?

а) 50 млн.; б) 60 млн.; в) 70 млн.

14. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын у ФРГ –

а) 60 год; б) 73 гады; в) 80 гадоў.

15. Сярэдняя працягласць жыцця жанчын у ФРГ –

а) 73 гады; б) 80 гадоў; в) 88 гадоў.

*Лекцыя восьмая*

# АСНОВЫ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ СІСТЭМЫ. УНУТРАНАЯ І ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ФРГ

***План:***

8.1. Дзяржаўны лад. Прычыны стабільнасці канстытуцыйнага ладу. Асаблівасці германскага федэралізму.

8.2. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі.

8.3. Унутраная і знешняя палітыка.

8.4. Палітычнае супрацоўніцтва паміж РБ і ФРГ, партнёрскія сувязі Брэстчыны з землямі і гарадамі ФРГ.

## *8.1. Дзяржаўны лад. Прычыны стабільнасці канстытуцыйнага ладу. Асаблівасці германскага федэралізму*

Характарыстыку дзяржаўнага ладу ФРГ распачнём з паказу месца прэзідэнта ў сістэме вышэйшага дзяржаўнага кіравання.

У германскага прэзідэнта зусім сціплыя паўнамоцтвы. Поле яго дзейнасці за невялікім выключэннем абмяжоўваецца выкананнем прадстаўнічых функцый.

Механізм абрання прэзідэнта ФРГ даволі просты. Выніковае рашэнне па яго кандыдатуры прымае Федэральны сход. З каго ж складваецца колькасць тых, хто галасуе? З дзвюх катэгорый парламентарыяў:

1) з парламентарыяў федэральнага ўзроўню, якія засядаюць у ніжняй палаце вышэйшага заканадаўчага органа краіны;

2) з парламентарыяў зямельнага ўзроўню, якія засядаюць у ландтагах.

У ходзе выніковага галасавання дзейнічае жорсткая фракцыйная дысцыпліна. Возьмем, напрыклад, выбары прэзідэнта ФРГ у 1994 і 1999гг. Пачнём з выбараў 1994г. Імёны асноўных прэтэндэнтаў былі вядомы загадзя: буйны дзеяч СДПГ, былы прэм'ер-міністр зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія Йоханес Рау і былы старшыня Канстытуцыйнага Суда ФРГ Раман Герцаг, які прадстаўляў ХДС. У першага велізарны вопыт як публічнага палітыка. Й. Рау выдатна зарэкамендаваў сябе на пасадзе кіраўніка зямельнага ўрада. Паўночны Рэйн-Вестфалія — гэта Рур, індустрыяльнае сэрца Германіі. Стан спраў у дадзеным рэгіёне істотна ўплывае на агульнафедэральную эканамічную сітуацыю. Бундэсбюргеры, канешне ж, памятаюць Й. Рау і як сацыял-дэмакратычнага кандыдата на пасаду федэральнага канцлера ў ходзе парламенцкіх выбараў 1987 года. Памятаюць і тое, што ён пэўны час быў намеснікам старшыні СДПГ. На федэральным ўзроўні высока цэняць інтэлект, арганізацыйныя здольнасці Й. Рау. Што яму мог супрацьпаставіць Раман Герцаг? Ён вядомы толькі як буйны юрыст. Нямала дэмахрысціян і іх саюзнікаў усведамляла, што Й. Рау па сваіх дадзеных стаіць вышэй за Р. Герцага. Але фракцыйная дысцыпліна, фракцыйная салідарнасць ўзялі верх, і менавіта экс-старшыня Канстытуцыйнага Суда ФРГ стаў чарговым прэзідэнтам дзяржавы. У 1999г. у час аналагічнай працэдуры сацыял-дэмакраты і іх саюзнік Саюз 90/Зяленыя мелі большасць галасоў, што прадвызначыла перамогу Й. Рау. На наш погляд, спрошчанасць працэдуры абрання прэзідэнта ФРГ тлумачыцца перш за ўсё яго сціплымі паўнамоцтвамі.

З пункту гледжання рэальнага аб'ёму паўнамоцтваў першай асобай дзяржавы з'яўляецца федэральны канцлер, які ўзначальвае ўрад. Разам з тым заўважым, што ў яго паўнамоцтваў значна менш, чым у кіраўнікоў дзяржаў у такіх прэзідэнцкіх рэспубліках, як Расія, Францыя.

Нямецкі вопыт цэнны наяўнасцю сістэмы супрацьвагаў, якая выключае ўсталяванне дыктатуры. У краіне склаўся выразны падзел улад. І па канстытуцыі, і ў рэальнай практыцы раздзельна дзейнічаюць заканадаўчая, выканаўчая, судовая ўлада.

Вышэйшым заканадаўчым органам ФРГ з'яўляецца парламент, які складаецца з дзвюх палат: верхняй (бундэсрата) і ніжняй (бундэстага).

Механізм фарміравання бундэсрата наступны. Кіраўнік выканаўчай улады суб'екта федэрацыі падбірае ўнутры ўзначальваемай ім структуры людзей, здольных высокапрафесійна адстойваць інтарэсы канкрэтнай зямлі, зямель увогуле. Яны набываюць статус членаў бундэсрата. Усяго ў такой якасці выступаюць 68 чалавек. Прадстаўніцтва у бундэсраце, гэта значыць палаце зямель ад суб'ектаў федэрацыі, неаднолькавае. У зямель розная колькасць насельніцтва. Менавіта гэты паказчык з'яўляецца вырашальным пры вызначэнні колькасці галасоў ад кожнай зямлі. Калі меней заселеныя землі дэлегуюць у бундэсрат трох дэпутатаў, то максімальнае прадстаўніцтва ад зямель роўна шасці дэпутатам.

Ніжняя палата — палата дэпутатаў — абіраецца ўсенародным галасаваннем. Для арганізацыі і правядзення парламенцкіх выбараў на федэральным узроўні ствараецца выбарчая камісія. У ФРГ дзейнічае змешаная сістэма. Адна палова дэпутатаў фарміруецца з дэпутатаў, якія абіраюцца па партыйных спісах. Партыі, якія набралі меней за пяць працэнтаў галасоў выбаршчыкаў, у бундэстаг не трапляюць. Праўда, тут ёсць сэнс зрабіць агаворку. Чатыры прамыя мандаты, якія дасталіся Партыі Дэмакратычнага Сацыялізму ў 1994г., далі ёй магчымасць сфарміраваць фракцыю ў складзе 30 чалавек. Другая палова членаў ніжняй палаты парламента набывае гэты статус у выніку выбараў на мажарытарным грунце.

Нямецкі бундэстаг мае права вызваліць ад займаемай пасады федэральнага канцлера. Найбольш тыповы прыклад рэалізацыі гэтага права — вынясенне канструктыўнага вотуму недавер'я ўвосень 1982 года, калі Гельмут Шміт вымушаны быў саступіць капітанскі мосцік Гельмуту Колю. Трэба звярнуць асаблівую ўвагу на выраз "канструктыўны вотум недавер'я". Заканамерна ўзнікае пытанне: "Чаму ён выносіўся толькі адзін раз у гісторыі ФРГ?" Для нямецкай вялікай палітыкі канструктыўным з'яўляецца тое, што прапаноўваецца інтэлектуаламі найвышэйшага класа, адпавядае нацыянальным інтарэсам краіны. Амбіцыі асобных палітыкаў, асобных партый ніяк не могуць быць галоўным матывам пры вылучэнні канструктыўнага вотуму недавер'я ў нямецкім бундэстагу.

А зараз пяройдзем да судовай улады.

Для разбіральніцтва разнастайных спраў задзейнічаны найшырэйшы спектр судоў. У заканадаўстве вельмі выразна акрэслена кампетэнцыя кожнага з іх. Найбольшыя паўнамоцтвы ў Вярхоўнага федэральнага суда, другі па значнасці — федэральны суд, трэцяя — федэральная палата. Судовую ўладу ажыццяўляюць таксама вышэйшыя земскія, участковыя суды. У катэгорыю спецыяльных судоў уваходзяць адміністрацыйныя, фінансавыя, працоўныя, сацыяльныя і дысцыплінарныя суды.

Ключавы элемент нямецкай судовай сістэмы — Канстытуцыйны суд, які мае пастаянную рэзідэнцыю ў Карлсруэ. Ён і толькі ён упаўнаважаны казаць апошняе слова, калі які-небудзь заканадаўчы акт не адпавядае Асноўнаму закону ФРГ. У выпадку наяўнасці важкіх падстаў Канстытуцыйны суд прымае рашэнне, паводле якога федэральны канцлер, федэральны прэзідэнт, іншыя постаці на нямецкім палітычным алімпе павінны вызваліць займаемыя пасады. Пры вынясенні такога гіпатэтычнага рашэння ніхто з іх не чапляўся б за ўладу, а ўходзіў бы адразу. Заканамерна ўзнікае пытанне: "Чаму за 56 гадоў дзеяння Асноўнага закона ФРГ Канстытуцыйны суд ні разу не прымаў падобныя рашэнні?" Адказ на гэта пытанне просты і ясны: ніводзін федэральны канцлер, ніводзін федэральны прэзідэнт, ніводная службовая асоба больш нізкага рангу (на зямельным, акруговым узроўнях) ні разу не парушыла Канстытуцыю.

ФРГ — гэта федэрацыя, якая складаецца з 16 зямель: Баварыі, Бадэн-Вюртэмберга, Берліна, Брандэнбурга, Брэмена, Гамбурга, Гесена, Мекленбурга-Пярэдняй Памераніі, Ніжняй Саксоніі, Паўночнага Рэйна-Вестфаліі, Рэйнланд-Пфальца, Саара, Саксоніі, Саксоніі-Анхальт, Цюрынгіі, Шлезвіг-Гальштэйна.

Пералічаныя тут суб'екты федэрацыі рэзка адрозніваюцца па наступных паказчыках: плошчы, насельніцтву, эканамічнаму патэнцыялу. Берлін, Брэмен і Гамбург з'яўляюцца гарадамі-землямі. Самы маленькі суб'ект федэрацыі – Брэмен (плошча 404 квадратныя кіламетры, насельніцтва 700 тысяч чалавек). Найбольшы па плошчы — Баварыя (70553 квадратныя кіламетры), па насельніцтву — Паўночны Рэйн-Вестфалія (17 мільёнаў чалавек). Нягледзячы на падобныя адрозненні, усе землі з'яўляюцца раўнапраўнымі ў рамках федэрацыі. 15 з 16 зямель падпісалі федэратыўную дамову. Толькі адна Баварыя пакуль гэтага не зрабіла.

На зямельным узроўні галоўным органам заканадаўчай улады з'яўляецца ландтаг. Артыкул 73 Асноўнага закону ФРГ вельмі выразна акрэслівае аб'ём паўнамоцтваў бундэстага. Для правільнага разумення аб'ёму паўнамоцтваў зямель звернемся да артыкула 70 германскай Канстытуцыі. Тут размова ідзе аб "праве заканадаўства ў той меры, у якой дадзеным Асноўным законам правы заканадаўчай улады не прадастаўлены федэрацыі". Абмежаваўшыся толькі дадзенай цытатай, немагчыма поўнасцю разабрацца ў суадносінах аб'ёмаў паўнамоцтваў, напрыклад, па такой лініі: бундэстаг — ландтаг зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія. У гэтай сувязі вельмі дарэчы выраз "канкурыруючая заканадаўчая кампетэнцыя", які ўтрымліваецца ў аналізуемым дакуменце. Гэты выраз ясна канкрэтызуецца ў дачыненні да суб'ектаў федэрацыі у артыкуле 73, у якім прапісана магчымасць узнікнення сітуацый, пры якіх яны "валодаюць правам заканадаўства толькі тады і пастолькі, калі і пасколькі федэрацыя не выкарыстоўвае сваіх правоў заканадаўства." Зразумела, з логікі самога выразу "канкурыруючая заканадаўчая кампетэнцыя" вынікае адсутнасць манаполіі ў адпаведнай галіне як у ландтага, так і ў бундэстага. Паводле артыкула 72(2) не выключаецца ўдзел дэпутатаў бундэстага ў пашырэнні юрыдычнага базісу дзяржаўнай палітыкі ў частцы "канкурыруючай заканадаўчай кампетэнцыі". А зараз важна канкрэтна акрэсліць сферу манапольных рашэнняў федэральных улад, "сферу выключнай кампетэнцыі" кіруючых органаў суб'екта федэрацыі.

Ніжэй будзе паказана схема заканадаўчых кампетэнцый федэрацыі і зямель у ФРГ.

| Федэрацыя | Землі |
|---|---|
| Выключнае заканадаўства:<br>- знешняя палітыка;<br>- абарона і грамадзянская абарона;<br>- грамадзянства і пашпартны рэжым;<br>- пошта і тэлекамунікацыя;<br>- валюта, грашовае абарачэнне, сістэма мераў і вагаў, федэральная статыстыка;<br>- мытня і знешні гандаль;<br>- паветраныя і чыгуначныя зносіны;<br>- прыняцце асноў заканадаўства | Выключнае заканадаўства:<br>- культура;<br>- паліцыя;<br>- адукацыя;<br>- ахова здароўя |
| Канкурыруючае заканадаўства:<br>- грамадзянскае, крымінальнае і крымінальна-працэсуальнае права;<br>- акты грамадзянскага стану;<br>- правы аб'яднанняў і сходаў;<br>- рэгуляванне статусу іншаземцаў і перамешчаных асобаў;<br>- вытворчасць і выкарыстанне атамнай энергіі;<br>- дзяржаўнае сацыяльнае забеспячэнне;<br>- гаспадарчае права | |

Крыніца: Павлов Н.В. Германия на пути в третье тысячелетие: Пособие по страноведению.-М.: Высшая школа, 2001. С. 21

У Германіі назапашаны каштоўны вопыт кіравання на месцах. На ўзроўні акруг найбольшы аб'ём паўнамоцтваў у прэзідэнтаў. Апошнія прыступаюць да выканання сваіх абавязкаў пасля адпаведнага ўказа, замацаванага подпісам прэм'ер-міністра зямлі. Прэзідэнты нясуць адказнасць перад зямельным урадам за выразнае функцыянаванне муніцыпальных органаў. Бундэсбюргеры шляхам свабодных, дэмакратычных выбараў вырашаюць, хто павінен уваходзіць у склад павятовых і абшчынных саветаў. У заканадаўстве спецыяльна агаворана сітуацыя, калі колькасць насельніцтва абшчыны не дасягае 200 чалавек. У кожнай з такіх абшчын акрамя адпаведнага савета ёсць яшчэ і сход выбаршчыкаў. Гарадскія сходы Берліна, Брэмена, Гамбурга адрозніваюцца біфункцыянальнасцю. Па-першае, яны ажыццяўляюць уладныя паўнамоцтвы ў межах названых зямель. Па-другое, для берлінцаў, брэменцаў, жыхароў Гамбурга размова ідзе аб органах гарадскога самакіравання.

### *8.2. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі*

Ва ўмовах ФРГ уяўляецца слушным весці размову не аб палітычнай сістэме, а аб партыйна-палітычным механізме. У гэтай сістэме закладзены механізм унутранага самаразвіцця, унутранага самаруху. Крыніца самаразвіцця, самаруху – у барацьбе паміж кіруючымі і апазіцыйнымі партыямі.

Тыповай ілюстрацыяй дзеяння гэтага механізма з'яўляецца крах сацыял-ліберальнай кааліцыі і вяртанне дэмахрысціян да ўлады ў 1982 годзе. Дэмахрысціяне зрабілі акцэнт на манетарысцкія метады, на што не адважваліся пайсці сацыял-дэмакраты. У тагачасных умовах менавіта гэтыя метады ў найбольшай меры адпавядалі інтарэсам краіны і яе грамадзян.

Зразумела, у сваёй барацьбе і ўрад, і парламенцкая апазіцыя ніколі не выходзілі за рамкі канстытуцыйнага поля. Гэтая барацьба вялася і вядзецца цывілізавана.

У адносінах да Бонскай рэспублікі з некаторымі агаворкамі можна было казаць аб іс-наванні $2^1/_2$ партыйнай сістэмы. З 1949 года тут у барацьбе за ўладу сапернічаюць блок ХДС/ХСС і СДПГ. Блоку ХДС/ХСС толькі адзін раз (у 1957 годзе) удалося дасягнуць абсалютнага поспеху на парламенцкіх выбарах і манапольна сфарміраваць урад. Сацыял-дэмакраты такога поспеху не дасягалі ні разу. Зразумела, для таго, каб стаць ля дзяржаўнага руля, і ХДС/ХСС, і СДПГ прыходзілася заключаць кааліцыйныя пагадненні з СвДП. Праўда, у 1966-1969 гг. існавала вялікая кааліцыя ў складзе ХДС/ХСС і СДПГ. Набыццё "зялёнымі" ўстойлівага рэйтынгу ў федэральным маштабе, сур'ёзнага вопыту дзяржаўнага кіравання на зямельным, акруговым, камунальным узроўнях, выцісканне ў кіраўніцтве партыі фундаменталістаў рэалістамі на чале з Ёшкай Фішэрам прадвызначалі магчымасць нясення ёю ўрадавай адказнасці на федэральным узроўні, што было рэалізавана ў 1998 г., гэта значыць у час існавання Берлінскай рэспублікі.

Кансерватыўны лагер у ФРГ прадстаўляюць партыі ХДС, ХСС, якія ўтвараюць блок ХДС/ХСС.

Гэтыя партыі ўзніклі на некалькі гадоў раней, чым з'явіліся на геаграфічнай карце ФРГ. Перадгісторыю іх узнікнення нельга зразумець без наступнага меркавання нямецкага навукоўцы В. Хазелофа: "Пасля краху нацыянал-сацыялізму ў Нямеччыне заставалася жывой толькі адна сіла і адна ідэя-царкоўныя арганізацыі і хрысціянства."[57] Гэта бліскуча разумелі буйныя дзеячы, якія стаялі ля вытокаў ХДС: Г. Абс, Т. Дзінкельбах, Г. Кост, Р. Лер, Г. Пюндэр, Р. Пфердменгес і г.д.

---

[57] Haseloff W. Die politischen Parteien in der Bundesrepublik Deutschland. Frankfurt a. M..u.a.,1986.S.42.

"Большасць заснавальнікаў і першых сяброў ХДС...(складалі. – М.С.) прадстаўнікі інтэлігенцыі і сярэдніх слаёў, служачыя і рабочыя, якія выйшлі пераважна з шэрагаў (каталіцкай партыі. – М.С.) Цэнтра, хрысціянскіх прафсаюзаў і канфесійных ферэйнаў. Думка стварыць межканфесійную партыю нарадзілася ў іх з сумеснага актыўнага ці, што было значна часцей, пасіўнага супраціўлення злачыннаму нацыянал-сацыялістычнаму рэжыму, а ідэалагічным грунтам іх поглядаў быў хрысціянскі гуманізм. Яны лічылі, што фашызм з'явіўся вынікам забыцця нямецкім народам прынцыпаў хрысціянскай маралі, і хацелі запоўніць узнікшы "этычны вакуум" хрысціянскім маральным законам. Гэтыя храсціянскія дэмакраты "першай гадзіны" імкнуліся да стварэння грамадскага ладу, які заснаваны на хрысціянскіх прынцыпах."[58]

І праз больш чым паўстагоддзя хрысціянскі гуманізм праходзіць чырвонай ніткай праз усе ідэйна-палітычныя ўстаноўкі дэмахрысціян. Рэтраспектыўны погляд на гісторыю ХДС паказвае, што аб'яднанне пад адным дахам католікаў і пратэстантаў было выйгрышным крокам у стратэгічным плане. Заўважым, што ў першыя гады існавання партыі ў большасці яе сяброў былі ілюзіі на прадмет аптымальнай палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай сістэмы, што накладала адбітак нават на некаторыя тагачасныя праграмныя ўстаноўкі. Але так працягвалася нядоўга. Рэалізм узяў верх.

З усіх слаёў насельніцтва з ідэалогіяй дэмахрысціян і іх баварскага хаўрусніка ХСС больш за усё стыкуюцца інтарэсы прадпрымальніцкага корпуса.

Зразумела, і зараз і ХДС, і ХСС ставяць у аснову асноў хрысціянскія каштоўнасці. Трэба мець на ўвазе, што гэтыя каштоўнасці маюць дачыненне да ўсяго нямецкага народа. Пагэтаму не зусім маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што ХДС і ХСС – гэта партыі выключна прадпрымальнікаў. У нямецкім грамадстве ніхто не можа параўнацца з дадзенымі партыямі ў прапагандзе нацыянальнай, дзяржаўнай ідэі, ідэі трывалай сям'і, парадку, стабільнасці. Агульны назоўнік указаных ідэй – кансерватызм. Ні адну з іх нельга выключыць з сістэмы агульнанямецкіх, адрасаваных усім немцам ідэй.

Вядома, што Хрысціянска-дэмакратычны саюз (ХДС) дзейнічае ў пятнаццаці землях, гэта значыць на агульнафедэральным узроўні. Хрысціянска-сацыяльны саюз (ХСС) абмяжоўваецца выключна рамкамі Баварыі. Блок паміж гэтымі партыямі існуе з 1949 года. Былі і непаразуменні, і пагроза распаду блока. Адзін час ХСС паспрабаваў выйсці за рамкі Баварыі, што выклікала рэзка адмоўную рэакцыю з боку ХДС. Аднак увогуле паміж імі пераважала згода.

Ідэі лібералізму – гэта карта, па якой гуляе партыя свабодных дэмакратаў (СвДП). Калі паслухаць нямецкіх лібералаў, то можна зрабіць выснову, што ніхто ў ФРГ не выступае так актыўна за рыначнаю сістэму, за цывілізаваную канкурэнцыю, як яны. На наш погляд, у такой заяве ёсць нацяжка, якая мае на сваёй мэце зарабіць дадатковыя прапагандысцкія ачкі. Добра вядома, што і ХДС, і ХСС былі, ёсць і застаюцца актыўнымі прыхільнікамі і рыначнай сістэмы, і цывілізаванай канкурэнцыі.

Калі браць праграмныя ўстаноўкі СвДП з аднаго боку і ХДС/ХСС з другога боку, то ў лібералаў акажацца больш гнуткі варыянт дасягнення мэты па пытаннях, якія маюць дачыненне да сферы ўнутранай бяспекі. Па ўзросту СвДП не на шмат маладзей за ХДС і ХСС.

Старэйшая нямецкая партыя – Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ). Яе вытокі бяруць пачатак ад далекіх 1860-ых гадоў. Гэта перш за ўсё партыя працаатрымальнікаў, нягледзячы на тое, што афіцыйна яна называецца народнай партыяй. Сацыял-дэмакраты па-ранейшаму верныя лозунгу вялікага

[58] Сокольский С.Л. Христианско-демократический союз ФРГ: социология и политика. – М.: Наука, 1983. С. 6.

тэарэтыка Э. Бернштэйна: рух – ўсё, канчатковая мэта – нішто. Яны выступаюць за тое, каб у грамадстве было больш справядлівасці, больш роўнасці.

У ідэалагічным арсенале партыі значнае месца займае праца. Ідэальнае для СДПГ грамадства – грамадства дэмакратычнага сацыялізму. На думку ідэолагаў дадзенай партыі, у гэтым грамадстве возьмуць верх палітычная, эканамічная, сацыяльная дэмакратыя. Сацыял-дэмакраты імкнуцца зрабіць капіталізм лепш, чым ён ёсць, не змяняючы яго базісных асноў.

Месца СДПГ у палітычным спектры – лявей ад цэнтра і правей ад «Зялёных» і ПДС.

Складаным пытаннем для дадзенай партыі з'яўляецца стаўленне да новых сацыяльных рухаў. З аднаго боку трэба пашыраць электарат, а з другога – нельга губляць свой профіль. Пагэтаму сацыял-дэмакраты папаўняюць свой асенал далека не ўсімі лозунгамі гэтых рухаў. «Зяленыя» з аднаго боку робяць акцэнт на экалагічныя праблемы, а з другога – усё больш запазычваюць элементы ліберальнай ідэалогіі. Партыя «Зялёных» была створана ў1980 годзе. У 1993 заходнегерманскія «зялёныя» аб'ядналіся з усходнегерманскім «Саюзам 90» і ўзнікла арганізацыя «Саюз 90/Зялёныя».

Партыя дэмакратычнага сацыялізму (ПДС) бярэ свой пачатак ад сацыялістычнай адзінай партыі Германіі (САПГ), якая манапольна вызначала ўнутраную і вонкавую палітыку экс – ГДР. На ідэалогію ПДС моцны адбітак накладвае марксізм. Аднак удзельная вага марксізму ў праграмных установках дадзенай партыі меншая, чым у яе папярэдніцы.

Увосень 2005 года адбудуцца парламенцкія выбары і пачнецца адлік новай легіслатуры. Ведучы размову аб маючых адбыцца выбарах, нельга не спыніцца на выніках апошніх парламенцкіх выбараў для вядучых партый краіны. Яны адбыліся 22 верасня 2002 года.

Кааліцыя СДПГ/Саюз 90/Зялёныя, якая бесперапынна знаходзіцца ва ўладзе з 1998 года, зноў выйшла пераможцай. Калі лічыць з моманту заснавання Бонскай дзяржавы, першых выбараў у Бундэстаг, то і ХСС/ХДС, і СДПГ павінны быць далёкія ад эйфарыі. Так ужо атрымалася, што ў дадзены момант працэнт бундэсбюргераў, якія галасавалі за дэмахрысціян і іх баварскага хаўрусніка, быў самым нізкім за ўсю гісторыю блока. У 1998 годзе блок ХДС/ХСС набраў больш галасоў, чым у 1949 годзе, але менш, чым на тых выбарах, якія праходзілі між гэтымі гадамі. Напрыклад, у 1990 годзе вынік для ХДС склаў 43,8%, а ў 1994 годзе – 41,4% галасоў бундэсбюргераў. Размеркаванне паміж партнёрамі па блоку было такое: 28,4% – за ХДС, 6,7% – за ХСС. У 2002 годзе блок дабавіў 3,4% (ХДС +1,1%; ХСС +2,3%).

Вядома, што рэкорд СДПГ быў устаноўлены ў 1972 годзе, калі за партыю Вілі Бранта прагаласавала 45,8% бундэсбюргераў. Па выніках выбараў 2002 года (38,5%) сацыял-дэмакраты былі далёкія ад гэтага рэкорду. Яны маглі запісаць у свой пасіў той факт, што на папярэдніх выбарах за СДПГ прагаласавала на 2,4% выбаршчыкаў больш.

Адназначна павінны запісаць сабе вынікі выбараў у актыў лідэры лібералаў. Вынік для партыі суцяшальны: – 7,4%. На парламенцкіх выбарах 1998 года за СвДП прагаласавала на 1,2% выбаршчыкаў менш.

Зараз у бундэстагу засядае 603 дэпутаты. З іх 306 прадстаўляе ўрадавыя партыі і 297 – апазіцыю. Як бачым, апошняй зусім няшмат не хапіла для перамогі на выбарах. Для параўнання важна прывесці наступны факт: у парламенце папярэдняга склікання апазіцыйныя партыі мелі на 21 дэпутацкі мандат меней, чым урадавыя.

Зараз палітычныя ўнукі Бранта маюць 251 голас ў ніжняй палаце германскага парламента. 55 дэпутатаў прадстаўляюць арганізацыю «Саюз-

90»/«Зялёныя». За яе прагаласавала 8,6% бундэсбюргераў. У 1990 годзе, калі«Саюз-90» і «Зялёныя» яшчэ не былі аб'яднаны, вынікі выбараў для іх былі больш сціплымі. «Саюз-90»/ «Зялёныя», які дзейнічаў у экс-ГДР, меў у сваім актыве 1,2%. Вынік для «Зялёных», якія дзейнічалі ў экс-ФРГ, быў вышэй 3,8%. У 1994 годзе за «Зялёных» прагаласавала 7,3% выбаршчыкаў, а ў 1998 годзе – 6,9%. Па выніках выбараў 2002 года «Саюз-90»/«Зялёныя» мае ў бундэстагу 55 дэпутатаў.

Заўважым, што і за ХДС/ХСС, і за СДПГ прагаласавала аднолькавая колькасць бундэсбюргераў – 38,5%. Аднак сацыял-дэмакраты апярэдзілі дэмахрысціян па колькасці мандатаў, і, як вынік, маюць у ніжняй палаце парламента на 3 дэпутаты болей, чым дэмахрысціяне.

У ПДС няма і не будзе электарата ў экс – ФРГ. У 1994 годзе ПДС набрала ў экс-ГДР 18,5% галасоў. У 1998 годзе партыя зрабіла моцны рывок, пераадолеўшы 5%-ую перашкоду (5,1%) і мела ў бундэстагу самастойную фракцыю у колькасці 36 дэпутатаў.

У 2002 годзе вынік для ПДС быў зусім сціплым і ў парламент ад яе трапілі толькі 2 дэпутаты.

«Новы» Бундэстаг стаў меншы, маладзейшы, больш жаночы. У мінулыя гады Германскі Бундэстаг быў буйнейшым у свеце дэмакратычна абраным парламентам. Зараз, пасля рэформы выбарчых акруг, на гэта месца вылучылася ніжняя палата брытанскага парламента. (У германскага парламента трэцяе месца пасля брытанскага і італьянскага. – М. С.)

Прыкладна трэць членаў парламента – навічкі. На долю кіруючай СДПГ прыпадае каля 20% новых дэпутатаў, яе кааліцыйны партнёр «Саюз 90/ Зялёныя» налічвае самую вялікую колькасць дэпутатаў-дэбютантаў (каля 40%). Свайго кшталту прэм'еру перажыў дэпутат ад «зялёных» Ханс Крысціян Штробеле, хоць у парламенце ён ужо даўно. У сваёй берлінскай выбарчай акрузе 65-гадовы юрыст змог дасягнуць прамога мандата – першага ў гісторыі сваёй партыі. У фракцыях СвДП, ХДС/ХСС прыкладна трэць парламентарыяў – навічкі.

Сярэдні ўзрост дэпутатаў сёння (у параўнанні з 14-м бундэстагам. – М. С.) на паўгода меней – 49,3. Доля жанчын вырасла – ужо сёмы раз запар – з 30,9 да 32,5%. У абсалютных лічбах гэта азначае: 196 дэпутатаў з 603 – жанчыны. Па гэтым паказчыку Германія займае месца ў першай трэці спіса еўрапейскіх краін.

Сярод дэпутатаў «Саюза -90/Зялёныя» доля жанчын самая вялікая – 58,2%. Адначасова гэта самая маладая фракцыя, сярэдні ўзрост яе дэпутатаў – 45 гадоў. У «зялёных» і самы юны дэпутат. Ганна Люрман з зямлі Гесен у 19 гадоў стала самым маладым дэпутатам за ўсю гісторыю германскага бундэстага. У СДПГ доля жанчын складае 37,5%. У ХДС/ХСС – 22,2%. Самая нізкая доля жанчын – у фракцыі «СвДП» – 21,3%».[59]

Цікава прасачыць суадносіны мужчын і жанчын у выбарчым корпусе партый, якія прадстаўлены ў бундэстагу.

41,5% жанчын прагаласавалі ў час выбараў за СДПГ, і толькі 38,7% - мужчын. Наадварот: 40,6% мужчын аддалі сваю перавагу ХДС/ХСС, і толькі 38,7% - жанчын. Найлепшага выніку СДПГ дасягнула сярод маладых выбаршчыкаў, ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў. У сваю чаргу блок ХДС/ХСС атрымаў большасць сваіх галасоў (47%) ад мужчын ва ўзросце старэйшым за 60 гадоў. Што тычыцца выбаршчыц, то «Саюз-90/Зялёныя» таксама ў плюсе, хоць адрозненні па палах тут не столькі яскрава выражаныя, як у выпадку з абедзвюма буйнымі партыямі: 7,6% жанчын, і толькі 6,8% мужчын аддалі свае другія галасы за малодшага партнёра па кааліцыі.

[59] Новое федеральное правительство // Deutschland. - 2002. - №6. Декабрь-январь. С. 21-23.

І калі гэта тэндэнцыя ў «зялёных» захоўваецца з 1990 года, то паводзіны выбаршчыц у адносінах да буйных партый змяніліся... Да 1969 года за блок ХДС/ХСС галасавала больш жанчын, чым мужчын. У СДПГ усё было наадварот: больш мужчынскіх галасоў, чым жаночых. Аднак пачынаючы з 1976 года і да цяперашніх выбараў захавалася амаль поўная роўнасць галасоў. Для партый паводзіны жанчын на выбарах уяўляюць вялікую цікавасць. Яны ж прадстаўляюць большасць выбаршчыкаў: у 2002 годзе права голасу мелі 31,9 млн. жанчын і толькі 29,3 млн. мужчын». [60]

Кожная з 4 фракцый у бундэстагу мае свайго лідэра.

Кіраўнік фракцыі СДПГ – Франц Мюнтэферынг, які з 6 лютага 2004 года з'яўляецца старшынёй СДПГ.

Лідэр ХДС Ангела Меркель – першая асоба ў фракцыі ХДС/ХСС.

Спецыфіка фракцыі «Саюз-90/Зялёныя» ў тым, што яе старшынямі адначасова з'яўляюцца дзве жанчыны, якія дакладна называюцца сустаршынямі: Катрын Герынг-Экард, Крыста Загэр.

Лідэр самай малой па колькасці фракцы, фракцыі СвДП, – Вольфганг Герхарт.

Ёсць сэнс сказаць таксама аб іншых партыях і арганізацыях.

Германскія неанацысты прадстаўлены Нацыянал-дэмакратычнай партыяй, Рэспубліканскай партыяй.

Станавым хрыбтом СДПГ з'яўляецца Аб'яднанне Нямецкіх Прафсаюзаў (АНП).

Шырокі рэзананс у грамадстве мае дзейнасць Аб'яднання палітычнай моладзі, Германскага федэральнага маладзёжнага аб'яднання, Саюза маладых, Маладых сацыялістаў, Маладых лібералаў. Маладыя сацыялісты цесна звязаны з СДПГ, Маладыя лібералы – са СвДП, сябры Саюза вызнаных складаюць істотную частку сацыяльнай базы ХДС/ХСС.

Заўважым, што ўладныя структуры ўспрымаюць прафсаюзы як аўтарытэтную, уплывовую сілу. Рэгулярна адбываюцца сустрэчы "Саюза за працу, адукацыю і канкурэнтаздольнасць", які склікаецца ўрадам для кансультацый паміж прадпрымальнікамі і прафсаюзамі. Пад націскам масавай базы апошнія выходзяць за межы чыста тарыфных пагадненняў, ставяць праблемы гуманізацыі вытворчасці, супрацьдзейнічаюць вываду прадпрыемстваў за мяжу. У 1990-я гады колькасць арганізаваных у прафсаюзы значна скарацілася, і каб захаваць былы ўплыў, галіновым прафсаюзам прыходзіцца аб'ядноўвацца. У сакавіку 2001 года ў Германіі ўзнік буйнейшы ў свеце прафсаюз работнікаў сферы паслуг (ver. di.), які налічвае ў сваіх шарэнгах каля 3 млн. рабочых і служачых". [61]

Набліжаюцца чарговыя парламенцкія выбары ў ФРГ. Заканамерна ўзнікае пытанне: ці вернецца блок ХДС/ХСС да ўлады?

Пасля таго, як Г.Коль, В. Шойбле перасталі адыгрываць ключавую ролю ў ХДС, лічылася, што ў гэтай партыі адсутнічаюць палітыкі, якія здольныя заваяваць сімпатыі большасці бундэсбюргераў. Сацыял-дэмакраты, Саюз 90/Зялёныя імкнуліся выжаць максімум палітычнага капіталу з-за скандалу вакол незаконных ахвяраванняў ХДС, што, безумоўна працавала супраць дэмахрысціян. Не выпадкова старшыня ХСС, прэм'ер-міністр Баварыі Эдмунд Штойбер быў кандыдатам у канцлеры ад блока ХДС/ХСС на выбарах у бундэстаг 2002 года. Яму не хапіла зусім няшмат галасоў, каб трапіць на палітычны алімп, змяніць кіраўніка выканаўчай улады Г. Шродэра. Разам з тым з цягам часу набралася палітычнага вопыту Ангела Меркель, старшыня ХДС. З 2005 года яна лідэр блока ХДС/ХСС. У цяперашняй легіслатуры, якая скончыцца восенню 2005 года, галоўны сапернік Г. Шродэра – эканоміка. Сучасныя германскія рэаліі

[60] Новое федеральное правительство // Deutschland. Политика, культура, экономика и наука. - 2002. -№6. Декабрь/январь. С. 23.

[61] Ватлин А. Ю. Германия в XX веке. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2002. С. 298.

прадвызначылі крызісныя з'явы ў яго ўласнай партыі. Каб пакласці канец гэтым з'явам, 6 лютага 2004 года канцлер пакінуў пасаду старшыні СДПГ. Зразумела, у А. Меркель, на якую зрабіў стаўку блок ХДС/ХСС, на выбарах 2005 г. будуць высокія шанцы для дасягнення перамогі.

Разам з тым трэба мець на ўвазе і тое, што працуе супраць ХДС/ХСС.

Па-першае, Г. Шродэр з самага пачатку свайго канцлерства ўзяў на ўзбраенне канцэпцыю сацыяльнай рыначнай гаспадаркі, што знайшло падтрымку і з боку малодшага партнёра па ўрадавай кааліцыі – «Зялёных». Дэмахрысціяне і сацыяльныя хрысціяне зусім абгрунтавана абвінавачваюць сваіх апанентаў у крадзяжы іх ідэй. Аднак бясспрэчным фактам з'яўляецца тое, што такая стаўка сацыял-дэмакратаў істотна звузіла свабоду манеўра блока ХДС/ХСС.

Па-другое, і партыі «чырвона-зялёнай» кааліцыі, і хрысціянскія палітычныя партыі ўсе больш актыўна і небеспаспяхова ўрываюцца ў сферу, якую свабодныя дэмакраты лічаць сваёй ідэалагічнай манаполіяй. У аб'яднанай Германіі ліберальная ідэалогія ўсё больш накладвае адбітак на праграмныя ўстаноўкі гэтых партый. Да таго ж трэба ўлічваць, што ў кіраўніцтве патэнцыяльнага саюзніка блока ХДС/ХСС – СвДП – няма дзеячаў, якіх можна параўнаць, напрыклад, з В. Шэялем, Г – Д. Геншарам. Пагэтаму немагчыма нават дакладна прагназаваць пераадоленне ліберaламі 5%-га рубяжа ў 2005 годзе. Між тым шанцы блока ХДС/ХСС на паўтарэнне выніку 1957 года на бліжэйшых выбарах роўныя нулю. Сярод бундэсбюргераў мала хто верыць, што А. Меркель стане маці эканамічнага цуда. Безумоўна, на гэтых выбарах будзе пратэстнае галасаванне, скажа важкае слова традыцыйны электарат блока. Аднак 50% + 1 голас у яго актыве не будзе.

Па-трэцяе, галоўны козыр «Зялёных» – Ёшка Фішэр, віцэ-канцлер, федэральны міністр замежных спраў. Ё. Фішэр – самы папулярны палітык у ФРГ. Ён мае вельмі высокія шанцы стаць міністрам замежных спраў Еўрасаюза. Гэта азначае, што «Зялёныя» будуць набіраць дадатковыя ачкі на еўропа-палітыцы.

Па-чацвёртае, у сучаснай Германіі скарачаецца доля каталікаў і евангелістаў, немалым з'яўляецца працэнт бундэсбюргераў, якія індыферэнтныя да рэлігіі.

Такім чынам, далейшае развіцце палітычнай сітуацыі ў ФРГ уяўляе ўраўненне з многімі невядомымі. Ёсць фактары, якія працуюць на А. Меркель і супраць А. Меркель.

### *8.3. Унутраная і знешняя палітыка*

На сучасны этап гісторыі ФРГ аказваюць уплыў наступныя фактары:

-узмацненне тэндэнцыі да глабалізацыі;

-беспрэцэдэнтны прагрэс у паглыбленні працэсаў еўрапейскай інтэграцыі,яе распаўсюджванне на сферу бяспекі і знешняй палітыкі;

-пашырэнне НАТО і Еўрасаюза на ўсход;

-уступленне цывілізаванага свету ў стадыю лічбавага капіталізму;

-пераезд ў 1999г. цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання ФРГ у Берлін;

-складанасць і супярэчлівасць працэсаў інтэграцыі экс-ГДР у палітычную, эканамічную і сацыяльную сістэму ФРГ;

-уступленне стандартаў сацыяльнай дзяржавы, якія ўстаяліся, у супярэчнасці з магчымасцямі германскай эканомікі;

-умацаванне ў ФРГ пазіцый сіл, якія стаяць у палітычным спектры лявей за цэнтр, знаходжанне з кастрычніка 1998г. ва ўладзе кааліцыі ў складзе СДПГ і Саюза 90/Зялёных;

-тэндэнцыя да пераадольвання неадпаведнасці паміж эканамічным патэнцыялам ФРГ і яе роллю ў еўрапейскай і сусветнай палітыцы, якая становіцца ўсё больш выразнай;

-рост прыцягальнасці германскай сацыяльна – эканамічнай і палітычнай мадэлі на глабальным узроўні.

Кааліцыя ў складзе СДПГ,Саюза 90/Зялёных набліжаецца да чарговых парламенцкіх выбараў з шэрагам складаных праблем.

"Нявырашанай праблемай для «чырвона-зяленай» кааліцыі з'яўляецца сітуацыя ва Усходняй Германіі, сацыяльная інтэграцыя якой апярэджвае эканамічную мадэрнізацыю. Паказчыкам неспрыяльнасці з'яўляецца адток самадзейнага насельніцтва, перш за ўсё моладзі на захад, які працягваецца. На тэрыторыі былой ГДР зараз пражывае толькі 15 млн. чалавек, тут сканцэнтравана толькі 6% прамысловых магутнасцяў і вытвараецца 11% валавога сацыяльнага прадукту ў ФРГ. Ільвіная доля сродкаў дзяржаўнага бюджэту, якая накі-равана ў былую ГДР, была выдаткавана на павышэнне ўзроўню жыцця ўсход-ніх немцаў, які вырас за дзесяць гадоў у тры разы. Але аптымістычныя прагнозы аб тым, што неўзабаве новыя федэральныя землі змогуць самастойна зарабляць сабе на жыццё, нязменна адсоўваюцца ў аглядную будучыню."[62] Другая складаная праблема — беспрацоўе. Няпроста ўраду рэагаваць і на той факт, што ў структуры насельніцтва рэзка ўзрастае доля пажылых людзей. Шэраг падводных камянёў нясе ў сабе стратэгія ў адносінах да міграцыі. Адзначым, што ўрад пастаянна знаходзіцца ў пошуку.

«Асноўнай тэндэнцыяй паступова становіцца мадыфікацыя сацыяльнай палітыкі з мэтай змяншэння дзяржаўных выдаткаў на сацыяльныя патрэбы і ўзмацнення адраснай падтрымкі тым, хто мае патрэбу. Сістэма сацыяльнай падтрымкі паступова замяняецца сістэмай добраахвотнага сацыяльнага страхавання на грунце накапляльнага метаду».[63]

«Чырвона-зялёная» кааліцыя актыўна заахвочвае «істотную перабудову ўсёй германскай эканомікі на карысць высокатэхналагічных і інтэлектуальных вытворчасцяў і пашырэння інтэрнэт — тэхналогій».[64]

Урад «звязвае вялікія надзеі з інтэрнэтам...У інфармацыйнай і камунікацыйнай галінах да 2010г. можа ўзнікнуць 750000 новых працоўных месцаў». [65]

У актыў кааліцыі СДПГ і «Саюза 90/Зялёных» можна запісаць прыняцце рашэння аб правядзенні падатковай рэформы. «Гэта рэформа была праведзена ў тры этапы. Першы этап у 2001 г. прадугледжваў карэнную рэформу падаткаабкладання прадпрыемстваў. З 2001 г. да 25% быў зніжаны карпаратыўны падатак. Максімальнае падаткаабкладанне карпарацый, уключаючы прамысловы падатак, склала 38%. Акрамя таго, прыбытак ад продажу доляў у акцыянерных таварыствах не падлягае падаткаабкладанню.

Германія стала прывабнай для замежных інвестараў,таму што тут абкладаюцца падаткам толькі 50% дывідэндаў. Максімальная стаўка падаходнага падатку для людзей з невялікімі даходамі зніжана з 22,9% да 15% у 2005 г. (Істотна павялічаны.–М.С.) памер даходаў, якія не абкладаюцца падаткам. Дзякуючы зніжэнню максімальнай стаўкі падатку да 42%, Германія дасягнула ўзроўню,які адпавядае міжнародным стандартам».[66]

«У такой важнай сферы, як падатковая палітыка ,Германія зрабіла тое, што ЗША правільна зразумелі і з бачным поспехам ажыццявілі ў пачатку 80-х гадоў, а многія еўрапейскія суседнія дзяржавы – у 90-х гадах мінулага стагоддзя».[67]

---

[62] Ватлин А.Ю.Германия в XX веке. — М:«Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2002. — С.288

[63] Гутник В. Германия – дорога к подъёму//Мировая экономика и международные отношения. — 2000. — №8.С.96-97.

[64] Гутник В. Германия — дорога к подъёму //Мировая экономика и международные отношения. — 2000.— №8.С.95.

[65] Пакет реформ. Союз во имя труда // Deutschland. —2000. —№4.Август/сентябрь С.17.

[66] Пакет реформ // Deutschland. —2000. — №4.С.16-17.

[67] Штаудт Э. Налоговая реформа: импульс для предприятий // Deutschland.—2000.— №4.Август/сентябрь С.3.

«З 1 студзеня 2000 года "ў Германіі ўступіла ў сілу новае права грамадзянства. Дзеці мужа і жонкі – іншаземцаў, адзін з якіх пражывае ў Германіі не менш за 8 гадоў, якія нарадзіліся тут, з нараджэння атрымліваюць германскае грамадзянства».[68]

Прафесар Басам Цібі (ФРГ) даў такую ацэнку гэтаму закону: «Закон прагрэсіўны, аднак ён не зменіць за ноч свядомасць.Інтэграцыя –гэта ўключэнне ў агульнасць, а не толькі атрыманне пашпарта. Закон – папярэдні крок, пасля якога павінны адбыцца змены ў свядомасці праз выхаванне, сродкі масавай інфармацыі. Немцы павінны навучыцца вызваляць паняцце грамадзяніна ад яго этнічнага зместу, каб эмігранты маглі стаць мясцовымі жыхарамі».[69]

А зараз пяройдзем да знешняй палітыкі аб'яднанай Германіі.

Вядома, што ключавым аспектам палітыкі ФРГ на міжнароднай арэне ў 1949 – 1990 гг. была «гістарычная адказнасць».

«Паняцце «гістарычная адказнасць» Германіі складвалася з дзвюх складовых: Германія як краіна, адказная за ўзнікненне другой сусветнай вайны, і Германія як фарпост заходняй дэмакратыі ў пасляваенныя гады. Менавіта «гістарычнай адказнасцю» матывіраваліся ў свой час такія важнейшыя прынцыпы знешняй палітыкі Заходняй Германіі, як неўмяшальніцтва ва ўзброеныя канфлікты або развіццё асаблівых адносін з Ізраілем».[70]

«Перайшоўшы з аб'яднаннем у новую якасць нацыянальнай дзяржавы, Германія набыла і новыя нацыянальныя інтарэсы».[71] У пачатку XXI стагоддзя гэтыя інтарэсы дэфініраваныя, ёсць падставы казаць аб «узрослай адказнасці» Германіі».[72]

«Узрослая адказнасць» перакрочвала ў вядомай ступені за межы адказнасці «гістарычнай» і ў пэўнай меры меркавала мадыфікацыю некаторых асноватворных і зафіксаваных у канстытуцыі знешнепалітычных прынцыпаў, якія грунтуюцца на «гістарычным вопыце» або поўную адмову ад іх. Тэза аб «узрослай адказнасці» абапіралася пераважна на прасторава-геаграфічны фактар і была першым крокам на шляху фармавання нямецкай геапалітыкі».[73]

Палітычная эліта ў ФРГ спецыяльна падкрэслівае, што яе краіна мае рычагі для таго, каб актыўна «ўздзейнічаць на міжнародныя адносіны з мэтай іх цывілізавання».[74]

Пасля таго, як хрысціянска-ліберальная кааліцыя перадала эстафету сацыял-дэмакратам, размова ўжо ішла аб «вельмі актыўнай знешняй палітыцы», нацэленай на бяспеку, знешняй палітыцы, якая мае ўласны профіль у рамках еўрапейскага прызначэння Германіі».[75]

Прафесар Юрген Кока адзначае: «Пасля таго, як зніклі бар'еры, якія падзяляюць Захад і Усход, Германія зноў аказалася сувязным звяном паміж Усходам і Захадам. І гэта не цяжар і не небяспека, а ў першую чаргу вялікі шанц».[76]

---

[68] Факты 2000. Германия на пути в XXI век.// Deutschland.—1999. — №6.Декабрь/январь, приложение.
[69] Тиби Б.Прообраз будущей Германии // Deutschland.—1999. — №6.Декабрь/январь.С.37.
[70] Павлов Ю.М., Погорельская С.В. Становление внешней политики объединенной Германии (на примере Югославского кризиса 1991 года.) // Вестник Московского университета.Серия 12. Политические науки.—1999. — №2.С.9.
[71] Погорельская С.В. Некоторые аспекты европейской политики объединенной Германии // Мировая экономика и международные отношения.—2000.— №1.С.91.
[72] Там же.
[73] Павлов Ю.М.,Погорельская С.В. Указ соч.С.9 —10.
[74] Kaiser K.,Krause I.(Hrsg.) Deutschlands neue Aussenpolitik. Bd.3.-Bonn, 1996.S.10.
[75] Контуры новой германской внешней политики // Deutschland. —1999— №4. —Август/сентябрь. С.18.
[76] Кока Ю.На стыке тысячелетий:что мы возьмем с собой в будущее ?// Deutschland.—1999. —№6. —Декабрь/январь.С.7.

«Германія знаходзіцца ў пошуках сваёй самабытнасці і ў той жа час спрабуе пазбегнуць выбару паміж унутрыеўрапейскай і больш шырокай трансатлантычнай арыентацыяй».[77]

Атлантычны накірунак знешняй палітыкі сучаснай ФРГ грунтуецца па стратэгічнай канцэпцыі НАТО, якая прынята на Вашынгтонскай сесіі Савета НАТО (24-25 красавіка 1999 года). Паводле гэтай канцэпцыі, у выпадку, калі іншыя варыянты выхаду з вельмі недарэчных міжнародных крызісаў акажуцца безвыніковымі, НАТО можа выкарыстаць сілу без санкцыі Савета Бяспекі ААН. Гэта канцэпцыя, якую падтрымаў Берлін,упершыню была апрабавана ў ходзе натаўскай аперацыі «Рашучая сіла» (24 сакавіка—10 чэрвеня 1999 года), якая мела на мэце ліквідацыю ачага напружнасці ў Косава. У аперацыі альянсу былі непасрэдна задзейнічаны германскія вайскоўцы. Гэта азначала, што Германія ўпершыню з дня заканчэння другой сусветнай вайны ўдзельнічала ў ваенных дзеяннях.

«За некалькі тыдняў да пачатку вайны ў Косава канцлер Шродэр казаў: «Германія і не можа, і не хоча ісці асаблівым шляхам. Мы выраслі ў саюзе. І мы хочам у ім заставацца. Пагэтаму сёння мы без усялякіх «калі» і «але» гатовы браць на сябе адказнасць як «нармальныя» члены –ці ў ЕС ці ў НАТО». «У сталіцах дзяржаў НАТО гэты крок быў успрыняты з увагай і поўным ухваленнем».[78]

Пасля таго, як у чэрвені 1999 года было дасягнута мірнае ўрэгуляванне ў Косава, адзін з архітэктараў балканскай палітыкі ФРГ В.Ішынгер меў усе падставы для наступнай заявы: «Мы дасягнулі таго,што зараз Федэратыўная Рэспубліка Германія можа ўносіць уклад у вырашэнне... буйных праблем..., які адпавядае яе вазе, яе ролі, эканамічнай магутнасці і структуры ўзброеных сіл».[79]

Цэнтральны накірунак знешняй палітыкі ФРГ – еўрапейскі.

У пачатку 1992 года расійскі палітолаг І. Максімычаў пісаў: «Германія мае зараз патрэбу ў новым апірышчы, якое павінна забяспечыць ёй істотна большую ступень уплыву на развіццё еўрапейскіх спраў. Такім апірышчам можа стаць усход кантынента, толькі ён можа ўзмацніць Германію настолькі, што яна палічыць магчымым адмовіцца ад замежнай прысутнасці на сваёй тэрыторыі».[80]

У пачатку XXI стагоддзя мы назіраем і рэзкае ўзрастанне ўплыву ФРГ ва Усходняй Еўропе, і рэзкае скарачэнне колькасці войскаў і ўзбраенняў саюзнікаў ФРГ на яе тэрыторыі.

Германія на практыцы даказала ў 1990-ыя гады – пачатку XXI ст. сваю зацікаўленасць у будаўніцтве новай Еўропы, у стварэнні трывалай сістэмы еўрапейскай бяспекі. Залогам гэтага з'яўляецца яе глыбокая ўцягненасць у працэсы еўрапейскай інтэграцыі. Берлінская рэспубліка ў значнай меры можа паставіць сабе ў заслугу тое,што былі дасягнуты беспрэцэдэнтныя поспехі ў дадзеным накірунку.

Зараз відавочна ўзмацняюцца германскія пазіцыі ў Азіі, Афрыцы, Лацінскай Амерыцы. Удзел Берлінскай рэспублікі ў пошуках аптымальных мадэляў бяспекі для гэтых рэгіёнаў на парадак вышэй, чым Бонскай рэспублікі.

У Берлінскай рэспубліцы ў адрозненне ад Бонскай ніхто не ўзгадвае аб «абароне на перадавых рубяжах».У афіцыйных дакументах фігуруе прынцып

---

[77] Вайденфельд Д.Взгляд со стороны// Deutschland. —2000. —№4.Август/сентябрь. С.56.

[78] Эрлер Г.Внешняя политика и политика безопасности Германии после войны в Косово//Мировая экономика и международные отношения.—2000.— №1. С.83.

[79] Контуры новой германской внешней политики.Интервью статс-секретаря в федеральном министерстве иностранных дел Вольфганга Ишингера журналу "Deutschland"// Deutschland.—1999.— №4.Август/сентябрь. С.18.

[80] Максимычев И.Куда идешь... Германия? // Международная жизнь.—1992. — №2. С.75-76.

абароны на мяжы. Гэты прынцып азначае значнае змяншэнне колькасці сцэнарыяў ваенных дзеянняў з выкарыстаннем ядзернай зброі.

У адпаведнасці з новымі рэаліямі палітыкі не бачаць сэнсу ва ўжыванні тэрміна «пагроза». Ва ўжытак увайшло паняцце «рызыка для нацыянальнай бяспекі»[81].

У працэсе распрацоўкі знешнепалітычнай дактрыны Берлінскай рэспублікі важнае месца займалі пошукі адказу на пытанне: якія інстытуты і у якой ступені павінны быць задзейнічаны для таго, каб эфектыўна вырашаць праблемы міжнароднай бяспекі?

Сэрцавінай палітыкі бяспекі ФРГ было, ёсць і застаецца членства ў НАТО. Разам з тым у канцэпцыі бяспекі Берлінскай рэспублікі ўплыў еўрапеістаў прасочваецца ў значна большай ступені, чым Бонскай.

У 1990-я гады на парадак вышэй у параўнанні з перыядам Бонскай рэспублікі была роля Германіі ў Заходнееўрапейскім саюзе, які з канца XX-га стагоддзя стаў інтэгравацца ў Еўрапейскі Саюз.

У пачатку XX-га стагоддзя Берлін імкнецца да таго, «каб паступова надаць Еўрапейскаму Саюзу здольнасць сваімі сіламі пераадольваць крызісныя сітуацыі. Перш за ўсё тады, калі амерыканцы (не важна па якіх прычынах) у гэтым не ўдзельнічаюць, або не хацелі б браць на сябе кіруючую ролю.»[82]

Цяперашні германскі канцлер Г.Шродэр у першай жа сваёй урадавай заяве выразна і ясна казаў: «Мы маем намер развіваць і выкарыстоўваць інструменты сумеснай еўрапейскай знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі, каб у галіне знешняй палітыкі зрабіць Еўропу больш дзеяздольнай».[83]

Сумесная знешняя палітыка і палітыка бяспекі (СЗППБ) ў рамках ЕС атрымала старт на сесіі Еўрапейскага савета ў Кёльне (ліпень 1990 года). Х.Салана стаў першым містэрам СЗППБ.

Берлін надае важнае значэнне дзейнасці Савета Бяспекі ААН, аперацыям ААН па падтрыманні міру.

ФРГ лічыць,што ў пошуку шляхоў замацавання бяспекі ў Старым Свеце нямала можа зрабіць Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ).

Берлінская рэспубліка актыўна ўдзельнічала ў распрацоўцы Хартыі еўрапейскай бяспекі, якая замацавана подпісамі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў 54 краін на саміце АБСЕ ў Стамбуле (17-19 лістапада 1999 года). Яна «павінна стаць новым грунтам працы Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, не замяніўшы,а замацаваўшы сабой Хельсінскі дакумент 1975 года, які стварыў Нараду па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ), якая затым трансфарміравалася ў АБСЕ».[84]

У плане будаўніцтва новай архітэктуры бяспекі Старога Света немалаважнае значэнне мае пагадненне па адаптацыі Дамовы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе (ДЗУСЕ) і абнаўленне Венскага дакумента 1994 года па мерах даверу. Гэтыя пагадненні таксама былі замацаваны подпісамі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў 54 краін на стамбульскім саміце.

Крокі, якія Берлін здзейснівае пасля Стамбула, сведчаць аб тым, што Германія зацікаўлена ў тым, каб напоўніць дакументы саміта канкрэтным зместам. «Абяцаючы зрабіць усё «лепей, чым Коль» і весці наступальную еўрапейскую палітыку, якая ўлічвае нямецкія нацыянальныя інтарэсы, Шродэр (іншага шляху ў яго не

---

[81] Чистяков В.,Лунев С.,Симоненко С.Крупным планом:Что происходит в вооруженных силах стран Запада? // Эхо планеты.—1994.— №44-45. С.5-6.

[82] Контуры новой германской внешней политики. С.20.

[83] Интервью с федеральным канцлером Г.Шрёдером // Deutschland.—1999. — №1. Февраль/ март. С.13.

[84] Люшкевич А.Равные среди равных. // Советская Белоруссия.—1999.—16 ноября С.20.

было) пераняў «Еўропа — палітычная» прыярытэты, якія былі распрацаваны за доўгія гады кіравання кансерватыўна-ліберальнай кааліцыяй».[85] «Немцы ўзялі на сябе актыўную працу ў будаўніцтве еўрапейскага дома».[86] Яны адыгралі ключавую ролю ў распрацоўцы Маастрыхцкай і Амстэрдамскай дамоваў, дамовы ў Ніцы, Канстытуцыі Еўрасаюза.

Берлінская рэспубліка больш самастойна паводзіць сябе ў адносінах да Вашынгтона, чым старая ФРГ. Калізіі ў адносінах паміж ЗША і ФРГ назіраліся па пытаннях, звязаных з амерыканскай праграмай нацыянальнай сістэмы супрацьракетнай абароны, з дамовай аб абароне ядзерных выпрабаванняў, з іракскім крызісам і г.д.

У пачатку XXI стагоддзя істотна ўзрастае роля ФРГ у міжнародных эканамічных адносінах.

### *8.4. Палітычнае супрацоўніцтва паміж РБ і ФРГ, партнёрскія сувязі Брэстчыны з зямлямі і гарадамі ФРГ*

У 90-я гады XX ст. —пачатку XXI ст. Федэратыўная Рэспубліка разглядала свае адносіны з Мінскам у кантэксце германскай усходняй палітыкі (Ostpolitik). У аналізуемы перыяд канцэпцыя Ostpolitik зазнавала істотныя змены, што было абумоўлена наступнымі фактарамі.

Па-першае, 3.10.1990 года адбылося аб'яднанне Германіі.

Па-другое, распаўся СССР. На постсавецкай прасторы ўзнікла 15 новых дзяржаў, у тым ліку Рэспубліка Беларусь.

Па-трэцяе, напрыканцы 80-х гадоў па Усходняй Еўропе пракацілася хваля народна-дэмакратычных рэвалюцый, затым наступіў крах Арганізацыі Варшаўскага Дагавора, Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Адметнай рысай міжнародных адносін 90-х гадоў з'явілася імкненне шэрагу ўсходнееўрапейскіх дзяржаў да ўступлення ў НАТО і ЕС.

Па-чацвёртае, скончылася халодная вайна, міжнародныя адносіны ў Еўропе ўступілі ў постканфрантацыйны этап, знік вобраз ворага.

Па-пятае, трэба мець на ўвазе рэзкае ўзмацненне пазіцый германскіх еўрапеістаў, уцягненасць ФРГ у працэсы еўрапейскай інтэграцыі.

Крэда стратэгаў германскай Ostpolitik 90-х гадоў XX ст. —пачатку XXI ст. можна сфармуляваць наступным чынам: "пашырэнне" Захаду на Усход як перадумова для паступовага дасягнення пануючага ўплыву Федэратыўнай Рэспублікі на ўсёй усходнееўрапейскай прасторы. У гэта пашырэнне укладваецца такі змест: трансфармацыя палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай сістэмы ў строгай адпаведнасці з крытэрыямі НАТО і ЕС, уступленне ў дадзеныя арганізацыі. У пачатку XXI ст. можна канстатаваць той факт, што большасць былых саюзнікаў Масквы трымаюць раўненне на ФРГ, поўнасцю падтрымліваюць тыя стандарты, якія задавальняе федэральны ўрад. У гэтай сувязі трэба выдзеліць сярэдзіну 90-х гадоў, калі Рэспубліка Беларусь на ўзроўні кіраўніцтва афіцыйна абвясціла свой асаблівы шлях развіцця. Выходзячы з дадзеных абставін, мэтазгодна адзначыць два этапы ў развіцці беларуска-германскіх адносін у 90-я гады XX ст.—пачатку XXI ст.: першы этап—да сярэдзіны 90-х гадоў, другі—з сярэдзіны 90-х гадоў.

Важная палітычная перадумова для развіцця двухбаковых адносінаў была закладзена 13 сакавіка 1992 года, калі РБ наведаў з афіцыйным візітам кіраўнік знешнепалітычнага ведамства ФРГ Г.-Д. Геншэр. Галоўны вынік візіту: дасягненне дамоўленасці аб адчыненні беларускай амбасады ў Боне і герман-

[85] Погорельская С.Указ соч.С.89.

[86] Романова Н.Германская гравитация. // Советская Белоруссия. — 2000.— 5 октября С.5.

скай — у Мінску. Заўважым, што размова ішла аб аднаўленні дыпламатычных адносінаў. Усталяванне гэтых адносінаў адбылося ў 1922 годзе і страціла юрыдычную моц у сувязі з утварэннем СССР.

Пасля візіту Г.-Д. Геншэра стаў напаўняцца новым зместам палітычны аспект супрацоўніцтва. Мелі месца сустрэчы на вышэйшым, высокім узроўнях. У бундэстагу была створана парламенцкая група ФРГ-Беларусь. Актывізаваліся кантакты прадстаўнікоў усіх галін улады абедзвюх краін.

У высакародную справу ўмацавання супрацоўніцтва з Беларуссю сталі ўносіць уклад мясцовыя ўладныя структуры. Афіцыйныя сувязі з РБ усталявалі наступныя федэральныя землі: Паўночны Рэйн-Вестфалія, Брандэнбург, Шлезвіг-Гальштэйн, Ніжняя Саксонія. Павялічылася колькасць гарадоў-пабрацімаў.

Пасля афіцыйнай сустрэчы А.Лукашэнкі з віцэ-канцлерам ФРГ К.Кінкелем (21.08.95.) сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з прадстаўнікамі германскай палітычнай эліты мелі выключна неафіцыйны характар. Да такіх сустрэч належаць: сустрэча з федэральным прэзідэнтам Раманам Герцагам (красавік 1996 г., Гановер), Г.-Д. Геншэрам (верасень 1997 г., Вільнюс), Г.Шродэрам (красавік 1998 г.,Гановер) і г.д.

У 1992-2005 гг. афіцыйныя прадстаўнікі абедзвюх краін замацавалі сваімі подпісамі 17 пагадненняў, якія заклалі прававую базу для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва.

У 1996 годзе адносіны паміж Бонам і Мінскам пачалі страчваць ранейшую дынаміку. Федэральны ўрад не прызнаў вынікі рэспубліканскага рэферэндуму 1996 года, які адбыўся па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі. ФРГ лічыла адзіным легітымным заканадаўчым органам нашай краіны Вярхоўны Савет РБ 13-га скліканння, адмаўлялася ад падтрымання афіцыйных кантактаў з Нацыянальным Сходам РБ. "13 лістапада (1997 года. —М.С.) ЕС і нямецкі бундэстаг прынялі... рашэнне аб скарачэнні палітычных сувязяў з Беларуссю, замаражванні крэдытаў, спыненні дзелавой актыўнасці"[87].

Бон салідарызаваўся з лініяй Еўрасаюза, якая фактычна накіравана на ізаляцыю Беларусі. Разам з тым федэральны ўрад неаднойчы заяўляў аб жаданні палепшыць германа-беларускія адносіны.

Германская палітычная эліта праявіла цікавасць да трохбаковых перамоваў паміж дэлегацыяй Еўрасаюза, прадстаўнікамі прэзідэнцкага боку, дэлегацыяй Вярхоўнага Савета 13 склікання.

У Боне станоўча ацанілі згоду Мінска на стварэнне кансультатыўна-маніторынгавай групы (КМГ) АБСЕ, якая павінна была вывучаць сітуацыю на Беларусі. Групу ўзначаліў вядомы германскі дыпламат Х.-Г. Вік. Дарэчы, Прэзідэнт Беларусі А.Г. Лукашэнка прапанаваў на гэтую пасаду кандыдатуру эксміністра замежных спраў Германіі, аднаго з архітэктараў германскага адзінства Г.-Д. Геншэра. Група рэальна працавала з пачатку 1998 года.

У часы Шродэра, калі Мінск мае справу з афіцыйным Берлінам, двухбаковыя палітычныя адносіны развіваюцца супярэчліва. Пасля таго, як спыніла сваю дзейнасць КМГ АБСЕ, Берлін рабіў актыўныя захады, каб была створана новая структура, якая прадстаўляе АБСЕ ў Мінску. З пачатку 2003 года там запрацаваў офіс АБСЕ, узначальваемы да жніўня 2005г. германскім дыпламатам Эберхардам Хайзенам. У Мінску станоўча ацанілі той факт, што менавіта ФРГ адыграла важнейшую ролю ў тым, каб беларускаму парламенту ў пачатку 2003 г. было вернута месца ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Разам з тым ФРГ не прызнала афіцыйных вынікаў рэферэндуму ў РБ ад 17 кастрычніка 2004г., ініцыяванага прэзідэнтам Беларусі, і выбараў у Палату прадстаўнікоў, якія адбыліся адначасова з дадзеным мерапрыемствам.

---

[87] Лазарь Л. Крупный немецкий бизнес заинтересован в сотрудничестве с нашей страной // Советская Белорусия, 1998, 14 мая. С.3.

Абедзве краіны плённа супрацоўнічалі па пытаннях умацавання еўрапейскай і глабальнай бяспекі. Для гэтага існуюць наступныя перадумовы.

Па-першае, і РБ, і ФРГ аднолькава прыступныя ў выніку магчымай вайны у Еўропе і, натуральна, не зацікаўлены ў ёй.

Па-другое, і РБ, і ФРГ аддаюць прыярытэт забеспячэнню ўнутранай стабільнасці.

Па-трэцяе, і РБ, і ФРГ строга прытрымліваюцца без'ядзернага статуса сваіх краін.

Па-чацвёртае, і РБ, і ФРГ не бачаць у аглядным будучым неабходнасці павелічэння колькасці сваіх узброеных сіл.

Мінск і Бон, зыходзячы з гэтых перадумоў, сканцэнтраваліся на наступных аспектах: 1) узаемадзеянне ў межах міжнародных арганізацый [ААН, АБСЕ, Савет Паўночнаатлантычнага Супрацоўніцтва (з 1997 года Савет Еўраатлантычнага Партнёрства)]; 2) двухбаковае супрацоўніцтва.

Менавіта Бон быў ініцыятарам стварэння Савета Паўночнаатлантычнага Супрацоўніцтва [СПАС] у 1991 годзе. Беларусь, як Германія, адразу ж уступіла ў гэту арганізацыю. Бон і Мінск былі адзіныя ў тым, што СПАС (СЕАП) павінен унесці сур'ёзны ўклад ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі.

Узаемадзейнічалі абедзве дзяржавы і ў рамках праграмы НАТО "Партнёрства ў імя міру".

Менавіта супрацоўніцтва Узброеных Сіл Беларусі і ФРГ у рамках дадзенай праграмы было галоўнай тэмай перамоваў генеральнага інспектара бундэсвера Клауса Наўмана з кіраўніцтвам Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь у ходзе яго візіту ў нашу рэспубліку 23-24 лістапада 1995 года.

У ходзе перамоваў былі закрануты пытанні пашырэння супрацоўніцтва ваенных ведамстваў дзвюх дзяржаў у інтарэсах умацавання мер даверу і бяспекі ў Еўропе, выканання міжнародных раззбраенчых дамоў і пагадненняў.[88]

Заўважым, што ў рэспубліцы ў аналізуемы перыяд зацікаўлена абмяркоўвалася пытанне аб выкарыстанні вопыту развіцця бундэсвера пры рэфармаванні беларускай арміі. У гэтай сувязі даволі ўдалым уяўляецца артыкул ваеннага эксперта А.Бужана ў часопісе "Армія"[89].

Бон істотна дапамог Мінску ў ажыццяўленні мер рэальнага раззбраення, якія тычыліся як ядзерных, так і звычайных узбраенняў. Маюцца на ўвазе і фінансавая падтрымка, і высокапрафесійныя парады экспертаў. Увогуле быў назапашаны каштоўны вопыт, які можа быць выкарыстаны ў будычым.

І Мінск, і сучасны афіцыйны Берлін аднадушныя ў тым, што галоўнае вымярэнне бяспекі – чалавечае, што бяспека ўключае і палітычны, і экалагічны, і ваенны, і сацыяльны аспекты.

Адзінства падыходаў прасочваецца і ў асуджэнні выпрабаванняў ядзернай зброі Індыяй і Пакістанам, і ў падтрымцы далейшых мер рэальнага раззбраення і г.д.

Ёсць узаемапаразуменне наконт таго, што трэба развязаць вузлы небяспечных крызісаў у Нагорным Карабаху, у Афганістане, у Афрыцы, у Прыднястроўі, на Балканах, у Каўказкім рэгіёне, у Таджыкістане і г.д.

Бакі згодны з тым, што трэба павышаць ролю ААН, АБСЕ у пошуку шляхоў умацавання міжнароднай бяспекі.

Зараз Мінск лічыць свій удзел у СЕАП, у праграме "Партнёрства дзеля міру" максімальным узроўнем супрацоўніцтва з НАТО. У адрозненне ад Мінска Берліну даспадобы тыя ўсходнеўрапейскія краіны, якія маюць намер значна перавысіць гэты ўзровень.

---

[88] Из бундесвера с визитом // Рэспубліка,1995,22 лістапада,№-№-243-244. Худинский Г. В Минске – делегация бундесвера // Рэспубліка,1995,23 лістапада,№-24.С.1.

[89] Бужан А. Внутреннее руководство бундесвера // Армия,1997,№-№-1-2.С.60

Вядома, што ФРГ з'яўляецца адным з ініцыятараў пашырэння НАТО на Усход. Пры гэтым федэральны ўрад вылучаў наступныя аргументы:

1) "хто не экспартуе стабільнасць, той імпартуе нестабільнасць";

2) "усходная мяжа (Германіі.–М.С.) не павінна заставацца мяжой атлантычнай бяспекі".[90]

Рэспубліка Беларусь выступіла супраць пашырэння НАТО на Усход. Гэта пашырэнне ўпершыню стала рэальнасцю ў выніку ліпеньскай (1997г.) сесіі Савета НАТО,якая прыняла рашэнне аб уступленні ў гэтую арганізацыю з 12 сакавіка 1999 года Польшчы, Чэхіі, Венгрыі. Уступленне Польшчы ў НАТО азначала, што Беларусь непасрэдна мяжуе з зонай дзеяння Паўночнаатлантычнага альянсу. У 2004 годзе членамі НАТО сталі памежныя з Беларуссю Літва, Латвія, а таксама Славакія, Славенія, Балгарыя, Румынія, Эстонія.

Кіраўніцтва Беларусі лічыць пашырэнне НАТО на Усход самай вялікай дыпламатычнай памылкай у гісторыі 2-й паловы XX стагоддзя – пачатку XXI стагоддзя.

Не ўсё супадала ў пазіцыях бакоў у адносінах да ўрэгулявання шэрагу міжнародных крызісаў. Мінск у адрозненне ад Берліна не дыстанцыраваўся ад Белграда часоў Мілошавіча, развіваў разнастайнае супрацоўніцтва з Саюзнай Рэспублікай Югаславія. Мінск быў не згодны з тым, каб крыніцу нестабільнасці на Балканах шукаць выключна ў Белградзе. У адрозненне ад ФРГ Рэспубліка Беларусь лічыла, што міжнародная супольнасць павінна праяўляць большую гнуткасць у адносінах да Ірака.

У актыў і Берліну, і Мінску можна запісаць стварэнне грунтоўнай прававой базы для ўзаемадзеяння з мэтай пасяховага супрацьстаяння арганізаванай злачыннасці, тэрарызму. Нямецкія эксперты ў гэтай галіне неаднаразова наведвалі РБ, дзяліліся вопытам са сваімі беларускімі калегамі. Супрацоўнікі праваахоўных органаў Беларусі таксама здзяйснялі карысныя паездкі ў ФРГ.

У ажыццяўленні знешняй палітыкі РБ на германскім напрамку ўносіць уклад і Брэстчына.

Брэст падтрымлівае партнёрскія адносіны з Равенсбургам, Зееловым, Кобрын – з Ульцэнам, Лунінец – з Шонэфэльдам, Пінск – з Альтэнай, Бланкенбургам, Столін – з Хомбергам.

"Аналіз партнёрскіх сувязей ...(Брэстчыны з гарадамі і землямі ФРГ.– М.С.)...дазваляе выдзеліць іх асноўныя накірункі і формы. Такімі з'яўляюцца: афіцыйныя кантакты кіраўніцтва, адміністрацыі; супрацоўніцтва ў галіне адукацыі; кантакты паміж спецыялістамі асобных сфер прафесійнай дзейнасці; сувязі ў галіне культуры, спорту і турызму; супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі; развіццё прыватных кантактаў паміж жыхарамі гарадоў-пабрацімаў. Асобна можна выдзеліць рэгулярную гуманітарную дапамогу, якая паступае з Германіі ў розных яе формах".[91]

А зараз прывядзём некалькі канкрэтных прыкладаў.

"Па ўзаемнай ініцыятыве Саюза абшчын Сярэдняй Шусенталі і Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта ў 2002 годзе быў рэалізаваны сумесны праект па рэканструкцыі і аснашчэнню медыцынскім абсталяваннем філіяла дзіцячай паліклінікі №1 г.Брэста. Гэты філіял па вул.Чырвонагвардзейскай, які атрымаў назву "Сярэдняя Шусенталь", прызначаны для аказання

---

[90] Стралец М.В., Коршак М.А. Асноўныя этапы гісторыі беларуска- нямецкіх сувязей. - Брэст : Выдавецтва С.Лаўрова, 2000. С.45

[91] Яроміч М.М., Грыбаў Г.М. Беларусь і Германія сёння( З вопыту партнёрскіх сувязей Брэста і Саюза абшчын Сярэдняй Шусенталі) // Навечна ў памяці народнай: Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне – Брэст, 25-26 красавіка, 1995, Брэст, 1995. С.7-8

артадантычнай дапамогі ўсяму дзіцячаму насельніцтву горада ў рэжыме дзённага стацыянара. Рэканструкцыя будынка была выканана за кошт сродкаў гарадскога бюджэту, а нямецкім бокам па лініі Чырвонага Крыжа былі сабраны грашовыя сродкі для набыцця медыцынскага абсталявання і аснашчэння цэнтра на агульную суму 229 530 еўра. Зараз у філіяле паліклінікі №1 разгорнуты і функцыянуюць ўсе дыягнастычныя службы і кабінеты".[92]

"Нямецкія партнёры стварылі таварыства "Усход-Захад", якім паспяхова кіравалі Фолкер Янсек, Эрыка Айхвальд і Барбара Дзік. Дзякуючы ім сталі рэгулярнымі штогадовыя абмены жаночымі дэлегацыямі. У Брэсце гэтую працу шмат гадоў курыруе і арганізоўвае Святлана Гіль, якая ўзначальвае Брэсцкі цэнтр сяброў Равенсбурга.

Існуюць кантакты паміж Брэсцкім камітэтам ветэранаў вайны і Нямецкім саюзам па нагляду за магілкамі. Былыя салдаты, якія ваявалі ў Савецкай Арміі і Вермахце, шмат зрабілі не толькі для захоўвання памяці аб тых, хто загінуў, але і для прымірэння двух народаў, для таго, каб трагедыя вайны больш не паўтарылася.

Найбольш актыўнымі удзельнікамі працэсу развіцця сяброўства і супрацоўніцтва былі былыя нямецкія ваеннапалонныя, якія вымушаны былі ў пасляваенны час некалькі гадоў знаходзіцца на тэрыторыі СССР (Э.Кнап, З.Ротэр.–М.С.). На жаль, ветэранаў вайны, непасрэдных удзельнікаў яе трагічных падзей з абодвух бакоў становіцца ўсё менш і менш. Пагэтаму правільным і мудрым было рашэнне падключыць да дзейнасці былых салдат Саюза рэзэрвістаў бундэсвера "Кіфхойзер" і ваеннаслужачых 38-й мабільнай Чырвонасцяжнай брыгады. Эстафету ўзаемапаразумення павінны падхапіць афіцэры дзвюх краін пасляваенных пакаленняў. Заслуга ў наладжванні кантактаў паміж ваеннымі людзьмі належыць Р.Нагелю, сп. Фісінгеру, Ю. Аджымамедаву, В.Буркоўскаму."[93]

"У пабрацімскіх сувязей г.Брэста і Саюза абшчын Сярэдняй Шусенталі, а таксама ў іншых населеных пунктаў Беларусі і ФРГ, паміж якімі існуюць партнёрскія адносіны, безумоўна, ёсць шырокія перспектывы. Сумесная рэалізацыя хоць бы часткі праектаў, абмен вопытам, ідэямі і інфармацыяй адкрываюць новыя магчымасці для развіцця ... (разнастайных. – М.С.) кантактаў паміж рэгіёнамі дзвюх краін. Акрамя таго, пабрацімскія сувязі з ФРГ дапамагаюць дэманстраваць перад нямецкай грамадскасцю станоўчыя бакі супрацоўніцтва з Беларуссю, што ў перспектыве магло б спрыяць наладжванню поўнамаштабнага палітычнага дыялога на міждзяржаўным узроўні паміж дзвюма нашымі краінамі".[94]

---

[92] Краюшкин Д.А Состояние, перспективы развития и значение побратимских контактов Брестской области с ФРГ // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры: Материалы международной научной конференции.–Брест,14-16 октября 2004 года.– Брест: Брестский государственный технический университет, 2005. С.248

[93] Гиль С.В., Грибов Т.М. Партнёрские связи г. Брест (Беларусь) и гг. Равенсбург-Вайнгартен (Германия): история и перспективы // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры: Материалы международной научной конференции.-Брест,14-16 октября 2004 года. - Брест: Брестский государственный технический университет, 2005. С.256-257.

[94] Краюшкин Д.А. Указ. соч.. С.249.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Ці можа быць прадстаўлена ў бундэстагу самастойнай фракцыяй партыя, якая, з аднаго боку, не пераадолела на парламенцкіх выбарых 5% - ны бар'ер, а з другога–атрымала 8 прамых мандатаў?

2. Чым германскі федэралізм адрозніваецца ад расійскага?

3. Чаму ключавыя партыі ФРГ страцілі зараз сваю ідэалагічную спецыфіку?

4. Чаму Партыя Дэмакратычнага Сацыялізму (ПДС) не мае электарата ў старых федэральных землях?

5. Ці ёсць падставы лічыць ФРГ парламенцкай рэспублікай?

**Тэст-заданні:**

1.Колькі членаў налічвае германскі бундэсрат?
а) 68; б) 48; в) 100.

2.Назавіце германскія гарады, якія адначасова з'яўляюцца суб'ектамі германскай федэрацыі.
а) Бон, Мюнхен, Штутгарт; б) Берлін, Брэмен, Гамбург;
в) Дзюсельдорф, Кіль, Эрфурт.

3.Ці ўваходзіць у выключнае заканадаўства германскай федэрацыі гаспадарчае права?
а) так; б) не.

4.Калі быў устаноўлены рэкорд СДПГ на выбарах у бундэстаг?
а) у 1972 г.; б) у 1976 г.; в) у 2002 г.

5.Сэрцавіна палітыкі бяспекі ФРГ—
а) членства ў НАТО; б) членства ў ЕС; в) членства ў ААН.

6.Дата аднаўлення беларуска–германскіх дыпламатычных адносін
а) 13 сакавіка 1992 г.; б) 10 траўня 1994 г.; в)11 лютага 2000 г.

7.Якая з пералічаных федэральных зямель не ўсталёўвала афіцыйных сувязяў з Рэспублікай Беларусь?
а) Баварыя; б)Брандэнбург; в) Шлевіг-Гальштэйн.

8.Калі стала рэальна працаваць кансультацыйна-маніторынгавая група (КМГ) АБСЕ ў Мінску?
а) з пачатку 1998 г.; б) з пачатку 2000 г.; в) з сярэдзіны 2004 г.

9.Станавы хрыбет СДПГ–
а) Аб'яднанне Нямецкіх Прафсаюзаў (АНП); б) зямельныя арганізацыі партыі;
в) рабочыя супольніцтвы партыі.

10.Старэйшая германская партыя–
а) ХДС; б) СвДП; в) СДПГ.

11. Блок паміж ХДС і ХСС існуе з
а) 1945 года; б) 1949 года; в) 1950 года.

12. У якой германскай зямлі дзейнічае Хрысціянска–сацыяльны саюз?
а) у Берліне; б) у Саксоніі; в) у Баварыі.

13. Калі ўзнікла арганізацыя "Саюз 90/ Зялёныя"?
а) у 1990 г.; б) у 1993 г.; в) у 1995 г.

14. Ці мелі германскія "Зялёныя" вопыт урадавай адказнасці на федэральным узроўні да 1998 г.?
а) так; б) не.

15. Калі Гельмут Коль быў канцлерам ФРГ?
а) з 1982 па 1998 гг.; б) з 1969 па 1982 гг.; в) з 1966 па 1969 гг.

*Лекцыя дзевятая*

# АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ, ЗВЫЧАІ, ТРАДЫЦЫІ. СІСТЭМА АДУКАЦЫІ. РАЗВІЦЦЕ НАВУКІ І ТЭХНІКІ. ВЫДАТНЫЯ ДЗЕЯЧЫ НЯМЕЦКАЙ ГІСТОРЫІ

***План:***

9.1. Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі.
9.2. Сістэма адукацыі.
9.3. Развіцце навукі і тэхнікі.
9.4. Выдатныя дзеячы нямецкай гісторыі.

## *9.1. Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі*

«Бадай нідзе федэратыўная структура Германіі не праяўляецца, так яскрава, як у сферы культурнага жыцця. У Германіі ніколі не было вядучага культурнага цэнтра, якім, напрыклад, быў Парыж у Францыі або Лондан у Англіі.

Самастойнасць культурнага жыцця зямель прывяла да ўзнікнення вялікіх і малых культурных цэнтраў рознага профілю.Культура і навука квітнеюць у невялікіх гарадках і абшчынах.

Большасць культурных устаноў у Федэратыўнай Рэспубліцы знаходіцца ў распараджэнні гарадоў і абшчын. Заканадаўства ў галіне культуры – за некатарымі выключэннямі – з'яўляецца прэрагатывай зямель. Кожная федэральная зямля ў асноўным самастойна будуе і сваю сістэму адукацыі. Платформай для супрацоўніцтва паміж землямі служыць Пастаянная канферэнцыя міністраў адукацыі і культуры зямель, на якую ўскладзены важныя каардынацыйныя функцыі.

У сілу гэтага ў Федэратыўнай Рэспубліцы ніколі не было федэральнага міністэрства культуры.(З 1998 года. – М.С.) Федэральны ўрад заснаваў пасаду дзяржміністра па справах культуры і СМІ ў Ведамстве федэральнага канцлера. Вытрымліваючы суверэнітэт зямель у галіне культуры, ён каардынуе ўсю дзейнасць федэрацыі ў галіне культуры, якая была раней размеркавана паміж рознымі федэральнымі міністэрствамі. Дзяржміністр і ўпаўнаважаны федэральнага ўрада па справах культуры і СМІ бачыць сябе ў якасці партнёра для кантактаў і генератара ідэй у галіне культуры на федэральным узроўні, а таксама прадстаўніка інтарэсаў культуры на міжнародным, перш за ўсё еўрапейскім узроўні. Асаблівую ўвагу ён надае развіццю культуры ў сталіцы краіны – Берліне і ва ўсходніх землях».[95]

«Па звестках еўрапейскага статыстычнага ведамства Eurostat, 2,2 % насельніцтва Германіі заняты ў «творчых» прафесіях (для параўнання – 3,5 % у Фінляндыі і 1,4 % у Партугаліі і Славакіі), да якіх аднесены не толькі пісьменнікі, мастакі, музыканты, акцёры і г. д., але і бібліятэкары».[96]

А зараз звернемся да канкрэтных напрамкаў культурнага жыцця.

У літаратуры Берлінскай рэспублікі выразна прасочваюцца літаратурныя традыцыі і наватарства. Далёка за межамі Германіі вядомы імёны Г.Беля, З.Ленца, Г.Граса, П.Шалюка, М.Шпера, Г.Генкеля, Ф.К.Крэтца, П.Вайса, Р.Гохута, іншых сучасных нямецкіх майстроў слова.

«Лепшыя дасягненні ў архітэктуры (аб'яднанай Германіі. – М.С.) звязаны з цікавымі эксперыментамі , пошукамі новых ідэй, спалучэннем стылю і ідэалогіі мастацтва «Баўгаўза» з найноўшымі тэндэцыямі сусветнай архітэктуры».[97]

Сучасная германская архітэктура прадстаўлена такімі імёнамі, як Г.Ян, Г. Бём, Г.Беніш, О.М. Унгерс.

---

[95] Германия. Факты.- Франкфурт-на Майне: Societatsverag, 2000. С. 449-450.

[96] Крывашэй Д.А. Федэральная культурная палітыка Германіі: вынік апошняга трыццацігоддзя // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры. Материалы международной научной конференции, 14-16 октября 2004 г. С.133.

[97] Германиія // Беларуская энцыклапедыя ў 18 тамах. Том 3. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя імя П.Броўкі, 1997. С.185.

Істотнае развіццё атрымала выяўленчае мастацтва.

Славу мастацтву аб'яднанай Германіі нясуць І. Бойс, Г.Базеліц, А.Кіфер, М.Люпертц, А.Р.Пенк, З.Польке, Г.Рыхтэр, У.Рыкрым, Р.Горн.

Бундэсбюргеры праяўляюць вялікую цікавасць да музыкі.

У развіцці дадзенага напрамку культурнага жыцця ў маштабах германскай федэрацыі асабліва вылучаюцца сталіцы яе суб'ектаў: Мюнхен (Баварыя), Штутгарт (Бадэн-Вюртэмберг), Дзюсельдорф (Паўночны Рэйн-Вестфалія), а таксама горад Гамбург, які мае статус федэральнай зямлі, дзелавая сталіца краіны Франкфуртна-Майне, горад-прыгажун Кёльн. Возьмем, напрыклад, Мюнхен. Прадмет гонару яго жыхароў – Баварская дзяржаўная опера. Моцным падборам выканаўцаў традыцыйна адметны сімфанічны аркестр Баварскага радыё. Высокі ўзровень характэрны для прафесарска-выкладчыцкага складу Мюнхенскай канн-серваторыі. Не меней насычана музычнае жыццё ў сталіцы Бадэн-Вюртэмберга. Тут добры водгук прэсы традыцыйна атрымліваюць рэжысёры і спевакі Вюртэмбергскага опернага тэатра, Штутгарцкі балет, кансерваторыя.

Гамбург славіцца Гамбургскай дзяржаўнай операй, сімфанічным аркестрам Паўночна-германскага радыё, кансерваторыяй. Жыхары і госці Дзюсельдорфа пастаянна атрымліваюць асалоду ад наведвання Нямецкай оперы на Рэйне.

У якасці аўтараў папулярнай музыкі ў ФРГ і за яе межамі шырока вядомы П.М.Гамель, В.Рым, М.Траян.

Высокую планку ў дырыжорскім мастацтве пастаянна задаюць О.Іохум, В. Фуртвенглер, Г. Караян, Р. Кемпе, Г. Кнапертсбуш, Г. Росбаўд, Р. Кубелік, П. Андэрс, К. Рыхтэр.

Удалыя творчыя рашэнні добра прасочваюцца ў операх, якія ставяць З. Вагнер, Г.Рэнерт, Г.Р. Зельнер.

Бундэсбюргеры, жыхары іншых краін атрымліваюць асалоду, калі маюць магчымасць ужывую пачуць голас Э. Шварцкопфа, Х. Пілarчыка, Дз. Фішэра-Дзіскава, І. Борка, А.Шлема, А.Ротэнбергера, Г.Прэя, Л.Попа.

Звычайна ў патрабавальнай германскай публікі назіраецца ўзвышаны настрой, калі за раяль садзяцца В.Бакгаўз, В.Кемпф.

«Немцы вельмі беражліва ставяцца да сваёй культурнай спадчыны. У Германіі колькасць наведвальнікаў музеяў у 10 разоў перавышае колькасць аматараў, якія наведваюць футбольныя матчы бундэслігі. Штогод звыш за 100 млн. чалавек наведваюць музеі. Усяго ў краіне налічваецца каля 5 тыс. музеяў і звыш за 8 тыс. выстаў. Гэта музеі зямель, гарадоў, саюзаў, краязнаўчыя і прыватныя музеі плюс скарбніцы, музеі епархіі і сабораў, гарадоў-рэзідэнцыяў, замкаў, палацаў і музеі пад акрытым небам. Найбольш папулярныя Этнаграфічныя і краязнаўчыя музеі, за імі ідуць музеі мастацтваў.

Шматстайнасць музейных калекцый здаецца бязмежнай: ад твораў Рэмбранта і Пікасо да шпалер (г. Касель), ад прылад вінаробства (г. Кобленц) да метэарытаў (г. Марбург), ад мумій, узятых з дрыгваў (г. Шлезвіг), да антычных прылад (г. Оберкохен), ад старажытнага плывучага сродку (г. Брэмерхафен) да музея бульбы».[98]

«Сучасныя немцы карыстаюцца рэпутацыяй нацыі з добрым характарам. Ім уласцівыя сумленнасць і гаспадарлівасць. Акуратнасць, практычнасць, добрасумленнасць, прадбачлівасць, пунктуальнасць, дакладнасць, працавітасць – гэта лепшыя нацыянальныя якасці, вядомыя ўсяму свету. Яны надзелены тэхнічным складам разуму, любяць спорт, набажныя. Яны вызначаюць і заахвочваюць маральнасць у сямейным жыцці і быце.

---

[98] Павлов Н.В. Германия на пути в третье тысячелетие. Пособие по страноведению. – М.: Высшая школа, 2001. С.5

Характэрная рыса немцаў ва ўжытку – сціпласць. Яны больш, чым іншыя народы, вывучаюць замежныя мовы... У немцаў няма яскрава выражанай нацыянальнай гордасці. Негатыўны бок характару немцаў – схільнасць да перайманя, невысокае меркаванне аб сваёй арыгінальнасці, прага да метадычнасці, педантычнасці.

Мысленне немцаў адрозніваецца здольнасцю да адцягненых пабудоў, глыбінёй абстрагіравання, філасофскай шырынёй. У вядомым сэнсе гэта іх нацыянальна-псіхалагічная асаблівасць з'явілася вынікам адыходу ад нямецкай рэчаіснасці з яе дробнай абмежаванасцю, традыцыйным уціскам строгага парадку і адсутнасцю імкнення пазнаць унутраны свет іншых людзей. Як паказваюць псіхалагічныя даследаванні, з аднаго боку, гнуткасць, кемлівасць, рацыянальнасць мыслення ў вядомай ступені чужыя немцу, а з іншага – па ўменню планаваць свае будучыя дзеянні немцы пераўзыходзяць прадстаўнікоў многіх іншых этнічных агульнасцяў.

Яны надзелены і здаровым розумам, які не перашкаджае ім у той жа час быць уражлівымі і параўнальна лёгка падвяргацца ўнушэнню.

Па тэмпераменту немцаў можна аднесці да флегматыкаў. Ім уласціва халодная разважальнасць і вытрымка ў дасягненні пастаўленых мэт, а таксама здольнасць пераносіць звязаныя з гэтым цяжкасці і нягоды. З усіх цывілізаваных нацый немцы лягчэй і далей за ўсе здольны падпарадкоўвацца ўрадам, пад уладай якіх яны жывуць, больш за ўсё далекія ад прагі пераменаў і супраціўлення існуючым парадкам.

Цэнтралізацыя краіны, жорсткі рэжым кіравання і строгая рэгламентацыя ўсіх бакоў жыцця ў дзяржаве, дробязны нагляд і прыдзірлівае ўмяшальніцтва ва ўсе галіны палітычнага, гаспадарчага і прыватнага жыцця Германіі парадзілі ў нямецкім нацыянальным характары педантызм і прыхільнасць да сістэмы. У гэтым і сіла і недахоп немцаў, таму што прыхільнасць да сістэмы параджае любоў да шаблону, глушыць ініцыятыву».[99]

### *9.2. Сістэма адукацыі*

Першая адукацыйная ступень для юных немцаў – дашкольная. Мінімальны ўзрост для наведвання адпаведных устаноў – тры гады, максімальны – шэсць. Затым распачынаецца працяглы перыяд школьнага навучання. Прычым уладныя структуры канкрэтнага суб'екта федэрацыі самі вырашаюць, колькі гадоў трэба будзе адвучыцца 6-гадоваму Петэру, яго равесніцы Ільзе, каб стаць выпускніком пачатковай школы. У 14 землях хлопчыкі і дзяўчынкі выступаюць у гэтай якасці дзесяцігадовымі і толькі юныя берлінцы і брандэнбуржцы – дванаццацігадовымі. Далей існуе шырокі спектр выбару. Адны дзеці накіроўваюцца ў асноўную школу. Другія становяцца вучнямі рэальнай школы. Трэція папаўняюць корпус гімназістаў. І, нарэшце, чацвёртыя аддаюць перавагу агульнай школе. Кантынгент навабранцаў асноўных школ у 1,5 раза болей, чым дэбютантаў навучальнага працэсу ў астатніх тыпах школ, разам узятых. Важным тыпам школ з'яўляюцца рэальныя. Іх дзеці заканчваюць у 16 гадоў. Яны вывучаюць у гэтых школах курс агульнаадукацыйных дысцыплін, авалодваюць шэрагам неабходных для жыцця ўменняў і навыкаў. Аднак усяго гэтага недастаткова, каб стаць уладальнікам атэстата аб поўнай сярэдняй адукацыі.

У выпускнікоў рэальных школ ёсць два варыянты далейшых дзеянняў. Рэалізуючы першы варыянт, яны становяцца навучэнцамі прафесійных школ. Другі варыянт звязаны з магчымым папаўненнем корпуса гімназістаў, якія наву-

[99] Соботковская О.Н. Актуальные проблемы этнопсихологии: Истоки немецкого характера // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры: Материалы международной научной конференции, 14-16 октября 2004 года. – Брест: Брестский государственный технический университет, 2004. С. 163-164.

чаюцца ў 11 класе. Гэта зрабіць гранічна проста тым, хто бліскуча скончыў рэальную школу. Для дадзеных выпускнікоў дастаткова прынесці спецыяльны ліст, падпісаны дырэктарам рэальнай школы. Выпускнікі, якія маюць відавочна горшыя выніковыя паказчыкі, праходзяць праз няпростыя экзаменацыйныя іспыты.

А зараз звернемся да тых гімназістаў, якія вучацца тут яшчэ да 11 класа. Адны з іх выступаюць у дадзенай якасці з 5 класа, другія – з 7, трэція – з 8. Апошні клас у гімназіі – 13-ты. Толькі бундэсбюргер, які прайшоў гімназічны курс, можа патэнцыяльна папоўніць корпус студэнтаў германскіх універсітэтаў. Кантынгент гімназістаў 11,12,13-га класаў вельмі спецыфічны. Ён мае права не вывучаць трэцюю частку дысцыплін, якія выкладаюцца ў гімназіі. Ключавым элементам навучальнага працэсу з'яўляецца курсавая сістэма. Гімназісты могуць наведваць сваю альма-матэр або днём, або вечарам ў залежнасці ад прынятага адміністрацыяй рэжыму працы. Гімназіі класіфікуюцца і па профілю. У адных ён гуманітарны, у другіх – эканамічны, у трэціх – тэхнічны, што дае падставы для мэтанакіраванай рэалізацыі гімназістамі сваіх схільнасцяў.

Пры разглядзе асаблівасцяў агульнай школы ўявім сабе настаўніка гісторыі СШ № 30 г. Брэста Іванова Івана Сяргеевіча, які спецыяльна прыехаў у Германію, каб знаёміцца з вопытам існавання падобных школ. Ён, безумоўна, здзівіцца адсутнасці класна-ўрочнай сістэмы. Іван Іваноў заўважыў у свайго калегі Петэра Шнайдэра адразу дзве праграмы па ўсіх дысцыплінах, якія ўваходзяць у гістарычны цыкл. Здольным да грунтоўнага вывучэння айчыннай, усеагульнай гісторыі адрасуецца паглыбленая праграма. З вучнёўскім кантынгентам са здольнасцямі сярэднімі і ніжэйшымі за сярэднія П.Шнайдэр працуе па скарочанай праграме. Тым самым германскі настаўнік рэалізуе прынцып дыферэнцыраванага падыходу, улічвае індывідуальныя асаблівасці кожнага вучня. Многія выхаванцы Петэра Шнайдэра авалодваюць курсам школьных дысцыплін столькі ж часу, як і падапечныя Івана Іванова – 12 гадоў.

Для Германіі характэрна вялікая разнастайнасць навучальных устаноў, якія не належаць дзяржаве. Маюцца на ўвазе ўстановы такога кшталту, створаныя каталіцкімі, евангельскімі, мусульманскімі, іудзейскімі аб'яднаннямі, школы – інтэрнаты па-за межамі гародоў, школы, да якіх абавязкова дабаўляецца прыметнік «альтэрнатыўныя».

Германская дзяржава не займае дамінуючых пазіцый у агульнагерманскай сетцы дзіцячых садкоў, ва ўстановах, у якіх юнак і дзяўчына навучаюцца канкрэтнай прафесіі. Такое ж становішча прасочваецца і ў структурах, якія даюць магчымасць грунтоўна ўдасканальвацца асобам, якія сфарміраваліся як прафесіяналы.

Важна адказаць і на такое пытанне: «Які далейшы лёс чакае выпускніка асноўнай школы, які па ўзросту яшчэ не перайшоў 18-гадовы рубеж?». Тут магчымы тры варыянты.

Варыянт першы. Ён становіцца вучнем больш прэстыжнай агульнаадукацыйнай школы.

Варыянт другі. Гэты выпускнік атрымлівае статус працаатрымальніка, рэгулярна наведвае пастаяннае працоўнае месца і ў пазарабочы час праходзіць навучанне па канкрэтнай спецыяльнасці ў прафесійнай школе.

Варыянт трэці. Ён – выключна навучэнец прафесійнай школы. Калі хлопчык ці дзяўчына пачынаюць выступаць у гэтай якасці ў 17 гадоў, то ў 18 гадоў яны ставяць кропку у навучанні ў дадзенай установе.

Базісны элемент сістэмы германскай вышэйшай школы ўтвараюць аб'екты ўласнасці суб'екта федэрацыі. Намнога менш прадстаўлены ў гэтай сістэме аб'екты федэральнай уласнасці і тыя, што зусім не маюць дачынення да дзяржаўнай уласнасці.

У ФРГ ёсць два тыпы ВНУ: універсітэцкі і неуніверсітэцкі. Універсітэцкі тып лічыцца прэстыжным. Твар універсітэцкага корпуса перш за ўсё вызначаюць універсітэты, якія існуюць ужо сотні гадоў.

Размова ў прыватнасці ідзе пра старэйшы ў Германіі Гайдэльбергскі універсітэт, установы такога кшалту ў Кёльне, Лейпцыгу. Яны ўжо знаходзяцца на сёмым стагоддзі сваёй гісторыі. Даўно ўжо мінаваў пяцісотгадовы рубеж Мюнхенскі універсітэт, пару дзясяткаў гадоў не хапае да дасягнення гэтага рубяжа Марбургскаму універсітэту, 268 гадоў Гётынгенскаму універсітэту, 225 гадоў Мюнстэрскаму, 219 – Бонскаму, набліжаецца да 200-гадовага юбілею Берлінскі універсітэт. Амаль 170 гадоў функцыянуе Тэхнічны універсітэт у Дрэздэне. Сярод універсітэтаў, якія з'явіліся ў найноўшы час германскай гісторыі, асабліва трэба вылучыць Гамбургскі і Свабодны Берлінскі. Першы стаў прымаць студэнтаў у год, калі пачалася гісторыя Веймарскай рэспублікі, а другі– у год, калі Саветы абвясцілі сумна вядомую блакаду Заходняга Берліна.

«Нямецкі універсітэт – аўтаномная арганізацыя з універсітэцкімі і факультэцкімі органамі самакіравання. Яны самі вызначаюць навучальную, персанальную, арганізацыйную, гаспадарчую і да т.п. палітыку універсітэта, выдаюць дакумент аб вышэйшай адукацыі і вучонай ступені. Фактычна універсітэт у Германіі незалежны ад дзяржавы ва ўсіх пытаннях, якія ўваходзяць у кола яго кампетэнцыі.

Самакіраванне ва універсітэтах Германіі склалася ў XIX стагоддзі, калі прафесары афіцыйна з'яўляліся адзінымі носьбітамі самакіравання. Зараз гэта афіцыйна замацаваны ў статуце універсітэта прынцып, паводле якога за ўсімі важнымі рашэннямі стаіць абсалютная большасць карпарацыі прафесараў ВНУ. На чале факультэта стаіць дэкан, які абіраецца з ліку прафесараў факультэта, на чале універсітэта – рэктар, якога абірае сенат універсітэта».[100]

«Побач з ... універсітэтам важная роля ў ФРГ адводзіцца вышэйшым прафесійным школам. Зараз гэтыя ВНУ валодаюць статусам вышэйшай школы, але не адносяцца да навуковых ВНУ. Пагэтаму вышэйшыя прафесійныя навучальныя ўстановы не даюць права на атрыманне дыплома, эквівалентнага унівесітэцкаму і абарону доктарскай (у нас кандыдацкай) дысертацыі. Дадзены тып вышэйшай навучальнай установы ў адрозненне ад універсітэта мае практычны ўхіл. Пры паступленні ў гэтыя ВНУ не абавязковы атэстат сталасці аб заканчэнні гімназіі..., навучанне ў іх завяршаецца ў кароткія тэрміны (ад трох да чатырох гадоў). Добрыя перспектывы далейшага працаўладкавання робяць прафесійную вышэйшую школу болей прывабнай для моладзі».[101]

«У (сучаснай. – М.С.) вышэйшай школе разгарнулася барацьба за скарачэнне тэрмінаў навучання, пачаліся ўводзіны англасаксонскай сістэмы дыпломаў (бакалаўр – магістр). Саступаючы патрабаванням вышэйшых слаёў грамадства, улада дала дабро з'яўленню ў Германіі прыватных універсітэтаў, якія носяць элітны характар – атрымаўшы мянушку «яслі для дарослых дзяцей», яны тым не менш гарантуюць сваім выпускнікам зайздросную кар'еру ў бізнесе».[102]

«Зараз у Германіі налічваецца звыш 300 ВНУ, у якіх навучаецца каля 1,8 млн. студэнтаў, працуе больш за 40 тыс. прафесараў і 70 тыс. выкладчыкаў. Чакаецца, што ў 2010 годзе колькасць тых, хто паступае, павялічыцца на 25%».[103]

---

[100] Шебанова И.А. Германия в аспекте создания общеевропейского образовательного пространства // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры. Материалы международной научной конференции, 14-16 октября 2004 года. – Брест: Брестский государственный технический университет, 2004 С. 112

[101] Ракицкая В.Т. Из опыта реформирования высшего образования в Германии // Актуальные проблемы германской истории, политики, экономики, культуры: Материалы международной научной конференции, 14-16 октября 2004 года – Брест:Брестский государственный технический унирерситет, 2004. С.179.

[102] Ватлин А.Ю. Германия в XX веке. – М.: «Российская политическая энциклопедия». (РОССПЭЭН), 2002. С.288.

[103] Павлов Н.В. Германия на пути в третье тысячелетие. Пособие по страноведению. Курс лекций. – М.: Высшая шк., 2001. С.23.

### *9.3. Развіцце навукі і тэхнікі*

Бундэсбюргэры, якія імкнуцца сказаць апошняе слова ў навуцы, шырока прадстаўлены ва універсітэтах. Неўніверсітэцкая частка навуковага корпуса сканцэнтравана ва ўстановах з рознай формай уласнасці. Спектр гэтых устаноў даволі шырокі. Ёсць сусветна вядомыя структуры ў індустрыяльным комплексе, якія ўяўляюць бліскучы прыклад інтэграцыі навукі і вытворчасці. Заўсёды запатрабаваны вынікі дзейнасці цэнтраў, якія канцэнтруюцца на макраэканамічных і прыкладных эканамічных даследаваннях.

Свае акадэміі навук ёсць у сталіцах суб'ектаў федэрацыі: Паўночнага Рэйна-Вестфаліі (Дзюсельдорф), Баварыі (Мюнхен) і ў гарадах са шматвяковымі навуковымі традыцыямі: Гайдэльбергу, Гётынгене, Лейпцыгу, Майнцы. Цесная геаграфічная і гістарычна – культурная сувязь двух новых федэральных зямель – Берліна і Брандэнбурга – выразна падкрэсліваецца ў назве Берлінска – Брандэнбургскай акадэміі мастацтваў. У навуковых часопісах часта можна прачытаць цікавую інфармацыю на прадмет плённай кааперацыі навуковага корпуса універсітэтаў і аўтараў перспектыўных напрацовак, якія прадстаўляюць дадзеныя акадэміі.

Не будзе перабольшваннем назваць таварыствам генератараў навуковых ідэй Таварыства імя Макса Планка. Ужо ў поўным найменні таварыства падкрэсліваецца яго функцыянальнае прызначэнне – развіццё навук. Суб'екты руху за развіццё навук, якія прадстаўлены ў гэтым таварыстве, маюць міжнароднае прызнанне. Ніводзін з гэтых суб'ектаў не ўваходзіць ва універсітэцкую структуру. Такіх суб'ектаў, гэта значыць асобных калектываў, налічваецца не меней за 60, што яшчэ раз падкрэслівае моц германскай навукі.

«Увогуле па краіне ў сферы навуковых даследаванняў і распрацовак занятыя каля 463.000 чалавек.Больш за 50 % з іх – навукоўцы і інжынеры. Астатнія дзеляцца пароўну на тэхнічны і іншы персанал, напрыклад, кіруючы.

У 1998 годзе выдаткі на навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў памеры 87 млрд. марак склалі 2,3 % валавога ўнутранага прадукту. Па гэтым паказчыку Германія займае 3-е месца сярод сямі буйнейшых прамысловых дзяржаў пасля Японіі (3,06%), ЗША (2,79%). На чацвёртым месцы Францыя (2,18%) Больш за 54,3 млрд. марак выдаткаў прыйшлося на долю прадпрыемстваў.

Федэрацыя і землі вылучылі прыблізна па 15 млрд. марак, яшчэ 1,5 млрд. марак з федэральнага бюджэту пайшлі за мяжу».[104]

Заўважым, што ў сілу пэўных эканамічных цяжкасцяў Берлінская рэспубліка не здольна на фінансавую падпітку навукі ў тым аб'ёме, як раней. «Калі за 1980-я гг. дзяржаўныя выдаткі на навуковыя даследаванні павялічыліся ў два разы, то да 1998 г. толькі на 20%».[105]

Не сакрэт, што кожны навуковец, у тым ліку і германскі, марыць аб шырокім прызнанні яго дасягненняў. Найбольш яскравае сведчанне падобнага прызнання – прысуджэнне Нобелеўскай прэміі.

«У апошняе (дваццацігоддзе. – М.С.) сярод нобелеўскіх лаўрэатаў у галіне хіміі, фізікі і медыцыны былі і германскія навукоўцы. Так, Нобелеўская прэмія ў галіне медыцыны ў 1991 г. была прысуджана Эрвіну Негру і Берту Закману. Нобелеўскую прэмію ў галіне фізікі ў 1989г. падзялілі з двума амерыканскімі калегамі фізік Вольфганг Пауль, а ў 1988г. Нобелеўскай преміяй у галіне хіміі адзначаны даследчыкі Іаган Дайзенхофер, Роберт Хубер і Хартмут Міхэль. Лаўрэатамі Нобелеўскай прэміі ў галіне медыцыны ў 1995 г. сталі генетык Крысціане Нюсляйн-Фольхард і нідэрландскі хімік Пауль Крутцэн, які выкладае ў Майнцы. Нобелеўскую прэмію ў галіне медыцыны атрымаў Гюнтэр Блобель, які ахвяраваў большую частку прэміі на аднаўленне дрэздэнскай царквы Фраўэнкірхэ.

---

[104] Германия. Факты. Франкфурт-на –Майне: Societatsverlag. 2000. С.293.

[105] Ватлин А.Ю. Германия в XX веке. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2000. С.288.

«Раней германскія ўніверсітэты займалі вядучыя пазіцыі ў многіх галінах прыродазнаўства і гуманітарных навук. Да другой сусветнай вайны немцам было прысуджана 10 з 45 Нобелеўскіх прэмій у галіне фізікі і 16 з 40 – у галіне хіміі.

Дыктатура нацыянал-сацыялістаў выжыла з краіны лепшыя розумы.Некаторыя з іх выехалі ў ЗША, што дало неацэнныя штуршкі амерыканскай навуцы. Ад такога «кровапускання» Германія пасля 1945 г. апраўлялася павольна і з вялікім цяжарам. Доўгім быў адваротны шлях да дасягнення сусветнага навуковага ўзроўню».[106]

Па традыцыі «ідуць у нагу» навука і вытворчасць.

Зараз германскія суб'екты гаспадарання з «хуткасцю, якая нарастае, прыстасоўваюцца да... дынамікі тэхналагічных зменаў... Асноўная ўвага вытворцаў перасоўваецца на распрацоўку і ўкараненне лагістычных канцэпцый і стратэгій, якія заснаваны на сучасных інфармацыйных сістэмах...

(Рэальнасцю сучаснага этапа з'яўляецца наяўнасць. – М.С.) цэлага комплексу лагістычных інфармацыйных сістэм (ЛІС).

Асноўнымі класамі ЛІС з'яўляюцца:

• сістэма планавання рэсурсаў прадпрыемства – ERP (Enterprise Ressource Planning);

• сістэмы кіравання ланцужкамі паставак – SCM (Supply Chain Management);

• сістэмы кіравання ўзаемадачыненнямі з кліентамі – CRM(Customer Relation Management).

Акрамя таго, сюды ж трэба таксама аднесці такія накірункі, якія хутка развіваюцца, як e – commerce, e – business, e – procurement, ECR (Efficient Consumer Response, ASP (Application Service Providing), ATP (Available To Promise) і інш..

Калі працэс укаранення сістэм класа ERP буйнымі нямецкімі кампаніямі практычна завершаны, то сістэмы кіравання ланчужкамі паставак толькі пачынаюць масавае ўкараненне.... Разам з тым гэты сегмент ЛІС мае вельмі высокі патэнцыял росту...

*Нямецкі рынак CRM – рашэнняў таксама знаходзіцца на этапе ўпэўненага росту».*[107]

Можна прывесці і іншыя пераканаўчыя прыклады саюза навукі і вытворчасці ў германскіх умовах.

### *9.4. Выдатныя дзеячы нямецкай гісторыі*

Да выдатных дзеячаў нямецкай гісторыі трэба аднесці асоб, якія адыгрывалі ў ёй лёсавызначальную ролю. Пералік можа быць вялікім. З-за абмежаванасці аб'ёму ўзгадаем толькі асобныя імёны.

«Курфюст Фрыдрых III заснаваў Прускае каралеўства... Пры каралю Фрыдрыху II (1712-1786 гг.), якога яшчэ празвалі Вялікім, Прусія становіцца вялікай еўрапейскай дзяржавай».[108]

З імем Ота Бісмарка звязана аб'яднанне Германіі 1870-1871гг.

Знакамітыя немцы XX стагоддзя – Адэнаўэр, Эрхард, Брант, Шміт, Коль, Геншэр.

На асабісты рахунак першага канцлера ФРГ Конрада Адэнаўэра можна запісаць наступныя разважанні германскага даследчыка фон Глінскі: «Дзяржава (ФРГ. – М.С.), якая з'явілася на свет (у 1949г. – М.С.), не была пры сваім нара-

---

[106] Германия. Факты. – Франкфурт-на-Майне: Societatsverlag, 2000. С.295

[107] Олешко И.М. Основные тенденции процессов внедрения и развития логистических информационных систем немецкими компаниями // Актуальные проблемы германской истории, политики, эко-номики, культуры: Материалы II международной научной конференции, 14-16 октября 2004 года. – Брест: Брестский государственный технический университет, 2004. С.243-246.

[108] Павлов Н.В. Германия на пути в третье тысячелетие. Пособие по страноведению. – М.: Высшая шк., 2001. С.228-229.

джэнні суверэннай. Яна павінна была зарабіць права на суверэнітэт і атрымаць яго часткова і, як ні дзіўна, у той меры, у якой прынятае паняцце «суверэнітэт» мадыфікавалася зусім новымі спосабамі дзякуючы палітыцы адмовы. Так, адмовіўшыся ад самастойнага нацыянальнага камандавання і поўнасцю інтэгрыраваўшыся ў НАТО, бундэсвер ператварыўся там ва унікальны фактар моцы. Адмовіўшыся ад суверэнітэту ў эканамічнай галіне, Федэратыўная Рэспубліка Германія дасягнула свайго становішча ў Еўрапейскім Супольніцтве. Тое, што спачатку меркавалася як сродак стрымлівання нямецкіх непрадказальнасцяў, ператварылася ў рынак непрадказальных магчымасцяў».[109]

Дзякуючы Л. Эрхарду ў Германіі спрацавала канцэпцыя сацыяльнай рыначнай гаспадаркі.

Істотная заслуга чацвёртага канцлера ФРГ Вілі Бранта – «новае заснаванне Федэратыўнай рэспублікі».

«Брант і Адэнаўэр дапаўнялі адзін аднаго, кожны з іх наклаў свой адбітак на адзін з бакоў аднаго і таго ж медаля». Галоўнае заключалася не столькі ў саміх рэформах, колькі ў новым грамадскім клімаце, які яны адначасова выкарыстоўвалі і стваралі. Калі ў канцы 1960-х гг гатоўнасць пайсці на канфлікт з агульнапрынятымі каштоўнасцямі для таго, каб адстаяць сваё бачанне будучыні краіны, успрымалася як выклік стабільнасці і дэмакратыі, то праз пяць гадоў гэта стала нормай грамадзянскіх паводзін.

Час, калі кіраўнікі ФРГ лічылі за лепшае не ўзгадваць пра злачынства «трэцяга рэйха» (таксама, як не прынята было рабіць акцэнт на ахвяры сярод мірнага насельніцтва, выкліканыя англа-амерыканскімі бамбардзіроўкамі), адышоў у мінулае. Маральная адказнасць атрымала верх над тэхналогіяй улады».[110]

Пераемнік В. Бранта на пасадзе канцлера Г. Шміт шмат зрабіў для ўмацавання пазіцый ФРГ у НАТО, ЕЭС.

Шосты канцлер ФРГ Г.Коль і міністр замежных спраў у 1974-1992 гг. Г.-Д. Геншэр – гэта перш за ўсё архітэктары германскага адзінства.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**Пытанні:**

1. Ці ёсць падставы сцвярджаць, што германскі федэралізм найбольш яскрава праяўляецца ў культурнай сферы?

2. Ці ёсць неабходнасць ставіць пытанне аб рэфармiраванні германскай адукацыйнай сістэмы?

3. Як поліканфесійная структура насельніцтва Германіі ўплывае на культурныя працэсы ў гэтай краіне?

4. Як глабалізацыя ўплывае на маральна-філасофскія пошукі сучаснай нямецкай літаратуры?

5. Ці ёсць падставы сцвярджаць аб сусветным узроўні развіцця навукі ў Берлінскай рэспубліцы?

**Тэст-заданні:**

1. Штогод музеі Германіі наведвае

а) 10 млн. чал.; б) 20 млн. чал.; в) звыш за 100 млн. чал.

2. Старэйшы універсітэт Германіі –

а) Гайдэльбергскі; б) Мюнстэрскі; в) Гётынгенскі.

---

[109] Фон Глински Г. 40 лет внешней политики // Гутен Таг. – 1989. – № 5. С.4-5.

[110] Ватлин А.Ю. Германия в XX веке. – М.: «Российская политическая энциклопедия». (РОССПЭН), 2002. С. 231-232.

3. Нямецкі універсітэт –
а) аўтаномная арганізацыя;
б) арганізацыя, якая жорстка залежыць ад федэральных уладаў;
в) арганізацыя, усе напрамкі працы якой вызначае федэральная зямля.

4. Рэктара нямецкакга універсітэта
а) абірае сенат унівесітэта;
б) прызначае федэральны канцлер;
в) прызначае прэм'ер-міністр федэральнай зямлі.

5. Колькі ВНУ налічваецца ў сучаснай Германіі?
а) звыш за 300; б) звыш за 400; в) звыш за 500.

6. Колькі гадоў працягваецца навучанне ў пачатковай школе ў Берліне?
а) 4; б) 5; а) 6.

7. Ці можна стаць студэнтам нямецкага ўніверсітэта, не маючы атэстата аб заканчэнні гімназіі?
а) так; б) не.

8. Колькі асобных навуковых калектываў уваходзіць у Таварыства развіцця навук імя Макса Планка?
а) не меней за 60; б) не болей за 50; в) не болей за 40.

9. Колькі грамадзян Германіі занята ў галіне навуковых даследаванняў і распрацовак?
а) каля 463000 чалавек;
б) каля 282000 чалавек;
в) каля 912000 чалавек.

10. Калі федэральны ўрад заснаваў пасаду дзяржміністра па справах культуры і СМІ ў Ведамстве федэральнага канцлера?
а) у 1998 г.; б) у 2002г.; в) у 2005 г.

11. Які працэнт насельніцтва Германіі заняты ў творчых прафесіях?
а) 2,2%; б) 3,5%; в) 4,1%.

12. У якіх нямецкіх гарадах няма кансерваторыі?
а) Мюнхен; б) Кобленц; в) Штутгарт.

13. Ці ёсць у Германіі музей бульбы?
а) так; б) не.

14. Ці даюць вышэйшыя прафесійныя школы ФРГ права на абарону доктарскай дысертацыі?
а) так; б) не.

## Літаратура


Адам Міцкевіч і сусветная культура. Т. 1-5. – Гродна etc., 1998-2000.
Ватлин А.Ю. Германия в XX веке. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2002.
Германская история в новое и новейшее время. Т. 1 – 2. М., 1970.
Горский И.К. Польский исторический роман и проблема историзма. М., 1963.
Груббер Р.И. История музыкальной культуры. Т. 2, ч.2. – М., 1959.
Ёдике Ю. История современной архитектуры: Пер. с нем. – М., 1972.
История литературы ГДР. – М., 1892.
История литературы ФРГ. – М., 1980.
История немецкой литературы. Т. 1 – 5. – М., 1962-76.
История польской литературы. Т. 1 – 2. – М., 1968-69.
Кершнер Л. Немецкая народная музыка. – М., 1965.
Краткая история Польши: С древнейших времён до наших дней. – М., 1993.
Кушевский С. Современное польское кино: Пер. с пол. – Варшава, 1978.
Либман М.Я. Немецкая скульптура, 1350-1550. – М., 1980.
Яго ж. Дюрер и его эпоха: Живопись и графика Германии конца XV и первой половины XVI в. – М., 1972.
Липатов А.В. Возникновение польского просветительского романа. – М., 1994.
Лойка А.А., Перкін Н.С. Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязи ў XIX ст. - Мн., 1963.
Лойко Л.В. Политическая борьба в Польше (70-80гг.). – Мн., 1995.
Павлов Н.В. Германия на пути в третье тысячелетие: Пособие по страноведению. - М., 2001.
Петелин Б.В. Германская политика канцлера Гельмута Коля. 1982-1990 гг.: Научное издание. – Вологда, 2004.
Розанов Г.Л. Германия под властью фашизма (1933-1939). – М., 1961.
Рубанова И.И. Польское кино: Фильмы о войне и оккупации, 1945-1965. – М., 1966.
Руге В. Германия в 1917-1933 гг. – М., 1974.
Сакалоўскі У. Пара станаўлення. – Мн., 1986.
Яго ж . Беларуская літаратура ў ГДР. – Мн., 1988.
Яго ж. Восприятие современной белорусской литературы в ГДР и ФРГ // Современные славянские культуры: развитие, взаимодействие, международный контекст: Материалы междунар. конф. ЮНЕСКО. – Киев, 1982.
Сарматский портрет: Из истории политического портрета эпохи барокко. – М., 1979.
Смирин М.М. Германия эпохи Реформации и Великой Крестьянской войны. – М., 1962.
Соболев Р.П. Встреча с польским кино. – М., 1967.
Стрелец М.В. ФРГ и проблемы ограничения и сокращения вооружений в Европе. (1949-1990 гг.). – Брест: Издательство С. Лаврова, 1997.
Стрелец М.В. Христианско-социальный союз в Баварии (ФРГ): идеология и политика. Монография. – Брест: Издательство БГТУ, 2004.
Стрелец М.В., Малашук П.В. Германский бундесвер в 1990–ые годы: новые акценты, новые задачи. – Брест: Издательство С.Лаврова, 2000.
Стрелец М.В., Стариков В.И. Бонн и постсоциалистическое пространство в Европе: концепции и реалии 1990-ых годов. – Брест: Издательство С.Лаврова, 1994.
Тананаева Л.И. Польское изобразительное искусство эпохи Просвещения: Живопись, рисунок. – М., 1968.
Ферман В.Э. Немецкая романтическая опера // Ферман В.Э. Оперный театр. – М., 1961.

Цыбенко Е.З. Польский социальный роман 40-70-х г. XIX в. – М., 1971.
Часноўскі М.Э. Сістэмныя пераўтварэнні у Рэспубліцы Польшча (1989-1999). – Мн., 2000.
Шидловский Р. Театр в Польше. – Варшава. 1972.
Ювалова Е.П. Немецкая скульптура, 1200-1270. – М., 1983.
ADAMSKI Jerzy [au] DZIEDZICTWO i rzeczywistość polskiej kultury / Jerzy Adamski // /Myśl Socjaldemokr. – 2000, nr 2, s. 83-104
Almanach scény polskiej. T. 1-5 Warszawa, 1961-94.
AUGUSTYNIAK Urszula DLACZEGO barok : "sarmackie" mistyfikacje we współczesnej kulturze polskiej / Urszula Augustyniak // Ogród. – 1994. nr
BIAŁKOWSKA Barbara [au], KOCIUBIŃSKI Krzysztof [au] ANALIZA sytuacji w szkolnictwie oraz w kulturze w polskiej części Euroregionu Nysa / Barbara Białkowska, Krzysztof Koriubiński. – Streszcz. w JĘZ. niem. // /Europa Region. – T.-(1999), s. 143-157
BARTKOWIAK Kazimierz [au] WYBORCZA obłuda biskupów / Kazimierz Barkowiak // /Dziś. – 2001, nr 10 s. 13-15
BARTKOWIAK Kazimierz [au] WYBORCZA plajta Kościoła / Kazimierz Bartkowiak // /Dsiś. – 2001. nr 11. – s. 11-14
Baculewski K. Polska tworczosc kompozytorska. 1945-1984. Krakow, 1987:
BOJARSKI Włodzimierz Witold [au]. DMOCHOWSKI Zbigniew [au]. KUROWSKI Stefan [au], DMOWSKI Jędrzej [op] REFLEKSJE fjowyborcze / Włodzimierz Bojarski. Zbigniew Dmochowski. Stefan , Kurowski ; oprać. Jędrzej Draowski // /Myśl Poi – 2001. nr 40, s. 4.10
BOREA Konrad [au] KAMPANIA w cieniu sondaży: wybory 2001 / Konrad Borea // /Myśl Poi – 2001, nr 40, s. 11
BOREA Konrad [au] ich zaskoczyło!!! / Konrad Borea // /Myśl Poli.-2001. nr 40, s. 5
BRUDNICKI Jan Zdzisław [au] PYTANIA o tożsamość kulturalną / Jan Z[dzisław] Brudnieki Wind. Kult. – 1996. nr 40. s. 5
CHMIELEWSKI Witold [wp], MALINOWSKI Jan Adam [rp] MALA ojczyzna – skarbnicą kultury / Witold Climielewski; rozm. przepr. Jan A[dam] Malino wski // Wychów. na co Dzień. – 1997, nr 1/2, s. 4-6
CIEŚLIK Mariusz [au] CZESKI film: czego możemy się nauczyć od naszych południowych sąsiadów / Mariusz Cieśli /Wprost. – 2003. nr 1, s. 100-103
CYBULSKI Andrzej [au] KULTURA w letargu? / Andrzej Cybubki // Literatura. – 1996, nr 3, s. 8-9
CZYŻEWSKI Krzysztof [au] CZAS prowincji / Krzysztof Czyżewski // /Znak. – 2002, nr 7. s. 5-12
DŁUBACZ Włodzimierz [au] POLSKA na rozdrożu / Włodzimierz Dlubacz // /Ziaz. Nauk. WSZiP Łomża. – 2000. nr 3. s. 39-46.
DROZDOWSKI Marian Marek [au] O POTRZEBIE Kongresu Kultury Polskiej / Marian M[arek] Drozdowski // Palestra. – 1997, nr 3/4. a. 60-66
DRYSZEL Andrzej [au] ELEKTORAT nie wierzy sondażom / Andrzej Dryszel // /Przegląd. – 2001. nr 40, s. 11-13
DUDZIAK Sławomir Pawoł [au] KULTURA – dyfuzja – pogranicze – człowiek / Sławomir P[aweł] Dudziak // Pogranicze. – T. 5 (1996), s. 25-36
DURZEWSKA Małgorzata [ar] Dialog(i) w kulturze. – Pozn., 2001. – Rec. Małgorzata Durzcwska // / Kult. Współcz. – 2002, nr ½, s. 223-226
DYBCIAK Krzysztof [au] GEOKULTUROWA sytuacja Polski na przełomie stuleci / Krzysztof Dybciak // /Arcana. – 2002. nr 2,s. 20-28
Dzieje teátru polskiego. T. 1-5. Warszawa, 1977-93
DZIUBA Andzej Franciszek [ar] Studi in onore di. Jan Władysław Woś per il suo 60 compleanno. – Trento, 1999. – Rec. Andrzej Franciszek Dziuba // /,Saec. Christ. s-. 272-275

ELEKTOROWICZ Leszek [au] KAŻDY jesl "Każdym": [ref.] / Leszek Elektorowicz // /Arcana. – 2003, nr 5, s. 180-183
Encyklopédia kultúry polskiej XX wieku: Film. Kinematografia. Warszawa, 1994.
FEDYSZAK-RADZIEJOWSKA Barbara [au] KREACJE parlamentarne / Barbara Fedy.szak-Radziejowska // /Tyg. Solid. – 2001. nr 40. s. 4 Analiza powyborcza
FOSTAKOWSKA Anna [au ]LEPPERA nie ma? Nitj głosuje / Anna Fostakowska // / Gaz. Wybor. – 2001, nr 234, s. 18-19
FUDALA Magdalena [au] DRUŻYNA Leppera / Magdalena Fudala // /Przegląd. – 2001, nr 40, s. 17-19
GAŁAJ Dyzma [au] ROLA piśmiennoś i i nowoczesnych mediów w procesie zespalania się kultury wsi z kulurou narodu / Dyzma (ga-laj // Kult. Wst. – 1997, nr 1. s. 59-68
GAŁAJ Dyzma [au] "...WIEŚ to dalszy ciąg życia pokoleń": przemiany w kulturze wsi Bochen k. Łowicza / Dyzma Gałaj // Regiony. – 1996, nr 1, s. 86-102
GARGAS Anita [au]. MICHALIK Eliza [au]. SAKIEWICZ Tornad [au] NOWI w sejmie / Anita Gargas, Eliza Michalik, Tomasz Sakiewkz // /Gaz. Poi – 2001. nr 40, s. 8-1
GEBETHNER Stanisław [au] KOLKJNE przegrupowanie na polskiej scenie politycznej / Stanislaw Gebethrier // /Myśl Socjaldtmokr. - 2001, nr – 4, s. 12-.35
Gebhardt B. Handbuch der deutschen Geschichte. Bd. 1-4. Stuttgart, 1954-60.
GOLEC Jan [au] PRZED wyborami / Jan Golec // /Dziś. – 2001. nr 9, s. 26-31
GOLEC Jan [au] PRZED wyborami / Jan Golec // /Diii – 2001. nr 9, s. 26-31
Gomolka K. Bialorusini w II Rzeczypospolitey. Gdansc, 1992.
GOWIN Jarosław [wp]. MAJCHEREK .łanu-/, A. [wp]. ŚPIEWAK Paweł [wp]. DUDA Wojciech P. [rp] SYTUACJA nadzwyczajna: wybory 2001 / .Jaroslaw Gowin. Janusz A. Majcherek. Paweł Spiewak: lozm. przepr. Wojciech P. Duda// /Prz. Polit. – Nr 51 – (2001). s. 10-14
GRABOWSKA Mirosława RELIGIJNOŚĆ i Kościół w wyborach 2001 roku / Mirosława Grabowska. – Streszcz. w jez. ang. // /Slud. Polit. – Nr 13 – (2002), s. 67-111
GRZELAK Paweł [au] GŁOSOWANIE ekonomiczne w Polsce w 2001 roku w warunkach dezintegracji ugrupowań rzadzacych / Pawel Grzelak – Stresz. w jęz. ang. // /Stud. Polit,. – Nr Li – (2002). S. 113-133
GIEYSZTOR Aleksander [au] OBSZARY pamięci / Aleksander Gieysztor // /Rzeczpospolita--2000, nr 281, s. D6
Niewygłoszone przem. przygotowane na Kongres Kultury Polskiej w 1981 r.
GOŁĘBIOWSKI Bronisław [an] PO ZMILRZCHU i nocy – świt? / Bronisław Golębiowski // Wiail. Kult. – 1997, nr 14, s. 11
GOŁĘBIOWSKI Bronisław [au] ROLA badaczy i pisarzy regionalnych w twarzenu kultury narodowej / Bronisław Golębiowski // /Stud. Lomz.: s. 195-208
GÓRNY Tadeusz [au] FOGLER na koniec wieku czyli lato '99 nie tylko z skążką : zapiski nadciśnieniowca / Tadeusz (Górny // Mag. Lit. – 1999. nr 8/9. a. 26-27
GRUZEWSKA Anna [an]. SARZYŃSKI Piotr [au] ORKA Pegazem: najpłodniejsi twórcy / AnitaGrużewska. Piotr Sarzynski // Pohtyka. – 1997, nr – 36, s. 56-58
GRZELAK Zdzisław [au] CIĄGŁOŚĆ i zmiana w kulturze wsi polskiej / Zdzisław Grzeiak // Kult. Wsi. – 1997, nr 1, s. 117-143
HEN Magdalena [au] TO NIE jest podrzędny resort / Magdalena Hen // Rzeczpospolita. – 1999. nr 62, s. 8
HERTZ Pawel [wp]. PIEŃKOSZ Konstanty [rp]. SKROK Zdzisław [rp] KILKA myśli u kulturze / Pawci Hertz ; rozm. przepr. Konstanty Pieńkosz. Zdzisław Skrok // Sycyna. – 1996. nr 12, s. 1.3-4

HOPFINGER Maryla [au] komunikacyjna pod koniec XX wieku / Maryla hopfinger // *Polonistyk.* – 1996, nr 5, s. 260-265
HENNELOWA Józefa [an] GORZKIE prawdy / Józefa Ilennelowa // */tyg. Puinz.* – 2001, nr 40, s. 7
História filmu polskiego. T. 1-6. Warszawa, 1966-94;JACEWICZ Jan [au], BUDZYNSKI Adam [au] KULTURA na szczeblu gminy / Jan J wica, Adam Budzviiski // *Widii Kult.* – 1997, nr 14, s. 10
JAGIEŁŁO Michał [au] BIBLIOTEKA Nai-odowa czyli dom otwartej pokkośri / Michał Jagiello // / *Not. W yd.* – 2003, nr 9. s. 28-32
JAŁOWIECKI Bohdan [au] REGION etniczno-lingwistyczne i kulturowe w Polsce / Bohdan Jatowiecki // /Jęz. Obce Szk 2001, nr. 6, s. 5-12
JASTRZĘBOWSKI Jerzy [au] PEKYFERYJNi Jerzy Jastrzębowski//*Rztczposplit.* – 1996, nr 103. dod. s. I-II
JASTRZĘBSKI Jsrzy [au] KULTURA i moderniizacja czyli glupi, maja gorzej / Jerzy Jastrzebowski 1996, nr 4, s. 1-2
JANICKI Mariusz [au]. WŁADYKA Wiesław [au] KTO wpuścił Leppera? / Mariusz Janicki, Wie.sldw Władyka // */Polityka.* – 2001, nr 40, s. 3-6,8-9 Ocena wynikow wyborow
JASIEWICZ Krzysztof [au] CZYJ prezydent, czyj parlament?: wartości i Interesy a zachowania wyborcze w 2000 oraz, 2001roku / Krzysztof Jasiewicz. – Streszcz. w jęz. ang. // */Stad. Potit.* – Nr 13 – (2002), s. 135-155
JERSCHINA Jan [au] SEJM to nasze lustro / Jan Jerschina// / Tyg. Powsz.–2001. nr. 42. s. 4
JUREK Marok [wp], MILCAREK Pawel [rp] ĘDZIEMY bronić normalności / Marek Jurek; rosnii. przepr. Pawel Milcarek // */Chriihamtni.* – *Nr* 9 – (2001). s. 195-201
JĘDRASZEWSKI Marek [wp]. RATAJCZAK Wiesław [rp] KULTURA, Europa, inteligencja. Kościół / Marek Jedraszewski; rozm. Przepr. Wieslaw Ratajczak // Czas Kult. – 1999/2000, nr. 6/1, s. 38-45
KAŁUŻA Małgorzata [au]. KOSICKA Krystyna [au]. MISTEWICZ ERYK [au] DYKTATURA usmiechu // Wprost/ - 1997, nr. 24, s.58-60
KEBLOWSKI J. Dzieje sztuki polskiej. Warszawa, 1987.
KIENIEWICZ S. História Polska 1795-1918. Warszawa, 1987.
[KUHIRT U.] Kunst der DDR. Bd. 1-2. Leipzig, 1982-83.
KOCHAN Marok [au] KAPITAN Żbik głosuje na Pku.furmu r/yli komiks w służbie reklamy politycznej: (analiza przypadku} / Marek Kochali. – Stresici. w *jez.* ang. // */Zesz. Prasozn.* -2001, nr 3/4, s. 37-57
KOLARSKA-BOBIŃSKA Lena [wp], KUBLIK Agnieszka [rp] PODZIAŁÓW bez liku / Lena Kolarska Bobińska ; rozm. przepr – Agnieszka Kublik // */Gaz. Wybór.* – 2001. nr 225, s. 6
KONAHSKA Iwona [au] MODL się. pracuj i... głosuj / Iwona Kortarska // */Przegłąd.* – 2001, nr 40. s. 20-21 Liga Polskich Rodzin
KONDUSZA Wojciech [au] WYBORY parlamenlarne 2001 w okręgu jeleniogórsko–legnickim / Wojciech Kundusza. // */Szkice Leg.* – T. 22 – (2001). s. 141-176
KORWIN-MIKKE Janusz [au] WNIOSKI z wyborów / Janusz Korwin-Mikke // */Najwyz. Czar.* – 2001, nr 42, s. XIII-XIV
KORWIN-MIKKE Janusz [au] WYBORY – i po wyborach / Janusz Korwin-Mikke// / Naiwyz. Czas. – 2001, nr 40, s.X-XI
KOSTRZEWA Julian [au] LOTN1SKOW1EC Podlosie / Julian Kostrzewa // */Nowe Panst.* – 2003. nr 10. s. 20-27

KOTLINOWSKI Marek [wp], TWAROG Marek [rp] W SLUZBIE rodzinie, narodowi I Polsce Marek Kotlinowski ; rozm. Przepr. Maciej Twarog // / Musl Pol. – 2001, nr 41, s.4
KOWALSKI Marcin [au] WITAJCIE w lepszych czasach / Marcin Kowalski // /Gas. Wybór – 2001. nr 224, s. 10-11
KOWALSKI Sergiusz [au] ROZTERKA nad urną; wybory 2001 / Sergiusz Kowalski Respub. Nowa. – 2001, nr 9, s. 16-22
KOWALSKI Sergiusz [au] SEJM niemy: sens i bezsens polskiej polityki / Sergiusz Kowalski Respub. Nowa. – 2001, nr 40, s. 3
KRZYŻANOWSKI Tomas, [an] WYGRALI, przegrali... Czyli Polska po wyborach / Tomasz Krzyzanowski // /Bez Dogmatu. – Nr 50 – (2001), s. 8-9
KUBLIK Agnieszka [au] NIEZADOWOLENIE elit: wyniki wyborow a strukturą elektoratu / Agnieszka Kublik // / Gaz. Wybor. – 2001, nr 235, s.15
KURSKI Jarosław [au] DZIS zbieram żniwo: fenomen Samoobrony / .Jaroslaw Kurski // /Gas. Wybór – 2001, nr 227. s. 4-6
KWASNIEWSKI Aleksander [wp], BACZYŃSKI Jerzy [rp]. WŁADYKA Wiesław [wp] MNIEJSZA wiekszosc / Aleksander Kwasniewski; rozm. przepr. Jerzy Baczynski Wieslaw Wladyka // / Polityka. – 2001, nr 39, s. 8-9
MALGORZATA KALUZA, KRYSTYNA KOSICSA, ERYK MISTEWICZ // Wprost. – 1997 , nr 24, s. 58-60
KIJONKA Tadeusz [au] AUTOR! ... / Tadeusz Kijonka // *Śląsk*. – 1997. nr 5, s. 54-55
KOCH Karl [au] O DYNAMICZNYM partnerstwie turystyki i kultury: [ref. tl.] / Karl Koch // *Probl. Twyat.* – 1995. nr .*3/4.s* 49-54
KOCISZEWSKI Aleksander [au] REGIONALNY ruch kulturowy w Polsce / Aleksander Kociszewski // /*Kut. Zesz. Regton.* – T. I s. 395-418
KOŁAKOWSK1 Andrzej [au] MESJAN1ZM i kultura / Andrzej Kołakowski. – (Biblioteka polsca) // *Spot. Otwartet.* – 1996. nr 5, s. 50-52
KOŁODZIEJSKA Jadwiga [au] KTO czyta nie bladzi / Jadviga Kolodziejska // Tyg. Powsz. – 1997, n.r 29, s. 16
KONSTANTINOV Georgij [wp]. KRASSOWSKI Maciej [rp] NAJWAŻNIEJSZA jest tossamozć / Gergij Konstantinov; rozm. przepr. MACIEJ KRASSOWSKI // *Wiad Kult* 1996, nr 5, s. 23
KOT Wiesław [au] DĘTA sesja: dlaczego Kongres Kultury Polskiej nie poprawi kondycji polskiej kultury" / Wiesław Kot. // *Wprost*. – 2000. nr.22, s. 116-118
KOT Wiesław [an] KOLONIZACJA sztuki / Wiesław Kot // / Wprost.-2001, nr 1, s. 104-105
LUBOWSKI Andrzej [au] SZUKAJCIE pomyslu na Polsce / Andrzej Lubowski // / Gaz. Wybor. – 2001, nr 223, s. 12-13
ŁABĘDŹ Krzysztof [au] SONDAŻ przedwyborczy *w* Bochnii w 2001 roku niektóre funkcje i wyniki / Krzysztof Labedz // /Krak. Stud. Malop. – Nr 6 – (2002), s. 421-429
Literatura Polska: Przewodnik encyklopedyczny. T. 1-2. Warszawa, 1984-85.
Łozinski J.Z. Pomniki sztuki w polsce. T. 1-2. Warszawa, 1985-92.
LUBIEŃSKI Tomasz [wp]. WITKOWSKI Kamil [rp] SWIAT doskonale sobie bez Polski radzil / Tomasz Lubienski; rozm. przepr. Kamil Witkowski // Mag. Lit. 1999, nr. 3, s. 30-32.
ŁUZNY Ryszard [au] DZIEDZISTVO chrzescijanskiego wschodu slowianskiego a zycie kulturalne w Polsce – wczoraj I dzis: [ref.] / Ryszard Luzny. – Streszcz. w jez. niem. // Zesz. Nauk. UJ, Pr. Hist. – Lit. – Z. 89 (1994), s. 107-118
MAGALA Sławomir [au] KOSZTOWNE zachcianci : (kultura i jej utrzymanie) / Slawomir Magala. – Streszcz. wjez. ang. // *Format*. – 1998, nr ½ , s. 10-12

MAGALA Sławomir [au] KULTURA po Ural / Slawomir Magala. –(-Ksztalty jutra; cz.4) // / Odra. – 2003, nr 10, s. 7-11
MAJEWSKI Michal [au] KLUB wodza: wybory 2001 / Michal Majewski // / Rzeczpospolita. – 2001, nr 226, s. A4
MARKOWSKI Radosław [au] WSPÓŁZAWODNICTWO w polskim systemie partyjnym w wyborach 2001 roku / Radosław Markowski. -Streszcz. w jęz. ang. // /*Stud. Polit.* – Nr 13 – (2002), S 35-66
MAZUR Bogusław [an] ZWYCIĘZCA w szachu : czego nie wiemy o polskim spo – leczenstwie / Bogusław Mazur // /*Wprost.* – 2001. nr 49, s. 19-24.
MAZEWSKI Lech [au] ANTYSOLIDARNOŚCIOWY plebiscyt / Lech, Mazewski // /*Spr. Polit.* – *2001.* nr 6, s,. 26-34
MILLER Leszek [wp]. OLCZYK Eliza [rji]. GOTTESMAN Krzysztof [rp]. SKÓRZYŃSKI Jan [rp] NIE podejmuje akcji samobojczych / Leszek Miller; rozm. przepr. Eliza Olczyk, Krzysztof Gottesman, Jan Skorzynski // / Rzeczpospolita. – 2001, nr 228, s. A5
MILLER Leszek [au] KULTURA, polityka i przyszłość / Leszek Miller // Prz. nr 7, 5, s. 16-17
MIŁKOWSKI Marcin [au] MIT prowincji / Marcin Milkowski // Wind. Kult. – 1996, nr 35, s. 6.
MILOBEDZKI A. Architektúra ziem polski. Krakow, 1994.
MIRONOWICZ E. Bialorusini w Polsce, 1944-1949. Warszawa. 1993; Bialorusini
Mniejszosci narodowe w Polsce: Panstwo I spoleczenstwo polskie a mniejszosci
narodowe w okresach przelomow politycznych (1944-1989). – Warszawa, 1998.
MIŁOSZ Czesław [au] O TOŻSAMOŚCI Czesław Miłosz // *Gaz. Wybór.* – 1999, nr 300, s. 11
MOSKAL Stanisław [au] CZY utracimy) narodową tożsamość czyli Czym. nas straszy duch epoki / Stanislaw Moskal. – Streszcz. w jęz. ang. // /*Krak. Stud. Maeop.* – Nr 6 – (2002), s. 35-54
NOWAK-JEZIORAŃSKI Jan [au] KONIEC państwa opiekuńczego / Jan Nowak-Jezioiań-ski // /*Rzeczpospolita.* – 2001. nr s. A10
ORŁOŚ Kazimierz [au] DZIEL i rządź: wybory 2001 / Kazimierz Orloś // /*gaz Pol* – 2001. nr 39, s. 6
NOBIS Adam [au] EUROPA. Polska, Mauritius i Borderland / Adam Nobis // /*Odra.* – 2001. nr 6, s. 79-81
OSIATYŃSKI Wiktor [wp]. BURNETKO Krzysztof [rp] WYBORY nie gwarantują jakości / Wiktor Osiatyński ; rozm. przepr. Krzysztof Burnetko // /*Tyg.* Powsz. - 2001, nr.39, s. 3
OMELANIUK Anatol [au] IDEA regionalizmu / Anatol Omelaniuk // *Syrytin.* – 1998. nr. 14, s. 19
Otto K.-P. Deutschland in der Epoche der Urgesellschaft. Berlin, 1960.
PARADOWSKA Janina [au] ILE SLD? / Janina Paradowska // /*Polityka.* – 2001, nr 38, s. 2834
PARADOWSKA Janina [an] WYBORY po wyborach / Janina Paradowska // /*Polityka.* 2001. nr. 41. s. 20-21
PARADOWSKA Janina [an] WYBORY po wyborach / Janina Paradownka // /*Polityka.* – 2001, nr. 39. s. 3-6
PIERONEK Tadeusz [wp]. LIZUT Mikołaj [rp] PARTYJNOŚĆ onad szystko adeusz ieronek rozm. przepr. Mikołaj Lizut // /*Gaz. Wybór.* – 2001. nr 228, s. *23*
POSŁOWIE Ligi Polskich Rodzin. Cz. 4 // /*Glos.* -2001, nr. 46, s. 13
PYTLAKOWSKI Piotr [au] JAK Begerka podpisy zbierała / Piotr Pyt.lakowski // /*Polityka.* – 2004, nr 37, s. 28-30

PAWLAS Jerzy [au] JAK nie widza, to nie piszą / Jerzy Pawlas // *Tyg. Solid* – 1998, nr 1, s. 19.
Podlaski K. (Skaradzinski Bialorusini, Littwini, Ukraincy.,Bialystok. 1990.
PIETRASIK Zdzisław *[mi]* TEH AT użytkowy: spis ginących zawodów / Zdzisław PicLrasik // *Polityka.* – 1997, nr 30, s. 41-42
PIETRZAK Zdzisław [au] OGÓRKI, ale nie mizeria: w wakacje kultura wychodzi z ram / Zdzisław Pietrzak // *Polityka. – 2000, nr. 29,* s. 20-21
PISKOR Stanisław [au] UNIWERSALIZACJA lokalnego / Stanisław Piskoj // */Dikada Lit.* – 2002, nr 7/8. s. 24-31
PO DEKLARACJI – czas na reformy // Ił mol. *Kult* – s. 5
PODKAŃSKI Zdzisław [wp]. BUDZYŃSKI Adam [rp] LEPISZCZE, które spaja naród / Zdzisław Podkański; rozin. przepr. Adam Budzyński // Wiad. *Kult.* – 1907. nr 8, s. 23
POPRZĘCKA Maria [ar] Polskość jako sytuacja / Mieczysław Porębski – Krak., 2002. – Rec. Maria Popizęckd // */Tyg.porsw* – nr ,32, s. 16
PRZYBYLSKI Marian Marek [wp]. KĘPIŃSKI Piotr [rp], RATAJCZAK Winsław [rp] *SĄ* IENIĄDZE, jest. sut.uka / Marian Marek Prcybylski; rozin. przepr. Piotr Kępiński, Wiesław Rałajczak // *Czas Kult.- 1998.* nr 1, *s.* 104-106
PYTASZ Ewa [au] KULTURA a samorząd / Ewa Pytasz // *Ślas – 1998.* nr 5. s. 70-71
RACIBORSKI [an] ZMIANY w granicach normy / Jacek Raciborski /'/ */Myśl Socjaldemokr.* – 2001, nr 4. s. 36-43
ROMASZEWSKI Zbigniew [wp]. STYCHLERZ-KŁUCIŃSKA Marzanna [rp] WYGRAŁ radykalizm / Zbigniew Romaszewski ; rozm. przepr. Marzanna Slychlcrz-Klncińska // */lyg. Solid.* -2001. nr 39, s. 3
Roszkowski W. Najnowsza história Polski 1918-1989. Warszawa, 1991.
ROŻEK Edward [au]. ŻYSZKIEWICZ Waldemar [tl] HAŃBA Narodu / Edward Rożek ; tt. Waldemar Żyszkiewicz // */lyg. Solid.* – 2001, nr 42, s. 8-9
ROŻEK Edward [au], ŻYSZKIEWICZ Waldemar [tl] PRZEKLEŃSTWO «okrągłego stołu» / Fdwartl Hoirk: tl. Waldemar Żyszkiewicz // */Tyg. Solid.* – 2001, nr 41, s. 7
RYMARZ Ferdinand [an] JAWNOŚĆ i kontrola finansowania kampanii wyborczej w wyborach prezydenckich i parlamentamych w latach 2000 i 2001 (na tle praktyki Państwowej Komisji Wyborczej) / Ferdynand Rymarz. – Streszcz. w jez ang */Prz. Sejm.* – 2002, nr 6.s.11-28 ROGUSKA Agnieszka
WSPOMACANIR rozwoju kultury lokalnej z udzialem telewizji kablowej na podstawie badań / Agnieszka Roguska // */Eduk. U.itnw. Doros. – nr 1.* [nr] 1. S-. 53-66
ROTTENBERG Anda [au] ZAPOMNIANY drobiazg, / Anda Rottenberg, // *Wprast.* - 1997, nr *38. s.* 114-1 15
SAGANIAK Magdalena [au] POLONEZ : o tradycji w szkole i nie tyolko / Magdalena Saganiak // *Spot. Otwarli.* – 1097, nr .3. ,s. 37-37
SALVADORI Roberto BRAVO Paweł [tl] KONIEC roku w Polsce / Roberto Salvadori; tl. Pawel Bravo // *Zesz. Lit.* – 1997, nr 2, s. 163-l66
Samsonowicz H. História Polski do roku 1795. 5 wyd. Warszawa, 1990.
SARZYŃSKI Piotr PO LEKCJACH / Piotr .Sarzynski // Polityka. 1997 nr 34 s. 44-46
SARZYŃSKI Piotr [au]TROCHE kultury! / Piotr Sarzyński // *Polityka. – 1999* nr. 18, s. 3-8.
SIENNICKI PAWEL [au] SAMOFINANSOWAN1E Samoobrony / Pawel Siennicki // */Nowe Państ.* – 2001, nr 40. s. 12-14
SŁOŃSKA Anna [au]. MAŁKIEWICZ Andrzej [au] ANALIZA wyników wyborów parlamentarnich września 2001 roku w świetle indeksu siły Sliapleya-Shubika / Anna Slońska, Andrzej Malkiewuz. – Streszcz w jęz. ang. // */Ztst. Nauk. / WSZarządz. Wroc. – Z.* 11 – (2002), s. 195-201

Slownik literatúry polskiej XIX wieku. Wroclaw, 1991.
Slownik literatúry polskiej XX wieku. Wroclaw, 1992.
Slownik literatúry staropolskiej. Wroclaw, 1990.
SOSNOWSKA Honorata [au] JAK różnią sie indeksy sily? Honorata Sosnowsca. - Streszrz. w jęz. ang. // /Operę *Stnd. Oecon.* – 2003, nr.1 s. 103-112
SZACKI Jerzy [wp]. KUBLIK Agnieszka [rp] PARTIE jednego hasła / Jerzy Szatki; rozm. przepl. Agnieszka Kublik // /*Gaz. Wybór.* – 2001. nr 225 s. 7-8
SZAWIEL Tadeusz [au] TRZĘSIENIA ziemi nie było: system partyjny po wyborach 2001 / Tadeusz Szawiel // /*Tyg. Powsz.* – 2001. nr 41 s. 1,4
ŚPIEWAK Paweł [au] LATAJĄCY elektorat: wybory 2001 / Pawel Spiewak // /*Res Pub. Nowa.* – 2001. nr. 9 *s. 24-28*
ŚPIEWAK Paweł [au] LATAJĄCY elektorat: wybory 2001 / Pawel Spiewak // /*Res Pub. Nowa.* – 2001. nr 9 *s. 24-28*
Stern L., Bartmuss H.-J. Deutschland in der Feudalepoche von der Wende des 5./6. Jh. bis zur Mitte des 11. Jh. Berlin, 1964.
ŚWIDA-ZIEMBA Hanna [wp]. SMOLEŃSKI Pawel [rp] WYGRAŁA antynadzieja / Hanna Swida-Ziemba: rozm. przepr. Pawel Smoleński // /*Gaz. Wybór.* – 2001. nr 229. s. 20-21
ŚWIETLIK Wiktor [au] .NIE jesteśmy tacy straszni / Wiktor Swietlik // /*Nowr-Fańst.* – 2001, nr. 40, s. 9-11
SOCHA Natasza LATO kultury / Natasha Soclia // *Wprost.* – *1996.* nr *24.* s. 97-98
SULIMA Roch [au] KULTURA ludowa i polskie kompleksy: [rei.] / Roth Sulinia // Regiony. – 1997, nr 1, s. 77-81
SZCZEPAŃSKI Jan Józrf [au] SPOŁECZEŃSTWO w czasach przełomu / Jan Józef Szczepański. – (Alarm dla kultury) // *Tyg, Solid.* – 1997 nr 47, s.6
SZCZYPIORSKI Andrzej [au] IRYTACJE: ostatni felieton / Andrzej Szczypiorek i // *Polityka.* – 2000 nr. 22, s. 48-19
SZYĆ Ryszard [au] SPRYWATYZOWANO niewiele – i źle / Ryszard Szyć // *kontr. Państ.* – 1998.
TOJ [au] LUD wybral / TOJ // / Najwyz. Czas. – 2001, nr 39, s. VI-VII
TVRNA Marcin [wp]. CZERNECKI Jacek [rp] NIE chce stac z boku / Marcin Tyrna; rozm. Przepr. Jacek Czernecki // / Tyg. Solid. – 2004, nr 37, s.12
TUROWSKI Jan [au] TRWALE ireśri kultury chłopskiej / Jan Turowski // *Kult.* Wsi. – 1997. - nr 1. s. 45
TUROWSKI Stanisław [au] REGIONALIZM czy zaściankowość? / Stanisław Turowski // *Wiad. Kult.* – 1996. nr 35, s. 6
URBANEK Mariudz [au] PIĘCIOPROCENTOWE wybory / Mariusz Urbanek // /*Odm.* – 2001, nr *9, s.* 5-9
URBANEK Mariudz [au] PIĘCIOPROCENTOWE wybory / Mariusz Urbanek // /*Odm.* – 2001, nr *9, s.* 5-9
URBANOWSKI Maciej [au] MESJAMSTA Jerzy lirami / Mariej Urbanowski // /*Ar-L-ana.* – 2001, nr – 1, s. 55-68 Wstepdo skązki "Kultura jutra"
WAJDA Andrzej [wp]. SUDOTIĆ Małgorzata [rp] TO BYŁA zemsta na elitach / Andrzej Wajda ; rozm. przepr. Malgorzata Sudotić // /*Rzeczpospolita.* – 2001, nr 234, s. A5
WIECZOREK Wojciech [au] KUCHNIA polska / Wojciech Wieczorek // /*Wiąż.* - 2001, nr 11, s. 84-90
WILDSTEIN Bronisław [au] CALA wladza w ręce zwycięzcy / Bionislaw Wildstein // /*Rzeapospoliai* – nr 224 s. A12
WIŚCICKI Tomasz [au] NIECH porządzą inni... / Tomasz Wiścicki // /Wiez. – -2001, nr 11, s. 76-83
WNUK-LIPINSKI Edmund [wp]. GÓJSKA Katarzyna [rp] ŚWIADOMOŚĆ bez znaczenia: wybory 2001 / Edmund Wnuk-Lipinski; rozm. przepr. Katarzyna Gójska // /*Gaz. Poi;* 2001, nr 39, s. 4

WNUK-LIPIŃSKI Edmund [wp]. TOMCZYK Pawel [rp] BEZ legendy / Edmund Wnuk-Lipiński; rozm. przepr. Paweł Tomczyk // / *Odra.* – 2001, nr 11, s. 2-5

WRZEŚNIOWA kampania // /*Tyg Solid.* nr ,39, s. 6-7

WAJDA Andrzej [au] POTOP i polskie zacisze / Andrzej Wajda // *On;. Wybór.* – 2OOO. *s.* 25

WALAS Teresa [au]. LEVINE Madeline G. [U] POLISH culture after communism: an introduction tu a discussion / Teresa Walaa: tl. z pol. Madeline G. Leviiic // *Dekada L.it.* - 1997, spec. iss.. s. 20-23

WALAS Teresa [an] ZMIERZCH paradygmatu – i co dalej? / Teresa Walas // /*Dekada Lit.* – 2001. nr 5/6. s. 50-73

WAWRZKIEWICZ Marek [an] NA PRZEMIAŁ / Marek Wawrzkiewicz // *Przeglad.* - 2000. nr 20, s. 18

WIELGOSZ Anna [ar] Kultura narodowa, i Kościół katolicki w r.jsiąrleciu państwa polskiego. – Siedlce, 2003. – R.ec. Anna Wielgos? // /*Roes. Hist – Muz. Pot. Ruchu Lud.* - Nr 19 – (2001), s. 289-302

WILCZYŃSKI Marek [an] EGZORCYŚCI i demaskotorzy : neokonservatyzm polski wobec kultury ponoworzesnej / Marek Wilczynski // *Czas Kult.* – 1996, nr 1, s. 4-9

WIŚCICKI Tomasz [au] SPÓR o kulturę / Tomasz Wiścicki // Wiez/ – 1996. nr 11/12. s. 70-78

WITKOWSKI Lech [au] WOJNY *W* kulturze czyli o podwójnej nctizy spoiów : nie tylko o postmodernizm / Lech Witkowski // /*PAI, fr:. Artyst-Ltf.* – 2001, nr 5. s. 38--42

WOLNY Maja [au]. SARZYŃSKI Piotr BEZ dyplomu: wielkie talenty nie potrzebują szkól ani mistrzów / Maja Wolny, Piotr Sarzyński // *Polityka.* – 1999, nr 6, s. 86-87

WPROST od czytelników: ankieta 99 ponad szesc tysięcy opinii // *Wprost.* – 1999. nr 16, s. 26-29

WPROWADZENIE do "Raportu o tanie kultury wiejskiej w Polsce" // *Kult. Wsi.* – 1997 nr 1, s. 177-179

ZAKRZEWSKI Andrzej [au] WYSTĄPIENIE Ministra Kultury i Sztuki Andrzeja krolewskiego na Zamku Królewskim, 2 paździcinika 1999 roku 'z. okazji wręczenia wybranym twórcom dorocznych nagród za rok 1998 // /*Poez: Dzist.* – Nr 6 –(1999) s. 4-5

ZIĘBA Maciej [wp]. GAJEWSKI [rp]. ZAREMBA Piotr [rp] PIŁKA jest po stronie lewicy / Mauej Zięba : rozrn. przepr. Jarosław Gajewski. Piotr Zareinlja // /*Nowe* nr *39. s.* 14-15

ZYCHOWICZ Jacek [au] NOWA scena polityczna / Jacek Zycliowicz nr 11, s. 9-11

ZYCHOWICZ Jacek [au] NOWA scena polityczna / Jacek Zycliowicz nr 11, s. 9-11

ZYCHOWICZ Jacek [au] NOWA scena polityczna / Jacek Zycliowicz nr 11, s. 9-11

ŻUKOWSKI Tomasz [an] W PÓL drogj do Ziemi Obiecanej? / Tomasz Znkonski // *Wiez.* nr 11 s. 64-75

ŻUKOWSKI Tomasz [wp]. ZALEWSKI Igor – [rp] ZAREMBA Piotr [rp] KONIEC epoki / Tomasz Zukowski; rozm, przepr. Igor Zalewski, Piotr Zaremba // /*Nowe Panst.* – 2001, nr 40, s. 14-16

ŻYSZKIEWICZ Waldemar [an] MĄDROŚĆ ludu? Chytrość politykow? / Waldemar Zyszkiewicz // / Tyg. *Solid.* – 2001. nr 40. s. *7*

ZYCHOWICZ Jacek [au] DRUGIE rozstrzelanie Boya: '"bojowi – oddziały LPR-u" w akcji / Jacek Zydiowicz // /*Res Hum.* / TKS 2003. nr 5, s, 5-6

ŻURAKOWSKI Bogusław [au] ODMIENNE modele / Bogusław Zurakowski // *PAL. Prz. Artysł.-Lit.* – 1998. nr 1/2.


ГЕРМАНІЯ
Маштаб 1:6 000 000
ФЕДЭРАЛЬНЫЯ ЗЕМЛІ ГЕРМАНІІ
1. Шлезвіг-Гольштэйн
2. Мекленбург-Пярэдняя Памеранія
3. Гамбург
4. Брэмен
5. Ніжняя Саксонія
6. Саксонія-Ангальт
7. Берлін
8. Брандэнбург
9. Паўночны Рэйн-Вестфалія
10. Гесен
11. Цюрынгія
12. Саксонія
13. Рэйнланд-Пфальц
14. Саар
15. Бадэн-Вюртэмберг
16. Баварыя
ГЕРМАНІЯ
ДАНІЯ
Фленсбург
Шлезвіг
Кіль
Любек
Росток
Штральзунд
Грайфсвальд
Вісмар
Шверын
Гамбург
Брэмен
Брэмергафен
Куксгафен
Эмдэн
Гронінген
Ольдэнбург
Люнебург
Цэле
Гановер
Брауншвайг
Магдэбург
Берлін
Патсдам
Франкфурт-на-Одэры
Котбус
Оснабрук
Білефельд
Мюнстэр
Дортмунд
Дуйсбург
Эсэн
Бохум
Вуперталь
Дзюсельдорф
Кельн
Бон
Ахен
Кобленц
Касель
Гетынген
Галле
Лейпцыг
Дрэздэн
Хемніц
Эрфурт
Веймар
Іена
Гера
Цвікаў
Плаўэн
Рудныя горы
Карлавы Вары
Прага
Франкфурт-на-Майне
Вісбадэн
Майнц
Дармштат
Вюрцбург
Трыр
Люксембург
Саарбрукен
Мангейм
Гайдэльберг
Нюрнберг
Эрланген
Бамберг
Байройт
Рэгенсбург
Карлсруэ
Штутгарт
Пфорцгайм
Ульм
Аўгсбург
Мюнхен
Інгальштат
Пасаў
Лінц
Зальцбург
Страсбур
Фрайбург-ім-Брайсгаў
Базель
Цюрых
Канстанц
Інсбрук
Мец
Нансі
ФРАНЦЫЯ
ЧЭХІЯ
ШВЕЙЦАРЫЯ
УСХОДНІЯ АЛЬПЫ
Шварцвальд
Швабскі Альб
Франконскі Альб
Шумава
Цюрынгенскі Лес
Рэйнскія Сланцавыя горы
2963
1493
1456
1214
1142
880
841
1015
15°
10°
50°


ПОЛЬШЧА
Маштаб: 1 6 500 000
Лічбамі 1-6 пазначаны гарады: 1. Глівіцы, 2. Забжэ, 3.Бытам, 4.Хожаў, 5. Сасновец, 6. Дамброва-Гурніча.
Лічбамі 7-10 пазначаны нацыянальныя паркі: 7.Белавежскі, 8. Бяшчадскі, 9. Татранскі,10. Карканешскі
Ваяводствы Польшчы:
1 Заходне-Паморскае
2 Паморскае
3 Вармінска-Мазурскае
4 Любускае
5 Велікапольскае
6 Куяўска-Паморскае
7 Мазавецкае
8 Падляскае
9 Лодзінскае
10 Дольнашлёнскае
11 Апольскае
12 Шлёнскае
13 Свентакшыскае
14 Люблінскае
15 Малапольскае
16 Падкарпацкае
БАЛТЫЙСКАЕ МОРА
ВАРШАВА
ГДАНЬСК
ГДЫНЯ
ШЧЭЦІН
ПОЗНАНЬ
ВРОЦЛАЎ
ЛОДЗЬ
КРАКАЎ
КАТАВІЦЫ
ЛЮБЛІН
БЕЛАСТОК
БЫДГАШЧ
ТОРУНЬ
КЕЛЬЦЫ
РАДАМ
ЖЭШАЎ
АПОЛЕ
ОЛЬШТЫН
ЭЛЬБЛАНГ
КАЛІНІНГРАДСКАЯ ВОБЛ.
ЛІТВА
БЕЛАРУСЬ
УКРАІНА
СЛАВАКІЯ
ЧЭХІЯ
ГЕРМАНІЯ
ГРОДНА
БРЭСТ
ЛЬВОЎ
16°
20°
24°
52° пн.ш

## АДКАЗЫ НА ТЭСТ-ЗАДАННІ

### Да лекцыі 1

1 а) 2 в) 3 в) 4 в) 5 а) 6 а) 7 а) 8 а) 9 а) 10 в) 11 в) 12 б) 13 в)
14 а) 15 в) 16 б) 17 а) 18 в) 19 в) 20 в) 21 а) 22 в) 23 а) 24 в)
25 в)

### Да лекцыі 2

1 а) 2 а) 3 а) 4 а) 5 б) 6 в) 7 в) 8 а) 9 а) 10 б) 11 а) 12 а)

### Да лекцыі 3

1 а) 2 б) 3 б) 4 в) 5 а) 6 а) 7 а) 8 а) 9 а) 10 б) 11 в) 12 в)
13 б) 14 в) 15 а)

### Да лекцыі 4

1 в) 2 в) 3 а) 4 б) 5 б) 6 а) 7 а) 8 а) 9 а) 10 в) 11 в) 12 а) 13 б) 14 б)

### Да лекцыі 5

1в) 2 а) 3 а) 4 а) 5 в) 6 в) 7 в) 8 а) 9 а) 10 в) 11 а) 12 в) 13 б)
14 б) 15 б)

### Да лекцыі 6

1а) 2 а) 3 а) 4 а) 5 б) 6 б) 7 б) 8 а) 9 а) 10 б) 11 а) 12 а)
13 б) 14 в) 15 б)

### Да лекцыі 7

1 а) 2 а) 3 а) 4 а) 5 а) 6 а) 7 в) 8 в) 9 в) 10 б) 11 б) 12 б)
13 а) 14 б) 15 б)

### Да лекцыі 8

1 а) 2 б) 3 б) 4 а) 5 а) 6 а) 7 а) 8 а) 9 а) 10 в) 11 б) 12 в)
13 б) 14 б) 15 а)

### Да лекцыі 9

1 в) 2 а) 3 а) 4 а) 5 а) 6 в) 7 б) 8 а) 9 а) 10 а) 11 а) 12 б)
13 а) 14 б)

## ЗМЕСТ

**Уступ**......3
**Раздзел I.** Польшча......5
**Лекцыя першая.** Асноўныя этапы польскай гісторыі (са старажытных часоў да 1918г.)......5
1.1. Дадзяржаўны этап польскай гісторыі (ад верхняга палеаліту да другой паловы Х стагоддзя)......5
1.2. Сярэдневяковая Польшча ад часоў княжання Мешкі І да ўтварэння Рэчы Паспалітай (другая палова Х стагоддзя – 1569г.)......6
1.3. Рэч Паспалітая абодвух народаў і яе месца ў польскай гісторыі (1795-1918гг.)......11
1.4. Польскія землі пад уладай Расіі, Прусіі, Аўстрыі (1795 – 1918гг.)......12
**Лекцыя другая.** Вузлавыя праблемы польскай гісторыі (1918 – 2005гг.)......23
2.1. Другая Рэч Паспалітая: фарміраванне нацыянальнай тэрыторыі, суадносіны дэмакратычных і антыдэмакратычных метадаў у кіраванні грамадствам і дзяржавай (1918 – 1939гг.)......23
2.2. Польшча ў час Другой сусветнай вайны. Да пытання аб юрыдычным замацаванні новых дзяржаўных межаў (1939 – 1945гг.)......30
2.3. Польская гісторыя ў другой палове 1940-ых гг. – 1989г.: курс вонкавых і ўнутраных сіл на дэмантаж заваёў народна-дэмакратычнай рэвалюцыі, мадэль дзяржаўнага сацыялізму ў кантэксце польскіх рэалій......34
2.4. Рэспубліка Польшча (1989 – 2005гг.): сістэмныя пераўтварэнні ў рамках посткамуністычнага этапа......37
**Лекцыя трэцяя.** Эканамічная сістэма і сацыяльная сфера РП......39
3.1. Польскі вопыт эканамічных рэформаў......39
3.2. Праблемы сацыяльнай абароны грамадзян ва ўмовах эканамічнага рэфарміравання......44
**Лекцыя чацвёртая.** Асновы палітычнай і прававой сістэмы. Унутраная і міжнародная палітыка......49
4.1. Выканаўчая, заканадаўчая і судовая ўлада......49
4.2. Палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі РП......53
4.3. Унутраная палітыка......54
4.4. Міжнародная палітыка. Польшча – Беларусь......55
**Лекцыя пятая.** Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі. Развіццё навукі і тэхнікі. Сістэма адукацыі. Выдатныя дзеячы польскай гісторыі......60
5.1. Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі......60
5.2. Сістэма адукацыі......63
5.3. Развіццё навукі і тэхнікі......65
5.4. Выдатныя дзеячы польскай гісторыі......66
**Раздзел другі.** Германія......68
**Лекцыя шостая.** Вузлавыя праблемы нямецкай гісторыі......68
6.1. Германія са старажытных часоў да 1870 года......68
6.2. Германія (1871-1918гг.)......71
6.3. Веймарская рэспубліка (1919-1933гг.)......73
6.4. Германія пад уладай Гітлера......75
6.5. Ад капітуляцыі трэцяга рэйха да гегемоніі ГерманII ў Еўропе......80

**Лекцыя сёмая.** Эканамічная сістэма і сацыяльная сфера.....82
7.1. Станаўленне і развіццё сацыяльнай рыначнай гаспадаркі. Германскі эканамічны цуд.....82
7.2. Гаспадарчае развіццё Берлінскай рэспублікі: пераемнасць і абнаўленне. Праблемы станаўлення рыначнай гаспадаркі ва Усходняй Германіі.....91
7.3 Беларуска-германскае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва і ўдзел у ім Брэстчыны.....97
7.4. Сістэма сацыяльнай абароны грамадзян ФРГ. Сярэднестатыстычны бюджэт нямецкай сям'і. Становішча моладзі ў ФРГ.....101

**Лекцыя восьмая.** Асновы палітычнай і прававой сістэмы. Унутраная і знешняя палітыка.....106
8.1. Дзяржайны лад. Прычыны стабільнасці канстытуцыйнага ладу. Асаблівасці германскага федэралізму.....106
8.2. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі.....109
8.3. Унутраная і знешняя палітыка.....114
8.4. Палітычнае супрацоўніцтва паміж РБ і ФРГ, партнёрскія сувязі Брэстчыны з землямі і гарадамі ФРГ.....119

**Лекцыя дзевятая.** Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі. Развіццё навукі і тэхнікі. Сістэма адукацыі. Выдатныя дзеячы германскай гісторыі.....125
9.1. Асаблівасці культурнага развіцця, звычаі, традыцыі.....125
9.2. Сістэма адукацыі.....127
9.3. Развіццё навукі і тэхнікі.....130
9.4. Выдатныя дзеячы германскай гісторыі.....131

**Літаратура**.....134
**Адказы на тэст-заданні**.....145
**Змест**.....146

СТРАЛЕЦ МІХАІЛ ВАСІЛЬЕВІЧ

# КРАІНАЗНАЎСТВА
## (ПОЛЬШЧА, ГЕРМАНІЯ)
## Курс лекцый

*для студэнтаў спецыяльнасці*
*25 01 03 "Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны"*

ISBN 985-493-025-4

9 789854 930251

Адказны за выпуск **Стралец М.В.**
Рэдактар **Строкач Т.У.**
Камп'ютарная вёрстка **Баравікова А.А.**
Карэктар **Нікітчык А.В.**

Ліцэнзія №02330/0113017 ад 30.04.2004г.
Здадзена ў набор 7.07.2005г. Падпісана ў друк 1.08.2005г. Фармат 60×84 $^1/_{16}$.
Папера "Снягурачка". Гарнітура Arial. Ум. – друк. арк. 9,25. Ум. – выд. арк. 8,6.
Зак. № 1113. Тыраж 100экз. Надрукавана на рызографе установы адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт"
Ліцэнзія №02330/0148711 ад 30.04.2004г.
224017, г. Брэст, вул. Маскоўская, 267.